КРАІНА БЕЛАРУСЬ

ВЯЛІКАЕ КНЯСТВА ЛІТОЎСКАЕ

ІЛЮСТРАВАНАЯ ГІСТОРЫЯ

Тэкст Уладзіміра Арлова
Мастак Зміцер Герасімовіч

Рэцэнзенты:
доктар гістарычных навук Анатоль Грыцкевіч
кандыдат гістарычных навук Уладзімір Ляхоўскі

Рэдактар Зміцер Санько
Картограф Віктар Цемушаў
Карэктары Яніна Марціновіч, Марыя Кавальчук

Кніга выдадзеная пры падтрымцы
BelSwissBank

ISBN 978-985-6519-82-7

KALI KRAM [illegible]

[illegible]

Выданне сфармаваў:
Аўкцыённы дом «Парагіс»
Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва
Бібліятэка Віленскага ўніверсітэта
Бібліятэка Красінскіх у Варшаве
Галоўны архіў старажытных актаў у Варшаве
Гарадзенскі гістарычна-археалагічны музей
Музей беларускага кнігадрукавання
Нацыянальная бібліятэка Беларусі
Нацыянальны мастацкі музей Беларусі
Нацыянальны гістарычны музей Беларусі
Нацыянальны музей у Варшаве
Нацыянальны музей у Кракаве
Польскі інстытут у Мінску

Кніга, якую вы трымаеце ў руках, у сваёй сутнасці працягвае
папулярнага ілюстраванага выдання «Краіна Беларусь».
Займальная і даступная для чытача любога ўзросту,
яна прысвечаная найцікавейшай эпосе нашай мінуўшчыны –
часам Вялікага Княства Літоўскага. У гэтай магутнай еўрапейскай
дзяржаве, дзе сфармаваўся беларускі народ,
беларускія землі адыгрывалі вызначальную ролю,
а беларуская мова была дзяржаўнай.
Сваёй гістарычнай радзімай Вялікае Княства Літоўскае лічаць
і літоўцы, і ўкраінцы, якія доўгі час жылі з беларусамі ў агульнай
краіне, а таксама беларускія татары і габрэі-літвакі.
Адная гэтая кніга мае на мэце раскрыць найперш
ролю дзяржаватворчую ролю нашых продкаў.
Вас чакае сустрэча з выбітнымі гістарычнымі асобамі: палітыкамі,
военачальнікамі, асветнікамі. Вы даведаецеся пра жыццё і побыт,
вайны, перамогі і культурныя дасягненні продкаў.
На аснове гістарычных фактаў кніга даводзіць, што Вялікае Княства
Літоўскае – наша дзяржава, а найменні «Літва» і «ліцвіны»
на працягу некалькіх стагоддзяў былі назвамі Беларусі і беларусаў.
У кнізе змешчаная больш за тысячу ілюстрацый, у тым ліку
летапісныя мініяцюры, сярэднявечныя гравюры, унікальныя
фотаздымкі і рэканструкцыі. Шмат якія ілюстрацыі беларускаму
чытачу дагэтуль былі невядомыя.
Гісторыя нашай краіны разглядаецца як частка
агульнаеўрапейскага руху цывілізацыі.

Змест

СЛАВЯНЕ І БАЛТЫ

Пры канцы 3-га – на пачатку 2-га тысячагоддзя да н. э. з поўдня і захаду на сучасныя абшары Беларусі прыйшлі плямёны індаеўрапейцаў. Ад іх вядуць свой род шмат якія сучасныя народы Еўропы, у тым ліку славяне і балты.

Балты

Як сведчаць назвы рэк і азёраў, а таксама археалагічныя знаходкі, у бронзавым веку тэрыторыю нашай краіны засялялі старажытныя балты. Яны продкі не толькі беларусаў, але і суседніх народаў – летувісаў і латышоў.

Летапісы захавалі найменні балцкіх плямёнаў, што жылі на нашых землях: яцвягі, галындзь, дайнова. Да іх звычайна далучаюць і літву.

Яцвягі займалі абшары паміж рэкамі Нёманам і Нараваю. Гэта быў мужны і ваяўнічы народ, што некалькі стагоддзяў з поспехам бараніў свае паселішчы ад ворагаў. У яцвяжскіх пахаваннях археолагі знаходзяць шмат зброі і рыштунку баявых коней. З часам яцвягі цалкам славянізаваліся і сталі часткаю беларускага народа.

Літва, якая традыцыйна лічыцца балцкім племем, таксама жыла на захадзе сучаснай тэрыторыі Беларусі, была больш шматлікай і адыграла ў нашай гісторыі значную ролю. Яна дала найменне Вялікаму Княству Літоўскаму – адной з наймагутнейшых дзяржаваў сярэднявечнай Еўропы.

Аднак некаторыя навукоўцы трымаюцца думкі, што летапісная літва – гэта таксама славяне, якія пад націскам немцаў перасяліліся на нашыя землі з захаду. Да такога меркавання схіляюцца, напрыклад, Паўла Урбан і Алесь Жлутка, што даследвалі маладаступныя гістарычныя крыніцы.

Рассяленне балтаў на будучых беларускіх этнічных абшарах

ХРАНАЛОГІЯ

Канец 3-га тыс. да н. э. – [illegible]

Пачатак 2-га тыс. да н. э. – VIII ст. да н. э. – Бронзавы век у Беларусі. [illegible]

V–VIII стст. – [illegible]

VIII–X стст. – [illegible]

Славяне

Гісторыкі працягваюць спрачацца аб паходжанні славянаў. У працах грэчскіх і рымскіх аўтараў яны згадваюцца ад самага пачатку 1-га тысячагоддзя н. э. Але шмат вучоных лічаць першай пісьмовай звесткай пра нашых далёкіх продкаў паведамленне славутага антычнага гісторыка і географа Герадота пра племя неўраў, што ў VI ст. да н. э. жыло на поўнач ад скіфаў, у басейнах рэк Гарынь і Паўднёвы Буг.

Прарадзімаю славянаў адны навукоўцы змяшчаюць на рацэ Дунай, але большасць – паміж Віслай і Одрай на тэрыторыі цяперашняй Польшчы. Існуе і меркаванне, што гэтай прарадзімаю было міжрэчча Дняпра і Заходняга Буга, а таксама паўднёвая Беларусь.

У V ст. славяне ўключыліся ў «Вялікае перасяленне народаў». Якраз тым часам датуюцца першыя славянскія паселішчы на нашых землях, знойдзеныя археолагамі ў горадзе Петрыкаве і каля вёскі Хатомель Столінскага раёна.

Рассяленне славянаў на землях сучаснай Беларусі адбывалася паступова. Яны рухаліся па рэках, на берагах якіх будавалі свае паселішчы. Суіснаванне новага насельніцтва з ранейшым балцкім было пераважна мірным. Славяне мелі вышэйшы ўзровень грамадскай арганізаванасці, больш развітую гаспадарку, лепшыя прылады працы. Усё гэта разам з падобнымі паганскімі (язычніцкімі) вераваннямі і звычаямі спрыяла міжэтнічным кантактам і збліжэнню суседзяў.

Крывічы. Дрыгавічы. Радзімічы

Крывічы займалі землі Падзвіння і верхняга Падняпроўя. Летапісы называюць моцнае адгалінаванне крывічоў – палачанаў. Іх цэнтрам быў найстаражытнейшы беларускі горад Полацак (вядомы з 862 г.), збудаваны на беразе Дзвіны ля яе сутоку з Палатой. Другім важным цэнтрам крывічоў стаў Смаленск. На цяперашняй тэрыторыі нашай краіны знаходзіліся старажытныя крывіцкія гарады Віцебск, Ворша, Заслаўе, Браслаў.

Поўная славянізацыя балтаў расцягнулася на некалькі стагоддзяў, але ў VIII ст. ужо ўтварыліся познія летапісныя аб'яднанні крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў.

Дрыгавічы жылі ў паўднёвай частцы Беларусі. Цэнтрамі гандлю і рамёстваў у іх былі Тураў, Пінск, Давыд-Гарадок, Слуцак, Берасце (Брэст), Клецак, Капыль, Рагачоў. На крывіцка-дрыгавіцкім памежжы сталі Менск, Лагойск, Барысаў.

Гарады ў беларусаў узніклі на некалькі стагоддзяў раней, чым у суседзяў – літоўцаў і латышоў.

У басейне ракі Сож, на ўсход ад дрыгавічоў, жылі радзімічы. На іх абшарах вылучаліся старажытныя Чачэрск і Прапошаск (Слаўгарад).

Найважнейшая роля ў нашай гісторыі належыць крывічам. Яны стварылі першую беларускую дзяржаву – Полацкае княства, якое летапісы называюць таксама *Полацкай зямлёй*. Народы-суседзі менавалі нашых продкаў крывічамі і пасля таго, як гэтае плямённае найменне знікла з усходнеславянскіх летапісаў. Для немцаў вялікая частка Беларусі была Крывіяй нават у XIV ст. Доўгі час назоў «крывічы» азначаў не старую плямённую, а дзяржаўную прыналежнасць і быў гістарычным этнонімам беларусаў. Па-латышску беларусаў і цяпер завуць «baltkrievs». Калі ў часы нашага Адраджэння на пачатку XX ст. ішло змаганне за аднаўленне беларускай дзяржавы, гучалі прапановы назваць яе Крыўяй або Крывіяй

На старажытных беларускіх землях, акрамя Полацкага, існавалі таксама моцныя Смаленскае і Тураўскае княствы. Але найбольшае значэнне для дзяржаўнасці мела Полацкая зямля.

СТАРАЖЫТНЫЯ БЕЛАРУСКІЯ КНЯСТВЫ

Полацкае княства

Першым вядомым з летапісаў полацкім князем быў Рагвалод, які праводзіў сваю, не залежную ні ад Кіева, ні ад Ноўгарада палітыку. Спадзеючыся на падтрымку палачанаў у барацьбе за кіеўскі пасад, да Рагвалодавай дачкі Рагнеды пасватаўся ноўгарадскі князь Уладзімір Святаславіч. Ён атрымаў адмову, бо Рагнеда ўжо рыхтавалася да шлюбу з кіеўскім князем Яраполкам.

Сабраўшы вялікае войска з варагаў, славенаў і чудзі, Уладзімір здолеў перамагчы Рагвалода і зруйнаваць крывіцкую сталіцу. Сам полацкі ўладар трапіў у палон і разам з жонкаю і двума сынамі быў забіты. Жывой пакінулі толькі Рагнеду, якую Уладзімір насуперак яе волі зрабіў сваёю жонкай. Неўзабаве ён перамог Яраполка і стаў кіеўскім князем.

Аднаго разу Рагнеда зрабіла спробу паквітацца за родных і паняволеную Айчыну, але Уладзімір адбіў удар яе мяча. Непакорлівую палачанку з малалетнім сынам Ізяславам выслалі на радзіму. Дзякуючы вялікай княгіні Рагнедзе захавалася княская дынастыя Рагвалодавічаў, якая валодала Полацкай зямлёй у X–XIII стст.

За князем Ізяславам, які вярнуўся ў Полацак, горад адрадзіўся і пачаў зноў уваходзіць у сілу. Ізяслаў сын Брачыслаў, здзейсніўшы некалькі пераможных паходаў (у тым ліку на Ноўгарад), значна пашырыў межы Полацкай зямлі і прымусіў кіеўскага князя Яраслава Мудрага прызнаць яе незалежнасць.

Полацак ляжаў на старажытным гандлёвым шляху «з варагаў у грэкі», што праходзіў па Дзвіне. Ён звязваў Балтыйскае мора з Чорным і спрыяў развіццю найбольш буйных крывіцкіх земляў, якія прызнавалі ўладу полацкіх князёў. Так ужо ў сярэдзіне X ст., а магчыма, і на стагоддзе раней узнікла найстаражытнейшая дзяржава нашых продкаў.

ХРАНАЛОГІЯ

Сярэдзіна X ст. – Утварэнне Полацкага княства, першай старажытнабеларускай дзяржавы.
Каля 980 г. – Летапісныя звесткі пра нашага першага князя Рагвалода.
988–1001 гг. – Княжанне ў Полацку Ізяслава.
992 г. – Утварэнне Полацкай епархіі.
1001–1044 гг. – Княжанне ў Полацку Брачыслава Ізяславіча.
1005 г. – Заснаванне Тураўскай епархіі.
1044–1101 гг. – Княжанне Усяслава Чарадзея.
1050–1066 гг. – Будаўніцтва ў Полацку Сафійскага сабора.
3 сакавіка 1067 г. – Бітва на Нямізе.
1078 г. – Перамога палачанаў над войскамі Уладзіміра Манамаха.
Каля 1104 г. – 1167 г. – Жыццё і дзейнасць Еўфрасінні Полацкай.
1127–1159 гг. – Княжанне ў Смаленску Расціслава Мсціславіча.
Каля 1130 г. – каля 1190 г. – Жыццё і дзейнасць Кірылы Тураўскага.
1158 г. – Заняпад незалежнасці Тураўскага княства.

Знойдзеная ў Полацку вісячая пячатка з выявай і надпісам імя Усяслава Брачыславіча. XI ст.

Полацкае княства мела ўсе адзнакі дзяржаўнасці – суверэнную ўладу князя і веча, сваю адміністрацыю, войска, узятыя пад ахову межы.

Пастаянныя паходы палачанаў на Ноўгарад і Навагародак (цяперашні Навагрудак) устрывожылі трох сыноў Яраслава Мудрага на чале з кіеўскім князем Ізяславам. Бітва паміж войскам Усяслава Чарадзея і злучанымі сіламі Яраславічаў, якія перад тым захапілі і спалілі памежны горад Полацкага княства Менск, адбылася ў 1067 г. на рацэ Нямізе. Усяслаў, хоць і дарагой цаной, здолеў абараніць дзяржаву, змусіўшы Яраславічаў адвесці войскі.

Старажытны Полацак часоў Усяслава. Мастацкая рэканструкцыя Пятра Татарнікава, 1999



Княгіня Рагнеда спрабуе забіць князя Уладзіміра, помсцячы яму за бацькоў, братоў і родны горад. Фрагмент мініяцюры Радзівілаўскага летапісу

Княжыч Ізяслаў заступаецца за Рагнеду, маці ад помсты Уладзіміра. Мініяцюра Радзівілаўскага летапісу

Бітва дружыны князя Уладзіміра з палаўцамі. Мініяцюра Радзівілаўскага летапісу

Не дасягнуўшы перамогі ў бітве, ворагі запрасілі полацкага князя на перамовы. Парушыўшы клятву, дадзеную на крыжы, яны захапілі Усяслава з старэйшымі сынамі ў палон. Праз год у Кіеве выбухнула паўстанне. Яго ўдзельнікі вызвалілі Чарадзея з турмы і абвясцілі вялікім князем кіеўскім. Але праз сем месяцаў ён намерыўся вярнуцца на радзіму. Пасля запятага змагання Усяслаў цалкам вызваліў Полацкае княства. У 1078 г. палачане атрымалі надзвычай важную перамогу над аб'яднанымі войскамі паўднёвых княстваў, ноўгарадцаў і полаўцаў, якія вёў на незалежную Полацкую зямлю Уладзімір Манамах.

За Усяславам Полацкае княства ахоплівала большую частку тэрыторыі сённяшняй Беларусі і адпавядала сваімі памерамі такім тагачасным краінам, як герцагства Баварскае або каралеўства Партугальскае. Апрача сталіцы наша першая дзяржава налічвала яшчэ паўтара дзясятка гарадоў: Віцебск, Заслаўе, Браслаў, Менск, Ворша, Копысь, Усвят, Лагойск, Барысаў, Друцак, Лукомль... На землях, дзе жылі продкі сучасных латышоў, стаялі гарады Герсіка і Кукейнойс, у якіх кіравалі полацкія васалы. Улада Полацка пашыралася на ніжняе Падзвінне да самага Варажскага (Балтыйскага) мора. Гэта значыць, што Полацкае княства было марской дзяржавай.

Найвышэйшага ўздыму наша першая дзяржава дасягнула ў другой палове XI ст., у часы Усяслава Брачыславіча, што за свае шматлікія таленты і незвычайныя якасці атрымаў імя Чарадзей. На загад Усяслава ў Полацку быў збудаваны велічны Сафійскі сабор, трэці такі храм на ўсходнеславянскіх землях, які сімвалізаваў роўнасць Полацка з Кіевам і Ноўгарадам.

Срэбныя ґузікі XI–XIII ст.

Скураны абутак XII ст. з Полацка

ХРАНАЛОГІЯ

Першыя звесткі пра беларускія гарады ў пісьмовых крыніцах:

862 г. – Полацк.
863 г. – Смаленск.
974 г. – Віцебск.
980 г. – Тураў.
Каля 997 г. – Заслаўе.
1019 г. – Берасце.
1044 г. – Навагрудак.
1059 г. – Копысь.
1063 г. – Браслаў.
1067 г. – Менск, Ворша.
1070 г. – Воўка (Крычаў-гарадок).
1078 г. – Лагойск, Лукомль, Друцк.
1097 г. – Пінск.
1102 г. – Барысаў.
1116 г. – Слуцк.
1127 г. – Гародня, Клецк.
1136 г. – Крычаў, Прапошаск (Слаўгарад).
1142 г. – Гомель, Рагачоў.
1155 г. – Мозыр.
1156 г. – Амсціслаў.
1159 г. – Чачэрск.
1252 г. – Белыя, Здзітаў, Слонім, Ваўкавыск.
1253 г. – Турыйск.
1267 г. – Мастар.

Гарады Полацкай зямлі, як і іншых старажытных беларускіх княстваў, былі буйнымі цэнтрамі рамяства і гандлю. Археолагі падлічылі, што ў Полацку жылі майстры больш чым шасцідзесяці спецыяльнасцяў. Купцы гандлявалі не толькі з суседнімі гарадамі, але і з далёкімі землямі, найперш з Візантыяй і Блізкім Усходам. Адтуль прывозілі віно, аліўкавы алей, тканіны і прыправы. З Заходняй Еўропы рамеснікі атрымлівалі волава, медзь і цынк. Адным з найважнейшых імпартных тавараў некалькі стагоддзяў была соль. З беларускіх княстваў на продаж вывозілі найчасцей футра, мёд, воск, папары, вугаль і смалу, а пазней таксама збожжа і жалеза.

Усе спробы Кіева далучыць Полацкую дзяржаву да сваіх уладанняў нязменна заканчваліся правалам. Княства заставалася незалежным і адыгрывала важную ролю ва Усходняй Еўропе. Прызнаннем міжнароднага аўтарытэту Полацкай зямлі сталася блізкае сваяцтва Рагвалодавічаў з візантыйскім імператарскім домам Камнінаў, а таксама з іншымі еўрапейскімі дынастыямі. Дачка Усяслава Чарадзея ўзяла шлюб з імператарам Аляксеем Камнінам.

Усяславава праўнучка Сафія, дачка менскага князя Валадара Глебавіча, у 1157 г. пашлюбілася з каралём Даніі Вальдэмарам I, адным з найславутых уладароў у гісторыі сваёй краіны. Нашчадкі нашай суайчынніцы займалі каралеўскія пасады ў Даніі, Швецыі і Францыі. У дацкім горадзе Калундборг каралева Сафія пабудавала катэдральны сабор, які меў за ўзор Сафійскі сабор у Полацку.

У Полацкім княстве існавала сістэма ўлады, пры якой разам з князем вялікая роля належала вечу – агульнаму сходу палачанаў. На ім разглядаліся найбольш важныя грамадскія і дзяржаўныя справы. Полацкае веча мела права прызначаць князя і пазбаўляць яго ўлады. Ад імя князя і полацкага епіскапа яно падпісвала дамовы з іншымі гарадамі і дзяржавамі. Закладзеныя тады дэмакратычныя традыцыі захоўваліся ў Полацку на працягу некалькіх стагоддзяў.

Смаленскае княства

Першыя паведамленні пра Смаленск летапісцы пакінулі пад 863 г., але незалежнасці Смаленская зямля дасягнула толькі ў 1127 г., у часе валадарання князя Расціслава Мсціславіча. У XII ст. у яе склад уваходзілі Ворша, Крычаў, Копысь, Амсціслаў, Прапойск, Таропец, Рослаў, Дарагабуж, Ельня ды іншыя гарады. На ўсходзе Смаленску належалі абшары да вытокаў рэк Угры і Масквы, дзе межы княства супадалі з этнаграфічнымі межамі рассялення беларусаў.

Князь Расціслаў Мсціславіч валадарыў болей за трыццаць гадоў і стаў пачынальнікам дынастыі смаленскіх князёў. Ён заснаваў у Смаленску самастойную епіскапію. Пры ім у сталіцы княства былі пабудаваныя ўмацаванні і некалькі мураваных храмаў. Найстаражытнейшы з іх – царква Пётры і Паўла, якая захавалася да нашых дзён.

Сын Расціслава Раман працягваў бацькаву палітыку ўмацавання самастойнасці Смаленскай зямлі. Вялікую ўвагу ён аддаваў асвеце: адчыняў школы, запрашаў у княства замежных вучоных, сабраў багатую па тых часах бібліятэку.

На ўсходзе Полацкая зямля межавала з іншай створанай крывічамі дзяржавай – Смаленскім княствам. На яго абшарах перакрыжоўваліся важныя гандлёвыя шляхі, якія ішлі па Дняпры, Волзе і Дзвіне.

Тураўскае княства

Адрозна ад Полацка Тураў, першыя звесткі пра які датуюцца 980 г., на пачатку сваёй гісторыі прызнаваў уладу Кіева.

Пад 1097 г. летапісцы ўпершыню паведамілі пра Пінск, які вырас на беразе Піны, на тым месцы, дзе яна зліваецца з Прыпяццю. Менш чым за стагоддзе Пінск апярэдзіў Тураў у развіцці, што пазней дало гісторыкам падставы называць княства Турава-Пінскім.

Сваю незалежнасць яно заваявала ў 1158 г. пры князі Юр'ю Яраславічу. У гэты год Тураў, а следам за ім Пінск здолелі абараніцца ад вялізнага кіеўскага войска.

Цесную лучнасць з Тураўскім княствам мела Берасцейшчына. Апрача самога Берасця тут існавалі гарады Кобрынь, Камянец, Дарагічын, Бельск, Мельнік. У другой палове XII–XIII ст. гэтыя землі ўваходзілі ў склад Уладзіміра-Валынскага княства, але захоўвалі значную самастойнасць. У тым часе была збудаваная знакамітая Камянецкая вежа.

Тураўскія князі часта займалі вялікакняжацкі кіеўскі пасад, што сведчыць пра значнасць палескага горада дрыгавічоў. Адзнакай яго самастойнасці было існаванне тут на пачатку XI ст. біскупскай катэдры заходняга абраду на чале з біскупам Рэйнбернам.



Прыняцце хрысціянства

У X ст. беларускія землі адначасова з шэрагам іншых еўрапейскіх краінаў сталі часткаю хрысціянскага свету. Трывалыя сувязі Полацкага княства з Канстанцінопалем, што выяўляліся і ў дынастычных шлюбах, і ў магутным уплыве візантыйскай культуры, дазваляюць лічыць, што новая вера прыйшла сюды наўпрост з Візантыі.

У XII ст. толькі ў сталіцы нашай першай дзяржавы былі ўзведзеныя дзесяць каменных храмаў, сярод якіх Спасаўская царква, што лічыцца вяршыняй полацкай архітэктурнай школы. Пры цэрквах і манастырах навучалі грамаце, перапісвалі кнігі.

Важнай асаблівасцю прыняцця хрысціянства ў Беларусі быў ягоны негвалтоўны, добраахвотны характар. Цягам стагоддзяў яно мірна суіснавала з ранейшым светаўспрыманнем, даўнімі традыцыямі і звычаямі. Нашыя княствы прынялі хрост яшчэ перад афіцыйным падзелам царквы на ўсходнюю і заходнюю плыні, які адбыўся ў 1054 г. Хрысцячыся паводле грэцкага абраду, жыхары беларускіх княстваў не адчувалі варожасці да вернікаў-лацінянаў. У XII ст. у Полацкай зямлі працягвалі пашырацца жыццяпісы рымскіх святых. Ужо ў тым часе продкам быў уласцівы дух талеранцыі – рэлігійнай і нацыянальнай цярпімасці.

Першымі вядомымі з гістарычных крыніцаў хрысціянамі у Беларусі былі княгіня Рагнеда (яна прыняла манаства пад імем Настасся) і яе сын Ізяслаў. Летапісы называюць гэтага князя чалавекам пабожным і вялікім кніжнікам. Ізяслаў увёў у Полацку пісьменства і навучанне грамаце, стаўшы, такім чынам, нашым першым асветнікам.

Еўфрасінню першую сярод усходнеславянскіх жанчын праваслаўнай царквы абвясцілі святой. Сёння яна шануецца як нябесная заступніца Беларускай зямлі.

Полацкая епархія – царкоўная акруга на чале з епіскапам – утварылася яшчэ ў 992 г., Тураўская – ў 1005 г. На беларускіх землях распачалося будаўніцтва мураваных храмаў і манастыроў.

Культура

У XII–XIII стст. старажытныя беларускія княствы паводле ўзроўню развіцця адукацыі, кніжнай справы, дойлідства ды іншых галінаў культуры нічым не саступалі суседнім еўрапейскім дзяржавам.

Праз хрысціянства Беларусь увайшла ў еўрапейскую цывілізацыю. Царкоўнаславянская мова тагачасных рэлігійных кніг сталася своеасаблівай «усходнееўрапейскай лацінай», якой валодалі адукаваныя людзі ад Балтыйскага да Адрыятычнага мора.

Выдатнай асветніцай той эпохі ў маштабе ўсяго хрысціянскага свету была ўнучка князя Усяслава Чарадзея Еўфрасіння Полацкая, адна з самых адукаваных жанчын Еўропы. Яна перапісвала і перакладала з грэцкай і лацінскай моваў царкоўныя кнігі і хронікі, пісала ўласныя творы. Магчыма, пяро асветніцы выводзіла радкі Полацкага летапісу. Вялікі размах папярэднічаў пісьмовага слова Еўфрасіння надала, заснаваўшы ў Полацку жаночы і мужчынскі манастыры. Там былі адмысловыя майстэрні па перапісванні кніг – скрыпторыюмы. Перадавую праграму мелі створаныя асветніцай школы, дзе юныя палачане вывучалі царкоўнаславянскую, грэцкую і лацінскую мовы, гісторыю, паэтыку і рыторыку.

Збіраючы вакол сябе талентаў, Еўфрасіння ўвайшла ў гісторыю і як наша першая мецэнатка. На яе замову геніяльны полацкі дойлід Іаан у 50-х гадах XII ст. збудаваў храм Спаса, які захаваўся да нашых дзён і зберог у сваіх сценах унікальныя тагачасныя фрэскі. Асветніца была заможцаю створанага ў 1161 г. полацкім майстрам Лазарам Богшам знакамітага Крыжа, які зрабіўся нацыянальнай святыняй Беларусі.

Старэйшым сучаснікам Еўфрасінні Полацкай быў славуты пісьменнік і прапаведнік Кірыла Тураўскі, якога называлі другім Залатавуснам, што «паче всех воссиял на Руси». «Словы»-казанні, павучальныя аповесці і вершы-малітвы епіскапа Кірылы перапісваліся, а потым неаднаразова перавыдаваліся ў Беларусі, Украіне і Масковіі. Цяпер яны перакладзеныя на сучасную беларускую мову.

Буйным культурным цэнтрам старажытнай Беларусі стаў Смаленск. Князь Расціслаў Мсціславіч адкрыў у ім навучальню, якая давала веды такога ўзроўню, што не мянялі акадэміяй. У Смаленску склаўся свой летапіс. Там на пачатку XII ст. нарадзіўся пісьменнік, філосаф і царкоўны дзеяч Клім Смаляціч. Ён атрымаў адукацыю ў Канстанцінопалі, вывучаў Біблію і біблейныя тэксты, творы «айцоў царквы», а таксама Гамера, Арыстоцеля, Платона. Па вяртанні на радзіму Смаляціч неўзабаве быў абраны кіеўскім мітрапалітам – кіраўніком хрысціянскай царквы на ўсіх усходнеславянскіх землях. Клім Смаляціч выхаваў вучня і паслядоўніка Аўрама Смаленскага – асветніка, шчодра надзеленага красамоўствам і літаратурным талентам.

Вучоныя даўно выказалі думку, што менавіта наш невядомы суайчыннік з'яўляецца аўтарам «Слова пра паход Ігаравы» – геніяльнага твора, што знаходзіцца ля вытокаў беларускай, украінскай і расійскай літаратур. У «Слове» шмат згадваюцца падзеі з гісторыі Полацкага княства, а Усяслаў Чарадзей паказаны як мудры палітык і таленавіты палкаводзец, які праз усё жыццё праявіў вернасць Бацькаўшчыне.

ПАГРОЗА З ЗАХАДУ І ЎСХОДУ

Змаганне з крыжакамі

Для нашых продкаў, як і для многіх еўрапейскіх народаў, XIII стагоддзе сталася перыядам цяжкіх выпрабаванняў. З захаду на славянскі свет распачалі націск крыжакі, з усходу і поўдня смяротную небяспеку неслі мангола-татарскія орды.

Кукенойс (Кокнесе)... Малюнак Й. Дальберга. Другая палова XVII ст.

Ніжняе Падзвінне знаходзілася пад уладай Полацка, дзяржаўныя інтарэсы якога наўпрост сутыкнуліся з крыжацкай агрэсіяй. Барацьбу з захопнікамі ўзначаліў полацкі князь Валодша (Уладзімір). Нямецкія хронікі называлі яго «каралём Вальдэмарам». У 1208 г. крыжакі ўзялі ў аблогу падуладны Полацку горад Кукенойс, дзе кіраваў князь Вячка. Ён вымушаны быў спаліць сваю фартэцу і адступіць з дружынай у Ноўгарадскую зямлю. Пазней гэты таленавіты военачальнік стаў на чале эстаў пад час абароны Юр'ева (Тарту) і геройна загінуў. Праз год пасля Кукенойса немцы захапілі другі фарпост Полацка ў балцкіх землях – горад Герсіку.

Князь Валодша падпісаў з рыжскім біскупам Альбертам дамову, паводле якой адмаўляўся ад земляў у Прыбалтыцы. Але Полацак выкарыстоўваў мір для падрыхтоўкі вялікага паходу на захопнікаў. У ім павінны былі ўдзельнічаць войскі ўсёй Полацкай зямлі і не толькі. Якраз напярэдадні выступу князь Валодша раптоўна памёр – найверагодней, быў атручаны агентамі крыжакоў. Паход не адбыўся, аднак полацкі ўладар так і не дазволіў захопнікам ступіць на крывіцкія землі.

Пасля няўдалых крыжовых паходаў у Палесціну заходнееўрапейскія рыцары скіравалі свой позірк на ўсходняе ўзбярэжжа Балтыкі і суседнія славянскія землі. Пры канцы XII ст. у вусці Дзвіны нямецкія рыцары, святары і купцы заснавалі горад Рыгу і ператварылі яго ў моцную фартэцу. Праз год там быў створаны вайскова-манаскі Ордэн мечаносцаў (пазней яго называлі Інфлянцкім або Лівонскім). Сваёй мэтай ён абвясціў навяртанне ў хрысціянства балцкіх плямёнаў: земгалаў, латгалаў і куршаў, а таксама ліваў і эстаў, што належалі да фіна-ўгорскіх плямёнаў. Але насамрэч крыжакі імкнуліся да захопу чужых земляў і прасоўваліся на ўсход.

ХРАНАЛОГІЯ

1186–1216 гг. – Княжанне ў Полацку Валодшы.
1209 г. – Абарона Кукенойса князем Вячкам.
1216 г. – Падрыхтоўка аб'яднанага паходу супраць крыжакоў і смерць князя Валодшы.
1240 г. – Удзел палачанаў у разгроме шведскіх рыцараў на Няве.
1242 г. – Разгром нямецкіх рыцараў на Чудскім возеры.
1238–1239 гг. – Першыя набегі мангола-татараў на Беларусь.

Пячатка магістра Інфлянцкага (Лівонскага) ордэна. Гэтая агрэсіўная рыцарская дзяржава існавала ў XIII–XVI стст. У 1561 г. Ордэн быў ліквідаваны, а частка яго тэрыторыі стала часткай Вялікага Княства Літоўскага

Медны водалей з Гародні. Найбольш імаверна, што гэты выраб быў ваенным трафеем гарадзенцаў

Рыцарскі шалом «гаршковага» тыпу. Сярэдзіна XIII ст.

Крыжацкая экспансія штурхала Полацк да альянсу з Ноўгарадам, якому таксама пагражалі захопнікі. У 1239 г. ноўгарадскі князь Аляксандр Яраславіч ажаніўся з Аляксандрай, дачкой полацкага князя Брачыслава. Праз год полацкая дружына дапамагла ноўгарадцам здабыць перамогу над шведамі на Неве, пасля чаго Аляксандр дадаў да свайго імя ганаровае прозвішча Неўскі. Палачане разам з віцеблянамі склалі трэціну ўсяго славянскага войска ў славутым Лядовым пабоішчы з немцамі на Чудскім возеры ў 1242 г.

Напады мангола-татараў

Старажытным беларускім землям ў той самы час пачаў пагражаць новы вораг – мангола-татары, якія ўжо падпарадкавалі сабе велізарныя абшары ад Кітая да Цэнтральнай Еўропы. Летапісцы згадваюць пра напад усходніх заваёўнікаў на Берасце. Пазнейшая легенда апавядае пра вялікую бітву з татарскім войскам хана Койдана пад горадам Крутагор'ем. Чужынцы, што ішлі на Менск, пацярпелі паразу. Койдан загінуў і быў у тых мясцінах пахаваны, пасля чаго Крутагор'е нібыта было названае Койданавам (цяпер горад Дзяржынск).

Легендарным героем часоў мангола-татарскага нашэсця з'яўляецца кананізаваны праваслаўнай царквой Меркур Смаленскі. Паводле жыццяпісу, уначы перад нападам ворагаў на Смаленск Меркуру ўдалося прайсці ў іх стан і забіць там «магутнага волата». Гэта і прадвызначыла перамогу смальнянаў, хоць сам герой паклаў у сечы галаву.

Да рэальных, а не легендарных падзей належыць напад татараў на чале з ханам Бурундаем на захад Беларусі ўзімку 1258/1259 г. Спустошлівыя набегі паўтараліся ў 1275, 1277 і 1287 гг. Аднак адрозна ад расейскіх земляў беларускія княствы не трапілі пад мангола-татарскі прыгнёт і ніколі не плацілі Залатой Арда ганебнай даніны. Натуральны працэс гістарычнага руху на нашых землях не быў парушаны. Дзякуючы гэтаму тут яшчэ на стагоддзі захаваліся вечавыя дэмакратычныя традыцыі. Тым часам у Маскоўскай дзяржаве ў выніку 240-гадовай няволі сцвердзілася азіяцкая дэспатыя.

Ролю аб'яднаўчага цэнтра ўзяў на сябе Навагародак.

НОВАГАРОДАК І ЛІТВА

[illegible]

Новагародская зямля

На старонках летапісаў Новагародак (Наваградак) упершыню згадваецца пад 1044 г., але горад існаваў ужо напрыканцы X ст. У першай палове XI ст. была абкапана Замкавая гара, дзе новагародцы збудавалі магутныя ўмацаванні – дзядзінец.

У XII–XIII стст. горад, размешчаны на пагорках Навагрудскага ўзвышша, перажываў свой росквіт. Тут былі развітыя дзясяткі рамёстваў, у тым ліку будаўнічая справа, апрацоўка жалеза, каляровых і каштоўных металаў, косці, бурштыну. Знаходкі археолагаў сведчаць пра існаванне ў Новагародку багатага жылога квартала з двухпавярховымі будынкамі, якія мелі шкляныя вокны (на той час вялікая раскоша і рэдкасць) і падлогі, выкладзеныя фрэскамі [illegible].

Горад вёў актыўны гандаль не толькі з Полацкай, Кіеўскай ды іншымі ўсходнеславянскімі землямі, але і з краінамі Заходняй Еўропы, Прыбалтыкай і Прычарнамор'ем, Візантыяй і Блізкім Усходам.

[illegible]

[illegible]

У XIII ст. Новагародак стаў самым магутным горадам Панямоння і сталіцай княства, у якое ўваходзілі таксама гарады Слонім, Ваўкавыск і Зэльва. Новагародская зямля адыгрывала ў рэгіёне ўсё большую ролю. Летапісы паведамляюць пра новагародскага князя Ізяслава, які ў 1237 г. у саюзе з галіцка-валынскім князем Данілам Раманавічам хадзіў у паход на Кондрада Мазавецкага. У цесным суседстве з Новагародкам знаходзілася Гарадзенскае княства.

[illegible]

[illegible]

ХРАНАЛОГІЯ

[illegible]



[illegible]

Летапісная Літва

Навукоўцы дагэтуль спрачаюцца, адкуль паходзіць назва «Літва» і што ён азначае.

Першая згадка пра Літву датавана 1009 г. Адна з лацінамоўных сярэднявечных хронік XI ст. паведамляе, што ў гэтым годзе хрысціянскі місіянер Брунa прыняў «на мяжы Русі і Літвы» пакутніцкую смерць ад паганцаў.

Самы старажытны ўсходнеславянскі летапісны звод «Аповесць мінулых гадоў» называе літву сярод суседзяў з славянскімі народамі. У другой палове XII ст. назва «Літва» пачынае ўсё часцей сустракацца ў пісьмовых крыніцах з прычыны яе вайсковай актыўнасці. Яна часта нападала на блізкіх і далёкіх суседзяў, з якімі жыло ва ўзаемадзеянні насельніцтва беларускага Панямоння, Падзвіння і Падняпроўя.

Вучоныя не маюць агульнай думкі пра тое, дзе знаходзілася летапісная Літва. Традыцыйна лічыцца, што яна займала тэрыторыю на паўночным захадзе сучаснай Рэспублікі Беларусь і на Віленшчыне.

Некаторыя навукоўцы-летувісы, імкнучыся давесці дзяржаватворчую ролю сваіх продкаў, лічаць першай сталіцай Літвы Кернаў. Між тым, гэтае паселішча, размешчанае на Віліі, было такім самым аграрным паселішчам, як і Крывіч-горад (Вільня): вынікі археалагічных раскопак там даказваюць тыповы набор знаходак, характэрны для тагачасных беларускіх гарадоў. Акрамя згадванне Кернаў у хроніках толькі ў 1279 г.

Больш пераканаўчым падаецца іншае меркаванне, якое грунтуецца на аналізе чэмпыкаў летапісных звестак. Паводле яго старажытная Літва размяшчалася на абшары цэнтральнай Беларусі: паміж Новагародкам і Менскам (з захаду на ўсход) і Маладзечнам і Слонімам (з поўначы на поўдзень).

Гэта пацвярджаецца і дадзенымі тапанімікі. Менавіта на акрэсленай тэрыторыі знаходзіцца пяць вёсак з найменнем Літва (у Маладзечанскім, Стаўбцоўскім, Уздзенскім, Ляхавіцкім і Слонімскім раёнах). Нідзе болей у Беларусі такіх тапонімаў няма, хоць паселішчы з аднакарэннымі назвамі, а іх болей за шэсцьсот, – Ліцвінава (Літвінава), Ліцвіны (Літвіны), Ліцвінавічы (Літвінавічы), Ліцвінкі (Літвінкі), Ліцвяны (Літвяны), Ліцвякі, Літоўчанка, Літоўск, Літвічы, Літвінава Горкі, Літоўчыкі ды інш. – сустракаюцца па ўсёй нашай краіне.

Насельніцтва летапіснай Літвы большасць вучоных лічаць мяшаным славяна-балцкім, а само племя літва залічаюць да балтаў. Адным ёсць і іншая версія, паводле якой літва (лютва) – гэта частка вялікага заходнеславянскага племя лютычаў, якое жыло паміж рэкамі Лабай і Одрай (Эльбай і Одэрам) на паўночным усходзе сённяшняй Нямеччыны. Пасля доўгага змагання з нямецкімі рыцарамі лютычы, ратуючыся ад паняволення і вынішчэння, перасяліліся на ўсход.

У кожным разе нельга блытаць пазнейшых літоўцаў (летувісаў) і старажытных ліцвінаў, якія жылі на тэрыторыі Беларусі і ўдзельнічалі ў фарміраванні беларускага этнасу.

Адрозна ад сучаснай краіны і дзяржавы продкі сучасных летувісаў не мелі тады ні гарадоў, ні пісьменства, ні муравання дойлідства і вельмі позна стаялі язычнікамі [illegible].

[illegible]

Літва і Летува

На працягу 2-га тысячагоддзя назоў «Літва» ў розныя часы меў розны сэнс. Урэшце, ужо ў XX ст. ён набыў чатыры галоўныя значэнні:

1) старажытнае (летапіснае) племя і тэрыторыя, якую яно засяляла;
2) Вялікае Княства Літоўскае;
3) гістарычны рэгіён, які традыцыйна звалі Літвою, пасля таго як Вялікае Княства Літоўскае знікла з палітычнай карты;
4) новая дзяржава (Летува), якая ўзнікла ў 1918 г.

Нават на пачатку XX ст., калі ўжо даўно не існавала Вялікага Княства Літоўскага, заходнія і цэнтральныя беларускія землі ў Расейскай імперыі працягвалі называцца Літвой. Сітуацыя кардынальна змянілася толькі пасля Першай сусветнай вайны, калі найменне «Літва» (Lietuva) афіцыйна узяў для свайй дзяржавы народ, які сфармаваўся на населеных балтамі тэрыторыі Жамойці і прылеглых да яе землях. Падрабязней пра гэта гаворыцца ў наступных раздзелах, але будзьма памятаць: ні ў якім разе нельга атаясамліваць сярэднявечныя і сучасныя назовы «Літва», «літоўцы», «ліцвіны».

Летувісы выступаюць супраць ужывання тэрмінаў «Летува» і «летувіс» ў іншых мовах. Між тым карыстанне гэтай тэрміналогіяй мае ўжо даўнюю традыцыю ў самой Летуве. Да прыкладу, у 1928 г. для шматлікай супольнасці расейскіх старавераў, што жылі ў Летувіскай рэспубліцы, на замову ўрадоўцаў быў зроблены пераклад дзяржаўнага гімна, які пачынаўся словамі:

Летува, отчизна наша,
Ты – земля героев,
И сыны Твои из прошлого
Все величье строят.

Літва ў гістарычным сэнсе – гэта наша дзяржава, а ліцвінамі або літоўцамі называлі нашых продкаў. Каб пазбегнуць блытаніны, сучасную суседнюю з Беларуссю краіну варта менавіць яе саманазовам – Летува, яе жыхароў – летувісамі, а мову – летувіскаю.

НОВАЯ БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАВА. МІНДАЎ

[illegible]

Міф пра літоўскую заваёву

Некалькі стагоддзяў, пачынаючы з Стрыйкоўскага, існаваў міф, нібыта беларускія землі, спустошаныя і знясіленыя мангола-татарскай навалай, захапілі літоўскія князі Эрдзівіл і Мінгайла. Навука даўно высветліла, што не было ў гісторыі ні татарскага нашэсця на Беларусь, ні міфічных Эрдзівіла з Мінгайлам, ні самой «літоўскай заваёвы». Тым не менш гэтая байка, выгадная як летувісам, так і расейцам (апошнія ў такім разе прэтэндавалі на ролю «вызваліцеляў»), сталася жывучай і нават замацавалася ў навуковай літаратуры. «Заваёўнікам» цяпер спрабуюць абвясціць князя Міндоўга, асобу рэальную, але з зусім іншай гістарычнай роляй.

З гэтым міфам звязаны іншы – пра існаванне на балцкай тэрыторыі раннефеадальнай летувіскай дзяржавы, што як быццам была папярэдніцаю Вялікага Княства Літоўскага. Усе пошукі слядоў той дзяржавы – і з дапамогаю аналізу пісьмовых сведчанняў, і шляхам археалагічных даследаванняў – скончыліся марна.

Ва ўмовах пастаяннай пагрозы нападу нямецкіх рыцараў-крыжакоў з захаду і мангола-татараў з усходу старажытныя беларускія княствы былі зацікаўлены ў аб'яднанні. Надзвычай важную ролю ў гэтым працэсе адыграў князь Міндаў. Форма гэтага імя Міндоўг (і блізкія да яе) фігуруе ва ўсходнеславянскіх летапісах, якія захаваліся ў позніх спісах. Актуалізавана і трапіла ў гістарычную літаратуру. Форма ж Міндаў ужывалася ў дакументах, якія выходзілі з яго канцылярыі. Гэтай формай карыстаюцца і еўрапейскія даследчыкі, публікатары архіўных крыніц.

[illegible] 1260 г.

[illegible]

ХРАНАЛОГІЯ

1219 г. – Першая згадка пра Міндаўга (Міндоўга) у летапісах
1235 г. – [illegible] пра «[illegible] Міндаўга»
1246 г. – Пачатак княжання Міндаўга ў Навагрудку
1253 г. – Каранацыя Міндаўга
1260 г. – Разгром крыжакоў каля возера Дурбе
1263 г. – Забойства князя Міндаўга
1263–1264 гг. – Княжанне [illegible] князя Транаты

[illegible] Гравюра з «Хронікі Еўрапейскай Сарматыі» Аляксандра Гваньіні. 1581 г.

Князь Міндаў

Імя Міндава ўпершыню сустракаецца ў летапісах пад 1219 г. у сувязі з яго дамовай з галіцка-валынскімі князямі супраць Польшчы. У адным з беларускіх летапісаў – «Хроніцы Быхаўца» – апавядаецца, што, забіўшы частку сваіх супернікаў і выгнаўшы на чужыну іншых, Міндаў у 1235 г. «пачаў княжыць ва ўсёй зямлі Літоўскай адзін, меў славу і гонар вялікі і не цярпеў супроць сябе нікога».

Шматлікія незадаволеныя васалы распачалі з Міндавам зацятую барацьбу. У пошуках хаўрусніка князь скіраваў свой позірк у бок Навагародскага княства. Навагародцы ж бачылі ў суседнім валадары палкаводца вопытнага і палітыка, які мог спрыяць умацаванню іхнага княства і пашырэнню яго межаў. Яны падтрымалі Міндава і запрасілі на навагародскі пасад.

Палітычны альянс найважнейшага горада прынёманскага беларускага абшару з самым моцным з літоўскіх князёў меў вынікам стварэнне новай дзяржавы – Вялікага Княства Літоўскага, якой наканавана было набыць значную вагу ў Еўропе і існаваць больш за пяць стагоддзяў.

Напачатку новая дзяржава займала тэрыторыю верхняга і сярэдняга Панямоння і мела апрача сталічнага Навагародка гарады Ваўкавыск, Гародню, Слонім і Здзітаў.

Хрышчэнне Міндава. [illegible] XVIII ст.

Узыходжанне Міндава на пасад у Навагародку датуецца 1246 г. Пад тым самым годам пазнейшы Густынскі летапіс паведамляе, што літоўскі князь, які быў паганцам, нібыта прыняў праваслаўе – веру сваіх падданых, але абставіны прымусілі яго яшчэ раз змяніць веравызнанне.

Сталася так, што першыя гады існавання Вялікага Княства праходзілі ў цяжкім змаганні з Галіцка-Валынскім княствам, варожымі балцкімі князямі і нямецкімі рыцарамі Інфлянцкага (Лівонскага) ордэна. Каб разбурыць гэтую магутную кааліцыю, Міндаў пагадзіўся на пераход у каталіцтва. У 1251 г. князь з жонкай Мартай і двума малодшымі сынамі прыняў у Навагародку хрост паводле заходняга абраду.

Разам з сваім валадаром у новую веру перайшоў яго двор і тая частка войска, што складалася з паганцаў. Хрышчэнне адбывалася ў Навагародку з удзелам высокіх асобаў Інфлянцкага ордэна, які, такім чынам, з ворага ператварыўся ў хаўрусніка. Гэта паспрыяла перамогам над яцвягамі і жамойтамі. Княства ліквідавала небяспеку для сваёй незалежнасці. Міндава падтрымаў сам папа рымскі Інакенцій IV.

Каранацыя ў Навагародку

Прыняўшы ад пасоў валадара Вялікага Княства Літоўскага лісты з просьбаю пра апеку, папа рымскі даў згоду і накіраваў у Навагародак булу, дзе назваў Міндава каралём, а яго дзяржаву – каралеўствам. У другой буле, адрасаванай рыжскаму, дэрпцкаму (дэрпцкаму) і хэльмскаму біскупам, найвышэйшы кіраўнік каталіцкай царквы прасіў дапамагчы «каралю Літоўскаму, які хоча павярнуць паганцаў да хрысціянскай веры».

Міндавы пасы атрымалі таксама дазвол на каранацыю навагародскага князя каралеўскай каронаю. Папа даручыў зрабіць гэта хэлмінскаму біскупу Генрыху.

Цырымонія адбылася 6 ліпеня 1253 г. Адну карону папскі пасланец усклаў на галаву Міндаву, другую – яго жонкі Марты.

Міндаў таксама дамогся заснавання ў Навагародку Літоўскага арцыбіскупства з беспасрэдным падпарадкаваннем папу. Каранацыя і стварэнне для краіны асобнай дыяцэзіі (царкоўнай акругі) былі актамі вялікага дзяржаўнага значэння. Каралеўства Літоўскае здабыло прызнанне ў Еўропе, і хоць Міндавы наступнікі не мелі каралеўскага тытулу, каранацыя засталася ў гісторыі як важнае сведчанне існавання нашай незалежнай дзяржавы.

Як сведчыць Іпацьеўскі летапіс, «вялікі князь літоўскі Міндаў каранаваны быў на Каралеўства Літоўскае ў Навагародку, з дабраславення папы Інакенція праз Генрыха біскупа, у Прусах каралём».

Забойства караля

Праз некалькі гадоў кароль Міндаў разарваў пагадненне з сваім працікнікам – Інфлянцкім ордэнам. Найверагодней, што прычынаю сталася імкненне далучыць Жамойць, якая раней была аддадзеная крыжакам. Улетку 1260 г. нашае войска ўшчэнт разграміла нямецкіх рыцараў каля возера Дурбэ. Міндаў распачаў з Інфлянцкім ордэнам адкрытую вайну.

Аднак бесперапыннае змаганне з Ордэнам, галіцка-валынскімі князямі, Польшчай і Прусіяй ішло з пераменным поспехам і ўзмацніла апазіцыю Міндаву на землях васалаў. У змову супраць валадара дзяржавы ўступілі нальшчанскі князь Даўмонт і жамойцкі Транята, які марыў пра навагародскі пасад.

У 1263 г. Міндаў паслаў свае войска на Бранск. Даўмонт пагадзіўся на ўдзел у паходзе, але з дарогі нечакана павярнуў назад і ўначы напаў на Міндава. Караля і двух яго малодшых сыноў напаткала смерць.

У выніку гэтага забойства ў Літве пачаў княжыць Транята, але яго валадаранне скончылася вельмі хутка. Праз колькі месяцаў Траняту забілі Міндава слугі, якія выканалі волю Войшалка – старэйшага сына Міндава.

Разрыў Міндава з Інфлянцкім ордэнам прывёў да стварэння немцамі міфа, нібыта наш кароль адмовіўся ад новай рымскага і стаў адступнікам веры. Але ж пасля смерці Міндава папа Клімент IV пісаў пра яго як пра «слаўнай памяці караля, падступна забітага сынамі зрады». Болып за тое, ён рупіўся пра аднаўленне ў Літве каралеўскага пасаду і даваў даручэнне каралю Багеміі Атакару каранаваць сына Міндава. Тытул «кароль літвінаў» у дачыненні да манархаў Вялікага Княства выкарыстоўваўся ў актах дзяржаўнай канцылярыі і дыпламатычным ліставанні да Крэўскай уніі 1385 года.

АБ'ЯДНАННЕ НАШЫХ ЗЕМЛЯЎ

За Войшалкам Вялікае Княства павялічвала сваю тэрыторыю і ўключала Новагарадскую, Літоўскую, Пінскую, Нальшчанскую і Дзяволтаўскую землі. Нават Полацак прызнаў уладу Новагародка, але дачыненні паміж імі доўгі час нагадвалі раўнапраўны [illegible].

Князь Войшалк

Заручыўшыся падтрымкай у Пінску і Новагародку, старэйшы сын Міндава Войшалк, што нейкі час быў манахам, вярнуў сабе велікакняскі пасад і жорстка расправіўся з бацькавымі ворагамі. На чале аб'яднанага новагародска-пінскага войска ён захапіў Літоўскую зямлю. У 1265 г. з дапамогаю галіцка-валынскай дружыны Войшалк падпарадкаваў балцкія землі Нальшчаны і Дзяволтву. Забойца Міндава нальшчанскі князь Даўмонт мусіў ратавацца ўцёкамі ў Пскоў.

Пэўны час Войшалк валадарыў у Вялікім Княстве разам з сваім шваграм (мужам сястры) Шварнам, што быў сынам Данілы Галіцкага. Неўзабаве вялікі князь намерыўся вярнуцца ў заснаваны ім пад Новагародкам Лаўрышаўскі манастыр і перадаў уладу Шварну. Вельмі незадаволены гэтым быў галіцкі князь Леў Даніілавіч, які разлічваў, што ўлада дастанецца яму. Ён запрасіў Войшалка на пагадненне і сваімі рукамі зарэзаў засек князя-манаха. Па нейкім часе ад рук Льва Даніілавіча загінуў і князь Шварн.

Печатка князя Трайдзеня

Vitenes Princeps Litua-niae.

Вялікі князь літоўскі [illegible]. Гравюра з «Хронікі Еўрапейскай Сарматыі» Аляксандра Гваньіні. 1581 г.

ХРАНАЛОГІЯ

1264–1267 гг. – Княжанне вялікага князя Войшалка
1267–1270 гг. – Княжанне вялікага князя Шварна
1270–1282 гг. – Княжанне вялікага князя Трайдзеня
1295–1316 гг. – Княжанне вялікага князя Віценя
1307 г. – Канчатковае ўключэнне Полацкай зямлі ў Вялікае Княства Літоўскае
1316 г. – [illegible]
1319 г. – [illegible]

Князь Трайдзень

Наступны вялікі князь Трайдзень працягваў палітыку ўмацавання дзяржавы. Ён канчаткова далучыў да Вялікага Княства верхняе Панямонне, Дайнову і Яцвягію.

Войскі Вялікага Княства нераз рабілі пераможныя выправы і на польскія землі. Бліжэйшая з іх – Мазовія шукала міру з нашай дзяржавай. Дзеля гэтага мазавецкі князь Баляслаў Плоцкі ўзяў шлюб з дачкою Трайдзеня Гаўдэмундай, якая ў хросце стала Софіяй.

Трайдзень паспяхова супрацьстаяў нападам галіцка-валынскіх князёў і татарскім паходам. Ён даваў прытулак прусам, якія на сваёй зямлі вялі зацятую барацьбу з нямецкімі захопнікамі. Уцекачоў з Прусіі на загад вялікага князя сялілі ў ваколіцах Слоніма і Горадні.

Вялікае Княства Літоўскае ў гады гаспадарання Трайдзеня ўмацавалася і пашырыла замежнапалітычны ўплыў.

Вялікае Княства Літоўскае ў другой палове XIII ст.

Літоўскае войска рабіла ўдалыя паходы на ўладанні крыжакоў, даходзячы да эстонскага вострава Саарэма. Інфлянцкія рыцары атрымалі цяжкія паразы ў 1270 і 1279 гг., а ў 1281 г. Трайдзень змусіў крыжакоў перадаць яму замак Дынабург (Дзвінск, цяпер – Даўгаўпілс).

Дагавор рыжскага арцыбіскупа [illegible] горада Рыгі [illegible] 1299 г.

Летапісы звязваюць з імем Віцяня з'яўленне нашага старажытнага дзяржаўнага герба — «Пагоні». Як сведчыць летапіс, князь «прыдумаў сабе герб: рыцар збройны на коні з мячом, называны „Пагоня"». У сапраўднасці гэты сімвал мае нашмат больш даўнюю гісторыю і паходзіць з Полацка. Расійскі гісторык В. Тацішчаў, які карыстаўся страчанымі пазней полацкімі летапісамі, сцвярджаў, што «герб Беларусі спрадвеку быў вершнік з мячом». Падобны сімвал мелі і палабскія славяне, частка якіх, магчыма, перасялілася на нашыя землі.

Князь Віцень

Галоўным клопатам вялікага князя Віценя сталася абарона нашай дзяржавы ад крыжакоў. Скарыўшы Прусію, Тэўтонскі ордэн узмацніў націск на Вялікае Княства. Асабліва жорсткімі былі напады на Гарадзеншчыну, дзе знаходзілі другую радзіму прусы-перасяленцы.

Ад 1300 г. да канца ўладарання Віценя ордэнскія войскі здзейснілі блізу дзясяці паходаў на Літву, дасягаючы сталічнага Навагародка. У 1284, 1295, 1305 і 1306 гг. нямецкія рыцары нападалі на Гародню. Аднак Княства ўпарта баранілася: у памежных замках стаялі моцныя залогі, разбураныя ўмацаванні хутка адбудоўвалі, а за ворагам наладжвалі пагоню.

Віцень удала выкарыстаў канфлікт Ордэна з Рыгай і ўчыніў з ёй і рыжскім арцыбіскупам дамову пра супольныя дзеянні. У 1298 г. войску Вялікага Княства Літоўскага з дапамогай рыжанаў удалося нанесці крыжакам адразу дзве цяжкія паразы.

Князь Віцень здолеў істотна пашырыць абшар дзяржавы, далучыўшы да яе ў 1315 г. Берасцейскую зямлю. Яшчэ раней, у 1307 г., на ўмовах захавання значнай аўтаноміі ў Вялікае Княства Літоўскае з згоды жыхароў [illegible] баяраў і купцоў канчаткова ўвайшла Полацкая зямля. Палачане атрымлівалі ад вялікіх князёў пісьмовыя гарантыі «не рушыць старыны, не ўводзіць навіны».

Князь Віцень значна пашырыў межы дзяржавы, уключыўшы ў яе Полацкае княства і Берасцейскую зямлю. Гравюра з «Хронікі Еўрапейскай Сарматыі» Аляксандра Гваньіні. 1581 г.

Пад кіраўніцтвам Віценя нашая дзяржава здолела стрымаць агрэсію Тэўтонскага ордэна. Гэта мела важнае значэнне для далейшага лёсу не толькі Вялікага Княства Літоўскага, але і ўсёй Усходняй Еўропы.

Давыд Гарадзенскі

У часе валадарання Віценя гучную славу ў дзяржаве і за яе межамі здабыў гарадзенскі староста Давыд. У ім жыхары беларускага Панямоння знайшлі мужнага і пячорна надзеленага вайсковым талентам абаронцу ад пастаянных крыжацкіх нападаў. Давыд нараз граміў непрошаных гасцей на сваёй зямлі і водзіў дружыны ў нямецкія ўладанні.

Найвыдатнейшай перамогі ён дасягнуў у 1314 г., калі крыжакі тройчы нападалі на Вялікае Княства. Буйное рыцарскае войска павёў у паход сам маршал Тэўтонскага ордэна. Гарадзенцы на чале з Давыдам зрабілі свой замак непрыступным. Расчараваныя адсутнасцю здабычы, немцы рушылі далей. Тым часам Давыд Гарадзенскі захапіў зробленыя крыжакамі ў пушчы харчовыя запасы і вярхавых коней. На зваротным шляху рыцары ўбачылі на месцы схованак толькі пабітую варту. Рэшткі галоднага рыцарскага войска ахапіла роспач. Амаль ніхто з тэўтонцаў у Прусію не вярнуўся.

У росквіце славы Давыд загінуў. У 1326 г. у адным з паходаў здрадніцкім ударам у спіну яго забіў падкуплены крыжакамі польскі рыцар.

Пячатка магістра Інфлянцкага ордэна, які ў 1237 г. быў злучаны з Тэўтонскім.

Капітэль з выявай [illegible] магістра Тэўтонскага ордэна. Мальбарк. Польшча.

Мемарыяльны камень у гонар Давыда Гарадзенскага каля Барысаглебскай (Каложскай) царквы ў Гродне. Фота Зміцера Герасімовіча. 2010 г.

ВЯЛІКІ КНЯЗЬ ГЕДЗІМІН

[illegible] герб «Калюмны». [illegible] 1555 г.

Пашырэнне межаў

Вялікі князь Гедзімін [illegible]. Гравюра з «Хронікі Еўрапейскай Сарматыі» Аляксандра Гваньіні. 1581 г.

За часамі князя Гедзіміна, які заняў пасад пасля Віценя, у Вялікім Княстве знаходзілася ўжо большая частка тэрыторыі сучаснай Беларусі. Далучэнне новых земляў адбывалася рознымі шляхамі, але амаль заўсёды мела мірны характар, бо давала прымаючым княствам надзейную абарону ад ворагаў і магчымасць спакойна займацца земляробствам, рамёствамі і гандлем.

На пачатку XIV ст. канчаткова ўвайшлі ў склад новай дзяржавы Тураўская і Пінская землі, крыху пазней – Менскае княства. Віцебская зямля стала часткаю Вялікага Княства ў выніку шлюбу Гедзімінавага сына Альгерда з віцебскай князёўнай Марыяй Яраслаўнай. Дэманструючы палітычную мудрасць, набытым землям гаспадар (так называлі вялікіх князёў) Гедзімін гарантаваў захаванне ранейшых традыцыйных правоў і законаў.

[illegible]

Генеалагічнае дрэва Гедзімінавічаў. Фрагмент гравюры Аляксандра Тарасевіча. 1672 г.

ХРАНАЛОГІЯ

1316–1341 гг. – Княжанне вялікага князя Гедзіміна.
1317 г. – Заснаванне самастойнай Літоўскай мітраполіі.
1320 г. – Перамога над крыжакамі пад Меднікамі. Часткаю Вялікага Княства Літоўскага стала Віцебская зямля.
Каля 1325 г. – У склад дзяржавы ўвайшло Менскае княства.
1326, 1329 гг. – Войскі Вялікага Княства нанеслі паразы тэўтонцам у Брандэнбургу.
1331 г. – [illegible]

Замак у Медніках. Літаграфія з малюнка Напалеона Орды. Другая палова XIX ст.

Збудаваны Гедзімінам [illegible] замак у Троках. Фота [illegible]. 2008 г.

Герб Трокаў. На гербе [illegible] «Калюмны».

Барацьба з тэўтонцамі

Ужо на пачатку свайго гаспадарання Гедзімін разбіў тэўтонцаў пад Жэймамі. Гэтая перамога была замацаваная наступнай – у 1320 г. каля Меднікаў. У 1326 г. ліцвінскія войскі на чале з Давыдам Гарадзенскім, а налета – з Гедзімінавым сынам Альгердам нанеслі цяжкія паразы Брандэнбургу, які быў хаўруснікам тэўтонскіх рыцараў.

У барацьбе з Ордэнам гаспадар Вялікага Княства абапіраўся на альянс з Рыгай, што праз гандаль знаходзілася ў цеснай лучнасці з Полацкам. Паслядоўна падтрымліваў Гедзімін таксама варожых крыжакам Полацку і Пскоў.

Як і іншыя палітыкі, Гедзімін мусіў весці заняткі змаганне з Тэўтонскім ордэнам. Дзеля стрымлівання націску агрэсіўных суседзяў вялікі князь загадаў збудаваць магутныя замкі ў Троках (цяпер Тракай), Вільні, Навагрудку, Крэве, Медніках (цяпер Медзінінкай), Лідзе і Мядзеле.

Крыжакі [illegible]. Рыцар [illegible] XIV ст. Мастак А. Макбрайд. 1980-я гады.

Рыга. Гравюра з кнігі С. Мюнстэра «Касмаграфія». Базель. 1550 г.

Перанясенне сталіцы падкрэслівала, што Полацкая зямля набыла ў дзяржаве асаблівую вагу. У Вільні і ў іншых гарадах Гедзімін сяліў запрошаных з еўрапейскіх краін купцоў, рамеснікаў, адукаваных людзей. Такая палітыка спрыяла культурнаму росту дзяржавы.

Перавод сталіцы ў Вільню

У 1323 г. Гедзімін перанёс сталіцу дзяржавы з Навагрудка ў Вільню.

Паводле гістарычнай легенды, што трапіла ў некаторыя хронікі, гэты горад заснаваў сам Гедзімін. Гаспадар нібыта ўпадабаў на высокай гары тура, пасля чаго ўбачыў сон, які паганскі святар патлумачыў як знак збудаваць на гэтым месцы горад.

Напраўду Вільня заснавана на некалькі стагоддзяў раней. Напачатку яна мела назоў Крывы (Крывіч) горад і была старадаўнім цэнтрам крывіцкай каланізацыі. На думку аўтарытэтнага летувіскага вучонага К. Буги, крывічы з'явіліся тут яшчэ ў VI–VII стст. У 1070-х гадах горад стаў сталіцаю Віленскага ўдзела Полацкага княства. У часы Гедзіміна Вільня ўяўляла сабой ужо даволі вялікае места.

Гедзімін пачаў афіцыйна менаваць сябе «каралём Літвы і Русі», або «каралём ліцвіноў і русінаў». Русінамі, або «рускімі», тады называлі праваслаўных жыхароў нашай краіны. Пашыраючы межы, дзяржава «пашырала» і найменне. На пачатку XIV ст. яна называлася Літвой. Пасля далучэння Жамойці, украінскіх земляў ды іншых абшараў нашы манархі тытулаваліся як вялікія князі «ўсёй Літоўскае, Жамойцкае і многіх Рускіх земляў». Найменне, такім чынам, адлюстроўвала не федэрацыйную будову дзяржавы, а тэрытарыяльныя набыткі, уладанні вялікага князя. У Статуце 1529 г. быў замацаваны наступны назоў дзяржавы: «Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае». Але найчасцей тагачасную краіну нашых продкаў скарочана называлі Вялікім Княствам Літоўскім ці проста Літвой.

Вежа Гедзіміна на Замкавай гары ў Вільні. Фота Дзяніса Раманюка. 2001 г.

Літоўская мітраполія

Гедзімін заставаўся паганцам, але не чыніў перашкодаў хрысціянам, якія складалі большасць насельніцтва дзяржавы. У Вільні будавалі і праваслаўныя, і каталіцкія храмы ды манастыры. Адметная якасць для старажытнага Полацкага княства традыцыя талеранцыі (цярпімасці да людзей іншага веравызнання і этнічнага паходжання) атрымала за Гедзімінам заканадаўчае пацвярджэнне і захоўвалася ў Беларусі цэлым стагоддзем.

Гаспадар клапаціўся і пра тое, каб яго падданыя, што вызнавалі праваслаўе, кіраваліся не маскоўскім, а сваёй царкоўнай іерархіяй. У 1317 г. у Вялікім Княстве была ўтворана самастойная праваслаўная мітраполія. Наш мітрапаліт Феафіл, што узначаліў яе, меў рэзідэнцыю ў Навагрудку.

Першы мітрапаліт Літвы загінуў у бітве з рыцарамі пры аблозе крыжацкай фартэцыі Баербург. Тамсама забіваліся і жыццё князя Гедзіміна.

У Княстве праводзілася мірная палітыка. Сістэма кіравання ўсталёўвалася на ўзор старажытнабеларускіх земляў, а ў дзяржаўных справах ужывалася старабеларуская мова.

Помнік вялікаму князю Гедзіміну на плошчы ў Вільні. Скульптар В. Вашкіс. 1996 г. Фота Дзяніса Раманюка.

Літва на старажытнай гравюры М. Вольгемута і В. Плейдэнвурфа з «Сусветнай хронікі» Г. Шэдэля. Нюрнберг. 1493 г.

У часы гаспадарання Гедзіміна Вялікае Княства Літоўскае зрабілася моцнай дзяржавай, якая атрымала міжнароднае прызнанне і пастаянна для ўдзеяння на Усходзе Еўропы. Новая сталіца — крывіцкая Вільня стала рэальным прэтэндэнтам на ролю збіральніцы ўсіх усходнеславянскіх земляў.

ПАХОДЫ ВЯЛІКАГА КНЯЗЯ АЛЬГЕРДА

[illegible]

Прыход да ўлады

Альгерд быў сынам гаспадара Гедзіміна. Ён ажаніўся з віцебскай княжўнай Марыяй Яраслаўнай і неўзабаве стаў княжыць у Віцебску. Альгерд таксама меў вялікі ўплыў на Полацак, дзе ўладарыў яго сын Андрэй. Пазней Альгерд атрымаў яшчэ і Крэўскае княства. Усё гэта давала яму падставы лічыць сябе прэтэндэнтам на велікакняжацкую карону. Аднак пасля смерці Гедзіміна пасад заняў Яўнут, малодшы брат Альгерда.

Разам з іншым братам Кейстутам Альгерд у 1345 г. выступіў супраць улады Яўнута, які быў узяты ў палон. Кейстут захапіў Вільню, але прызнаў гаспадаром Альгерда, што кантраляваў большую частку дзяржавы. Сам Кейстут застаўся кіраваць у заходняй частцы Вялікага Княства Літоўскага.

Рыцар, які наведаў Вільню ў складзе нямецкага пасольства, пісаў пра Альгерда: «У князя велічны пагляд, вочы блакітныя, валасы светла-русыя. Рост ён мае вышэйшы за сярэдні, гаворыць гучна і выдатна сядзіць на кані». Альгерд добра ведаў нямецкую мову, але з крыжацкімі пасламі заўсёды размаўляў праз перакладчыка.

[illegible]

Бітвы з крыжакамі

Тэўтонскі ордэн імкнуўся адрэзаць нашую дзяржаву ад Балтыйскага мора. На Альгердава валадаранне прыпаў пік нямецкіх паходаў. Яшчэ ў 1342 г. Альгерд дапамог адбараніцца ад крыжакоў суседняму Пскову.

Займаючы велікакняжацкі пасад, ён адбіў шэсць вялікіх паходаў. У 1348 г. літоўскае войска сустрэлася з немцамі на рамянскай прытоцы Страве. У крыжацкіх шэрагах знаходзіліся рыцары-наймiты з Англіі і Францыі. Большую частку нашага войска складалі палкі з Полацка, Віцебска, Смаленска, Берасця.

Сеча на рацэ Страве была доўгай і надзвычай жорсткай. Ордэн распусціў чуткі пра сваю перамогу, але направду поспеху дасягнулі ваяры Княства. Упарты супраціў крыжацкай агрэсіі працягваўся.

ХРАНАЛОГІЯ

[illegible]

[illegible]

Разгром татараў на Сініх Водах

На паўднёвых межах Вялікага Княства таксама было неспакойна. Адтуль зноў і зноў нападалі татары. Яны стварылі велізарную дзяржаву – Залатую Арду, якая займала абшары ад Заходняй Сібіры да Дуная і трымала ў васальнай залежнасці расейскія і ўкраінскія княствы.

Альгерд пастанавіў разграміць ардынцаў у генеральнай бітве і рушыў з 30 тысячамі ваяроў углыб варожай тэрыторыі. Аснову войска складалі беларускія палкі, да якіх далучыліся кіеўскае і валынскае рушанне (апалчэнне). Татарскую арду ўзначальвалі князі Кутлубуг, Качубей і Дзмітр.

Бітва адбылася ў 1362 г. каля ракі Сінія Воды – прытокі Паўднёвага Буга. Татары разлічвалі выкарыстаць сваю звычайную тактыку – імклівай атакай зайсці з флангаў і абкружыць нашае войска. Але Альгерд яшчэ раз выявіў выдатны вайсковы талент і сарваў гэтыя планы, паставіўшы шэсць сваіх палкоў у лінію глыбокай абароны. Ардынцы мусілі распачаць франтальны бой. Адбіўшы іхны націск, Альгердава войска само атакавала ворага з фронту і з флангаў. Татары не вытрымалі магутнага ўдару і паказалі спіны. Рэшткі варожай конніцы ратаваліся ўцёкамі да самага Дуная. Асабліва вызначыліся ў той сечы навагародскія ваяры.

[illegible]

Перамогі над Масковіяй і Польшчай

Гаспадар Альгерд вёў палітыку далучэння новых земляў на ўсходзе. Другі раз ён узяў шлюб з цвярской князёўнай Ульянай і меў уплыў на моцнае Цвярское княства. Гэта выклікала вострую незадаволенасць у Маскве.

У 1368 г. маскоўскае войска рушыла на Цвер. Яе князь Міхайла звярнуўся па дапамогу да напага мацярка. Той адгукнуўся, і высланыя супроць Альгерда палкі былі разбітыя, прычым амаль усе варожыя ваяводы загінулі. Напалоханы маскоўскі князь Дзмітрый (які потым увайшоў у летапісы як Данскі) спаліў драўляныя пасады і зачыніўся ў Крамлі.

Войска Вялікага Княства Літоўскага зноў раз з'явілася каля крамлёўскіх муроў у 1370 г. Пасля тыднёвай аблогі Дзмітрый зноў папрасіў міру і прыслаў Альгерду вялізны выкуп – «дары многія, незлічона золата, срэбра, жэмчугу і сабалёў». Вялікі князь папракаў крамлёўскага ўладара – «любоў сваю над ім учыніў, з Масквы яго не здабываў ды мір з ім узяў». Пры гэтым наш гаспадар сказаў словы, што таксама засталіся ў летапісах: «Хоць я з табой і замірыўся, але хачу сабе яшчэ тую славу ўчыніць, што вялікі князь Альгерд дзіду сваю пад Масквою прыхіснуў». Поўную перамогу ён засведчыў тым, што пад'ехаў на кані да Крамля і пастукаў у яго сцены дзідай.

Памяткаю пра тыя падзеі засталася Паклонная гара ў Маскве. Менавіта туды маскоўскія баяры прыходзілі з выкупам на паклон да Альгерда.

Мір з Масквой, аднак, цягнуўся нядоўга. У 1372 г. цвярскі князь чарговым разам папрасіў падтрымкі ў змаганні з агрэсіўнай Масквой. Трэці паход Альгерда зноў быў пераможны і скончыўся замірэннем.

Князь Андрэй Полацкі

У Альгерда было дванаццаць сыноў. Найстарэйшы з іх, Андрэй, княжыў у Полацку. Ён вёў наступальную палітыку ў дачыненні да суседніх Пскова і Смаленска, паспяхова супрацьстаяў пагрозе старажытным крывіцкім землям з боку крыжакоў. Вядома, што ў 1373–1375 гг. Андрэй трымаў у аблозе нямецкую фартэцу Дынабург.

Пасля бацькавага скону Андрэй разлічваў заняць вялікакняскі пасад. Але гаспадаром стаў іншы Альгердаў сын – Ягайла. Андрэй з дружынаю мусіў пакінуць Полацак і пайсці на паразуменне з маскоўскім князем Дзмітрыем.

Пастаянна вялася вайна Вялікага Княства і з заходнімі суседзямі – Польскім Каралеўствам. Толькі за адзін паход у 1376 г. Альгердава войска вывела адтуль амаль 25 тысяч палонных.

Дзве тысячы палачан ваяроў на чале з сваім князем удзельнічалі ў Кулікоўскай бітве 1380 г. Андрэй камандаваў «палком правай рукі» – правым флангам славянскага войска.

Па нейкім часе Андрэй адваяваў Полацак. Доўгае і бурнае жыццё ён скончыў у 1399 г. у бітве з татарамі на Ворскле.

Апошняму ў гісторыі полацкаму князю ішоў тады 75-ы год.

Расійская гістарычная навука перабольшвае значнасць Кулікоўскай бітвы. Перамога над ханам Мамаем не стала пачаткам вызвалення расійскіх земляў ад татарскага ярма. Яшчэ цэлае стагоддзе пасля гэтага маскоўцы плацілі татарам ганебную даніну.

Князь Альгерд паказаў сябе дальнабачным палітыкам і таленавітым военачальнікам. За часы яго гаспадарання наша дзяржава стала найбуйнейшай па тэрыторыі і ўмацавала свой аўтарытэт у Еўропе.

Дзяржаўнай мовай Вялікага Княства Літоўскага да моманту стварэння гаспадарскай канцылярыі была беларуская.

Вялікае Княства Літоўскае ў часы Альгерда

КНЯЗЬ ЯГАЙЛА. КРЭЎСКАЯ ВУНІЯ

Герб Ягайлы з фрэскавай размалёўкі Замкавай капліцы ў Любліне, зробленай беларускімі майстрамі. Пачатак XV ст.

Змаганне з Кейстутам

Стаўшы гаспадаром, Ягайла адразу ж сутыкнуўся з супрацівам свайго магутнага дзядзькі Кейстута, які княжыў у Троках. У 1381 г. Кейстут захапіў Вільню і вялікакняжацкі пасад, аднак праз год Ягайла здолеў вярнуць сабе сталіцу. У часе перамоваў ён паланіў Кейстута, зняволіў яго ў вежы Крэўскага замка, а потым загадаў задушыць.

Ягайла захаваў уладу, але яе не прызналі ні полацкі князь Андрэй, ні Кейстутаў сын Вітаўт. Андрэй як найстарэйшы сын Альгерда лічыў сябе законным спадкаемцам бацькавай кароны, аднак пацярпеў паразу і на некалькі гадоў трапіў у палон. Вітаўт Кейстутавіч таксама быў зняволены, але здолеў уцячы з Крэўскага замка і працягваў змаганне.

Князь Кейстут кіраваў заходняй часткай Вялікага Княства. Гравюра пачатку XIX ст.

Кейстут і Вітаўт, зняволеныя Ягайлам у Крэве. Мастак Войцех Герсан. 1873 г.

ХРАНАЛОГІЯ

1377–1381, 1382–1392 гг. — Княжанне вялікага князя Ягайлы.
1381 г. — Княжанне вялікага князя Кейстута.
1382 г. — Забойства князя Кейстута ў Крэве.
1385 г. — Крэўская унія Вялікага Княства Літоўскага і Польскага Каралеўства.
1386 г. — Супраць Крэўскай уніі і Ягайлы выступіў князь Андрэй Полацкі.
1386–1434 гг. — Ягайла (Уладзіслаў II) — кароль Польшчы.
1422 г. — Шлюб Ягайлы з князёўнай Софіяй Гальшанскай, якая дала пачатак еўрапейскай дынастыі Ягелонаў (Ягайлавічаў).

Пячатка князя Кейстута, які меў рэальную [illegible] уладу

Мірнае пагадненне магістра Інфлянцкага ордэна з князямі Ягайлам і Скіргайлам. 1380 г.

Замежная палітыка

Гаспадар Ягайла найперш намагаўся замацаваць за дзяржавай яе тэрыторыі на ўсходзе. Дзеля гэтага ён нават часова саступіў крыжакам Жамойць. У 1380 г. Вільня ўчыніла з Залатой Ардой дамову супраць Маскоўскага княства. Ягайла планаваў удзельнічаць у Кулікоўскай бітве на баку Мамая, але войска Вялікага Княства спынілася за 20 вёрстаў ад поля сечы і не ўдарыла ў спіну маскоўцам. Ваяры-ліцвіны добра памяталі, як білі ардынцаў на Сініх Водах, і не хацелі ўздымаць зброю на аднаверцаў. Разам з тым Ягайла сам быў зацікаўлены ў прамаруджванні і чаканні, на чый бок схіліцца поспех, каб не апынуцца ў пройгрышы.

Конны партрэт Ягайлы. Фрэска ў Замкавай капліцы ў Любліне, фундаванай самім каралём у 1418 г.

Вялікі князь Ягайла. Гравюра з «Хронікі Еўрапейскай Сарматыі» Аляксандра Гваньіні. 1581 г.

У 1383 г. Ягайла ваяваў з крыжакамі і адначасова вёў перамовы пра хаўрус супраць іх з маскоўскім князем Дзімітрам Данскім. Альянс меркаваўся замацаваць шлюбам нашага гаспадара з дачкою Дзімітра, але гэтыя намеры не здзейсніліся.

Тым самым часам, у 1383–1384 гг., Ягайла ажыццявіў пераможныя паходы ў Польшчу, адкуль вярнуўся з багатай здабычай і вялікім палонам.

Ягайла (у праваслаўі Якаў, у каталіцтве Уладзіслаў) быў старэйшым сынам вялікага князя Альгерда і цвярской княжны Ульяны. Альгердавы дзеці выхоўваліся ў праваслаўным і беларускамоўным асяроддзі, хоць часам у палітычных мэтах і атрымлівалі паганскія імёны.

Вунія ў Крэве

Польскае Каралеўства перажывала надзвычай цяжкі перыяд. Яно засталося без уладара, а каралеве Ядвізе споўнілася толькі трынаццаць гадоў. Польшча страціла Сілезію, Памор'е і выйсце да Балтыкі. Яна апынулася перад пагрозаю заваёвы немцамі і страты незалежнасці.

Польскія паслы прыехалі ў Крэва (цяпер мястэчка ў Смаргонскім раёне), дзе была рэзідэнцыя Ягайлы, і папрасілі яго стаць новым каралём, ажаніўшыся з Ядвігай. Дзеля гэтага ён мусіў прыняць каталіцтва, а таксама ахрысціць у яго падданых, якія вызнавалі паганства. Апрача таго, акт падпісаной у жніўні 1385 г. у Крэўскім замку вуніі змяшчаў абяцанне Ягайлы вызваліць дзесяткі тысяч хрысціян-палякаў, што знаходзіліся ў палоне ў Вялікім Княстве.

Шмат хто з буйных польскіх феадалаў бачыў выйсце ў альянсе сваёй дзяржавы з Вялікім Княствам Літоўскім, якое таксама ўяўляла для Каралеўства знешнюю пагрозу. Небяспека з боку тэўтонцаў рабіла збліжэнне з Польшчай выгадным і нашай краіне.

Пазней, у XV–XVI стст., палякі выстаўлялі як арыгінал Крэўскага акту дакумент, які ўтрымліваў проста фантастычныя абавязанні Ягайлы. Той нібыта дакляраваў аддаць палякам увесь свой дзяржаўны скарб, заплаціць 200 тысяч фларынаў Вільгельму Аўстрыйскаму за адмову ад шлюбу з Ядвігай (за такія грошы тады можна было купіць цэлую краіну). І наогул Ягайла як быццам абяцаў зліквідаваць Вялікае Княства, далучыўшы яго да Польшчы.

Гэты тэкст нагадваў акт капітуляцыі і даваў усе падставы дзяржаўным дзеячам Вялікага Княства лічыць яго падробкай. Палякі ж шчыра выкарыстоўвалі сфальшаваны дакумент (пры жыцці Ягайлы ён быў невядомы і не згадваецца ў беларускіх летапісах) для абгрунтавання сваіх прэтэнзій на беларускія землі.

Партрэт Ягайлы з характэрнымі рысамі [illegible] Фрэска XVI ст.

Радаводнае дрэва Ягайлавічаў. 1521 г.

Узаемавыгадны альянс

Напраўду Крэўская унія азначала ўзаемавыгадны саюз двух самастойных дзяржаваў. Ён значна павялічваў іх вайсковую магутнасць (найперш у барацьбе з Тэўтонскім ордэнам), спрыяў пашырэнню эканамічных і культурных сувязяў паміж нашым гаспадарствам і Польшчай, а таксама іншымі еўрапейскімі краінамі.

У прывілеі Ягайлы 1387 г. гаворыцца пра поўную дзяржаўную незалежнасць Вялікага Княства Літоўскага. Тады ж, дарэчы, ён адзначаў, што традыцыя абароны «нашай літоўскай зямлі па-народнаму называецца пагоняй», гэта значыць залічаў сам сябе да ліцвіноў – тагачаснага беларускага этнасу.

Нічога пра ўваходжанне нашай дзяржавы ў склад Польшчы не сказана і ў падпісаных неўзабаве пасля Крэўскай уніі Востраўскім пагадненні 1392 г. і Віленска-Радамскай уніі 1401 г.

Як Крэўская, так і наступныя уніі Вялікага Княства Літоўскага з Польскім Каралеўствам (да Люблінскай 1569 г.) мелі асабісты (персанальны) характар.

Вялікая пячатка Уладзіслава Ягайлы [illegible]

VLADISLAUS IAGIELLO
FILIUS OLGIERDI MAGNI DUCIS L., ANTEQUAM HEDVIGIM REGINAM IN UXOREM DUXERIT, FIDEM ORTHODOXAM CUM INNUMERO NUMERO HOMINUM GENTIS SUÆ SUSCEPIT, DUCATUM L. REGNO ADIUNXIT, CRUCIFEROS INGENTI CLADE DEBELLAVIT ABAQ PERIMA COMMODA PATRIÆ ATTULIT. OBIIT IN GRODEK A. 1432. SEPULTUS CRACOVIÆ. REGNAVIT ANNIS 46.

Кароль Ягайла. Невядомы мастак XVIII ст.

На польскім троне

У 1386 г. Ягайла-Якаў перахрысціўся ў Кракаве ў каталіцтва і пасля шлюбу з Ядзвігай быў каранаваны на польскі трон пад імем Уладзіслава II, захаваўшы за сабою і пасад вялікага князя літоўскага. Яшчэ праз год у каталіцкую веру перавялі паганскае насельніцтва Вялікага Княства. Сваім прывілеем Ягайла даваў шляхце (баярству) дадатковыя правы і вольнасці пры ўмове хрышчэння паводле рымскага абраду. Ад таго часу на беларускіх землях сталі будаваць касцёлы і каталіцкія манастыры – кляштары. Імкненне Ягайлы зрабіць каталіцкую царкву дзяржаўнай выклікала пратэст у праваслаўных.

Пражыўшы некалькі дзесяцігоддзяў у Польшчы, Ягайла, як сведчаць летапісы і хронікі, размаўляў па-беларуску, трымаўся звычаяў продкаў. Ён прывёз з Вільні беларускіх пісцоў, музыкаў, мастакоў. Майстры-ліцвіны на замову караля аздаблялі фрэскамі храмы ў Кракаве, Любліне, Гнезне ды іншых польскіх гарадах.

На польскім троне Ягайла праявіў сябе найперш як ліцвін і пераможца ў Грунвальдскай бітве. Ён захаваў любоў да радзімы продкаў і, калі ў 1431 г. пачалася вайна за Падолле, таемна папярэдзіў суайчыннікаў-ліцвінаў пра рух і намеры польскага войска.

У трох першых шлюбах Ягайла не меў спадкаемцаў. Увесну 1422 г. у Навагародку ён павянчаўся з княжэўнаю Софіяй Гальшанскай, якая нарадзіла каралю сыноў Уладзіслава і Казіміра. Так была заснавана еўрапейская манархічная дынастыя Ягайлавічаў (Ягелонаў). З яе выйшлі гаспадары Вялікага Княства, каралі Польшчы, Чэхіі і Вугоршчыны (Венгрыі).

КРАІНА АД МОРА ДА МОРА. ВІТАЎТ ВЯЛІКІ

Вітаўтава вершнікавая пячатка. 1407 г.

Бунт супроць Ягайлы

Вітаўту выпаў цяжкі і драматычны шлях на вяршыню дзяржаўнай улады. Ягоны бацька Кейстут загінуў ад рук забойцаў, падасланых Ягайлам. Вітаўт таксама быў зняволены ў Крэўскім замку, але здолеў вырвацца на волю.

Ён не мог скарыцца з роляю Ягайлавага васала і не адпомсціць за бацькаву смерць.

Шукаючы хаўруснікаў, Вітаўт спачатку накіраваўся да крыжакоў. З дапамогай Ордэна ён авалодаў Коўнам і Трокамі, дайшоў да прадмесцяў Вільні, але ўрэшце мусіў пагадзіцца на мір з Ягайлам і атрымаў ад яго Гародню і Берасце.

Касцёл Вітаўта ў Коўне, пабудаваны ў XV ст.

Неўзабаве пасля падпісання Крэўскай уніі Вітаўт упэўніўся ў яе небяспечы для будучыні дзяржавы. Гэтыя погляды падзялялі паны і баярства Вялікага Княства, якія хацелі бачыць на чале гаспадарства не Ягайлавага намесніка, а паўнапраўнага манарха з незалежнай унутранай і замежнай палітыкай.

Акт Вітаўта [illegible] 1389 г.

Пасля жорсткай і ўпартай барацьбы з Ягайлам шалі вагаў схіліліся на бок Вітаўта. У 1391 г. ён заняў Гарадзенскі замак, а праз год увайшоў у Навагрудак. Ягайла змушаны быў пайсці на таемныя перамовы. Разарваўшы васальныя стасункі з Тэўтонскім ордэнам, Вітаўт спаліў тры рыцарскія замкі і вярнуўся на радзіму. У жніўні 1392 г. браты сустрэліся ў Вострава пад Лідай. Паводле падпісанага там пагаднення ўлада ў Вялікім Княстве пажыццёва перадавалася Вітаўту.

У 1389 г. Вітаўт узначаліў незадаволеных і ўзняў іх на бунт супроць Ягайлы, свайго стрыечнага брата. Не здабыўшы Вільні, якую абаранялі моцныя польскія гарнізоны, сын Кейстута зноў папрасіў падтрымкі ў крыжакоў, якім перадаў ва ўладанне Жамойць. Каб забяспечыць сабе спакой на ўсходзе, Вітаўт выдаў дачку Соф'ю замуж за маскоўскага князя Васіля I.

Разумеючы палітычную вагу свайго цесця, крамлёўскі ўладар пазней, перад смерцю, даручыў жонку і непаўналетняга сына-спадкаемца апецы князя Вітаўта.

Соф'я Вітаўтаўна і муж – маскоўскі князь Васіль I. Вышыўка XV ст.

ХРАНАЛОГІЯ

1350–1430 гг. – Жыццё і дзейнасць князя Вітаўта.
1382 г. – Уцёкі Вітаўта з палону ў Крэўскім замку.
1389 г. – Пачатак змагання Вітаўта супраць Крэўскай уніі і ўлады Ягайлы ў Вялікім Княстве.
1391, 1392 гг. – Вітаўт займае Гародню і Навагрудак.
1392 г. – Востраўскае пагадненне аб перадачы ўлады ў Вялікім Княстве Літоўскім Вітаўту.
1392–1430 гг. – Княжанне вялікага князя Вітаўта.
1404 г. – Уключэнне Смаленскага княства ў склад Вялікага Княства Літоўскага.
1408 г. – Вызначэнне мяжы паміж нашай дзяржавай і Маскоўскім княствам па рэках Угра і Ака.
1413 г. – Гарадзельская унія Вялікага Княства Літоўскага і Польскага Каралеўства.
1415 г. – Заснаванне незалежнай праваслаўнай мітраполіі Вялікага Княства з цэнтрам у Навагрудку.
1422 г. – Далучэнне да нашай дзяржавы Жамойці (Жмудзі).
Пасланае Вітаўтам на дапамогу гусітам 5-тысячнае беларускае войска ўступіла ў Прагу.
1425 г. – Маскоўскае княства становіцца залежным ад Вітаўта.

Умацаванне дзяржавы

Атрымаўшы тытул «вялікага князя Літвы і Русі», Вітаўт узяўся актыўна мацаваць Вялікае Княства. Ён быў шчодра адораны якасцямі, неабходнымі выдатнаму дзяржаўнаму дзеячу таго часу: палітычнай мудрасцю і дыпламатычнымі здольнасцямі, мужнасцю і вайсковым талентам, уладарнасцю і прастатой у побыце. Галоўнай апорай Вітаўта сталі баяры, якіх ён надзяляў зямлёю і сялянамі. За Вітаўтам наша дзяржава пачала біць уласную манету.

Ідэя незалежнасці ў Вялікім Княстве мела велізарную папулярнасць. Аднаго разу жонка Ягайлы каралева Ядвіга выказала незадаволенасць палітыкай Вітаўта і нагадала яму пра васальнае становішча. У адказ гаспадар звярнуўся наўпрост да сваіх паноў і баяраў. Сойм у Вільні прыняў аднагалосную пастанову: «Мы не падданыя Польшчы, і заўсёды былі вольныя. Продкі ніколі не плацілі даніны палякам, і мы не будзем плаціць, а застанемся назаўсёды пры сваіх вольнасцях».

Калі князі Свідрыгайла, Дзмітр Северскі і Фёдар Падольскі паўсталі супраць Вітаўта, ён пазбавіў іх удзельных княстваў, што спрыяла цэнтралізацыі дзяржаўнай улады.

Справе ўмацавання дзяржавы паслужыла і ўтварэнне Вітаўтам незалежнай ад Масквы праваслаўнай мітраполіі з цэнтрам у Навагародку. У 1415 г. сабор беларускіх епіскапаў абраў першым мітрапалітам Вялікага Княства вядомага вучонага, кніжніка і прапаведніка Рыгора Цамблака. Дзеля кансалідацыі дзяржавы, дзе жылі паслядоўнікі розных веравызнанняў, Вітаўт выношваў ідэю уніі праваслаўнай і каталіцкай цэркваў.

Вялікае Княства Літоўскае ў часы Вітаўта Вялікага

Крыжакі пасля паразы пад Грунвальдам адмовіліся ад прэтэнзій на Жамойць, што яшчэ больш умацавала пазіцыі Вялікага Княства ў Еўропе.

Жамойція да астатніх зямель і балцкім жыхарствам займалі менш за 1/15 тэрыторыі Вялікага Княства, якое за Вітаўтам стала найбуйнейшай краінай Еўропы. Дзяржаўнае жыццё ў Княстве праходзіла ў беларускіх нацыянальных формах.

Далучэнне новых абшараў

Гаспадар Вітаўт настойліва і паслядоўна працягваў Альгердаву палітыку пашырэння дзяржавы найперш за кошт славянскіх земляў. У 1404 г. да Вялікага Княства канчаткова далучылася Смаленская зямля з старажытным крывіцкім Смаленскам. Пад пратэктарат вялікага князя трапілі Ноўгарад Вялікі і Пскоў.

Пасля трох паходаў Вітаўта на Маскву з маскоўскім князем Васілём I было дасягнутае пагадненне, паводле якога межы паміж нашай краінай і Масковіяй праходзілі па рацэ Угры – прытоцы Акі. Па смерці маскоўскага князя Вітаўт падпарадкаваў Цвярское і Разанскае княствы, а таксама землі ў вытоках Акі. У тым часе ўдава Васіля Соф'я Вітаўтаўна стала рэгенткай пры малалетнім сыне Васілі II і прызнала бацькаў пратэктарат. Такім чынам, Маскоўскае княства зрабілася васалам Вітаўта. На поўдні ён авалодаў ніжнім Днястром, дзе нашая дзяржава атрымала выйсце да Чорнага мора.

Татары, якія пасяліліся ў Вялікім Княстве за часы Вітаўта, хутка беларусізаваліся, але захавалі сваю веру. Мячэць у Навагрудку. Сучасны выгляд.

Гаспадар запрасіў у Вялікае Княства хана Тахтамыша, якога ў Залатой Ардзе пазбавілі ўлады. Хан меў сваю рэзідэнцыю ў Лідзе. Ад таго часу на беларускіх землях і з'явіліся мірныя татары, што знайшлі тут другую радзіму. Шмат іх перасялілася да нас пасля супольных паходаў Вітаўта і Тахтамыша пад Азоў і ў Крым у 1397–1398 гг. Татары атрымалі землі паблізу Вільні, у Лідскім, Ашмянскім, Навагародскім, Берасцейскім паветах і былі прыроўнены ў правах да мясцовага насельніцтва. Тахтамышаў сын Джалалад-Дзін у складзе нашага войска браў удзел у Грунвальдскай бітве.

Галоўная роля ў дзяржаве належала беларускім землям. Нашыя продкі займалі большыню найвышэйшых пасадаў, у тым ліку ў Жамойціі ды на іншых населеных балтамі абшарах (у Коўне кіраваў баярын Іван Фёдаравіч, а войскам жамойтаў камандаваў князь Юрый). Беларусы-ліцвіны складалі і бліжэйшае акружэнне Вітаўта. Захаваліся дакументы пра сустрэчу вялікага князя з крыжацкім пасольствам у 1397 г. Тады Вітаўта суправаджалі князі Юрый Пінскі, Міхаіла Заслаўскі, Аляксандр Старадубскі, Іван Альшанскі і Іван Друцкі. Паслы Тэўтонскага ордэна паведамлялі, што сам гаспадар і яго двор гаварылі пабеларуску, на старабеларускай мове вялося і дзяржаўнае справаводства.

Вежа Луцкага замка (цяпер Украіна), у якім адбыўся з'езд манархаў у Вітаўта.

Адзін з актаў Гарадзельскай уніі паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Польскім Каралеўствам

Гарадзельская унія

Для абмеркавання далейшых дачыненняў Вялікага Княства Літоўскага і Польскага Каралеўства ў 1413 г. у замак Горадня на Заходнім Бугу з'ехаліся манархі, паны і баярства абедзвюх краінаў.

47 літвінскіх баярскіх родаў абмяняліся гербамі з польскай шляхтай. У выпадку смерці Вітаўта вярхі Княства абяцалі не абіраць сабе гаспадара без парады і згоды палякаў. Але тыя ў сваю чаргу таксама не павінны былі праводзіць выбары новага караля без згоды Вітаўта і ягоных баяраў.

Пячатка Вітаўта Вялікага

Новая персанальная унія спрыяла ўзмацненню сілаў Вялікага Княства і Польшчы ў змаганні з ворагамі небяспекай і мела на мэце супакоіць кіраўніцтва каталіцкай царквы ў Рыме, устрывожанае разгромам Тэўтонскага ордэна.

Паводле Гарадзельскай уніі самастойнасць Вялікага Княства Літоўскага захоўвалася і пасля смерці Вітаўта. У Польшчы зразумелі, што падпарадкаваць гэтую магутную дзяржаву немагчыма.

Еўрапейскае прызнанне

Прызнаннем вагі Вялікага Княства ў тагачаснай геапалітыцы сталася запрашэнне Вітаўта на чэшскі трон. Вялікі князь атрымаў яго ў час нацыянальна-вызвольнага і рэфармацыйнага руху чэхаў, вядомага як гусіцкія войны. Каб не канфліктаваць з каталіцкім светам, наш гаспадар адказаў на прапанову тым, што накіраваў на дапамогу гусітам 5-тысячнае беларускае войска. На чале яго стаяў Вітаўтаў пляменнік Жыгімонт Карыбутавіч, здольны палкаводзец, які праславіўся ў Грунвальдскай бітве. У траўні 1422 г. Жыгімонт увайшоў у Прагу, дзе пазней быў выбраны чэшскім каралём. Ліцьвіны, многія з якіх прынялі гусіцкую веру, ваявалі поплеч з чэхамі болей за дзесяць гадоў.

Тады сама Вітаўту прапанавалі каралеўскую карону імператар Святой Рымскай імперыі германскай нацыі Сігізмунд І і рымскі папа Марцін V, якія спадзяваліся, што наш гаспадар дапаможа задушыць гусіцкі рух. Гэтая прапанова таксама была сведчаннем міжнароднага аўтарытэту нашай дзяржавы.

Вітаўт даў згоду на каранацыю, якая была прызначаная на восень 1430 г. На ўрачыстую цырымонію ў сталіцу Княства з'ехаліся чужаземныя манархі ды іншыя высокія госці. Усе цярпліва чакалі, калі будучы кароль адужае хваробу і ўстане з ложка. Аднак 27 кастрычніка ў Троках сэрца Вітаўта спынілася. Існуе версія, што гэтаму паспрыялі інтрыгі польскіх магнатаў. Занепакоеныя далейшым узмацненнем Вялікага Княства, палякі, паводле легендарных звестак, напалі на імператарскіх паслоў, што везлі ў Вільню каралеўскую карону, і скралі яе.

Пасля сябе гаспадар Вітаўт пакінуў самую буйную ў Еўропе дзяржаву, якая ў гады яго княжання дасягнула найвышэйшай магутнасці.

За Вітаўтам наша дзяржава мела дыпламатычныя зносіны з усімі значнымі заходнееўрапейскімі краінамі, а таксама з Асманскай (Турэцкай) імперыяй і Маскоўшчынай.

Партрэт вялікага князя Вітаўта. Невядомы мастак XVIII ст.

Прага. Каляровая гравюра М. Валгемута і В. Плейдэнвурфа з «Сусветнай хронікі» Г. Шэдэля. Нюрнберг. 1493.

Менавіта ў часы Вітаўта Вялікае Княства стала вялікім не толькі паводле найменне і тэрыторыі, якая складала болей за 900 тысяч квадратных кіламетраў (дзеля параўнання: тэрыторыя Рэспублікі Беларусь – 207,6 тысячы квадратных кіламетраў), але і паводле сваёй палітычнай ролі ў Еўропе.

Пячатка магістра Інфлянцкага ордэна 1367 г.

РАЗГРОМ ТЭЎТОНЦАЎ ПАД ГРУНВАЛЬДАМ

Немцы зноў і зноў рабілі захопніцкія рэйды на балцкія і славянскія землі. Колькасць такіх нападаў дасягала васьмі за год.

Тэўтонскі ордэн

Найбольш небяспечнай для славянаў сілай ва Усходняй Еўропе заставаўся Тэўтонскі, або Нямецкі, ордэн, заснаваны ў Палесціне пад час крыжовых паходаў. У 1234 г. крыжакоў неабачліва запрасіў да сябе на дапамогу мазавецкі князь Конрад. У абмен на згоду скарыць балцкае племя пруcаў ён пагадзіўся на стварэнне самастойнай рыцарскай дзяржавы. Праз тры гады пасля гэтага тэўтонцы значна павялічылі сваю магутнасць, аб'яднаўшыся з Ордэнам мечаносцаў (Інфлянцкім). На чале Ордэна стаяў пажыццёва абраны вялікі магістр, якому падпарадкоўваліся камтур, маршал ды іншыя вышэйшыя асобы. Ад 1309 г. рэзідэнцыяй вялікага магістра і сталіцай тэўтонцаў быў горад Мальборк (Марыенбург), збудаваны на захопленых польскіх землях у дэльце Віслы недалёка ад марскога ўзбярэжжа.

Пяць разоў крыжакі спрабавалі захапіць Полацак, чатыры разы – Новагародак. Шмат цярпелі ад агрэсіўных суседзяў іншыя беларускія гарады і найперш Горадня. Тэўтонцы некалькі разоў трымалі гарадзенскі замак у аблозе.

Вялікае Княства імкнулася вярнуць захопленую крыжакамі Жамойць, Польшча – сваё Памор'е, Добжынскую ды іншыя сумежныя землі. Крыжакі, наадварот, былі зацікаўленыя ў тым, каб замацаваць іх за сабой, асабліва Жамойць, якая служыла своеасаблівым «мостам» паміж паморска-прускімі і інфлянцкімі (лівонскімі) уладаннямі Ордэна. Сутыкненне гэтых інтарэсаў прывяло да вайны, што ў гістарычнай літаратуры атрымала назоў «Вялікая».

ХРАНАЛОГІЯ

1409–1411 гг. – «Вялікая вайна» ...

Снежань 1409 г. – Таемная нарада ... Вітаўта і Караля Ягайлы ў Берасці.

15 ліпеня 1410 г. – Разгром ордэна крыжакоў пад Грунвальдам.

1411 г. – Торуньскі мір Вялікага Княства Літоўскага і Каралеўства Польскага з Тэўтонскім ордэнам.

У 1408 г. на радзе ў Навагрудку вялікі князь Вітаўт і кароль Ягайла прыйшлі да высновы, што спыніць агрэсію Тэўтонскага ордэна можна толькі разграміўшы яго, і пастанавілі зрабіць гэта сумесна.

Тэўтонская тарча «павеза» з ... Музей Войска Польскага ў Варшаве.

Вялікі князь літоўскі Вітаўт. Невядомы мастак. XVII ст.

«Вялікая вайна»

Напярэдадні вайны абодва бакі разгарнулі актыўную дыпламатычную дзейнасць. Вялікае Княства Літоўскае забяспечыла сабе тыл, падпісаўшы мірную дамову з Маскоўскім княствам. У сваю чаргу тэўтонцам паабяцалі дапамогу вугорскі і чэшскі каралі. Пасланцы крыжакоў ездзілі па ўсёй Еўропе, вярбуючы ў свае войска наймітаў. Тым часам на пачатку лета 1409 г. супраць Ордэна паўстала Жамойць, якую таемна падтрымаў наш вялікі князь.

Баявыя дзеянні распачаліся ў жніўні, калі немцы напалі на польскія гарнізоны ў Добжынскай зямлі. Гэтая тэрыторыя неўзабаве была захопленая Ордэнам. Наогул, ваенная кампанія 1409 г. склалася няўдала для Польшчы. Войскі Вялікага Княства, наадварот, атрымалі некалькі перамог і выгналі крыжакоў з Жамойці.

У снежні адбылася таемная нарада Вітаўта і Ягайлы ў Берасці. Цягам дзвюх дзён манархі ўзгаднялі стратэгію і тактыку будучай летняй кампаніі. Яны вызначылі колькасць, час і месца збору аб'яднаных сілаў, дамовіліся пра пабудову пантоннага моста праз Віслу. На берасцейскай сустрэчы прысутнічаў сын хана Тахтамыша Джалал ад-Дзін, які камандаваў залатаардынскай конніцай, што была на службе ў Вялікім Княстве Літоўскім.

Распрацаваны хаўруснікамі план, які прадугледжваў валоданне стратэгічнай ініцыятывай, дзеянні на тэрыторыі праціўніка і правядзенне генеральнай бітвы, пачаў неадкладна здзяйсняцца. Вялікія замовы атрымалі майстры-збройнікі. У лясах і пушчах, найперш у Белавежскай, ішла нарыхтоўка правіянту для войскаў. Па ўсім Княстве было наладжанае навучанне маладых ваяроў баявому майстэрству.

Пры канцы траўня 1410 г. у Горадні з усёй дзяржавы сабраліся палкі-харугвы – баявыя аддзелы, у якіх было ў сярэднім па трыста вершнікаў, а таксама лучнікі і пяхоцізбраяносцы.

Паўтараручныя двухлязовыя мячы. Другая палова XIV ст.

Рыцарскі меч з ... Першая палова XIV ст.

Большая частка з сарака харугваў Вялікага Княства прыйшла з беларускіх земляў. Вечную славу пад Грунвальдам здабылі аршанская, брэсцкая, ашмянская, берасцейская, быхаўская, ваўкавыская, віленская, віцебская, гарадзенская, драгічынская, друцкая, клецкая, кобрынская, крычаўская, крэўская, лідская, лукомльская, магілёўская, мазырская, мельніцкая, менская, навагрудская, пінская, полацкая, слонімская, слуцкая, смаленская, старадубская, троцкая, тураўская ды іншыя харугвы. Трыццаць з іх мелі на сваіх сцягах «Пагоню». Украінскімі паводле свайго складу былі, апроч кіеўскай, крамянецкая, рагнецкая, луцкая і уладзімірская. Яшчэ больш пэўна харугваў некаторыя даследнікі лічаць цалкам балцкімі (літувіскімі). Тагачасныя гістарычныя крыніцы згадваюць з іх толькі ковенскую.

Кароль Ягайла [illegible] перад Грунвальдскай бітвай. Гравюра канца XVI ст. [illegible]

Шолам тыпу «бацынет» [illegible] XIV – на пачатку XV ст.

Разгром крыжакоў

Нашае войска сустрэлася з ворагам 15 ліпеня 1410 г. на ўзгорыстым полі паміж тагачаснымі прускімі мястэчкамі Таненбергам і Грунвальдам.

Тэўтонцы на чале з вялікім магістрам Ульрыхам фон Юнгінгенам з'явіліся першыя і добра падрыхтаваліся да бітвы. Крыжакі размясцілі сваю наймацнейшую ў тагачаснай Еўропе армію ў дзве лініі на фронце 2,5 кіламетра па ўзвышшы. Побач з немцамі сталі рыцары з Англіі, Францыі, Швейцарыі ды іншых заходнееўрапейскіх краінаў. Наперадзе закутых у панцыры крыжацкіх «кліноў» знаходзіліся, як паведамляе «Хроніка Быхаўца», замаскаваныя дзёрнам «воўчыя ямы» – пастка для непрыяцельскай конніцы. За баявымі шыхтамі рыцараў чакалі сігналу арбалетнікі і бамбардзіры. Крыжакі выставілі 51 харугву – болей за 30 тысяч ваяроў.

Войска Вітаўта і Ягайлы ўтварала роўны па даўжыні фронт з праціўнікам. Сорак харугваў Вялікага Княства знаходзіліся на правым фланзе. У складзе Вітаўтавых сілаў была татарская кавалерыя хана Джэлалад-Дзіна. Маскоўскі князь Васіль і ад удзелу ў паходзе ўхіліўся. Ягайлава войска, як і тэўтонскае, складалася з 51 харугвы. На дапамогу Вялікаму Княству і Польшчы прыйшлі таксама аддзелы чэхаў і мараваў.

Злучаныя сілы дзвюх дзяржаваў мелі блізу 40 тысяч ваяроў. Крыжакоў было прыкладна на 10 тысяч меней, аднак яны мелі лепшае ўзбраенне, хоць і ў шэрагах нашай арміі шмат ваяроў у рыцарскім рыштунку нічым не саступалі ворагам.

Звесткі пра агульную колькасць удзельнікаў бітвы ў розных гістарычных крыніцах значна разыходзяцца. Некаторыя кронікі называюць лічбы 100 і нават 150 тысяч. У кожным разе гэта была адна з найбуйнейшых бітваў Сярэднявечча, ад якой залежала будучыня цэлага народу.

Шолам [illegible] Сярэдзіна XV ст.

Грунвальдскае поле. Мастацкая рэканструкцыя [illegible] 2009 г.

[illegible] Тэўтонскага ордэна. [illegible] Ульрых фон Юнгінген. [illegible] 1684 г.

Тэўтонскія [illegible] XIV – пачатак XV ст.

Традыцыйна лічыцца, што аб'яднанымі сіламі кіраваў кароль Ягайла. Але гэтае кіраўніцтва было намінальным. Ёсць важкія доказы ў тых гісторыкаў, якія сцвярджаюць, што арміяй рэальна камандаваў Вітаўт. [illegible]

[illegible]

Пасля спявання ўсім войскам «Багародзіцы» першай на сігнале баявых трубаў пайшла ў наступ лёгкая, а затым цяжкая кавалерыя Вялікага Княства. Пярэднія шэрагі вершнікаў праваліліся ў «воўчыя ямы», аднак астатнія знайшлі праходы і не далі атаку захлынуцца. Татарская конніца выкарыстала старую ўлюбёную зброю – арканы, у выніку чаго пярэдні шыхт крыжакоў на вокамгненні апынуўся пад капытамі ўласных коней. Вітаўт увесь час быў сярод сваіх ваяроў і сам кіраваў імі ў сечы.

Спадзяванні тэўтонцаў на артылерыю сталіся марныя. Нашыя вершнікі пасеклі кананіраў і арбалетнікаў. Але вялікі магістр Ульрых фон Юнгінген разам з вялікім камтурам Кунам фон Ліхтэнштайнам і вялікім маршалам Фрыдрыхам фон Валенродам, якія камандавалі правым і левым флангамі, былі спакойныя. Яны ведалі, што ўзначальваюць наймацнейшую ў Еўропе армію, і не сумняваліся ў поспеху.

Загула зямля, і на харугвы Вялікага Княства рушыла цяжкая тэўтонская кавалерыя. Праз гадзіну ўпартай сечы ліцвіны сталі адыходзіць да абозу. Крыжакі, ужо прадчуваючы перамогу, кінуліся ў пагоню. Яны не ведалі, што «ўцёкі» ліцвіноў насамрэч былі тактычным манеўрам Вітаўта, які меў на мэце парушыць баявыя парадкі цяжкой кавалерыі непрыяцеля і рассеяць яе па шырокай прасторы.

Асабістая сакрэтная пячатка Конрада фон Юнгінгена, які ўзначальваў Тэўтонскі ордэн у 1393–1407 гг.

Нямецкі рыцарскі меч даўжынёй каля 110 сантыметраў

Гэтай пячаткай карыстаўся вялікі маршал Тэўтонскага ордэна Фрыдрых фон Валенрод

Вялікі шалом, упрыгожаны геральдычнай эмблемай з рогамі і сэрцам. Такія шаломы насілі вышэйшыя рыцары палкаводцы

Пячатка імператара «Святой Рымскай імперыі», венгерскага (венгерскага) і чэшскага караля Сігізмунда Люксембургскага, які быў арганізатарам крыжовых паходаў супраць гусітаў

Тэўтонскія сцягі харугваў, якія трапілі ў палон пасля перамогі над крыжакамі пад Грунвальдам. Гэта былі мастацкія, вельмі прыгожыя [illegible]
[illegible]
Мініяцюры з «Гісторыі Польшчы» Яна Длугаша, напісанай у 1455–1480 гг.

Вечную славу ў гэты перыяд бітвы здабылі нашы амсціслаўская, аршанская і смаленская харугвы (у расійскай гістарычнай літаратуры іх беспадстаўна называюць «русскими смоленскими полками»). Тры гэтыя харугвы, пакінутыя Вітаўтам для прыкрыцця правага флангу палякаў, праявілі незвычайную мужнасць.

Адна з харугваў палкам палегла, дзве іншыя панеслі велізарныя страты, але выстаялі. Тым часам тэўтонская кавалерыя, што гналася за «ўцекачамі», была знішчаная. Вярнуўшыся на поле бітвы, нашы галоўныя сілы ўдарылі ў тыл крыжакам, што секліся з палякамі.

Харугвы вялікага магістра і правы фланг нямецкай арміі неўзабаве былі абкружаныя і апынуліся ў двух вялізных «катлах». Надвячоркам жорсткая і бязлітасная сеча скончылася поўным разгромам тэўтонцаў. Ад рукі аднаго з Вітаўтавых ваяроў-ліцвіноў загінуў вялікі магістр Ордэна. Палеглі ўсе ягоныя кіраўнікі: вялікі і ўсе астатнія камтуры, вялікі маршал, скарбнік, большасць войтаў.

Нададзеўшы пагоню, Вітаўт і Ягайла мелі шанец канчаткова дабіць Ордэн. Але перамога далася вельмі дарагой цаной. Палова войска Вялікага Княства навекі засталася ў чужой зямлі. З другога боку, Вітаўт не імкнуўся да поўнага разгрому Тэўтонскага ордэна, бо гэта ўзмацніла б Польшчу.

Перамога пад Грунвальдам (беларускія летапісы называюць гэтую бітву Дубровенскай, а нямецкія хронікі – Таненбергскай) зацвердзіла на гістарычным шляху еўрапейскіх народаў. Была спынена больш чым 200-гадовая нямецкая экспансія на ўсход. Паводле ўмоў падпісанага ў 1411 г. Торуньскага міру крыжакі мусілі вызваліць усе захопленыя землі і заплаціць пераможцам 300 тысяч дукатаў.

Міжнароднае значэнне бітвы

Разгромлены Ордэн не змог адрадзіць сваёй магутнасці і быў асуджаны на знікненне як самастойная дзяржава. Баланс сілаў у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе змяніўся на карысць славянскіх краінаў. Вялікае Княства Літоўскае ўмацавала незалежнасць і атрымала амаль стагоддзе пераможнага мірнага існавання.

Трыумфальны поспех аб'яднаных сілаў ужо шэсць стагоддзяў натхняе і будзе натхняць пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў... Праз сто гадоў бліскучае апеў выдатную перамогу пад Грунвальдам беларускі паэт-лацініст Ян Вісліцкі. Ягоная гістарычная паэма «Пруская вайна» (Кракаў, 1516) атрымала агульнаеўрапейскую вядомасць.

У 1960 г. на месцы бітвы (яно знаходзіцца непадалёку ад польскага горада Ольштына) адкрылі помнік. Усё Грунвальдскае поле з'яўляецца своеасаблівым мемарыялам. На ім цяпер штогод адбываецца шматтысячнае святкаванне перамогі з удзелам рыцарскіх клубаў з розных краінаў Еўропы, якія інсцэніруюць найбольш важныя этапы бітвы. Нязменны поспех на гэтых святах спадарожнічае беларусам – нашчадкам славы ваяроў Вітаўта Вялікага. Некалькі сотняў нашых сучасных рыцараў удзельнічалі ў рэканструкцыі Грунвальдскай бітвы ў 2010 г., калі шырока адзначалася 600-годдзе разгрому крыжакоў.

УЛАДАРАННЕ КАЗІМІРА ЯГАЙЛАВІЧА

Вайна Свідрыгайлы з Жыгімонтам

Пасля смерці гаспадара Вітаўта дзяржаву напаткалі цяжкія выпрабаванні. Спачатку велікакняжацкі пасад заняў Ягайлаў брат Свідрыгайла (у праваслаўі Леў, у каталіцтве Баляслаў). Ён разарваў унію з Польшчай, але не змог утрымаць уладу.

У выніку змовы, падтрыманай польскімі панамі, вялікім князем быў абраны малодшы Вітаўтаў брат Жыгімонт Кейстутавіч, які аднавіў скасаваную папярэднікам персанальную унію. Амаль увесь час уладарання ён мусіў весці вайну з Свідрыгайлам. Каб залучыць на свой бок беларускіх і ўкраінскіх паноў, якія падтрымлівалі былога гаспадара, Жыгімонт у 1434 г. ураўнаваў асабістыя і маёмасныя правы каталікоў і праваслаўных. Тым не менш вайна працягвалася яшчэ пяць гадоў.

Цэласць Княства ўдалося захаваць, але краіна панесла вялікія страты. Дзяржаўная ўлада была аслаблена. Урэшце Жыгімонта забілі ў Трокскім замку змоўшчыкі, звязаныя з Свідрыгайлам.

Паўстагоддзя міру

Узмацнілася роля велікакняжацкай Рады. Яна фактычна стала найвышэйшым органам улады на час знаходжання вялікага гаспадара ў Польшчы. Ад узбагачэння магнатаў дзяржава перарадзілася ў алігархічную.

Спакой і парадак у дзяржаве ўдалося навесці наступнаму вялікаму князю Казіміру Ягайлавічу, малодшаму сыну Ягайлы і княгіні Софьі Гальшанскай. Забойства Жыгімонта Кейстутавіча азначала ліквідацыю персанальнага альянсу з Польшчай. Унія з суседзямі была адноўленая толькі праз сем гадоў, пасля абрання Казіміра на польскі трон.

За Казімірам Вялікае Княства вярнула занятую палякамі Дарагічынскую зямлю, замацавала за сабой Валынь, на якую прэтэндавала і Польскае Каралеўства.

Вайна з Тэўтонскім ордэнам (Казімір Ягайлавіч вёў яе сіламі Польшчы) завяршылася тым, што крыжацкая дзяржава прызнала васальную залежнасць. Казімір дамогся выбрання свайго старэйшага сына Уладзіслава каралём Чэхіі, а затым і Вугоршчыны.

ХРАНАЛОГІЯ

1430–1432 гг. — Княжанне вялікага князя Свідрыгайлы.
1432–1440 гг. — Княжанне вялікага князя Жыгімонта Кейстутавіча.
1434 г. — Прывілей Жыгімонта пра ўраўнаванне правоў каталікоў і праваслаўных.
1440–1492 гг. — Княжанне вялікага князя Казіміра Ягайлавіча.
1447 г. — Прывілей вялікага князя пра пашырэнне правоў баяраў. Абранне Казіміра каралём Польшчы.
1454–1466 гг. — Вайна з Тэўтонскім ордэнам і падпарадкаванне яго Польшчы.
1468 г. — Прыняцце Статута Казіміра, першага збору законаў дзяржавы.

Выдадзеным у Вільні ў 1447 г. прывілеем Казімір даў шырокія правы і свабоды князям, панам і баярам незалежна ад іх веравызнання. Гаспадар дзяржавы абяцаў іх ахоўваць. Сялянскія маёнткі вызваляліся ад усіх дзяржаўных павіннасцей і грашовых павіннасцей на карысць уладальніка. Было таксама абяцана, што зямлі і пасады ў дзяржаве будуць мець толькі ўраджэнцы Вялікага Княства Літоўскага. Баяры атрымалі права вольнага выезду за мяжу.

На ўсходнім кірунку знешняя палітыка вялікага князя не вызначалася рашучасцю і, хоць спрыяла захаванню міру, была недальнабачнай. Казімір адмовіўся па просьбе маскоўскага князя ад прэтэнзій на Пскоў, што толькі ўзмацніла захопніцкую актыўнасць Масквы. Шукаючы ў змаганні з ёю падтрымкі, Ноўгарадская рэспубліка выказала намер далучыцца да Вялікага Княства пры ўмове захавання аўтаноміі. Казімір абмежаваўся тым, што паслаў ноўгарадцам свайго намесніка. Неўзабаве Ноўгарад Вялікі быў канчаткова падпарадкаваны Маскве.

Казімір Ягайлавіч меў славу прыхільніка і апекуна «літоўскага», гэта значыць беларускага, мастацтва. Якраз у гады яго ўладарання ў Кракаве выйшлі першыя кнігі, надрукаваныя кірылічным шрыфтам.

Статут 1468 года

Заслугай Казіміра была актыўная заканадаўчая дзейнасць. У 1468 г. ён зацвердзіў першы збор законаў Вялікага Княства Літоўскага, складзены на аснове мясцовага звычаёвага права і судовай практыкі.

Гэты Статут складаўся з 25 артыкулаў і адлюстроўваў тагачасны стан беларускага права. Статут Казіміра бараніў прыватную ўласнасць, замацоўваў прыгонную залежнасць сялянаў, прадугледжваў абавязковае выкананне судовых пастановаў, уводзіў прынцып індывідуальнай адказнасці.

Статут устанавіў адзіныя для ўсяго Вялікага Княства віды пакарання за злачынствы супраць прыватнай уласнасці, абмежаваў пераслед жонкі і дзяцей за злачынныя дзеянні мужа і бацькі. Упершыню ўводзілася паняцце праціўпраўнага дзеяння – «із права выступае», «на права сягнуў».

Казіміраў Статут быў напісаны на беларускай мове, якая ў той час была мовай гаспадарскага двара, адміністрацыі і справаводства ўсёй дзяржавы. Гэты збор законаў увасобіў адзінства краіны і істотна паўплываў на наступныя Статуты Вялікага Княства.

ЦАРКВА І ТАЛЕРАНЦЫЯ

У Сярэднявеччы рэлігія была надзвычай важнай часткай культуры і пранікала ва ўсе сферы жыцця грамадства.

Пераважную большасць насельніцтва нашай дзяржавы ў той перыяд складалі праваслаўныя, якія належалі да Полацкай, Турава-Пінскай, Смаленскай, Навагародскай, Уладзіміра-Берасцейскай і Чарнігаўскай епархій.

Пасля Крэўскай уніі 1385 г., якая давала перавагі каталікам, становішча пачало мяняцца. Было заснавана Віленскае каталіцкае біскупства. Гаспадар Ягайла даў біскупу дазвол будаваць касцёлы. У сярэдзіне XVI ст. толькі на Віленшчыне іх налічваліся ўжо болей за 250. Пры канцы XIV ст. у Вялікім Княстве з'явіліся першыя манаскія ордэны.

Адрозна ад шмат якіх еўрапейскіх краінаў, не кажучы ўжо пра Масковію з яе нецярпімасцю да ўсякага іншадумства, у нас людзі розных веравызнанняў мірна ладзілі між сабою. Паміж праваслаўнымі і каталікамі, а таксама жыдамі і татарамі-мусульманамі, якія жылі на нашых землях ад часоў Вітаўта, амаль не было крывавых канфліктаў.

Імшу ў касцёлах правілі на лаціне, але захаваліся пераклады набажэнскіх тэкстаў на беларускую мову, зробленыя ў XV ст., каб вернікі разумелі, што адбываецца ў храме. Пазней, у 1585 г., каталікі выдалі па-беларуску катэхізіс, які вызначаўся чысцінёй мовы («Ісус», а не «Езус», «Госпад», а не «Пан»). З'явіўшыся ў Беларусі ў другой палове XVI ст., езуіты выкарыстоўвалі беларускую мову як мову навучання ў сваіх калегіумах, ве выкладалі таксама як асобную дысцыпліну. Наша мова гучала і ў касцёлах. Да прыкладу, у 1682 г. віленскі біскуп Мікалай Стэфан Пац загадаў у нядзелі і святы тлумачыць Евангелле і выкладаць катэхізіс па-беларуску.

У асяродку свецкай і духоўнай эліты была папулярная ідэя уніі (аб'яднання) каталіцкай і праваслаўнай царквы. Калі ў 1439 г. Фларэнційскі сабор прыняў адпаведную пастанову, свой подпіс пад ёй паставіў мітрапаліт кіеўскі Ісідар, што стаяў тады на чале «ўсходняй» царквы Вялікага Княства Літоўскага. Ідэя уніі ў той час не ажыццявілася найперш праз варожыя захады Масквы.

Рэлігійная талерантнасць, узведзеная вагою вялікіх князёў Гедзімінаў, зрабілася адной з галоўных прынцыпаў дзяржаўнай палітыкі. Ужо ў першай палове XV ст. рэлігійныя абмежаванні для праваслаўных былі знятыя. Арыстакраты «грэцкае веры» атрымлівалі найвышэйшыя дзяржаўныя пасады. Да прыкладу, пасаду найвышэйшага гетмана і трокскага ваяводы займаў праваслаўны князь Канстанцін Астрожскі.

Дзеля абгрунтавання сваіх «правоў» на беларускія землі маскоўскія ўладары зноў і зноў заяўлялі пра «нячуваныя здзекі», якія цярпяць браты па веры ў Вялікім Княстве Літоўскім. Такі падыход замацаваўся і ў расейскай гістарычнай навуцы, але нічога агульнага з праўдай ён не мае. За вялікім князем Казімірам Ягайлавічам на абшары сучаснай Беларусі было зафундавана сем праваслаўных храмаў і толькі тры каталіцкія. Гаспадар Аляксандр Казіміравіч шчодра надзяляў вёскамі і сялянамі полацкіх і смаленскіх праваслаўных епіскапаў. У 1503 г. гэты вялікі князь выдаў Віцебску грамату, якая сведчыць, што ў праваслаўе пераходзілі нават палякі і літувісы: «Которыя будуць жмудзін або лях, хрышчаныя ў Рускую веру і хто з таго роду і цяпер жыве, таго нам не рушыці, права іх хрысціянскага ні ў чым не ламаці».

Пераканаўчым доказам таго, што паслядоўнікі ўсходняй царквы не цярпелі ўціску, было захаванне вернасці манарху-каталіку з боку праваслаўных князёў і баяраў у часе бясконцых войнаў з Маскоўскім княствам. Калі б «грэцкая» вера ў нашай дзяржаве сапраўды праследавалася, сюды не ўцякалі б шматлікія падданыя маскоўскіх уладароў – і князі з баярамі, і, пэўна, дзясяткі тысяч простых вернікаў, якія не прынялі царкоўных зменаў і былі абвешчаныя «раскольнікамі».

Парэўнаўча з Маскоўскім праваслаўе ў Вялікім Княстве Літоўскім мела большую незалежнасць ад свецкай улады. Тут захоўвалася недатыкальнасць царкоўнай маёмасці, судовая самастойнасць, права падаваць скаргі самому манарху ды іншыя замацаваныя ў дзяржаўных законах правы, у якіх цэрквы і касцёлы да сярэдзіны XVI ст. былі роўныя. Духавенства, як і шляхта, было вызваленае ад дзяржаўных падаткаў.

Касцёл Архангела Міхаіла ў вёсцы Гнезна Ваўкавыскага раёна ... Пабудаваны каля 1524 г. Сучаснае фота.

... Фрагмент фрэскі XVI ст. Фота ... 2003 г.

«Хрыстос Уладар (Сусветны)». Абраз XVI ст. ...

... у г. Астрог (Ровенская вобл., Украіна). Сучасны выгляд.

Кафляны абраз XV–XVI стст. з Гародні

Паслядоўна лаяльнае стаўленне дзяржавы да праваслаўнай царквы ў Вялікім Княстве красамоўна паказвае хуткі рост колькасці не манастыроў і храмаў. Ад канца XIII да паловы XVI ст. на беларускіх землях былі заснаваныя больш за 40 манастыроў: 17 – на Полаччыне, 7 – у Навагародскім павеце, па 5 – у Аршанскім і Пінскім, па 4 – у Віцебскім і Менскім, па 3 – у Берасцейскім, Гарадзенскім і Амсціслаўскім. Сярод храмаў у беларускіх гарадах пры канцы 60-х гадоў XVI ст. абсалютную перавагу мелі праваслаўныя цэрквы. У Пінску іх было 14, у Навагародку – 10 (і ўсяго адзін касцёл), у Берасці – 9, у Віцебску – 7, у Гародні і Слоніме – па 6. Толькі ў сталічнай Вільні існавала раўнавага – 15 цэркваў і 14 касцёлаў.

Адрозна ад шмат якіх еўрапейскіх краінаў наша талерантная дзяржава не ведала ў сваёй гісторыі ні рэлігійных войнаў, ні падзеяў кшталту жудаснай Варфаламееўскай ночы ў Парыжы. Правалам скончылася і спроба ўвесці ў Вялікім Княстве Літоўскім інквізіцыю.

Фарны касцёл у Гародні (Фара Вітаўта) ... 1389 г. ... быў узарваны ў 1961 г.

КУЛЬТУРНЫЯ ЗДАБЫТКІ

Абарончае дойлідства

Вялікае Княства часта рабілася арэнай ваенных дзеянняў: нападаў нямецкіх рыцараў, наездаў крымскіх татараў, уварванняў маскоўскіх войскаў. Гэта выклікала вялікую патрэбу ў адмысловых абарончых збудаваннях, асобным тыпам якіх сталі замкі. У іх будаўніцтве на ранейшаму пераважаў раманскі стыль.

У XIV ст. магутныя адна-, двух- або шматвежавыя мураваныя (каменныя) замкі былі ўзведзеныя ў Троках, Вільні, Медніках, Крэве, Лідзе, Навагародку... Разам яны стварылі моцную лінію абароны. Таўшчыня муроў Крэўскага замка дасягала трох метраў, а вышыня – трынаццаці. Нярэдка непрыступныя фартыфікацыі пастаўлялі на шляху тэўтонскіх захопнікаў навагародскія ўмацаванні. У 1394 г. Лідскі замак паспяхова вытрымаў цяжкую аблогу англійскіх і французскіх рыцараў, якія выкарыстоўвалі балісты ды іншую аблажную тэхніку.

Складаны комплекс пабудоваў уяўляў сабой на пачатку XV ст. пяцівежавы Гарадзенскі замак. Яго сцяна, звернутая да Нёмана, мела даўжыню 120 метраў, а да рэчкі Гараднічанкі – 90. Паміж чацвёртай і пятай вежамі знаходзіўся мураваны двухпавярховы палац вялікага князя Вітаўта (45 x 15 м). Пакоі ў ім размяшчаліся ў адзін рад, а вокны на другім паверсе мелі выгляд байніц.

Іншаземныя падарожнікі называлі тагачасную Літву-Беларусь «краінаю замкаў».

Царкоўная архітэктура

У XIV ст. у нашай дзяржаве актыўна працягвалася будаўніцтва мураваных храмаў. Праваслаўныя цэрквы і саборы ў гэты час былі ўзведзеныя ў Вільні, Троках, Навагародку, Віцебску ды іншых гарадах. У сувязі з пашырэннем каталіцтва пасля Крэўскай уніі 1385 г. пачалі будаваць касцёлы. З згоды вялікага князя Ягайлы яны былі заснаваныя ў Гайне на Лагойшчыне, Абольцах пад Талачынам, Крэве, Лідзе, Менску, Берасці... Адзін з найбольш старажытных каталіцкіх храмаў, што захаваліся да нашых дзён, – касцёл святога Андрэя ў вёсцы Ушлюб Навагрудскага раёна, пабудаваны, паводле некаторых звестак, у 1433 г.

На змену раманскаму стылю, уласціваму ранняхрысціянскім храмам, у тыя часы прыходзіла готыка. Яскравым узорам новага архітэктурнага кірунку стаў Траецкі касцёл у вёсцы Ішкалдзь пабліза Баранавіч, які і сёння захапляе сваёй суладнасцю. Пабудаваны ў 1472 г. Мікалаем Неміровічам, храм мае стромкі двухсхільны дах, пяцігранную апсіду і вежу з вітымі ўсходамі. Усярэдзіне касцёл падзелены чатырма слупамі, якія падтрымліваюць крыжовыя скляпенні.

І праваслаўныя, і каталіцкія храмы на нашых землях у XV ст. набывалі рысы абарончых збудаванняў. У выпадку небяспекі ў іх мурах маглі бараніцца вернікі і хавацца ад ворага мірныя жыхары.

Жывапіс і скульптура

Праваслаўныя і каталіцкія храмы былі багата аздоблены іконамі. Адзін з найбольш даўніх твораў беларускага іканапісу – абраз «Маці Божая Замілаванне» з Маларыты. Паводле стылю ён яшчэ належыць да візантыйскага мастацтва, але разам з тым ужо сведчыць пра ўзнікненне сваёй, беларускай, школы.

Касцёлы адрозна ад цэркваў аздабляліся і скульптурай. Выявы святых рабілі з дрэва і размалёўвалі фарбамі. У 1470–1480-я гадах полацкія майстры стварылі скульптуры святых, якія ўражваюць сваім падабенствам да рэальных асобаў.

Пад уплывам гатычнага мастацтва ў нашых каталіцкіх храмах з'явіліся складаныя скульптурна-жывапісныя алтары.

У гэтым часе ў Вялікім Княстве Літоўскім – нашмат раней, чым у суседняй Масковіі, – зарадзілася свецкае партрэтнае мастацтва. З гістарычных крыніцаў вядома, што ў замкавай царкве ў Віцебску захоўваўся «партрэт княгіні Ульяны старажытнага пісьма, дзе яна з мужам сваім князем Альгердам».

Узвядзенне храмаў суправаджала развіццё манументальнага мастацтва. Фрэскамі размалёўвалі не толькі цэрквы, але і княжскія палацы ў Полацку, Віцебску, Гародні. На загад вялікага князя і караля Ягайлы беларускія майстры стварылі выдатныя фрэскі ў Люблінскім замку. Размалёўкі нашых суайчыннікаў XV ст. захаваліся ў капліцы Святога Крыжа ў Кракаўскім кафедральным касцёле.

Кнігі і бібліятэкі

Высокага роўню дасягнула мастацтва кнігі. Пры буйных храмах і манастырах у Полацку, Навагародку, Смаленску, Вільні, Лаўрышаве, Супраслі дзейнічалі скрыпторыюмы, але быў падзел працы паміж перапісчыкамі ды іншымі майстрамі. Тэксты ўпрыгожваліся маляванымі загалоўкамі (ініцыяламі) і каляровымі мініяцюрамі. Вокладкі мелі эмалевыя выявы і багатую аздобу з каштоўных камянёў.

Для старажытнага Лаўрышаўскага манастыра ў першай палове XIV ст. было напісанае знакамітае Евангелле з 19 мініяцюрамі на біблійныя сюжэты. На срэбнай пласціне, пасярэдзіне абцягнутай аксамітам вокладкі, знаходзіцца выява святога з пячаткай і кадзілам. Магчыма, тут увасоблены заснавальнік манастыра сын Міндоўга князь Войшалк, у манастве Лаўрыш.

Выдатнымі ўзорамі беларускай рукапіснай кнігі сталі таксама Смаленскі Псалтыр XIV ст., Аршанскае (XIV ст.) і Жыровіцкае (XV ст.) Евангеллі.

Вялікая роля ва ўзбагачэнні і развіцці тагачаснай афіцыйнай і літаратурнай беларускай мовы належала вялікакняжацкай канцылярыі. Яе пісары карысталіся менавіта гэтай мовай – дзяржаўнай мовай Вялікага Княства Літоўскага.

Летапісы

У XIV–XV стст. на змену колішнім летапісам асобных княстваў прыйшлі агульнадзяржаўныя. Найбольш даўні помнік нашага летапісання – створаны блізу 1430 г. на беларускай мове ў Смаленску «Летапісец вялікіх князёў літоўскіх». Ён стаў асновай для беларускага летапісу 1446 г., які ахопліваў усю гісторыю Вялікага Княства, апавядаў пра падзеі ад IX да сярэдзіны XV ст. Аўтар гэтага летапіснага збору выступаў за аб'яднанне ўсходнеславянскіх земляў у складзе нашай дзяржавы, падкрэсліваў яе важнае месца ў Еўропе. У летапісе падрабязна апавядалася пра княжанне Вітаўта і змяшчалася ўзнёслая «Пахвала» гэтаму слаўтаму ўладару – адзін з першых твораў беларускай свецкай панегірычнай прозы.

У Вялікім Княстве ўжо існавалі значныя бібліятэкі-кнігазборы. Найстаражытнейшай з іх была бібліятэка Полацкага Сафійскага сабора. Акрамя рэлігійных кніг там збераліся летапісы, «Жыціе Еўфрасінні Полацкай», пераклады з антычных і візантыйскіх аўтараў. Пазней узніклі бібліятэкі пры манастырах Звеставання ў Супраслі, пры Святатроіцкім – у Вільні, Троіцкім – у Слуцку.

Вялікае Княства Літоўскае знаходзілася на скрыжаванні культурных традыцый Усходняй і Заходняй Еўропы. Гэта абумовіла багацце і своеасаблівасць нашых культурных здабыткаў. Пры канцы XV ст. у Беларусь пранікаюць ідэі Рэнесансу, што неўзабаве спрычыніліся да росквіту беларускай культуры.

ТЭРЫТОРЫЯ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА

Асноўныя часткі Княства да часоў Альгерда і Кейстута падзяляліся на дзве палавіны, якія ў 1413 г. былі пераўтвораны ў Віленскае і Трокскае ваяводствы. Тут знаходзілася большасць зямель, якімі валодаў сам вялікі князь. Галоўныя пасады ім раздаваў буйной арыстакратыі з старажытных родаў.

Фарміраванне абшару нашай дзяржавы – цалкам яна называлася Вялікае Княства Літоўскае, Рускае, Жамойцкае і Інфлянцкае – працягвалася і ў XVI ст. Даследчык гэтага працэсу Мацвей Любаўскі вылучыў у Княстве дванаццаць гістарычна-тэрытарыяльных частак: уласна Літву, Русь Літоўскую, Жамойць, Палессе, Падляшша (Берасцейскую зямлю), пяць асобных вобласцей-земляў (Полацкую, Віцебскую, Смаленскую, Кіеўскую, Валынскую і Падольскую) і раздробленыя Чарнігаўска-Северскія землі. Ядром дзяржавы былі абшары, якія ўваходзілі ў вялікакняжацкую (гаспадарскую) вотчыну. Іх утваралі родавыя ўладанні вялікіх князёў і далучаныя да іх воласці з гарадамі Навагародкам, Гародняй, Берасцем, Менскам, Магілёвам, Пінскам, Браславам, Слонімам, Бабруйскам, Мазыром, Гомелем, Рагачовам, Клецкам.

На тэрыторыі Беларусі ў XV ст. яшчэ існавалі ўдзельныя княствы: Амсціслаўскае, Слуцкае, Заслаўскае і Клецкае ў Віленскім ваяводстве; Пінскае, Тураўскае, Свіслацкае, Кобрынскае і Гарадзецкае (з сталіцай у цяперашнім Давыд-Гарадку) – у Трокскім. Імі найчасцей кіравалі князі-васалы з дынастыі Гедзімінавічаў.

TABULA MODERNA SARMATIE EUR SIVE HUNGARIE POLONIE RUSSIE PRSSIE ET VVALACHIE

На ўсходніх межах дзяржавы знаходзіліся Ноўгарад-Северскае, Старадубскае, Бельскае і Вярхоўскія (у вярхоўях Акі) княствы. Імі звычайна валодалі нашчадкі ад вялікага князя Рурыкавічы. У гэтых землях гаспадар надзяляў вотчынамі знатных перабежчыкаў з Масковіі. Напрыклад, гарады Бранск, Старадуб і Гомель у 1446 г. Казімір Ягайлавіч аддаў князю Васілю Бароўскаму, а пазней – Івану Мажайскаму.

Асаблівае становішча ў Вялікім Княстве займалі Полацкая, Віцебская і Смаленская землі. Яны падпарадкоўваліся Вільні на аснове ўзаемаўзгодненай дамовы («рады»). Перад тым як пасадзіць у сталіцы зямлі свайго намесніка, гаспадар выдаваў адпаведны прывілей (устаўную грамату). Ён дэкларыраваў «вечнае і непарушнае» захаванне правоў і «вольнасцяў», у тым ліку абавязак берагчы цэласць тэрыторыі ўсёй зямлі («не даваці нікому»).

Устаўныя граматы падкрэслівалі добраахвотны характар далучэння земляў да Вялікага Княства. Яны гарантавалі маёмасныя правы жыхароў, давалі ім магчымасць выезду за мяжу («путь чисты, куды что хочет, без усякой зацепки»). Пры гэтым прывілей атрымлівалі не нейкі адзін стан, а ўсё насельніцтва – «мяшчане і ўвесь горад, і ўся зямля Полацкая», «мяшчане места Віцебскага і ўсёй зямлі Віцебскай».

Карта Вялікага Княства Літоўскага ... 1613 г., г. Амстэрдам

Аўтаномія земляў не аслабляла дзяржавы. Усходнія і паўночныя беларускія землі не аддзяліліся ад Вялікага Княства, нават з увагі на цяжкія і доўгія войны з аднаверцамі Масковіяй. Гэтаму спрыяла адзінства палітычных і эканамічных інтарэсаў, а таксама павага вышэйшай улады да мясцовых парадкаў і традыцыяў. Тым часам маскоўскія князі, далучыўшы новыя землі, бязлітасна знішчалі іх ранейшы лад, а самых жыхароў часта перасялялі ўглыб дзяржавы.

Расейскія гісторыкі часам сцвярджаюць, нібыта Вялікае Княства Літоўскае было рыхлым і слабым дзяржаўным утварэннем і ўяўляла сабой у тагачаснай Еўропе нейкую анамалію. Але ў XVI ст. Гішпанія таксама складалася з Кастыліі, Арагона, Леона ды іншых земляў, аб'яднаных толькі адзіным манархам. Кангламерат розных тэрыторыяў утварала ў гэты час Святая Рымская імперыя нямецкай нацыі. Італія тады наогул перажывала паглыбленне палітычнай раздробленасці. Такім чынам, ніякім выняткам з агульнаеўрапейскай гісторыі наша дзяржава не была.

ГАСПАДАР. РАДА. СОЙМ

Вялікі князь

На чале дзяржавы стаяў вялікі князь, або, як яго ад XV ст. называлі дзяржаўныя дакументы, гаспадар. У часы Гедзіміна, Альгерда і Вітаўта ўлада вялікага князя лічылася неабмежаванай. Пасля смерці Вітаўта манарха выбіралі, але толькі з дынастыі Ягайлавічаў.

З часам усё больш складаныя патрэбы нутраной і замежнай палітыкі дзяржавы прывялі да ўтварэння шэрагу пасадаў і органаў кіравання. Яшчэ за Вітаўтам з'явіліся такія найвышэйшыя ў Княстве ўрады (пасады), як канцлер (кіраўнік вялікакняжацкай канцылярыі і захавальнік дзяржаўнай пячаткі), падскарбі (загадчык дзяржаўнага скарбу) і маршалак (кіраўнік вялікакняжацкага двара).

Галоўным абавязкам гаспадара была абарона краіны. Ён узначальваў узброеныя сілы, абвяшчаў вайну і падпісваў мірныя пагадненні, выдаваў законы, распараджаўся дзяржаўным скарбам (казной), ажыццяўляў дыпламатычныя зносіны з іншымі краінамі.

...пазней – гетман (галоўны военачальнік). Апрача іх існавалі ўрады гаспадарскага пісара, падчашага, падстолага, крайчага, кухмістра, канюшага... Прызначэнне на пасаду знаходзілася ў кампетэнцыі гаспадара. Арыстакрат, які атрымліваў пасаду, звычайна валодаў ёю пажыццёва і пакідаў яе, толькі пераходзячы на вышэйшую.

ХРАНАЛОГІЯ

1492 г. – Узнікненне вальнага Сойма і абранне гаспадаром Аляксандра Казіміравіча.
1492–1506 гг. – Княжанне вялікага князя Аляксандра.
1501 г. – Прывілей гаспадара Аляксандра аб пашырэнні правоў Рады.
1506–1548 гг. – Княжанне вялікага князя Жыгімонта Старога.
1506 г. – Прывілей гаспадара Жыгімонта пра абавязковае абмеркаванне з Радай усіх дзяржаўных пастаноў.
1548–1572 гг. – Княжанне вялікага князя Жыгімонта Аўгуста.
1563 г. – Прывілей Жыгімонта Аўгуста пра поўнае ўраўнаванне палітычных правоў праваслаўнай і каталіцкай шляхты Вялікага Княства.
1581 г. – Стварэнне Трыбунала Вялікага Княства Літоўскага.

Рада

Паступова ўсё большую вагу набывала велікакняжацкая Рада, або, як яе яшчэ называлі, Паны-Рада. Спачатку гэта быў дарадчы орган з найбліжэйшых асобаў гаспадара. Вядома, што Вітаўт раіўся з сваімі баярамі наконт стварэння ўласнай праваслаўнай мітраполіі ды наконт сваёй каранацыі. Статут 1468 г. вялікі князь Казімір Ягайлавіч уклаў «з князямі і з панамі-радаю нашаю Вялікага Княства Літоўскага». У часы гэтага гаспадара, які часта адсутнічаў у Польшчы (калі стаў і польскім каралём), Рада выконвала абавязкі найвышэйшай улады.

Значна пашырыў правы Рады прывілей, выдадзены ў 1492 г. вялікім князем Аляксандрам Казіміравічам. Цяпер гаспадар не мог без узгаднення з Панамі-Радай праводзіць замежную палітыку і прызначаць на дзяржаўныя пасады. Яшчэ больш вырасла роля Рады ў 1506 г., пасля прывілея гаспадара Жыгімонта Старога. Паводле яго ўсе дзяржаўныя пастановы вялікі князь меў права выдаваць толькі пасля іх абавязковага абмеркавання з Панамі-Радаю. (У заходнееўрапейскіх крыніцах гэты дзяржаўны орган называўся Сенатам.)

Рада складалася з 45 радных. (У заходнееўрапейскіх дакументах яе называлі Сенатам, а радных – сенатарамі.) У іх лік уваходзілі біскупы – віленскі, луцкі, кіеўскі і жамойцкі, ваяводы (або старасты) – віленскі, полацкі, смаленскі, наваградскі, віцебскі, падляшскі, трокскі, кіеўскі, луцкі, жамойцкі, мсціслаўскі ваяводы – кашталяны, канцлер, падканцлер, падскарбі, гетман, маршалак, пісар вялікакняжацкай канцылярыі ды іншыя высокія дзяржаўныя чыноўнікі.

З агульнага складу радных вылучалася старшая, або першая, рада. Яе прадстаўнікі – віленскі біскуп, а таксама віленскія і трокскія ваяводы і кашталяны – на пасяджэннях сядзелі на першай лаве. Гэтыя найбольш уплывовыя ў дзяржаве людзі часам збіраліся сваім вузкім колам і прымалі пастановы за ўсю Раду.

Шлях да пасады, якая давала права засядаць у Радзе, адкрываўся толькі для эліты Вялікага Княства. Гэта былі знакамітыя арыстакратычныя роды Астрожскіх, Валовічаў, Войнаў, Гальшанскіх, Гаштаўтаў (Гаштольдаў), Глінскіх, Глябовічаў, Забярэзінскіх, Збаражскіх, Ільінічаў, Кежгайлаў, Кішак, Пацаў, Радзівілаў, Сапегаў, Солтанаў, Хадкевічаў, Храптовічаў...

У кампетэнцыі Рады ўваходзілі кантроль за дзейнасцю манарха, дыпламатычныя зносіны дзяржавы, яе абарона, заканадаўства і фінансы, справы шляхецтва, раздача земляў, некаторыя судовыя пытанні. Радзе належала вызначальная роля ў выбары вялікага князя.

Службовыя асобы Вялікага Княства. Гравюры з кнігі Барталамея Папроцкага «Гнязда цноты». 1578 г.

Палітычная вага Рады ў жыцці дзяржавы пачала памяншацца, калі ўтвараўся новы найвышэйшы орган кіравання – Сойм. Такія органы былі тыповымі для тагачаснай Еўропы: у Англіі існаваў парламент, у Гішпаніі – картэсы, у Швецыі – рыксдаг, у Нямеччыне – рэйхстаг, у Польшчы – сойм.

Паслы (дэпутаты) Сойму. Гравюра з малюнка Яна Матэйкі. Другая палова XIX ст.

Сойм

Утварэнне Сойму азначала далейшае абмежаванне ўлады гаспадара, а таксама стрымлівала самаўладдзе алігархаў.

Гістарычныя дакументы XV ст. захавалі шмат сведчанняў пра дзейнасць земскіх сойміаў у Полацку, Віцебску, Смаленску ды іншых землях Вялікага Княства. У такіх сойміках, якія працягвалі традыцыі старадаўняга веча, бралі ўдзел выхадцы розных станаў – баяраў, шляхты, мяшчан. Пазней соймікі ператвараліся ў выключна шляхецкія органы.

Пры канцы XV ст. на аснове соймікаў асобных земляў утвараецца агульны Сойм Вялікага Княства. Палітычнае адзінства краіны цяпер грунтавалася не толькі на прызнанні зямлямі аднаго манарха, але і на ўдзеле іх паслоў (дэпутатаў) у найвышэйшым органе ўлады.

Найчасцей Соймы склікаліся ў сталічнай Вільні, але часам іх пасяджэнні адбываліся і ў іншых гарадах – Наваградку, Гародні, Берасці.

Рада і Сойм складалі разам двухпалатную парламенцкую сістэму Вялікага Княства Літоўскага.

Агульнадзяржаўны Сойм называўся вальным. На яго апрача членаў велікакняжацкай Рады і шматлікіх службоўцаў дзяржаўнага апарату з'язджаліся князі, паны і баяры з усіх частак краіны. На Сойм спачатку запрашалі наогул усю шляхту, што рабіла пасяджэнні надзвычай шматлюднымі. Таму пазней была зацверджана норма прадстаўніцтва: ад кожнага павета – па два шляхціцы-паслы, якіх выбіралі на павятовых сойміках.

Першым вальным Соймам стаў скліканы ў 1492 г. Панамі-Радай Віленскі з'езд, які абраў вялікім князем Аляксандра Казіміравіча. У часы княжання Жыгімонта Старога пасяджэнні Сойму пачалі збірацца рэгулярна. На іх разглядалі лёсавызначальныя дзяржаўныя пытанні: абранне гаспадара, адносіны з іншымі краінамі, заканадаўства і дзейнасць судоў. У сувязі з пастаяннай ваеннай небяспекай з боку Маскоўшчыны і Крымскага ханства вальныя Соймы мусілі найперш займацца абаронаю краіны. Дэпутаты абмяркоўвалі вайну, разглядалі ўмовы замірэння, прымалі пастановы аб вайсковых падатках.

ХРАНАЛОГІЯ

Утварэнне ваяводстваў:
- 1404 г. – Смаленскае
- 1413 г. – Віленскае, Трокскае
- 1471 г. – Кіеўскае
- 1503 г. – Віцебскае
- 1504 г. – Полацкае
- 1520 г. – Падляшскае
- 1566 г. – Амсціслаўскае, Брацлаўскае, Валынскае, Менскае, Наваградскае
- 1566 г. – Берасцейскае

Прывілей [illegible] Жыгімонта Аўгуста [illegible] 1562 г.

Кіраванне ваяводствамі і паветамі

У сярэдзіне XVI ст. наша краіна падзялялася на ваяводствы, а тыя – на паветы. Ваяводстваў было чатырнаццаць: Амсціслаўскае (Амсціслаўскі павет), Берасцейскае (Берасцейскі і Пінскі паветы), Брацлаўскае (Брацлаўскі і Вінніцкі), Віленскае (Ашмянскі, Браслаўскі, Віленскі), Віцебскае (Аршанскі, Віцебскі), Валынскае (Камянецкі, Луцкі, Уладзімірскі), Жамойцкае (Жамойцкая зямля), Кіеўскае (Кіеўскі, Мазырскі), Менскае (Менскі, Рэчыцкі), Наваградскае (Ваўкавыскі, Наваградскі, Слонімскі), Падляшскае (Бельскі, Драгічынскі, Мельніцкі), Полацкае (Полацкі), Смаленскае (Смаленскі і Старадубскі) і Трокскае (Гарадзенскі, Ковенскі, Трокскі, Упіцкі паветы).

Уся ўлада ў ваяводствах належала ваяводам. У іхняй кампетэнцыі знаходзіліся галоўныя гаспадарчыя, фінансавыя, вайсковыя і судовыя справы. На чале ўзброеных сіл ваяводства стаяў кашталян. Падваявода кіраваў ваяводскай канцылярыяй. Гараднічы быў адказны за ўмацаванні ваяводскага замка. За зборам падаткаў і адбываннем павіннасцяў наглядаў ключнік. Ляснічыя і лоўчыя адказвалі за стан лясоў і пушчаў. Ваяводскімі стайнямі (канюшнямі) загадваў стайнік.

Уладу ў паветах трымалі ў сваіх руках старасты. За выкананнем іх загадаў сачылі цівуны, сотнікі і прыставы. Цывільныя справы жыхароў павета разглядаў земскі суд, крымінальныя – замкавы, зямельныя спрэчкі – падкаморскі. Павятовы маршалак кіраваў шляхтай, склікаў і вёў павятовыя соймікі. Вайсковым кіраўніком мясцовай шляхты быў павятовы харунжы, які прызначаў сабе памочнікаў – ротмістраў.

Полацкае і Віцебскае ваяводствы працягвалі карыстацца значнай самастойнасцю. Пасады гараднічага, ключніка, стайніка і лоўчага тут маглі займаць толькі мясцовыя ураджэнцы. На ваяводскім судзе ў Полацку і Віцебску адрозна ад іншых ваяводстваў абавязкова прысутнічалі старэйшыя баяры і мяшчане. Самога ваяводу вялікі князь прызначаў палачанам і віцяблянам «з іх волі-

Пісар

Ваявода

Кашталян

Падкаморы

Харунжы

Адрозна ад Маскоўскай дзяржавы, дзе набірала сілу азіяцкая тыранія, а падданыя (нават з самых знакамітых баярскіх родаў) былі асуджаныя на ролю «государевых людишек», у нашай краіне асоба мела шырокія магчымасці для самасцвярджэння і рэалізацыі сваіх правоў. Гэта – яскравае сведчанне ўлучанасці Вялікага Княства Літоўскага ў агульнаеўрапейскую цывілізацыю, па-за межамі якой заставаліся нашы ўсходнія суседзі.

У кампетэнцыю Галоўнага суда ўваходзілі апеляцыі на пастановы земскіх, замкавых і падкаморскіх судоў, скаргі на незаконныя дзеянні мясцовых службоўцаў, а таксама апеляцыі шляхцічаў, засуджаных на пакаранне смерцю, доўгае зняволенне і вялікую грашовую кару. Справы разглядалі калегіі з некалькіх суддзяў. Прыгаворы адбываліся адкрыта, з удзелам бакоў ды іх пракуратараў (адвакатаў).

Свае дэкрэты (пастановы) трыбунальскія суддзі прымалі большасцю галасоў і накіроўвалі для выканання павятовым судам.

Стварэннем Галоўнага трыбунальскага суда завяршылася фармаванне сістэмы найвышэйшых органаў дзяржаўнай улады.

Трыбунал Вялікага Княства

Найвышэйшым судом дзяржавы быў створаны ў 1581 г. Трыбунал Вялікага Княства, або Галоўны трыбунальскі суд. Ён складаўся з суддзяў (па двое ад павета), якіх шляхта штогод выбірала на сойміках. Выбранымі маглі быць толькі народжаныя ў Княстве асобы, якія валодалі маёнткамі і добра ведалі мясцовыя звычаі і правы. Яны ў сваю чаргу шляхам галасавання вызначалі маршалка (старшыню). Паседжанні Трыбунала па чарзе праводзіліся ў Вільні, Навагрудку і Менску.

«Залаты век» дзяржавы

Вялікі князь Жыгімонт Стары быў прыхільнікам роўнасці шляхты незалежна ад яе этнічнага паходжання і рэлігійнай прыналежнасці.

У гады княжання гэтага гаспадара адбылося скасаванне Гарадзельскай пастановы 1413 г., якая забараняла праваслаўным уваходзіць у дзяржаўную Раду.

Пасаду троцкага ваяводы атрымаў праваслаўны князь Канстанцін Астрожскі, які на паседжаннях Рады заўсёды сядзеў на першай лаве. Пазней туды трапіў і праваслаўны троцкі кашталян Рыгор Хадкевіч.

Такая палітыка ўмацоўвала адзінства нашай дзяржавы, якая тады мусіла весці частыя войны з агрэсіўным усходнім суседам – Масковіяй.

Жыгімонт Стары атрымаў добрую адукацыю і валодаў некалькімі мовамі. Ён меў славу мецэната і апекуна навук. Значную ролю ў жыцці дзяржавы адыгрывала яго жонка Бона, што паходзіла з знатнага італьянскага роду Сфорца. Яна павялічыла зямельныя ўладанні дынастыі Ягайлавічаў і праводзіла аграрныя рэформы.

Сын Жыгімонта Старога і Боны Сфорца вялікі князь Жыгімонт Аўгуст працягваў бацькаву палітыку. Ягоны подпіс замацаваў пастанову, у якой галоўным крытэрам ацэнкі кандыдата на дзяржаўную пасаду называліся не паходжанне і веравызнанне, а здольнасці і заслугі перад Айчынай. Следам за бацькам гэты гаспадар падтрымліваў мастакоў, архітэктараў, літаратараў, музыкаў ды іншых людзей мастацтва.

Вялікае Княства Літоўскае дало ўсёй тагачаснай Еўропе прыклад дзяржавы, дзе мірна жылі розныя народы і спакойна суіснавалі розныя рэлігіі.

XVI стагоддзе ў гісторыі нашай краіны называюць яе «залатым векам».

Часы Жыгімонта Старога і Жыгімонта Аўгуста, апошніх з дынастыі Ягайлавічаў на вялікакняжацкім пасадзе, сталі ў нашай дзяржаве перыядам росквіту культуры Рэнесансу.

ГЕРБ. СЦЯГ. ГІМН

Герб Вялікага Княства Літоўскага з кнігі [illegible]. Пачатак XV ст.

Манеты розных дзяржаў з выявай «Пагоні». Канец XIV ст.

Гербам Вялікага Княства ад часоў гаспадара Віценя была «Пагоня». Яе выява звязаная з старажытнай традыцыяй нашых продкаў выпраўляцца ў пагоню за ворагамі, каб паквітацца за забітых і вызваліць палонных. У адной з вялікакняскіх граматаў канца XIV ст. гаварылася: «У тым жа разе, калі даводзецца гнацца за ворагамі і непрыяцелямі нашымі, дык у гэтае спагнанне, што па-народнаму завецца пагоняй, абавязаныя ісці не толькі рыцары, але і кожны мужчына, незалежна ад паходжання і багацця, абы ён здольны быў насіць зброю».

Старажытныя сімвалы «Пагоні» даследнікі звязваюць таксама з паганскім богам Ярылам, які ў хрысціянскія часы пачаў атаясамлівацца з святым Юр'ем.

Кафля з дзяржаўным гербам. XV ст.

Паводле законаў дзяржавы герб абавязкова змяшчаўся на пячатках манетах, упрыгожваў гарадскія брамы, вежы магістратаў і сядзібы ваяводстваў. Рыцар з узнятым мячом быў і на тысячасным сцягу Вялікага Княства. Даўней гэты сцяг меў выгляд пурпуровага або чырвонага палотнішча з вышытымі на ім «Пагоняй» з аднаго боку і Багародзіцай з немаўляткам – з другога. З баявым воклічам «Багародзіца! Памажы!» войска ішло ў бой.

Пячатка князя Лугвена Альгердавіча з «Пагоняй». 1379 г.

Дукат вялікага князя Яна Казіміра. 1665 г.

ХРАНАЛОГІЯ

1295 г. – Зацвярджэнне «Пагоні» гербам Вялікага Княства Літоўскага.
XV ст. – [illegible]
Пачатак XVI ст. – [illegible]

[illegible]

Пячатка [illegible]

Зацвярджэнне «Пагоні» як герба нашай дзяржавы адбылося ў 1295 г., але значна раней выявай коннага ваяра з мячом ужо карысталіся ў Полацкай зямлі. За князем Ягайлам на шчыце гербавага вершніка з'явіўся шасціканцовы крыж, які сваімі абрысамі нагадвае нацыянальную святыню – крыж Еўфрасінні Полацкай. Канчаткова склаўшыся, герб дзяржавы выглядаў як пурпуровы шчыт з белым конным рыцарам. Чырвоны колер сімвалізаваў агонь, мужнасць і вялікадушнасць. Белы колер, які ў геральдыцы адпавядае срэбру, азначаў у вачах продкаў чысціню, дабро, незалежнасць. Золата шасціканцовага крыжа на шчыце было сімвалам жыцця, святла, надзеі і высакароднасці.

«Пагоня» была на харугвах 30 з усіх 40 палкоў Вялікага Княства, якія ўдзельнічалі ў Грунвальдскай бітве.

[illegible]

Грош часоў Жыгімонта Аўгуста. 1547 г.

«Пагоня» з гербоўніка XVI ст.

Старонка Статута Вялікага Княства 1588 г. з гербам дзяржавы

У агульнадзяржаўным зборы законаў – Статуце 1566 г. – сцвярджалася: «Так мы, Гаспадар, даем пад гербам таго панства нашага Вялікага Княства Літоўскага, Пагоняю, пячаць да каждага павету». «Пагоню» на сваіх пячатках мелі адміністрацыйныя адзінкі толькі беларускай этнічнай тэрыторыі (Жамойць, да прыкладу, мела «мядзведзя», Валынь – крыж).

У XVI ст. па ўсёй Еўропе пачалі ўзнікаць дзяржаўныя сцягі, каляровая гама якіх звычайна ўтваралася ад гербаў. Прынцып быў такі: гербавая выява давала асноўны колер сцяга, а геральдычны шчыт – дадатковы. Срэбная «Пагоня» на чырвоным шчыце дала бел-чырвона-белы сцяг. Упершыню нашы нацыянальныя сцягі паказаныя на батальнай карціне XVI ст., прысвечанай слаўтай бітве пад Воршай у 1514 г.

Колеры нашага сцяга суадносяцца з хрысціянскай сімволікай. Бел-чырвона-белыя стужкі здабілі адзенне царкоўных іерархаў. Белы колер сімвалізуе тут чыстую душу верніка, а чырвоны – сляды праўды, пасеянай у ёй праз пакуты і смерць Хрыста.

Паштоўка з беларускай нацыянальнай сімволікай. Пачатак XX ст.

У XIX ст., калі Беларусь цярпела нацыянальны прыгнёт у Расейскай імперыі, «Пагоню» і бел-чырвона-белы сцяг адрадзілі ў якасці сваіх сімвалаў удзельнікі вызвольных паўстанняў 1831 і 1863 гг.

Пасля краху таталітарнай сістэмы Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прыняў 19 верасня 1991 г. законы аб дзяржаўным сцягу і дзяржаўным гербе, паводле якіх нацыянальная сімволіка зноў набыла дзяржаўны статус.

Бел-чырвона-белы сцяг і «Пагоня» зрабіліся дзяржаўнай сімволікай Беларускай Народнай Рэспублікі, незалежнасць якой была абвешчаная 25 сакавіка 1918 г.

Гімнам, або, як тады казалі, «песняй Айчыны», у Вялікім Княстве Літоўскім была «Багародзіца». Словы і музыка гэтай песні створаныя яшчэ ў XIII ст. Першыя звесткі пра яе выкананне ў якасці гімна звязаныя з Грунвальдскай перамогай над Тэўтонскім ордэнам. Тагачасныя хронікі паведамляюць, што перад тым, як рушыць на крыжакоў, усё нашае войска заспявала «Багародзіцу».

У XVI ст. «Багародзіцу» не толькі спявалі на пачатку кожнай бітвы, але і выконвалі на дзяржаўных і вайсковых урачыстасцях. Тэкст «песні Айчыны» быў змешчаны ў першай рэдакцыі Статута Вялікага Княства Літоўскага 1529 г.:

Багародзіца Дзявіца,
Богам слаўлёная Марыя,
У Тваёга Сына Госпада
Маці абраная, Марыя!
Зыч жа нам...

Старажытны ліцвінскі гімн у нашыя дні адроджаны музычным гуртом «Стары Ольса» і хорам «Унія».

Пашпарт грамадзяніна Рэспублікі Беларусь Уладзіміра Арлова, выдадзены 14 студзеня 1995 г.

ДЗЯРЖАЎНАЯ МОВА

У палітычным, эканамічным і культурным жыцці Вялікага Княства дамінавалі беларускія землі і наш народ. Цалкам заканамерна беларуская мова зрабілася ў краіне дзяржаўнай.

Віленскі вялікакняскі двор здаўна быў беларускамоўным. Ад моманту стварэння ў XIV ст. вялікакняскай канцылярыі ў ёй выкарыстоўвалася тагачасная беларуская мова, якая была добра распрацаваная і цалкам магла забяспечваць усе патрэбы жыцця краіны. Мова, на якой тады размаўлялі продкі сучасных летувісаў – жамойты, яшчэ не была пісьмовай. Іхняе пісьменства ўзнікла толькі ў сярэдзіне XVI ст., тым часам як беларускае мела ўжо 500-гадовую гісторыю.

Наша мова – адна з найстаражытнейшых дзяржаўных моваў у Еўропе. Для параўнання: кастыльская (іспанская) ужывалася ва ўрадавых дакументах з XIII ст., англійская зрабілася афіцыйнай у 1362 г., а французская – у 1400 г.

На нашай мове ствараліся і выдаваліся ўсе зборы законаў дзяржавы ад Статута (Судзебніка) вялікага князя Казіміра Ягайлавіча 1468 г. да самага дасканалага ў Еўропе Статута 1588 г.

Па-беларуску гаварылі, выдавалі граматы і прывілеі манархі і ўсе галоўныя асобы Княства. Па-беларуску пісалі соймавыя пастановы. Наша мова актыўна выкарыстоўвалася ў дыпламатычным ліставанні з Масковіяй ды іншымі суседнімі краінамі. Не існуе ніводнага дзяржаўнага дакумента Вялікага Княства, які быў бы напісаны па-летувіску.

ХРАНАЛОГІЯ

Другая палова XIV ст. – Беларуская мова становіцца дзяржаўнай

1468 г. – На беларускай мове пабачыў свет першы збор законаў дзяржавы – Статут (Судзебнік) вялікага князя Казіміра Ягайлавіча

1588 г. – Дзяржаўнасць беларускай мовы пацвярджае трэці Статут Вялікага Княства

У Смаленскім княстве яшчэ да яго ўваходжання ў Вялікае Княства Літоўскае тагачасная беларуская мова таксама была мовай княскага двара.

Падкрэсліваючы значнасць дзяржаўнай беларускай мовы, канцлер Леў Сапега з гонарам пісаў: «А если которому народу ўстыд праў сваіх не ўмеці, пагатоў нам, которыя не обчым якім языком, але сваім уласным правы спісаныя маем і кождага часу, чаго нам патрэба ку адпору ўсякае крыўды, ведаці можам».

Выкарыстанне беларускай мовы ў афіцыйным справаводстве і судаводстве заканадаўча замацоўваў Статут Вялікага Княства, які патрабаваў, каб земскі пісар пісаў «усе лісты, выпісы і позвы» менавіта па-беларуску, «а не іншым языком». Тады праваслаўных беларусаў-ліцьвіноў звычайна называлі «рускімі» (а продкаў цяперашніх расейцаў – «маскавітамі», «маскоўцамі»). Таму наша мова, на якой апрача дзяржаўных дакументаў ствараліся летапісы і хронікі, шматлікія мастацкія творы, звалася не толькі «літоўскай», але і «рускай». У вершы беларускага паэта першай паловы XVII ст. Яна Казіміра Пашкевіча ёсць поўныя гонару за родную мову радкі:

Польска квітнець лацінаю,
Літва квітнець русчызною.
Без той у Польсцы не прабудзеш,
Без сей у Літве блазнем будзеш.

У тагачасным Польскім Каралеўстве [illegible]

Апрача ўжывання ў справаводстве мовы [illegible] на ўсёй тэрыторыі Вялікага Княства [illegible]

Па-беларуску складзеная велізарная колькасць разнастайных матэрыялаў Літоўскай Метрыкі (архіва вялікакняскай канцылярыі), якая налічвае больш за 600 тамоў. Пераважная іх большасць у XIX ст. трапіла ў Расею. Калі ў 1920 г. бальшавіцкі ўрад падпісаў мірную дамову з незалежнай Летувой, тая, прэтэндуючы на гістарычную спадчыну Вялікага Княства, запатрабавала вярнуць ёй Метрыку. Адзін з запрошаных экспертаў – беларускі гісторык Мітрафан Доўнар-Запольскі прапанаваў перадаць летувісам усе дакументы на іхнай мове. Такіх у сотнях тамоў Метрыкі не знайшлося ніводнага.

У гэтай самай справе летувісы звярталіся па дапамогу і да Вацлава Ластоўскага, старшыні эміграцыйнага ўрада Беларускай Народнай Рэспублікі. Нават пасля атрымання катэгарычнай адмовы яны працягвалі настойваць. Урэшце В.Ластоўскі даручыў урадавай канцылярыі падрыхтаваць праект пагаднення, паводле якога згаджаўся на перадачу Летуве дакументаў Метрыкі, складзеных па-летувіску. У сваю чаргу прасьвёты мусілі назаўсёды адмовіцца ад дакументаў, напісаных па-беларуску. Летувіскі ўраднавец з радасцю падпісаў пагадненне і, як сведчаць відавочцы, спрабаваў [illegible] іх у Маскве «па вялікі канфуз свой і свайго начальства».

Насуперак відавочным фактам гісторыкі Летувы не хочуць прызнаваць дзяржаўнасць старабеларускай мовы ў Вялікім Княстве Літоўскім. Не маючы аніякіх падставаў называць дзяржаўную мову Княства летувіскай, яны ў сваіх кнігах упарта вынаходзяць іншыя назовы для беларускай, характарызуючы яе, да прыкладу, як «афіцыйную славянскую» або «канцылярскую». Часам ужываюць даўнейшае найменне «руская», але ў сучасным значэнні гэтага слова. З другога боку, летувіскія вучоныя імкнуцца давесці, што вялікія князі хоць і пісалі «па-славянску», але гаварылі па-летувіску. Ды гэтаму няма нават ускосных пацверджанняў. Між тым з гістарычных дакументаў вядома, што, выпраўляючыся ў які-небудзь населены жамойтамі куток дзяржавы, гаспадары і іншыя вялікакняскія службоўцы бралі з сабой перакладчыкаў.

Статус дзяржаўнай беларускай мовы захоўвала да самага канца XVII ст. У 1696 г. Сойм Рэчы Паспалітай, у склад якой тады ўваходзіла нашая краіна, надаў афіцыйны статус на тэрыторыі Вялікага Княства польскай мове. На той час яна ўжо фактычна выціснула беларускую з афіцыйнага ўжытку. Але паводле соймавай пастановы ўсе напісаныя і выдадзеныя па-беларуску дакументы і зборы захоўвалі юрыдычную сілу.

СЯЛЯНСТВА

«Грабянцовы» талер Жыгімонта Аўгуста [?]. 1564 г.

Самую значную частку насельніцтва дзяржавы складалі сяляне. Да сярэдзіны XV ст. яны яшчэ пераважна заставаліся асабіста незалежнымі ад землеўласнікаў. Сялянін меў долю (надзел) зямлі, за якую разлічваўся з дзяржавай цалкам – натуральнымі і грашовымі павіннасцямі. У цэлым уваходзіла даніна (аброк) і гаспадарчыя працы. На захадзе Беларусі адзінкаю абкладання была «служба» – дзве ці тры «дымы» (сялянскія гаспадаркі). У Падзвінні і Падняпроўі доўгі час існавалі воласці, жыхары якіх займаліся найперш промысламі і плацілі толькі даніну. Дакументы называюць у іх ліку бортнікаў, баброўнікаў, асочнікаў, лаўцоў, сакольнікаў, рыбаловаў, руднікаў. За карыстанне лясамі і пушчамі дзяржава брала плату бабрамі, куніцамі, мёдам.

Паступова сяляне страчвалі правы на зямлю, дзе здаўна працавалі. Побач з людзьмі «пахожымі» (вольнымі) сярод насельніцтва на сельнішчах з'явіліся «непахожыя» (чалавекі несвабодныя), а таксама пачалі былі прыгоны «тутэйшых нявольных» (парабкі). «Вольныя» для селяніна было права вольнага пераходу да іншага гаспадара.

Пчальнікі. Гравюра 1563 г.

Карчаванне лесу [?]. Гравюра [?] г.

Працэс юрыдычнага запрыгоньвання сялянаў звязаны з прывілеем вялікага князя Казіміра Ягайлавіча, выдадзеным у 1447 г. Гаспадар дзяржавы забяспечыў васалам валоданне зямлёй на правах поўнай уласнасці і дазволіў чыніць суд над залежным насельніцтвам. У велікакняскіх уладаннях сяляне яшчэ доўга мелі права пераходу, але таксама трапілі ва ўсё большую залежнасць. Буйнымі землеўласнікамі былі і манастыры, якія часам валодалі дзясяткамі вёсак.

Паводле сваіх павіннасцяў сяляне падзяляліся на цяглых і дваровых. Першыя плацілі пану аброк збожжам, мясам ды іншымі прадуктамі або грашовы аброк – чынш. Дваровыя сяляне служылі пры панскім двары стайнікамі (конюхамі), агароднікамі, шаўцамі, краўцамі, сталярамі, паляўнічымі...

Павіннасці, якія трэба было адбываць на панскай зямлі, называліся паншчынай. Цяглыя сяляне нярэдка і плацілі аброк, і мусілі працаваць на паншчыне. Апрача таго, на заможных сялянаў кладаліся дадатковыя павіннасці: будаўніцтва і рамонт замкавых умацаванняў і мастоў, пракладанне дарог, перавозка грузаў.

Да канца XVI ст. амаль усё сялянства было запрыгонена. Непамагалі выпадкі плаці вясковаму... утваралі служылыя сяляне – «слугі путныя, панцырныя, пчытныя, конныя». Яны былі асабіста вольнымі, неслі вайсковую службу, але не вызваляліся і ад падаткаў, якое было проста ... Звычайна служылыя сяляне, асабліва пасля спустошальных войнаў, папаўнялі шляхецкі стан.

У сярэдзіне XVI ст. у Вялікім Княстве Літоўскім пачала праводзіцца аграрная рэформа, гэтак званая «Валочная памера». У якасці зямельнай меры ўводзілася валока (21,36 га), якая рабілася адзінкай абкладання падаткамі. За карыстанне валокай зямлі цяглыя сяляне працавалі на паншчыне два дні на тыдзень, а таксама выконвалі іншыя павіннасці па гаспадарству.

МАГНАТЫ І ШЛЯХТА

У Вялікім Княстве зямля дзялілася на прыватную і дзяржаўную, галоўным уладальнікам якой быў манарх-гаспадар. Дзяржаўныя землі пашыраліся за кошт далучэння да краіны новых абшараў.

Уладальнікі прыватных земляў мелі права прадаваць, дарыць і мяняць сваю маёмасць. З развіццём феадальных дачыненняў колькасць прыватнаўласніцкіх земляў расла і ўтвараліся буйныя латыфундыі.

Гаспадароў вялікіх абшараў у другой палове XIV ст. пачалі называць «панамі». Гэтае найменне пашыралася і на іншых уласнікаў. Найбагацейшыя сталі звацца магнатамі. Шмат хто з іх меў княскія або графскія тытулы: Радзівілы, Сапегі, Гальшанскія, Хадкевічы, Слуцкія, Друцкія, Астрожскія, Тышкевічы, Алелькавічы, Гаштаўты, Чартарыйскія.

Людзі, якія атрымлівалі зямлю ад вялікага князя за вайсковую службу, называліся баярамі. Зямля належала ім часова, але баярын мог выслужыць або выкупіць свой надзел у вотчыну, гэта значыць у поўнае ўладанне.

Як асобная палітычная сіла баярства ўмацавалася ўжо пры Вітаўце. Клапоцячыся пра моц войска, гаспадар шчодра раздаваў землі васалам. Гарадзельская унія 1413 г. надзяліла прывілеямі і гербамі толькі буйное баярства (51 род) каталіцкага веравызнання. Аднак такое становішча трывала нядоўга. Вялікі князь Жыгімонт Кейстутавіч у 1434 г. ураўнаваў у правах каталіцкую і праваслаўную арыстакратыю. У часы Казіміра Ягайлавіча баяры таксама атрымалі аднолькава шырокія прывілеі – незалежна не толькі ад веры, але і ад памераў уладанняў.

Ад XV ст. разам з даўнейшым назовам «баяры» ўсё часцей пачаў ужывацца новы «шляхта», што ў перакладзе з тагачаснай нямецкай мовы азначала «род, парода». На пачатку XVI ст. усіх вайскова-служылых людзей ужо называлі шляхцічамі.

Герб роду Радзівілаў з уласнай брамы Нясвіжскага замка.

Прывілей імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі Фердынанда I, які пацвярджае княжы тытул Мікалая Радзівіла Чорнага. Аўгсбург, 14 снежня 1547 г.

На левай старонцы: генеалагічнае дрэва Радзівілаў. Сярэдзіна XVIII ст.

Шляхта Вялікага Княства карысталася надзвычай шырокімі правамі. Яна мела асабістую недатыкальнасць і магчымасць вольнага выезду за мяжу, вызвалялася ад натуральных павіннасцяў і падаткаў з маёнткаў, вольна распараджалася вотчынамі, судзіла сваіх сялянаў.

Барбара Радзівіл. Майстар Лукас Кранах Малодшы. 1553–1556 гг.

Караль Станіслаў Радзівіл, [illegible] Вялікага Княства Літоўскага. Невядомы мастак. XVII ст.

Самога ж шляхціча маглі судзіць толькі роўныя яму, гэта значыць шляхоцкі суд. Праз мясцовыя соймікі і вальны Сойм шляхта ўдзельнічала ў самакіраванні ў паветах і ваяводствах, а таксама ў вызначэнні палітыкі ўсёй краіны. Менавіта шляхта выбірала вялікага князя і суддзяў усіх роўняў да самага галоўнага – Трыбунала Вялікага Княства Літоўскага.

Да самай багатай і ўплывовай арыстакратыі Еўропы належаў літвінскі род Радзівілаў. У агромных уладаннях знаходзілася больш за дваццаць замкаў, 426 гарадоў і мястэчкаў, блізу 2 тысяч маёнткаў з 10 тысячамі вёсак. Радзівілы далі дзяржаве шмат славутых палітыкаў, палкаводцаў, культурных дзеячоў. Выдатную ролю ў гісторыі Вялікага Княства Літоўскага адыгрывалі таксама магнацкія роды Астрожскіх, Сапегаў, Хадкевічаў...

Альжбета Радзівіл. З нясвіжскай калекцыі Радзівілаў. Невядомы мастак. XVII ст.

Асноўным абавязкам шляхоцкага стану была абарона Айчыны. За «нявартыя» заняткі рамяством або гандлем пагражала страта шляхоцтва.

У залежнасці ад сваёй маёмасці і палітычнай вагі шляхта падзялялася на тры групы. Верхнюю складала арыстакратыя – вялікія паны і князі, якія былі нашчадкамі Рурыкавічаў і вялікакняжскіх дынастыяў. Яны мелі велізарныя зямельныя абшары і тысячы прыгонных сялян, ішлі на вайну пад уласнай харугвай на чале свайго войска з баяраў і слугаў. Попіс (перапіс) узброеных сілаў Вялікага Княства паказвае, што траціну ўсяго войска выстаўлялі толькі блізу дваццаці родаў – Радзівілы, Кезгайлы, Алелькавічы, Астрожскія, Осцікавічы, Глябовічы, Заберэзінскія, Кішкі, Ходкевічы, Сангушкі ды іншыя.

Да асноўнай часткі шляхты належалі сярэднія і дробныя землеўласнікі, што валодалі ў лепшым разе некалькімі дзясяткамі сялянскіх «дымоў». Апошнюю прыступку займалі самыя дробныя шляхцічы, якія мелі зямельны надзел без падданых.

Больш за 80% шляхты нашага краю былі беларусамі, але незалежна ад этнічнага паходжання і веры ўвесь шляхоцкі стан Княства ўтвараў адзіную агульнадзяржаўную супольнасць.

Шляхта вяла настойлівае змаганне за пашырэнне сваіх правоў і кантроль над дзейнасцю вышэйшых дзяржаўных органаў і чыноўнікаў. Гэта прывяло ўрэшце да стварэння своеасаблівай шляхоцкай рэспублікі.

Разглядаючы пазнейшыя падзеі, некаторыя аўтары памылкова называюць шляхту былога Вялікага Княства польскай. Напраўду наша шляхта, хоць і карысталася ў XIX ст. польскай мовай, была мясцовага паходжання. Яна ніколі не пакідала гэтай зямлі, а, наадварот, бараніла яе ад ворагаў, паўставала супраць акупантаў, добра ведала беларускую мову і традыцыйную народную культуру.

Адыход панавальнага стану ад сваіх каранёў адбываўся не толькі ў нас. Да прыкладу, вярхі нарвежскага грамадства засвоілі дацкую культуру, чэшскага – нямецкую, а расейскага – французскую. Але, калі наставалі новыя гістарычныя ўмовы, пачалося вяртанне эліты да нацыянальных каштоўнасцяў. Літва-Беларусь не была тут выняткам. Нягледзячы на намаганні паланізатараў і русіфікатараў, наш край не стаў ні польскім, ні расейскім. Гэта засведчылі і настроі шляхты.

Паводле дадзеных перапісу насельніцтва, праведзенага ў Расейскай імперыі ў 1897 г., 65 тысяч, або каля 50%, дваранаў у беларускіх губернях (дзе шмат было тады і прыезных) назвалі роднай мовай беларускую.

Параўнальна з іншымі еўрапейскімі краінамі шляхоцкі (дваранскі) стан складаў у Вялікім Княстве Літоўскім вельмі значную долю насельніцтва. Гэта тлумачыцца частымі войнамі і неабходнасцю мець вялікую колькасць вайскова-служылых людзей. У XVII ст. шляхціцам быў прыкладна кожны дзясяты жыхар нашай краіны (у суседніх Расіі, Аўстрыі і Прусіі дваранства складала блізу 1% жыхарства, у Францыі – 2–3%).

Шматлікасць і велізарная роля шляхты далі гісторыкам падставу называць яе «палітычным народам» Княства. Гэты народ [illegible] шмат дзяржаўных на працягу некалькіх стагоддзяў.

Надмагілле Альбрэхта Гаштаўта ў Віленскім катэдральным касцёле. Сярэдзіна XVI ст.

МАГДЭБУРГСКАЕ ПРАВА

Месты і мястэчкі

Гістарычныя дакументы сведчаць, што пры канцы XVI ст. у Вялікім Княстве было 530 гарадоў (якія тады называлі местамі) і мястэчак. Іх жыхары складалі ўсяго 15–20% насельніцтва краіны, але адыгрывалі вельмі значную ролю. Вялікія князі заўсёды ўлічвалі ўплыў буйных гарадоў як даўніх палітычных і эканамічных цэнтраў сваіх земляў. Дэлегацыі Полацка і Віцебска, да прыкладу, разам з Гедзімінам у 1338 г. бралі ўдзел у падпісанні гандлёвага пагаднення з Тэўтонскім ордэнам. Пасланцы Полацка, Вільні, Віцебска, Менска, Навагрудка, Берасця і Смаленска падпісалі супольна з баярамі дамову паміж Ордэнам і вялікім князем Свідрыгайлам.

ХРАНАЛОГІЯ

1387 г. – Вільня.
1390 г. – Берасце (Брэст).
1391 г. – Гародня (Гродна).
[illegible]
1444 г. – Трокі.
[illegible]
1499 г. – Менск.
[illegible]

LONGINQVITAS REPARGII NON POTEST

Гарадскія паселішчы былі звычайна не надта вялікія і мелі дзве-тры тысячы жыхароў. Але існавалі і значныя гарады з больш чым 10-тысячным насельніцтвам – Магілёў, Віцебск, Берасце, Менск, Пінск. Да сярэдзіны XVI ст., калі пачалася Інфлянцкая (Лівонская) вайна, самым буйным у дзяржаве быў Полацак, які і колькасцю жыхарства, і багаццем перасягаў сталічную Вільню. Некаторыя дакументы сцвярджаюць, што колішняя сталіца Полацкага княства мела каля 100 тысяч насельнікаў.

У гарадах жылі пераважна рамеснікі і купцы, а таксама шляхта з прыслугаю. Гараджанаў называлі месцічамі, або мяшчанамі, ад слова «места», што ў тагачаснай беларускай мове азначала «горад». Насельніцтва вялікіх гарадоў здаўна было шматэтнічным. У Полацку знаходзілася цэлая фактарыя Ганзейскага гандлёвага хаўрусу нямецкіх гарадоў. Нямецкія супольні існавалі ў Берасці і Гародні. Ад часоў Вітаўта ў беларускіх местах сяліліся таксама габрэі, татары, палякі.

Мяшчане часта цярпелі ад самавольства вялікакняскіх намеснікаў і імкнуліся мець сваю незалежную ўладу. Гаспадары дзяржавы таксама былі зацікаўленыя ў надзяленні гарадоў самастойнымі правамі, каб спрыяць іх гандлёва-рамеснаму развіццю і прываблiць туды новае насельніцтва. Магчымасці для стварэння ўласнага кіравання давала гораду магдэбургскае права.

Магдэбургскае (майдэборскае) права, або права горада на самакіраванне, узнікла пры канцы XIII ст. у нямецкім горадзе Магдэбургу, адкуль хутка пашыралася па Еўропе.

Гарадское самакіраванне

У нашай дзяржаве граматы (прывілеі) на магдэбургскае права выдавалі местам вялікія князі. Першай у 1387 г. такі прывілей атрымала Вільня, а следам за ёю, у 1390 і 1391 гг., – Берасце і Гародня. У грамаце на самакіраванне Полацку (1498 г.) гаспадар Аляксандр аб'яўляў, што надзяляе горад правамі «на вечныя часы, каб людзі нашы, там жывучы, праз уред добры і справядлівы былі размножаныя».

Дадзены ў 1499 г. прывілей на магдэбургскае права Менску прадугледжваў, што месцічы могуць судзіцца толькі сваім судом, падаваць скаргі непасрэдна вялікаму князю і выбіраць уласнае кіраўніцтва. Менчукі не толькі вызваляліся ад шэрагу ранейшых павіннасцяў, але атрымлівалі права мець важніцу з капнікай (памяшканні, дзе ўзважвалі тавар і тапілі воск) і лазню, даходы ад якіх ішлі ў гарадскі скарб. Жыхары места Менскага маглі секчы дровы (на будоўлю і апал) у дзяржаўных лясах і пушчах.

ХРАНАЛОГІЯ

1569 г. – Дзісна, Крычаў, Сураж.
1577 г. – Магілёў, Мазыр.
1581 г. – Пінск.
1582 г. – [illegible]
1585 г. – [illegible]
1586 г. – [illegible]
1589 г. – Кобрын.
1590 г. – Ліда, [illegible], Пружаны.
1597 г. – Віцебск.
1601 г. – Смаленск.
1613 г. – Горкі, Жыровічы.
1620 г. – Ворша, Друя.
1623 г. – Нясвіж, Рэчыца, Себеж.
1625 г. – Дарагабуж, [illegible], Старадуб.
1628 г. – [illegible]
1633 г. – [illegible]
1634 г. – [illegible], Чавусы.
1637 г. – Ружаны.
1641 г. – [illegible]
1643 г. – [illegible]
1646 г. – [illegible]
1652 г. – [illegible], Клецк.
1654 г. – [illegible]

Жыхарам дазвалялася будаваць «клеці хлебныя», «камору пастрыгальную» і млын. Прывілей даваў права на свой гарадскі сцяг-харугву.

Магдэбургскае права мела большасць беларускіх гарадоў і мястэчак. Яно вызваляла жыхароў ад улады і суда намеснікаў, ваяводаў, старастаў ды іншых дзяржаўных асобаў. Мяшчане пазбаўляліся ад цяжкіх феадальных павіннасцяў, у тым ліку ад талок і «гвалтаў» (збораў на агульную працу), ад фурманкавай павіннасці (выдзялення фурманак), утрымання ганцоў і паслоў, неабходнасці выстаўляць варту-«старожу» на замках. Цяпер гараджане ахоўвалі толькі муры і брамы самога места.

Насельніцтва «вольных» гарадоў атрымлівала права гандляваць у дзяржаве без мытных падаткаў, збіраць прыбытак ад гарадскіх мераў, вагаў і крамаў, будаваць грамадскія будынкі і нават бровары. Мяшчане набывалі ў наваколлі звычайныя земельныя абшары. Буйныя гарады будавалі для замежных купцоў адмысловыя гасцінныя двары.

Абавязкі мяшчан у магдэбургскіх правах зводзіліся да выплаты ў дзяржаўны скарб фіксаванага падатку, «чынша карчомнага» і «сярэбшчыны» (надзвычайнага падатку на ваенныя мэты).

Прыбыццё маскоўскага пасольства ў Гародню. Ілюмінаваная гравюра М. Цюндта. 1568 г.

Магістрат

Местам кіравау выбарны магістрат, які складаўся з дзвюх «палатаў» – рады і лавы. Рада займалася маёмаснымі і цывільнымі справамі мяшчанаў. Лава разглядала крымінальныя злачынствы.

Для пасяджэнняў магістрата будаваліся адмысловыя будынкі – ратушы (майдэборыі), якія разам з гербамі гарадоў былі своеасаблівымі сімваламі гарадской «вольнасці». У ратушы знаходзіліся канцылярыя, скарб і архіў, захоўваліся граматы з наданнем месту правоў магдэбургскага права. Магістрат збіраў падаткі, сачыў за правільнасцю мераў і вагаў на рынках, вырашаў спрэчкі паміж гандлярамі і рамеснікамі, што прыбывалі ў места з іншых гарадоў.

У раду штогод на агульных выбарах горад абіраў раднаў (райцаў), у лаву – лаўнікаў. Калі насельніцтва належала да розных веравызнанняў, рада выбіралася на парытэтных асновах: палову месцаў мелі праваслаўныя, палову – каталікі. Да прыкладу, у прывілеі, дадзеным Вільні, адзначалася, што «палавіца тае рады закону Рымскага, а палавіца закону Грэцкага, так як абодвум права Магдэбургскае дано».

Раду ўзначальвалі выбарныя бурмістры, а лаваю кіравау прызначаны вялікім князем або прызначаны ўладальнікам горада войт. Але ў Воршы, Магілёве, Нясвіжы і ў некаторых іншых гарадах войта выбіралі самі месцічы. Паводле звычаю войт прысягаў на крыжы, што будзе верна служыць месту. Колькасны склад магістрата залежаў ад насельніцтва места: Полацак абіраў 24 раднаў, Менск – 12, Навагрудак – 6.

Беларускія месты не проста механічна пераймалі заходнееўрапейскія нормы самакіравання, але дастасоўвалі іх да мясцовых асаблівасцяў і традыцый. Апрача магістрата судовыя справы ў Слуцку, Слоніме ды некаторых іншых гарадах разбіраў яшчэ і традыцыйны копны суд. У Полацку, Воршы, Віцебску, Амсціславе і Крычаве ў магдэбургскія органы ўвайшлі вядомыя ад вечавых часоў пасады сотніка.

Гарадскія ўлады не цырымоніліся з парушальнікамі. Напрыклад, месцічы, які на людзях зневажыў бурмістра, пастановаю рады мог быць не толькі пазбаўлены на нейкі час права займацца рамяством, але й публічна пакараны бізуном на гарадскім пляцы.

Патрыцыят і паспольства

Мяшчанства не было аднародным. Багатыя жыхары (патрыцыят) імкнуліся кіраваць першынна, бяднейшыя («паспольства») адстойвалі свае правы, патрабуючы, каб іх дэпутаты кантралявалі ўсю дзейнасць магістрата. Архіўныя дакументы паведамляюць, напрыклад, пра сход «полацкіх магістрацкіх асобаў усіх трох сесій і паспольства», які прапанаваў магістрату скласці пры ўдзеле паспалітых гараджанаў падатковы спіс і надалей збіраць падаткі «з багатага і ўбогага, без ніякае карупцыі».

Розніца паміж гарадскімі вяршкамі і простымі рамеснікамі або гандлярамі была надзвычай вялікай. Запавет полацкага купца Якуба Хадыкі, складзены ў сярэдзіне XVII ст., сведчыць, што той меў чатыры крамы, прыгарадны маёнтак і жыў у доме, сцены якога аздаблялі «на палатне карціны паснапаны». У пераліку маёмасці і срэбных згадваюцца 69 срэбных талераў, спадкаў і кубкаў, а таксама «476 копаў літоўскіх грошаў, 1600 чырвоных злотых, 349 шведскіх талераў» і лёўт пазычальнікаў – 3850 копаў грошаў (капа – 60 штук).

Але незалежна ад заможнасці жыхары места паводле магдэбургскіх прывілеяў мелі роўныя правы, якія замацоўваліся ў агульнадзяржаўных законах. Кожны месцічанін, у прыватнасці, мог прыцягнуць да адказнасці шляхціча – «калі каму з мяшчанаў нашых права майдэборскага каторая крыўда дзеяла ад князей, паноў і земян і падданых іх... такога кожнага месцічаніна маець да суду земскага павятовага пазваць».

Паспольства пакрыўджвалася галоўным чынам за кошт складаў, якія ўцякалі ад прыгнёту сваіх уладальнікаў. Уцекачоў, што сяліліся ў месце, магістрат браў пад апеку і не дазваляў вярнуць былому гаспадару, якое б высокае становішча той ні займаў.

Беларускія гарады сваім выглядам і арганізацыяй жыцця, культурай і побытам нагадвалі гарады усёй тагачаснай Еўропы. На землях ад Вялікага Княства Літоўскага, у Масковіі, а потым у Расійскай імперыі, але даволі доўга захоўвалі сваё з ім адметнымі фізіяльнымі народамі, магдэбургскае права нікалі не існавала.

Сцвярджаючы волю і правы асобы, магдэбургскае права ўзняло мацную дзяржаву ў прастору агульнаеўрапейскай цывілізацыі, адной з самых важных адметнасцяў якой і было гарадское самакіраванне.

КУПЦЫ І РАМЕСНІКІ

Развіццё рамёстваў

Магдэбургскае права спрыяла развіццю рамяства, якое было асноўным заняткам мяшчанаў. У тагачасных беларускіх гарадах працавалі майстры каля 200 спецыяльнасцяў. Да прыкладу, у Магілеве іх налічвалася болей за 80: збройнікі, ліцейнікі, муляры, кафляры, разьбяры, катляры, каптаннікі, сярмяжнікі, сафьяннікі, півавары ды інш.

Найбольшым попытам карысталіся вырабы кавалёў, краўцоў, шаўцоў, гарбароў, ткачоў, шкляроў, ганчароў, бондараў. Зважоўваліся сваіх спажыўцоў і прадукцыя майстроў больш вузкай спецыялізацыі: каптурнікаў, панчошнікаў, замочнікаў, залатароў, серабранікаў, чаканшчыкаў. У спісах збройнікаў «места Полацкага» згадваюцца пароховнікі, мечнікі, шабельнікі, пішчальнікі. З полацкім портам было звязанае жыццё цесляроў, стырнавых, майстроў па вырабе ветразяў. Далёка за межамі Княства славіліся беларускія майстры-гарматнікі.

Вырабы рамеснікаў звычайна спалучалі ў сабе практычную, эстэтычную і сімвалічна-абрадавую функцыі і часта былі сапраўднымі творамі мастацтва. Сярэдневечныя майстры, напрыклад ювеліры, нярэдка валодалі такімі тэхнічнымі сакрэтамі, якія з цяжкасцю раскрываюцца сёння.

Нашы таленавітыя землякі атрымлівалі запрашэнні з іншых краінаў. Да прыкладу, еўрапейскую вядомасць здабыў майстар Ян з Вільні, што ў 1562 г. стаў прыдворным ювелірам дацкага караля Фрэдэрыка II.

Частыя ваенныя дзеянні абумовілі развіццё лекарскай справы. Вялікай павагай карысталіся зелнікі – знаўцы лекавых раслінаў-зёлак. Шырокую спецыялізацыю мелі цырульнікі, якія не толькі займаліся пастрыганнем і галеннем, але і лячылі вывіхі і пераломы, рабілі хірургічныя аперацыі.

Майстры і цэхі

Бароначы свае інтарэсы ад канкурэнцыі, рамеснікі беларускіх гарадоў, як і ва ўсёй Еўропе, аб'ядноўваліся ў цэхі – своеасаблівыя тагачасныя прафесійныя звязы.

Стварэнне цэхаў прадугледжвалася граматамі на магдэбургскае права або асобнымі дакументамі, што горад атрымліваў ад гаспадара дзяржавы ці ад свайго ўладальніка.

Прывілей на заснаванне цэха звычайна меў статут, у якім пералічваліся правы і абавязкі ягоных удзельнікаў, зацвярджалася цэхавая пячатка, герб і харугва. Цэхавыя статуты падрабязна рэгламентавалі вытворчасць і збыт прадукцыі, якасць сыравіны і тавараў, тэхналогію, час і ўмовы працы. Цэхі існавалі практычна ва ўсіх гарадах і мястэчках. У Магілеве іх, да прыкладу, налічвалася 21, у Слуцку – 17, Берасці – 14, Менску – 9.

Рамесніцкія цэхі мелі складаную іерархію. Іх узначальвалі абраныя на год старасты-цэхмістры. Наступныя прыступкі займалі старэйшыя і малодшыя майстры, за імі ішлі падмайстры, чаляднікі, шаклярі і «хлопцы» (вучні). У вялікіх цэхах былі дапаможныя службоўцы – ключнікі, «стольнікі», пісары, шафары (бухгалтары).

Рамеснікі, якія не ўваходзілі ў прафесійныя суполкі, не маглі прадаваць свае вырабы на гарадскіх рынках і нават у ваколіцах. Так, полацкі цэх кушняроў і гарбароў карыстаўся правам за тры мілі ад горада канфіскоўваць ва ўсіх майстроў-аднаасобнікаў тавар, а іх саміх саджаць у астрог.

Аднак таго каб падняцца па цэхавай лесвіцы, найперш трэба было мець дакумент пра законнае нараджэнне, потым доўгія гады вучыцца і плаціць складкі. Да ўступлення ў цэх дапускалі людзей «жанатых і дабрачынных», а вось «п'яніцы або гультаі ў косці» з гэтай марай мусілі развітацца.

Прэтэндэнт на пераход у майстры павінны быў вытрымаць цяжкое выпрабаванне – «зрабіць штуку», шэдэўр свайго майстэрства. Экзамен (яго дазвалялася здаваць тры разы) адбываўся пад пільным наглядам найлепшых прафесіяналаў, якія сачылі, каб кандыдат у майстры працаваў абсалютна самастойна. Каваль, да прыкладу, мусіў выштукаваць падкову, пясак і сякеру, а слесар – змайстраваць складаныя замкі для куфра і крамы. Экзамены завяршаліся шчодрым частаваннем экзаменатараў у карчме.

Рамеснікаў, якія не ўваходзілі ў цэх ці былі выгнаныя з іх за парушэнне статуту, называлі «партачамі». Іх вырабы звычайна мелі меншы кошт, але і ніжэйшую якасць. Цэхавыя рамеснікі пераследвалі партачоў у судовым парадку і нярэдка выганялі з гарадоў.

Гандаль

У цэхі абʼядноўваліся таксама купцы, якім магдэбургскае права стварала лепшыя ўмовы для гандлю. Агульнадзяржаўныя і гарадскія прывілеі вызвалялі купцоў Вялікага Княства ад мыта за правоз тавараў праз дзяржаўную мяжу, а таксама давалі ім іншыя перавагі. Іншаземныя купцы не маглі гандляваць уразброб, а павінны былі здаваць тавар гуртам (оптам), хоць для кірмашоў рабілі выняткі. Дзеля абароны ўласнага рынку існавалі своеасаблівыя «квоты» на продаж і набыццё замежнымі купцамі шэрагу тавараў. Да прыкладу, дадзены Полацку ў 1498 г. прывілей пацвярджаў, што «ні адзін купец Рыжскі, або кіторы іншы чужы не мае воску інака прадаваці і купіваці, толькі пад меру, паладей выпісаную».

Дзяржава і гарадскія ўлады патрабавалі стварэння ў прымежных гарадах «складаў» імпартных тавараў. Кожны купец-іншаземец пад пагрозаю канфіскацыі мусіў абвясціць колькасць, кошт і месца прызначэння свайго тавару, а потым заплаціць адпаведнае мыта. Апрача гэтага прыезджых купцоў чакалі іншыя зборы – «маставыя» (за пераезд праз мост), «брукавыя» (за праезд па добрай дарозе), грэбельныя (за праезд па грэблі). Такая сістэма часта прыводзіла да таго, што замежнікі пакідалі свой тавар на складзе, а ўнутры дзяржавы ім гандлявалі мясцовыя купцы.

Найважнейшымі імпартнымі таварамі былі сукно, шаўковыя (шаўковыя) тканіны, палатно, медзь, волава, свінец, сталь, віно і прыправы. З Вялікага Княства ў Заходнюю Еўропу вывозілі найперш воск і футра. На экспарт ішлі таксама арэўтына, футра, скуры, сала, смала, дзёгаць, паташ, жалеза, хмель. З канца XV ст. асноўным экспартным прадуктам стала збожжа. Галоўным гандлёвым шляхам дзяржавы, як і ў папярэднія стагоддзі, заставалася Дзвіна. Месцы гандлявалі і ў вёсках, дзе былі патрэбныя шырокім гарадскіх майстроў.

Карыстаючыся выгадным геаграфічным становішчам краіны, беларускія купцы актыўна гандлявалі з Прыбалтыкай, Польшчай, Нямеччынай, Чэхіяй, Венгрыяй, Масквой.

Раз ці два на тыдзень ва ўсіх гарадах і мястэчках адбываліся таргі. Рынак займаў самы вялікі гарадскі плац. У Магілеве на ім стаялі больш за 400 крамаў.

У кожным буйным горадзе Княства можна было без праблем памяняць грошы іншай краіны. Тагачасныя «абменнікі» бралі за паслугу 4–5 адсоткаў. Ад XV ст. Вялікае Княства карысталася зручнай дзесятковай сістэмаю грашовых наміналаў, на якую шэраг еўрапейскіх дзяржаваў перайшоў толькі ў XIX ст.

ВІЛЬНЯ – СТАЛІЦА НАШАЙ ДЗЯРЖАВЫ

[illegible]

[illegible]

ХРАНАЛОГІЯ

[illegible]

[illegible]

[illegible]

[illegible]

Крывы горад

Летувіскія гісторыкі трымаюцца думкі, нібыта Вільню заснаваў вялікі князь Гедзімін. Гэта не болей як прыгожая легенда, якая не вытрымлівае праверкі гістарычнымі фактамі. Ужо ў XI ст. на месцы сучаснай Вільні існавала заснаванае крывічамі гарадское паселішча, што першапачаткова называлася Крывым горадам. Славянскае паходжанне мае і пазнейшы назоў – ад ракі Вільні, якая тут зліваецца з Віллёй (Віліяй).

Крывы горад (часам яго менавалі таксама Крывіч-горадам) быў сталіцаю удзельнага княства Полацкай зямлі. У ім валадарылі князі полацкай дынастыі: у 1070 г. – Расціслаў Рагвалодавіч, а пазней – ягоныя сыны. У часы вялікага князя Войшалка Віленскае княства ўвайшло ў Вялікае Княства Літоўскае. Крывы горад згадваецца ў гістарычных крыніцах яшчэ і ў XIV ст. Нямецкія хронікі паведамляюць, што гэта – «рускае места». Назоў Вільня ўпершыню сустракаецца ў грамаце нямецкіх гарадоў Ганзейскага гандлёвага хаўрусу, датаванай 1323 г.

[illegible]

Віленскае насельніцтва

Пераважная частка насельніцтва Віленскага княства, як і самой старажытнай Вільні, была крывічамі. Славяне, а дакладней нашыя продкі – беларусы-ліцьвіны складалі большасць жыхароў Вільні на працягу некалькіх стагоддзяў. Паводле перапісу 1897 г., летувісаў сярод віленчукоў налічвалася менш за 2%.

Пра беларускі характар віленскага жыцця ў Сярэднявеччы і ў пазнейшы перыяд пераканаўча сведчыць гарадская тапаніміка: вуліца Вялікая, Крывая (Лысая) гара, Зялёны мост, Траецкая, Мокрая, Вострая брама, прадмесці Зарэчча, Пагулянка, Палюдаы, Папоўшчына.

Яшчэ адно яскравае сведчанне таго, што асноўным насельніцтвам тагачаснай Вільні былі праваслаўныя беларусы, – колькасць храмаў. У 1511 г. места Віленскае мела 14 праваслаўных цэркваў, у тым ліку Прачысценскую, Спаскую, Міхайлаўскую, Кацярынінскую, Пятніцкую, Юр'еўскую на Росах, Петрапаўлаўскую на Зарэччы... Побач з імі мірна стаялі сем касцёлаў, прыхаджанамі якіх таксама былі пераважна беларусы.

Апрача беларусаў і нязначнай колькасці жмудзінаў (летувісаў) у месце ад Альгердавых часоў жылі габрэі і немцы. Гаспадар Вітаўт пасяліў тут частку крымскіх татараў, якія перайшлі да яго на службу і хутка збеларусіліся, але захавалі пры гэтым сваю рэлігію. У першай палове XV ст. вялікі князь Жыгімонт Кейстутавіч запрасіў сюды колькі дзясяткаў майстроў з Італіі і Польшчы.

Як і па ўсёй дзяржаве, у Вільні панавала рэлігійная і нацыянальная цярпімасць.

[illegible]

Палітычны цэнтр краіны

З Вільняй звязана дзейнасць вялікакняскай канцылярыі, працоўнай мовай якой была беларуская. Пры канцылярыі захоўваўся дзяржаўны архіў – Метрыка Вялікага Княства. З пашыраным кнігадрукам там па-беларуску «бітымі літарамі» выдаваўся Статут – агульнадзяржаўны збор законаў.

У 1323 г. Вільня пераняла ў старажытнага Новагародка ролю сталіцы. Падпісаная ўвосень таго самага года мірная дамова Вялікага Княства Літоўскага з Інфлянцкім ордэнам і Рыгай ужо называе места Віленскае сталічным і згадвае размешчаны ў ім палац гаспадара Гедзіміна.

У Вільні знаходзіліся не толькі рэзідэнцыя вялікіх князёў, але і ўсе галоўныя дзяржаўныя органы і ўстановы. Тут звычайна збіралася велікакняская Рада, найчасцей праводзіліся паседжанні Сойму, падпісваліся важныя міжнародныя дамовы. У 1401 г. князі і паны нашай дзяржавы замацавалі тут сваімі подпісамі і 40 пячаткамі акт Віленска-Радамскай уніі з Польшчай. Ён пацвярджаў правы князя Вітаўта на самастойнае кіраванне, а абедзве дзяржавы рабіў раўнапраўнымі ўдзельніцамі палітычнага і вайсковага альянсу. Адным з вынікаў гэтай уніі сталася Грунвальдская перамога над Тэўтонскім ордэнам.

Вялікая пячатка гаспадара Жыгімонта Старога, якой ён карыстаўся у 1506–1548 гг.

Карта Вялікага Княства Літоўскага і прылеглых земляў, створаная Г. Меркатарам і Ё. Гондзіусам. З атласа, выдадзенага ў 1607 г. у Амстэрдаме.

Пасля Гарадзельскай уніі 1413 г. Вільня зрабілася адначасова цэнтрам Віленскага ваяводства, куды напачатку ўваходзілі велізарныя абшары ад Вількаміра і Уцянаў на поўначы да Рэчыцы і Чачэрска на поўдні.

Ад 1416 г. у Вільні знаходзілася рэзідэнцыя праваслаўнага мітрапаліта Вялікага Княства Літоўскага.

Сталіца Вялікага Княства Літоўскага. Гравюра XVII ст.

VILNA

Срэбныя грошы Жыгімонта Аўгуста. Аверс і рэверс. 1562 г.

У 1495 г. пачаў дзейнічаць Віленскі манетны двор – асноўны цэнтр грашовай эмісіі ў краіне. Аднак гісторыкі мяркуюць, што манеты ў Вільні білі значна раней – да канца XIV ст. На ўсіх манетах пазначаны адлюстраваны дзяржаўны герб – «Пагоня».

Дукат Яна Казіміра. Аверс і рэверс. 1666 г.

Віленскі касцёл бернардзінцаў. XV ст.
Фота Дзяніса Раманюка. 2001 г.

Гарадская культура

У сярэдзіне XVI ст. Вільня мела больш за 20 тысяч жыхароў і колькасцю насельніцтва саступала ўва ўсёй дзяржаве толькі Полацку.

Магдэбургскае права, атрыманае Вільняй у 1387 г., прычынілася да росквіту рамёстваў і гандлю. Вялікакняскі прывілей даваў віленскім купцам права бязмытна гандляваць на ўсім абшары дзяржавы. Два разы на год у Вільні вiравалі велізарныя кірмашы, на якія з'язджаліся купцы з дзясяткаў краін і гарадоў. У месце існавалі Нямецкі і Маскоўскі гандлёвыя двары. Віленскіх майстроў больш чым ста спецыяльнасцяў аб'ядноўвалі 20 рамесніцкіх цэхаў, першы з якіх – кушнерскі – узнік у 1458 г.

Фрагмент унікальнай манументальнай фрэскавай размалёўкі Віленскага бернардзінскага касцёла, на якім ілюстраваныя падзеі Інфлянцкай вайны. Другая палова XVI ст.

Выгляд Вільні на гравюры з кнігі С. Мюнстэра «Касмаграфія». 1550 г.

На пачатку XVI ст. горад уражваў замежных паслоў і падарожнікаў сваёй еўрапейскай планіроўкай, велічнымі храмамі і раскошнымі палацамі Радзівілаў, Хадкевічаў, Астрожскіх, Сапегаў, Кішкаў ды іншых беларускіх арыстакратаў. Памерамі Вільня была роўная Кракаву з усімі яго перадмесцямі. Тут налічвалася больш за 300 двух- і трохпавярховых мураваных будынкаў. Разам з нашымі ў Вільні працавалі архітэктары, запрошаныя з Нямеччыны, Галандыі, Італіі. Тады ўжо дзейнічаў першы гарадскі водаправод з драўлянымі трубамі.

«Граматыка славенская мовы». Друкарня Мамонічаў. Вільня. 1621 г.

Вільня зрабілася адным з еўрапейскіх культурных цэнтраў. Гістарычныя дакументы паведамляюць пра высокі ровень ведаў, якія давала заснаваная ў другой палове XIV ст. школа для дзяцей месцічаў. Апрача дзяржаўнай беларускай там выкладаліся лацінская, грэцкая, нямецкая і габрайская мовы. Больш за сто выпускнікоў школы паступілі ў Кракаўскі ўніверсітэт. У 1579 г. была заснаваная свая вышэйшая школа – Віленская акадэмія, якая мела ўніверсітэцкі статус.

На пачатку XVI ст. беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар Францішак Скарына выдаў у Вільні першыя ў Вялікім Княстве друкаваныя кнігі. Ягоную справу працягвалі тут Пётра Мсціславец, Кузьма, Лукаш і Лявон Мамонічы.

Старонка з кнігі «Апостал» Францыска Скарыны. Вільня. 1525 г.

Палац Сапегаў і катэдра ў Вільні. На другім плане руіны замка Гедзіміна. Акварэль Напалеона Орды. 1875 г.

Сталіцу нашай дзяржавы ў розныя часы наведвалі і знаходзілі тут гасцінны прытулак шмат якія выдатныя дзеячы еўрапейскай культуры. У 1413 г. вялікі князь Вітаўт з пашанаю прымаў у Вільні паплечніка Яна Гуса магістра Геранiма Пражскага, які шмат год свабодна прапаведваў у нашай краіне гуманістычныя ідэі гусітаў. Пры вялікакняскім замку пад апекаю гаспадара Аляксандра жылі астраном Войцех з Брудзева і публіцыст Эразм Вітэлій.

Адзін з паплечнікаў чэшскага рэфарматара Яна Гуса магістр Геранім Пражскі, які наведаў Вільню ў 1413 г. Старадаўняя гравюра.

БЕЛАРУСКАЕ РЫЦАРСТВА

Гаспадарчыя дакументы сведчаць, што ў 1528 г. Віленскае ваяводства давала ў паспалітае войска 3605 коннікаў, Троцкае – 2867, Падляшша – 1747, Полацкае – 709, Пінск – 111... Тады сам князь Юрый Алелькавіч Слуцкі выстаўляў 433 кавалерыстаў, Канстанцін Астрожскі – 426, князі Салтуновы – 170. Наступныя прыведзены сучасных летапісцаў. Жамойць выстаўляла на вайну 1855 коннікаў. У татарскім войску Вялікага Княства тады налічвалася 673 конных ваяры.



Паспалітае рушанне

Асноваю войска Вялікага Княства Літоўскага на працягу некалькіх стагоддзяў заставалася ўсеагульнае апалчэнне, якое называлася паспалітым рушаннем. Паводле закону вайскова-абавязанымі былі ўсе мужчыны, што валодалі зямлёй. Апрача таго, кожны шляхціч выстаўляў добра ўзброеных і навучаных ваяроў. Іх колькасць вызначалася велічынёй зямельных уладанняў. Бараніць краіну выпраўляўся адзін ваяр ад васьмі гэтак званых службаў (служба была роўная двум сялянскім гаспадаркам). Дробны шляхціц, які не меў сялянаў, ішоў у войска толькі сам. Ад княжання Вітаўта значную частку нашага войска складалі беларускія татары. Часам узброеныя сілы дзяржавы папаўняліся аддзеламі прафесійных найміту-іншаземцаў.

Пастанову пра пачатак ваенных дзеянняў і скліканне паспалітага рушання прымаў вальны Сойм. Па ўсіх паветах рассылаліся вялікакняскія лісты з загадамі-ўніверсаламі, дзе паведамлялася пра месца і час вайсковага збору.

Кожны павет выстаўляў сваю харугву. Зборныя харугвы ваяводства ўзначальвалі кашталяны. Пасля адыходу шляхты з рушаннем на вайну за парадак у паветах адказвалі адмысловыя службовыя асобы – войскія.

Як і арміі большасці краінаў тагачаснай Еўропы, паспалітае рушанне складалася з двух асноўных частак – капійнікаў і стральцоў. Баявая адзінка з аднаго цяжкаўзброенага рыцара, які спецыялізаваўся выключна ў рукапашным баі, а таксама некалькіх стральцоў з лёгкім узбраеннем называлася капі'ём. Колькасць ваяроў у капі'і залежала ад фінансавых магчымасцяў землеўладальнікаў. Часам сустракаліся капі'і з адных капійнікаў або з адных стральцоў. Капійнікі і стральцы маглі быць коннымі або пешымі, але галоўная роля ў войску належала кавалерыі.

Пра падрыхтоўку нашых продкаў-ліцвіноў да вайсковай службы ў паэме «Песня пра зубра» піша выдатны беларускі паэт XVI ст. Мікола Гусоўскі. У мірны час баявым станам рабіліся «бязмежныя пушчы і вольныя палі», дзе ваяры практыкаваліся ў коннай яздзе, валоданні мячамі, шаблямі і дзідамі, стральбе з лукаў і арбалетаў.

Калі наш маладняк [illegible] у сваіх уладаннях
[illegible] ў пушчах...
[illegible] да сутонку
[illegible] на кругі
Шабляй і стрэламі [illegible] у вазкі...
[illegible]
[illegible]
[illegible] Вось [illegible] коні,
[illegible]
А на [illegible]
Конных [illegible] рукою
Кожны [illegible]

[illegible]

Узбраенне

Да зброі бліжняга бою належала клінковая, друўкавая і абуховая. Сярод клінковай найбольш пашыранымі былі адна-, паўтара- і двухручныя мячы. Разам з імі выкарыстоўваліся карацейшыя і аднаЛязовыя цесакі і корды. З часоў Вітаўта ў Вялікім Княстве вядомыя шаблі, якім спачатку належала галоўнае месца ў арсенале беларускіх татараў. Дакументы XVI ст. паведамляюць, што шаблі па распаўсюджанасці ўжо займалі другое месца пасля корда ва ўсёй кавалерыі. Вояры добра валодалі кінжаламі, шпагамі і кончарамі – мячамі з доўгім кантовым клінком-джалам, прызначаным для прабівання панцыраў.

Вельмі папулярнай наступальнай дрэўкавай зброяй і ў конных, і ў пешых ваяроў былі дзіды (кап'і) розных тыпаў: рагаціны, вошчыны, суліцы. У баі з цяжкай варожай конніцай найбольшы эфект давалі алебарды. Гэта было ўдалае спалучэнне дзіды, сякеры і крука, прызначанага для сцягвання кавалерыста з каня. Побач з алебардамі на ўзбраенні знаходзіліся бердышы і «партызаны» (пратазаны) – своеасаблівыя дзіды з доўгім і шырокім двухлязовым лязом.

Абуховая зброя складалася з сякераў, чаканаў, клявцоў (баявых молатаў для прабівання панцыраў), кісцянёў (баявых цапоў), булаваў, перначоў (булаваў з сталёвымі пёрамі). Важнай часткаю баявога арсенала традыцыйна заставаліся лукі і арбалеты (самастрэлы).

Шляхецкі герб «Вуж»

Ад варожых куляў і ўдараў ваяра абаранялі разнастайныя панцыры, шаломы і шчыты-тарчы.

Апрача кавалерыі і пяхоты нашае войска складалася з артылерыі. У сярэдзіне XVI ст. у Вільні дзейнічала вядомая ў Еўропе людвісарня (гарматня), дзе за дзень маглі вырабіць 18 гарматаў, што стралялі чыгуннымі ядрамі. Іншая славутая людвісарня знаходзілася ў Нясвіжы. Шмат якія з нясвіжскіх гарматаў, што вылучаліся сваімі баявымі характарыстыкамі, мелі нават свае назовы («Пірат», «Сава»).

Войска нашае дзяржавы было ўзброена нароўні з арміямі іншых еўрапейскіх краінаў. Жаўнеры мелі агнястрэльную зброю – ручніцы і аркебузы, а таксама ручную [illegible], якая падпальвалася ад [illegible].

[illegible]

[illegible]

Рыцарства

Правы і абавязкі рыцараў, якія не складалі асобнага стану, а былі заможнейшай часткаю шляхты, рэгламентаваліся законам. Найперш ваяры мусілі клапаціцца пра ўзбраенне. Рыцар меў права выехаць у іншую дзяржаву (апрача непрыяцельскай) «дзеля прымнажэння славы». Побач з ідэаламі роўнасці і ўзаемадапамогі рыцарскі кодэкс патрабаваў падтрымліваць царкву, бараніць слабых, шанаваць жанчыну,

[illegible] у рыцарскім панцыры. Невядомы мастак пачатку XIX ст.

[illegible]

Партрэт Крыштофа [illegible]

дэманстраваць асабістую мужнасць, а таксама дбаць пра адукацыю і навуку. Правілы не дазвалялі забіваць праціўніка ззаду. Пячатка ганьбы кладася на таго, хто ў двубоі конны забіў пешага або ўзброены — безабройнага.

Найгалоўнейшымі з рытуалаў былі цырымонія рыцарскага пасвячэння і турніры. Асабліва часта турніры, ладжаныя паводле класічных еўрапейскіх правілаў, адбываліся ў Вільні за гаспадаром Жыгімонтам Аўгустам. У 1547 г. на вялікія рыцарскія спаборніцтвы ў сталіцу Вялікага Княства з'ехаліся арыстакраты з дзесяці краінаў. У турнірных міжбоях выступаў сам вялікі князь.

Выдатных ваяроў з берагоў Дзвіны, Дняпра і Нёмана можна было бачыць пры дварах манархаў розных дзяржаваў. Шмат хто з нашых рыцараў браў удзел у заходнееўрапейскіх турнірах. Турнірныя гербоўнікі мелі асобныя раздзелы, прысвечаныя рыцарству Вялікага Княства Літоўскага.

Тырольскі герцаг Фердынанд у 1581 г. намерыўся стварыць у фамільным замку музей «еўрапейскай славы». Ён звярнуўся да самых знакамітых рыцараў з просьбаю прыслаць сваю зброю. У іх лік трапілі нашы суайчыннікі Радзівілы — Мікалай Руды і Мікалай Чорны. Цяпер іх парадныя панцыры выстаўляюцца ў Венскім гістарычным музеі.

Частка панцыра князя Мікалая Радзівіла Чорнага. [illegible] Захоўваецца ў Венскім гістарычным музеі

Сябар сучаснага рыцарскага клуба на фэсце сярэднявечнай культуры. Фота [illegible]

Шляхта нашай дзяржавы лічыла сябе нашчадкамі ваяўнічых, вольных і ўдачлівых сарматаў, якія за тысячу гадоў да гэтага былі ўладарамі велізарных еўрапейскіх абшараў і кідалі выклік самому Рыму. Новыя сарматы кіраваліся дэвізам «Жыццё — Айчыне, гонар — нікому». Сёння ўяўленне пра рыцараў Вялікага Княства Літоўскага дае асобны гістарычны жанр жывапісу — так званы сармацкі партрэт.

Традыцыі беларускага рыцарства належаць не толькі гісторыі. Цяпер у адным Менску дзейнічае блізу пятнаццаці рыцарскіх клубаў, а ў краіне іх болей за трыццаць. Яны рэгулярна бяруць удзел у святкаванні гадавінаў Грунвальдскай і Аршанскай перамог. У Менску, Навагрудку, Нясвіжы адбываюцца міжнародныя рыцарскія фэсты. Разам з турнірамі ў іх праграму ўваходзяць бугурты (штурмы абарончага ўмацавання), спаборніцтвы лучнікаў і арбалетчыкаў, конкурсы старадаўніх строяў.

У Вялікім Княстве Літоўскім, як і ў іншых еўрапейскіх краінах, існавала рыцарства. У 1387 г. гаспадар Ягайла паставіў подпіс пад граматай, дзе ўпершыню згадваюцца «рыцары і баяры». Гэтую дату можна лічыць пачаткам пашырэння рыцарскіх традыцый у нашай дзяржаве.

У XV ст. беларускае рыцарства здабыло сабе славу пад Грунвальдам і ў гусіцкіх войнах, дзе нашы суайчыннікі змагаліся на баку гусітаў.

Вобразы рыцараў Вялікага Княства стварыў у XVI ст. невядомы аўтар знакамітага батальнага твору «Бітва пад Воршай», які захоўваецца ў Нацыянальным музеі ў Варшаве. На гэтай карціне першы раз сустракаюцца бел-чырвона-белыя баявыя штандары ваяроў-ліцвінаў.

АБАРОНА АД МАСКОВІІ І ТАТАРАЎ

Масква.
Гравюра Г. Браўна і Ф. Гогенберга. 1575 г.

Пасля захопу туркамі ў 1453 г. Канстанцінопаля і гібелі апошняга візантыйскага імператара Масква ўзяла на сябе прэтэнзіі на ролю «трэцяга Рыму». Крамлёўскія ўладары называлі сябе спадкаемцамі «истинно христианского царства» — Візантыі, а значыцца, верхавенства ва ўсім хрысціянскім свеце, у «паганых» і «рас-кольніках». Маскоўскія князі з дапамогай свайго царквы займаліся вывядзеннем іх паходжання ад імператара Аўгуста. «Два Рима пало, а Москва третий есть, а четвертому не бытии», — пісалася ў дзяржаўных дакументах.

«Трэці Рым»

Тэўтонскі ордэн быў разгромлены, але праз некалькі дзесяцігоддзяў наша дзяржава сутыкнулася з новай небяспекай, цяпер ужо на ўсходзе, дзе ўзмацнілася Маскоўскае княства. Яго вызваленне ад татарскага прыгнёту, гэтай найвялікшай трагедыі расійскага народа, было толькі вонкавым. Маскоўшчына пераняла дзяржаўную будову Арды і, па сутнасці, зрабілася яе адлюстраваннем. Пра гэта сведчыла жорсткае адзінаўладдзе, сляпая падпарадкаванасць «холопов государевых», чынгісханаўская ідэя ўлады над усім светам. У татараў пазычалі і арганізацыю войска, і тактыку выпаленай зямлі, і нялюдскія расправы з насельніцтвам сумежных дзяржаваў, што было прадэманстравана пры знішчэнні Ноўгарадскай і Пскоўскай рэспублік.

ХРАНАЛОГІЯ

- 1492–1494 гг. — Першая вайна Масквы з Вялікім Княствам Літоўскім
- 1500–1503 гг. — Другая вайна Масквы з Вялікім Княствам Літоўскім
- 14 ліпеня 1500 г. — Бітва на рацэ Ведрошы
- 5 жніўня 1506 г. — Разгром татараў пад Клецкам
- 1507–1508 гг. — Трэцяя вайна Масквы з Вялікім Княствам Літоўскім
- 1512 г. — Разгром татарскай арды пад Вішнявцом на Украіне

Пачатак войнаў з Маскоўшчынай

Маскоўскі князь Іван III, узяўшы шлюб з пляменніцай апошняга візантыйскага імператара Соф'яй Палеалог, абвясціў сябе абаронцам усіх праваслаўных Усходняй Еўропы і ў 1478 г. запатрабаваў ад вялікага князя Казіміра Ягайлавіча «Полацка, Віцебска, Смаленска ды іншых земляў рускіх». Наступны гаспадар нашай дзяржавы Аляксандр Казіміравіч адразу пасля бацькавай смерці мусіў уступіць у распачатую Маскоўшчынай у 1492 г. вайну за гэтак званую «вотчыну». Падпісанае замірэнне 1494 г. Аляксандр замацаваў шлюбам з дачкой Івана III Аленай. Аднак гэты дынастычны шлюб не прынёс спакою. Двор вялікай княгіні ў Вільні стаў прыкрыццём для дзейнасці маскоўскіх выведнікаў.

У 1500 г. Іван III зноў накіраваў на Вялікае Княства велізарнае 40-тысячнае войска. 14 ліпеня каля ракі Ведрошы на Смаленшчыне захопнікі ўбачылі перад сабой гатовыя да бітвы нашыя харугвы, дзе было ўсяго чатыры з палавінаю тысячы ваяроў. Яны біліся з неверагоднай мужнасцю і амаль усе загінулі. У выніку той вайны наша дзяржава часова страціла 19 гарадоў, у тым ліку Гомель, Чарнігаў, Бранск, Старадуб, Невель і Веліж.

Праз некалькі гадоў вальны Сойм Княства пастанавіў склікаць паспалітае рушанне і адваяваць свае землі. Не чакаючы гэтага, маскоўскае войска ўварвалася ў Беларусь з поўначы і ўсходу. Варожыя ваяводы паведамлялі свайму гаспадару Васілю III, што «землю воевали мало не до Вильны, везде огонь пускали, и шкоды чинили и полону на колко десеть тысяч взяли». Аднак здабыць непрыяцель здолеў толькі Друцак. Ворша, Слуцак, Клецак, Слонім, Навагрудак ды іншыя гарады адбараніліся. Асабліва мужна два тыдні адбіваў прыступы захопнікаў Менск, які разам з невялікім гарнізонам баранілі ўсе мяшчане.

Наезды стэпавікоў

Яшчэ адным небяспечным ворагам Вялікага Княства ў гэты час зрабілася Крымскае ханства, якое ўзнікла пасля распаду Залатой Арды. У другой палове XV ст. яно ператварылася ў васала Асманскай імперыі і адначасова ўчыніла пагадненне пра хаўрус з Масковіяй. Выпраўляючыся ў замежныя наезды, татары пустошылі Падолле, Валынь, Кіеўшчыну, урываліся на Берасцейшчыну ды іншыя беларускія землі. У 1497 г. была паруйнавана Мазыршчына.

Амаль штогоду татары палілі гарады і вёскі, гналі ў няволю тысячы палонных. Нашыя войскі разбілі захопнікаў у 1503 г. пад Давыд-Гарадком, але наезды не спыняліся.

Хаўруснік татараў маскоўскі князь Іван III вымагаў ад крымскага хана хадзіць «да Слуцка, і да Турава, і да Пінска, і да Менска». Двойчы татарскія загоны нападалі на беларускую зямлю ў 1503 г., а ў 1505-м іхная 5-тысячная конніца зрабавала менскія ваколіцы.

Бітва пад Клецкам

Улетку 1506 г. на Беларусь рушыла 20-тысячная конная арда, якую вялі крымскія «царэвічы» Біці і Бурнаш. Супроць яе выйшлі харугвы навагрудскага, гарадзенскага і менскага рушэнняў. 6 жніўня нашае войска на чале з князем Міхаілам Глінскім сустрэлася з ворагам непадалёку ад Клецка.

Пад камандаю князя было блізу 10 тысяч ваяроў, але адрозна ад захопнікаў яны мелі апрача лукаў і агнястрэльную зброю – ручніцы і некалькі гарматаў. Пад іх заслонай ліцьвіны загацілі дзве пераправы цераз раку Лань. Адзін правы фланг нашага войска паспешліва перабраўся на другі бераг і трапіў пад знішчальныя націскі лепшых татарскіх сячкароў.

Князь Глінскі зладзіў паскорыць пераправу астатніх сілаў, і харугвы «левай рукі» ўдарылі ўпоперак варожых загонаў. Шляхоцкая конніца ў сталёвых панцырах рассекла шыхты стэпавікоў на дзве часткі. Тым часам перайшло ў наступ і войска «правай рукі». Частка татараў апынулася ў абцугах і была пасечаная, астатнія ратаваліся ўцёкамі. Пагоня перайняла іх каля Слуцка, Петрыкава і навет на Украіне. Усяго некалькі сотняў з вялікага войска дабраліся да Крыма. Ваяры Міхаіла Глінскага вызвалілі 40 тысяч палонных беларусаў-ліцьвіноў і адбілі ў ворага 30-тысячны табун коней.

Падзеі гэтага вайсковага трыумфу захоўваюць як пісьмовыя крыніцы, так і людская памяць. Яшчэ ў XIX ст. на месцы перамогі ўзвышаўся крыж. У 1996 г. героям тае бітвы нашчадкі ўшанавалі помнікам.

Пазней, у 1508 г., нашыя продкі разбілі татараў каля Слуцка, а ў 1512 г. 5-тысячнае войска Вялікага Княства разграміла 25-тысячную арду пад Вішнявецам на Гарыні. У гісторыі засталася і бітва на рацэ Альшаніцы недалёка ад Кіева, дзе ваяры-ліцьвіны ў 1527 г. вярнулі свабоду 80 тысячам нашых суайчыннікаў.

Клецкая бітва стала-ся першай буйной перамогай над крымскімі татарамі. Напалоханы хан Менглі-Гірай пачаў шукаць перамоваў і на нейкі час ператварыўся ў хаўрусніка Вялікага Княства Літоўскага.

«Літоўскі Геркулес»

У абароне Айчыны ад захопнікаў з усходу і поўдня праславіўся князь Юрай Радзівіл. Лаўры пераможца даставаліся яму ў трыццаці бітвах.

Сучаснікі так і называлі яго – Victor, што ў перакладзе з лаціны азначае «пераможца». Юрай Радзівіл заслужыў таксама ганаровае імя «літоўскі Геркулес».

У 1511 г. ён разам з князем Юрыем Слуцкім і кіеўскім ваяводам Андрэем Неміровічам (які паходзіў з Наваградчыны) у выніку начнога нападу на татарскі лагер вызваліў некалькі тысяч палонных ліцвінаў. Праз год Радзівіл удзельнічаў у пераможнай бітве пад Вішняўцом, а затым вызначыўся ў знакамітым разгроме маскоўцаў пад Воршай.

На чале шляхецкага рушання ў 1519 г. Юрай Радзівіл спыніў пад Крэвам маскоўскае войска, якое рвалася да Вільні. У тым самым годзе ён з уласным рыцарскім аддзелам дапамагаў Польшчы ў вайне з Тэўтонскім ордэнам. Невялікі корпус «літоўскага Геркулеса» узяў варожыя замкі Голань, Брандэбург, Любаву і змусіў крыжакоў прасіць міру. Атрымаўшы ўрэшце жаданую булаву вялікага гетмана, князь Юрай вызваліў ад маскоўскіх захопнікаў Гомельскую і Старадубскую землі.

«Літоўскі Геркулес» стаў заснавальнікам біржайска-дубінкаўскай галіны роду Радзівілаў, якая дала шмат выдатных вайсковых і дзяржаўных дзеячаў. Ягоная дачка Барбара – жанчына незвычайнай прыгажосці і трагічнага лёсу – была жонкай вялікага князя Жыгімонта Аўгуста, а сын Мікалай, названы Рудым, гэтаксама застаўся ў гісторыі як мужны абаронца нашай краіны ад ворагаў.

АРШАНСКАЯ БІТВА

Новая вайна

Увосень 1512 г. маскоўскі князь Васіль III, што любіў паўтараць: «Пакуль конь мой хадзіць будзе і меч сячэ, не дам спакою Літве», распачаў новую штарэнніцу. Маскве на той час удалося схіліць на свой бок імператара Святой Рымскай імперыі

Максіміляна I. У таемную кааліцыю супраць нашай дзяржавы мелі ўвайсці Прусія, Данія, Саксонія.

Непрыяцельскія палкі, якія вялі баяры Чалядні і князь Булгакаў-Голіца, складаліся пераважна не з простых ратнікаў, а з баяраў, дваранаў і «дзяцей баярскіх». Вялікі князь Жыгімонт Стары выслаў насустрач ворагу 30-тысячную армію. Абсалютную большасць не складалі нашыя продкі – рыцары-ліцвіны з усіх беларускіх паветаў. Часткаю войска Вялікага Княства Літоўскага былі блізу 3 тысяч наймітаў-палякаў, якія ваявалі пад нашымі сцягамі і атрымлівалі заробак з вялікакняжскага скарбу. (Сцвярджэнні польскіх гісторыкаў, нібыта ў арміі, што выступіла супраць захопнікаў, знаходзілася 17 тысяч польскіх кавалерыстаў і пяхотнікаў, ёсць фантастычнымі, бо не пацвярджаюцца ніякімі гістарычнымі крыніцамі – нічым, акрамя імкнення ўсялякім спосабам падкрэсліць вырашальную ролю палякаў.)

Аддзеламі лёгкай конніцы Княства камандаваў празваны «літоўскім Геркулесам» палкаводзец Юрый Радзівіл, які пазней стаў найвышэйшым гетманам дзяржавы. Асобныя аддзелы кавалерыі былі ў падпарадкаванні Івана Сапегі. На чале арміі стаяў найвышэйшы гетман Канстанцін Астрожскі.

На трэці год вайны амаль 100-тысячная орда захопнікаў заходзіла ўжэнь Смаленск і рушыла ўглыб Вялікага Княства на Оршу і Вільню. «Войскі літоўскія ад Масквы не былі шчытам прагнанымі!» – такі загад даў сваім ваяводам Васіль III, якому ўжо мроілася цудная перамога.

ХРАНАЛОГІЯ

1460(?)–1530 гг. – Жыццё і дзейнасць Канстанціна Астрожскага.
1512–1522 гг. – Чарговая вайна Масквы з Вялікім Княствам Літоўскім.
8 верасня 1514 г. – Аршанская перамога.
1534–1537 гг. – [illegible]
1535 г. – [illegible]

Гетман Канстанцін Астрожскі

Старажытны род Астрожскіх паходзіў з турыўскіх князёў. Мужчыны з гэтага роду спрадвеку славіліся ваярскім майстэрствам. Князь Канстанцін вельмі ў юнацтве выявіў талент ваяводы. Ён стаў адным з першых барацьбы з крымскімі татарамі: нямала разоў разбіваў іхнія аддзелы і аднаго разу захапіў у палон сына хана Мэнглі-Гірэя.

Адзначыўшы заслугі Астрожскага ў абароне Айчыны, гаспадар Аляксандр у 1497 г. прызначыў яго найвышэйшым гетманам – начальнікам усіх узброеных сілаў Вялікага Княства. Князю Канстанціну было ўсяго 37 гадоў. Нікто раней не атрымліваў гэтай высокай пасады ў такім маладым веку.

Апрача вайсковых клопатаў гетман Астрожскі будаваў цэрквы і манастыры, адчыняў школы і шпіталі. Па колькасці зямлі і сялянаў ён быў тады другім у дзяржаве пасля віленскага ваяводы А. Гаштаўта і выстаўляў з сваіх маёнткаў у войска больш за 400 конных воінаў.

Цяжкія выпрабаванні напаткалі гетмана ў 1500 г. У бітве на рацэ Ведрошы, дзе маскоўскія захопнікі мелі перавагу ў дзесяць разоў, войска Астрожскага амаль палягла цалкам, а сам ён трапіў у палон. Адмовіўшыся ад выгадных прапановаў маскоўскага князя, гетман праз сем гадоў змог уцячы і вярнуцца на радзіму.

За свой жыццё Канстанцін Астрожскі перамог у шасцідзесяці трох бітвах,

але вечную славу яму прынёс трыумф пад Оршай.

Перад бітвай гетман, стоячы пад дзяржаўным сцягам з «Пагоняй» і выявай Багародзіцы, звярнуўся да сваіх ваяроў з кароткай гарачай прамовай: «Мужныя рыцары! Няхай адвага і храбрасць вашы будуць вартымі слаўных бацькоў!..»

Разгром маскоўцаў

На самым пачатку восені 1514 г. маскоўскія ваяводы з велізарным 80-тысячным войскам наблізіліся да Воршы. Тут 8 верасня, у дзень нараджэння Дзевы Марыі, на рацэ Крапіўне і адбылася вырашальная бітва.

Маючы амаль трохразовую колькасную перавагу над Астрожскім, ваяводы Чаляднін і Булгакаў-Голіца не сумняваліся ў лёгкай перамозе. Яны лічылі, што здольныя разбіць ліцвіноў, нават дзейнічаючы паасобку. Самаўпэўненасць саслужыла ім дрэнную службу, але галоўную ролю ў далейшых падзеях адыгралі талент Астрожскага і гераізм нашых ваяроў, якія баранілі родную зямлю.

Уначы перад бітвай гетман пераправіў свае аддзелы праз Дняпро. Частка кавалерыі перайшла раку ўброд, для астатняга войска былі хутка наведзеныя масты на звязаных, добра прасмоленых бочках. На досвітку нашы баявыя шыхты занялі пазіцыі насупраць расцягнутага на некалькі вёрстаў расійскага войска.

Наперадзе Канстанцін Астрожскі паставіў найлепшых пешых стралкоў з ручніцамі, на флангах – конніцу. Частка гарматаў прыкрывала пяхоту, але астатнія сілы артылерыі былі схаваныя ў засадзе.

Загрымелі баявыя бубны, засвісталі трубы-сурмы з турыных рагоў, і сеча пачалася. Конныя палкі «правай рукі» маскоўскага войска пайшлі ў атаку. «Наперад, дзеці!» – крыкнуў 54-гадовы гетман сваім рыцарам, кідаючы іх у контрнаступ. На доўгіх дзідах нашых конных ваяроў віліся бел-чырвона-белыя сцяжкі.

Неўзабаве конніца ваяводы Булгакава-Голіцы кінулася наўцёкі. Другі маскоўскі ваявода Чаляднін вырашыў не дапамагаць яму, бо хацеў сам выйграць бітву. Цяпер сеча закіпела на нашым правым фланге, якім камандаваў Юрый Радзівіл. Гетман Астрожскі быў сярод сваіх жаўнераў. Яговая ўзнятая над галавою булава дадавала мужнасці слабейшым.

[illegible] гетмана Канстанціна Астрожскага. Трыумфатар бітвы пад Воршай [illegible] Масква. Павел Татарнікаў. 2009 г.

Аршанская бітва завяршылася поўным разгромам маскоўскага войска. Пазней вядомы царскі гісторык М. Карамзін у сваёй «Гісторыі Расійскай дзяржавы» пісаў, што войскі Вялікага Княства «ніколі не атрымлівалі такой славутай перамогі над рускімі». Летапісы і хронікі паведамляюць, што непрыяцель страціў забітымі 40 тысяч. [illegible] у палон. Сярод іх былі самі Чаляднін з Булгакавым-Голіцам і многія іншыя маскоўскія ваяводы. У лік трафеяў пераможцы ўзялі некалькі [illegible] і 20 тысяч коней.

Нейкі час вайсковае шчасце не хілілася ні на чый бок. І тут здарылася нечаканае: кавалерыя Астрожскага сымітавала напад, а потым і нібыта пакацілася назад. Узрадаваны ваявода Чаляднін кінуў у бой усе свае сілы. Расцягнутыя баявыя парадкі расійцаў з пераможнымі крыкамі перайшлі ў наступ. Колькі хвілінаў нашая конніца вельмі праўдападобна дэманстравала ўцёкі, а затым, падзяліўшыся на дзве паловы, зрабіла імклівы бакавы манеўр. Маскоўскія вершнікі апынуліся перад пакінутымі ў засадзе артылерыяй і пяхотай з ручніцамі. Ужо першыя залпы нанеслі ворагу вялікія страты і спарадзілі паніку.

Тысячы ахопленых жахам захопнікаў расцякліся па шырокім прырэчным полі, страціўшы ўсякую здольнасць да супраціву. Шмат хто ў роспачы кідаўся ў Дняпро. Ворагаў гналі і секлі яшчэ пяць вёрстаў. Рэчку Крапіўну загацілі целы забітых. Пасля заходу сонца сеча аціхла, хоць некаторыя нашы конныя аддзелы пераследавалі непрыяцеля яшчэ восем літоўскіх міляў, гэта значыць шэсцьдзесят кіламетраў, і вярнуліся з тысячамі палонных.

Залаты медаль з выявай гетмана Канстанціна Астрожскага. Дзяржаўны Эрмітаж у Санкт-Пецярбургу. Аверс. XVI ст.

Нашы продкі адстаялі пад Воршай суверэнітэт дзяржавы. Трыумф Астрожскага аддаў ініцыятыву вайны ў рукі Вялікага Княства. Усе захопленыя Масквой гарады, апрача Смаленска, былі вызвалены.

Аршанская перамога трывала ўвайшла як у летапісы, так і ў памяць народа, які склаў пра тыя падзеі песню-баладу:

[illegible]
Места Воршу пакідалі,
А як і Воршы ўцякалі,
Рэчку шалёну праклінаючы:
«Бадай ты, рэчка, сто лет высыхала,
Як наша слава тутака прапала;
[illegible]
Што нашай славонькі ўжо нетту».
Слава Воршы ўжо не згіне.
Сячы, пан Астрожскі!

Штогод у пачатку верасня на вякапомным Крапіўенскім полі адбываецца святкаванне ўгодкаў Аршанскай перамогі.

Еўрапейскі розгалас

Бітва на Крапіўне атрымала шырокі розгалас у свеце. Бліскучую перамогу тры дні святкавалі на Вацлаўскім пляцы ў Празе нашыя браты-чэхі, каралём якіх быў тады Уладзіслаў IV, сын вялікага князя літоўскага Казіміра Ягайлавіча. Пра перамогу ліцвінскага войска паведамілі тагачасныя газеты-ўлёткі, надрукаваныя ў Ляйпцыгу, Нюрнбэргу, Рыме ды іншых еўрапейскіх гарадах. Ужо ў пераможным 1514 годзе ў Кракаве выйшаў паэтычны зборнік з творамі ў гонар трыумфу ліцвінскай зброі. Кніга падобнага зместу – «Вершы пра вякапомны разгром маскоўцаў» – пабачыла свет у 1515 г. у Рыме.

Пасля перамогі Астрожскага еўрапейскія дзяржавы, і найперш імператар Свяшчэннай Рымскай імперыі Максіміліян, адмовіліся ад таемнага альянсу з маскоўскім князем.

Аднак Масква не пакідала прэтэнзій на беларускія землі. У 1534 г. разгарэлася новая вайна з усходнім суседам. Вайсковая агрэсія аслабляла дзяржаву, але, з іншага боку, спрыяла яе кансалідацыі.

Расійскія гісторыкі часта пішуць пра «спрадвечнае імкненне» праваслаўных беларусаў да аб'яднання з расійскімі братамі па веры. Але перамогу над маскоўскімі захопнікамі ў 1514 г. атрымала войска, дзе пераважную большасць складалі праваслаўныя беларусы-ліцвіны. Гэта было сведчаннем іх дзяржаўнага патрыятызму. Ён яскрава выявіўся і тады, калі з захопленага Смаленска ў Вялікае Княства ўцякло 50 баярскіх і шмат мяшчанскіх праваслаўных родаў. А маскоўскі князь Васіль III успрымаўся нашымі продкамі як «вораг і супастат веры хрысціянскай, праваслаўнае».

Гетмана Астрожскага называлі другім Ганібалам, а яго [illegible] з мужнымі [illegible] Македонскага.

Аршанская бітва стала адной з найбуйнейшых у Еўропе XVI ст., вывучалася ў розных краінах (у тым ліку ў Расіі) як прыклад бліскучага ўжывання палявой артылерыі супраць значна большай сілы праціўніка.

[illegible]

БЕЛАРУСКІ НАРОД. МЫ – ЛІЦЬВІНЫ

Этнічнай асновай беларусаў сталіся тры праваплямёны – крывічы, дрыгавічы і радзімічы, у мове і звычаях якіх перапляліся славянскія і балцкія прыкметы.

Вывучэнне полацкіх і смаленскіх граматаў ды іншых помнікаў пісьменства прывяло вучоных да высновы, што ўжо ў XIII ст. існавалі аканне, дзеканне, цвёрдае «р» – рысы, уласцівыя беларускай мове.

[illegible]

[illegible]

Русь, русіны, ліцьвіны

Пасля ўтварэння Вялікага Княства Літоўскага нашыя продкі нейкі час яшчэ прытрымлівалі традыцыйна называць сябе па найменні колішніх дзяржаваў-земляў – «палачане», «віцябляне», «случане». Аднак у свядомасці і ў пісьмовых крыніцах пачалі сцвярджацца новыя назовы, якія адлюстроўвалі жыццё ў агульнай дзяржаве.

Доўгі час існавалі дзве асноўныя формы самаазначэння нашых продкаў: «Русь» («русіны») і «Літва» («ліцьвіны»). Жыхары Палесся і Падняпроўя часцей былі вядомыя як русіны, «рускія». (Як «Рускі» згадваецца часцяком палачанамі ў Рызе тагачасны двор.) Насельніцтва заходніх абшараў Княства называлася «ліцьвінамі», а часам і «літоўцамі».

Найменні «русін» і «ліцьвін» не заўсёды адпавядалі і падзелу паводле веравызнання, бо і ў XVI ст. большасць насельніцтва беларускіх земляў складалі праваслаўныя. У тагачасных дзяржаўных і прыватных дакументах шмат разоў сустракаюцца такія азначэнні, як «рускія рымскае веры» або «ліцьвіны грэцкага закону», «ліцьвіны рускага роду». Францішак Скарына ў залежнасці ад месцазнаходжання называў сябе то палачанінам, то русінам, то ліцьвінам.

Паступова назоў «ліцьвіны» пашырыўся на ўсіх жыхароў-славянаў Вялікага Княства Літоўскага незалежна ад іх паходжання і рэлігіі. У гэтым продкі выяўлялі адчуванне свайго адзінства і дзяржаўны патрыятызм. Найменне «ліцьвін» больш за стагоддзе захоўвалася і пасля захопу Вялікага Княства Расейскай імперыяй.

[illegible]

[illegible]

[illegible]

«Нарадзіўся я ліцьвінам», – пісаў наш славуты сучасны пісьменнік Тадэвуш Касцюшка. Ліцьвінамі лічылі сябе беларус па бацьку Адам Міцкевіч і першы прафесійны беларускі пісьменнік новага часу Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч.

Дзясяткі тысяч беларусаў маюць сёння прозвішчы з коранем 'літв' ('ліцьв'): Літвін (Ліцьвін), Літвіновіч (Ліцьвіновіч), Літвінка (Ліцьвінка), Літвіненка (Ліцьвіненка), Літвінена (Ліцьвінена), Літвінёнак (Ліцьвінёнак), Літвінаў (Ліцьвінаў), Літвінчык (Ліцьвінчык), Літвінок (Ліцьвінок), Літвінчук (Ліцьвінчук), Літвінскі (Ліцьвінскі), Літоўчанка, Ліцьвінец... На беларускім Палессі шмат дзе жыхары шмат якіх вёсак называюць сябе ліцьвінамі. Вядомыя выпадкі, калі пад час перапісу насельніцтва Рэспублікі Беларусь ужо пры канцы XX ст. некаторыя нашы сучаснікі ў афіцыйных дакументах пазначалі сваю нацыянальнасць як ліцьвін.

[illegible]

Жыхароў Літвы-Беларусі ўсходнія суседзі заўсёды ўспрымалі як іншаземцаў. Праваслаўных «літоўскіх» шляхту не пускалі ў цэрквы, а палонных хрысціянаў усходняга абраду прымушалі браць «сапраўднае» хрышчэнне.

У сваю чаргу ліцьвіны ніколі не ўжывалі свае даўнія найменні «русь» і «русіны» ў дачыненні да жыхароў Масквы, якія былі для нашых продкаў «масквітамі», «маскоўцамі», а пазней «маскалямі». Гуманіст XVI ст. Сымон Будны пісаў пра славянскія народы так: «Русіны, маскавіты, сербы ды іншыя славяне».

[illegible]

Герб Жамойці з кнігі Бартламея Папроцкага «Гнездо цноты», 1578 г.

Летувіскія гісторыкі сцвярджаюць, што вялікія князі літоўскія мелі балцкае паходжанне. Між тым ні ў якіх сярэднявечных дакументах нельга знайсці ні «Вітаўтаса», ні «Альгірдаса». І самі гаспадары нашай дзяржавы ніколі так свае імёны не пісалі. Апошнім часам, дарэчы, высветлілі, што імя нашага першага вялікага князя, а затым караля Міндаўга, як і імёны яго сыноў, мае славянскае паходжанне.

Жамойты

Жамойты – ядро будучага летувіскага этнасу – канчаткова апынуліся ў складзе Вялікага Княства Літоўскага толькі праз дваццаць гадоў пасля Грунвальдскай бітвы, у 1422 г. Каб падкрэсліць сваю адрознасць ад русінаў і ліцвінаў, яны папрасілі ў князя Вітаўта аўтаномных правоў і асобнага дадатку да наймення дзяржавы, якая пачала называцца Вялікім Княствам Літоўскім, Рускім і Жамойцкім. Гэтая дыстанцыя захоўвалася і значна пазней. Навет у XVI ст. у рэестры дзяржаўнага войска нешматлікія жамойцкія харугвы пералічваліся асобна.

Жамойты неаднаразова звярталіся ў Сойм Вялікага Княства з просьбамі не прызначаць да іх на адміністрацыйныя пасады «чужынцаў»–ліцвінаў. Аналагічныя звароты накіроўваліся вялікаму князю, якога жыхары Жамойці прызнавалі гаспадаром, але «сваім» не лічылі. Непрыхільнае стаўленне жамойтаў да дзяржаўных службоўцаў адлюстравалася ў старадаўнім заклёне: «Perkune, dievaiti, nemuik žemaiti, muik gudą, kaip šunį rudą» –«Пяруне, божа, не бі жамойта, а бі гуда, як сабаку рудога». (Гудамі летувісы здаўён называюць ліцвінаў-беларусаў.)

Не вытрымліваюць ніякай крытыкі спробы абвясціць гаспадара Вітаўта жамойтам. Ён ніколі не ставіўся да Жамойці як да роднай зямлі, а, наадварот, выкарыстоўваў яе ў шматлікіх палітычных камбінацыях, у тым ліку праз аддачу тэўтонцам.

«Руская» мова

У Вялікім Княстве стара-беларуская мова, якая была дзяржаўнай, звычайна афіцыйна звалася «рускай». Таму Біблія Ф. Скарыны і мае назву «Руская».

«Па-руску», «рускімі літарамі» патрабавала ад службоўцаў складаць дакументы наша тагачаснае заканадаўства.

У Маскве мова нашых продкаў лічылася «літоўскай», і не так слаба разумелі, патрабуючы ў пасольстве або купцоў перакладчыка.

Літвінамі мову суседняй дзяржавы называлі «маскоўскай».

«Літоўскай» беларускую мову нярэдка называлі і заходнееўрапейскія падарожнікі. Да прыкладу, у першай палове XVI ст. аўстрыйскі дыпламат Сігізмунд Герберштэйн пісаў, што па-літоўску бізон будзе зубр (Suber). Тым часам летувісы завуць гэтага звера stumbras.

Адныя былі выпадкі, калі і самі жыхары Княства, як, напрыклад, асветнік Лаўрын Зізаній, называлі нашую мову «літоўскай» або «літоўска-рускай». Адам Міцкевіч, які ў 40-х гадах XIX ст. чытаў у Парыжскім універсітэце лекцыі пра славянскія літаратуры, казаў: «На беларускай мове, якую называюць русінскай або літоўска-русінскай, гавораць каля дзесяці мільёнаў чалавек; гэта самая багатая і самая чыстая гаворка, яна ўзнікла даўно і выдатна распрацавана. У перыяд незалежнасці Літвы вялікія князі карысталіся ёю для сваёй дыпламатычнай перапіскі».

Цяпер гістарычны назоў «руская мова» таксама прыкметызаваны ўсходнімі суседзямі, што служыць асновай для вялікадзяржаўных спекуляцый. Да прыкладу, некаторыя расейскія аўтары характарызуюць дзяржаўную мову Вялікага Княства Літоўскага як «русскую» (у сучасным разуменні), а Ф. Скарыну называюць «русским печатником и просветителем».

Беларусь, беларусы

Назоў «Белая Русь», «Беларусь» не ёсць для нашай краіны старажытным. У XIII–XV стст. такое найменне за ўсходніх славянаў практычна не згадвалася. Ім доўгі карысталіся толькі заходнееўрапейскія храністы і картографы, у якіх «Russia Alba» (што на лаціне значыць «Белая Русь») знаходзілася то ў раёне Вялікага Ноўгарада, то каля Белага мора, то на Доне. Пасля заваёвы Ноўгарадскай рэспублікі гэты назоў перайшоў на саму Маскоўскую дзяржаву. На адной з картаў таго часу так і напісана: «Белая Русь Масковія». Толькі на пачатку XVII ст. найменне «Белая Русь» больш-менш трывала замацавалася за ўсходнімі абшарамі Вялікага Княства Літоўскага – Полацкім, Віцебскім, Смаленскім і Амсціслаўскім ваяводствамі.

У XIX ст., нават праз сто гадоў пасля інкарпарацыі Вялікага Княства Літоўскага ў склад Расейскай імперыі, нашыя заходнія землі па-ранейшаму называліся Літвой. «Радзіма Літва!» – звяртаўся да роднай Наваградчыны Адам Міцкевіч. Літвой называў Бацькаўскую зямлю Кастусь Каліноўскі.

Тое, што Літва – спрадвечна славянскі край, добра разумелі і ў Расеі. «Литва ли, Русь ли, что гудок, что гусли, всё нам равно, было бы вино», – засведчыў Аляксандр Пушкін у трагедыі «Барыс Гадуноў». У вершы «Клеветникам России» ён жа назваў вызвольнае антырасейскае паўстанне 1831 г. «волнением Литвы», «спором славян между собою».

Найменні «Беларусь» і «беларусы» значна больш адпавядалі інтарэсам імперыі, бо дазвалялі трактаваць наш край як частку Русі – Расеі, а нашых жыхароў – як разнавіднасць расейцаў. Царскія ўлады сур'ёзна распаўсюджвалі гэтых назоваў. Тым не менш як азначэнне ўсёй тэрыторыі і ўсяго насельніцтва краю яны пашырыліся вельмі позна – на мяжы XIX і XX стст.

Мы – беларусы, але мы – і літвіны, спадкаемцы гісторыі і культуры магутнай еўрапейскай дзяржавы – Вялікага Княства Літоўскага.

Найменні «Белая Русь» і «беларусы» Масква выкарыстоўвала ў сваіх захопніцкіх мэтах. Цары і іерархі расейскага праваслаўя сцвярджалі, што гэтыя землі неабходна злучыць з «усёй Руссю».

Калі палітычныя ... і ... з «рук у рук» ... «...», некаторыя дзеячы руху за нацыянальнае адраджэнне ... назоў таму ... Вацлаў Ластоўскі прапанаваў назву «Крывія». ... «Літва», а пазней «Вялікалітва». ... беларусаў ... а беларускую мову – вялікалітоўскай. Але сталася так, што замацавалася назва «беларусы» ...

ЛІТВА-БЕЛАРУСЬ – УСХОДНІ РУБЕЖ РЭНЕСАНСУ

Эпоха Рэнесансу (XIV – першая палова XVII ст.) у еўрапейскай гісторыі была пераходным перыядам ад Сярэднявечча да Новага часу. Яна характарызавалася ўздымам навукі і мастацтва, станаўленнем нацыянальных моў, літаратуры і самасвядомасці, гуманістычным светапоглядам.

Карта Паўночнай і Усходняй Еўропы з кнігі С. Мюнстэра «Касмаграфія». 1550 г.

XVI – пачатак XVII ст. сталіся часам найвышэйшага ўздыму беларускай культуры. Яго абумовілі багатая культурная спадчына папярэдніх стагоддзяў, эвалюцыйны ўздым краіны і магутны ўплыў агульнаеўрапейскага Адраджэння, або Рэнесансу.

Нашыя продкі жылі ў талерантнай дзяржаве, шырока адкрытай для кантактаў з астатнім светам. Пранікненню заходняй культуры спрыялі беспасярэдныя сувязі з рымска-каталіцкай царквой. Прывілей вялікага князя Казіміра Ягайлавіча 1447 г. даў шляхце заканадаўча замацаванае права вольнага выезду ў кожную (апрача непрыяцельскай) краіну «дзеля лепшага шчасця набыцця або ўчынкаў рыцарскіх». У заходні «лацінскі» свет накіроўваліся і каталікі, што ў Вялікім Княстве па-ранейшаму былі ў меншасці, і ліцвіны-праваслаўныя.

Падарожжамі па Еўропе выславіўся пан Аляксандр Солтан праваслаўнага веравызнання, які ў 1467–1469 гг. аб'ездзіў двары самых вядомых манархаў і здзейсніў паломніцтва ў Святую зямлю. Шмат вандраваў, жыў у Лейпцыгу і Альтдорфе шляхціч Полацкага ваяводства Саламон Рысінскі, вядомы паэт XVI ст. Ён сабраў надзвычай каштоўную тысячатомовую бібліятэку. З антычнымі творамі Гамэра і Герадота, Тацыта, Авідзія, Ювенала ў ёй суседнілі кнігі Томаса Мора, Ульрыха фон Гутэна, Яна Кахановускага ды іншых выдатных гуманістаў.

Юнакі-ліцвіны яшчэ з сярэдзіны XIV ст. вучыліся ва ўніверсітэтах Прагі і Кракава. Сярод іх былі арыстакраты, аднак пераважную большасць складалі дзеці мяшчанаў і шляхты. Традыцыйнымі для тых, хто імкнуўся атрымаць дзяржаўную пасаду, рабіліся як універсітэцкае навучанне, так і служба пры адным з еўрапейскіх двароў. У сваіх мемуарах навагрудскі падсудак Хведар Еўлашоўскі, напрыклад, з гонарам адзначыў, што ягоныя сыны служылі ў італьянскіх князёў Гонзага ў Мантуі.

Дзясяткі мастакоў, музыкаў, настаўнікаў ды іншых адукаваных асобаў, якія натхняліся ідэямі Рэнесансу, прыбылі ў нашую дзяржаву з Італіі разам з герцагіняй Боннай Сфорца, што стала жонкаю вялікага князя Жыгімонта Старога.

Беларускі вучоны першай паловы XVII ст. Іван Ужэвіч, выконваючы, як мяркуюць даследчыкі, замову кардынала Рышэлье, напісаў для Французскай акадэміі славянскую граматыку. Рукапіс гэтага каштоўнага помніка тагачаснай беларускай філалогіі захоўваецца цяпер у Нацыянальнай бібліятэцы ў Парыжы.

Ідэі Рэнесансу знаходзілі сваіх прыхільнікаў у беларускіх брацтвах – рэлігійна-дабрачынных і культурных аб'яднаннях гарадскога насельніцтва, што ўтвараліся пры праваслаўных (а пазней і пры уніяцкіх) царквах і манастырах, а таксама пры каталіцкіх парафіях. Брацтвы істотна ўплывалі на пашырэнне асветы і кнігадрукавання, развіццё літаратуры і музыкі, іканапісу і дойлідства.

Адукаваныя пласты грамадства нашай дзяржавы дзякуючы перакладам чыталі на тагачаснай беларускай мове не толькі тэксты Святога Пісьма і папулярныя ў Еўропе духоўныя аповесці, але і свецкія творы – прысвечаную Аляксандру Македонскаму «Александрыю», «Аповесць пра Трышчана і Ізоту», «Сказание про Сівілу Прарочыцу», гістарычную «Аповесць пра Траянскую вайну». Героі «Александрыі» згадваюцца ў беларускіх летапісах і хроніках, а бітва Аляксандра Македонскага з індыйскім царом Порам нават увайшла ў рэпертуар нашага старажытнага лялечнага тэатра – батлейкі.

Эпоха Рэнесансу змяніла ўсе сферы жыцця краіны, найбольш выразна выявіўшыся ў адукацыі і кнігадрукаванні, літаратуры і мастацтве. Але гэтыя змены не азначалі адмаўлення продкаў ад ранейшых культурных дасягненняў, што ўзбагачаліся і напаўняліся новым гуманістычным зместам.

З Рэнесансам у нашай дзяржаве, як і ў іншых еўрапейскіх краінах, цесна перапляталіся гуманізм і рэлігійны рух Рэфармацыі.

Знаходзячыся на скрыжаванні ўсходніх і заходніх культурных уплываў, Вялікае Княства Літоўскае было ўсходнім аванпостам Рэнесансу і годна папоўніла яго агульную скарбніцу сваімі шэдэўрамі. З другога боку, Княству выпала быць своеасаблівым культурным мостам паміж Еўропай і Расеяй. На вялікі жаль, наша ўсходняя суседка засталася па-за межамі еўрапейскага Адраджэння. Жыхары Вялікага Княства мелі нязмерна большыя магчымасці атрымаць адукацыю, непараўнана болей правоў і духоўнай свабоды.

Алегорыя. Гравюра XVII ст.

АДУКАЦЫЯ. БЕЛАРУСКІЯ СТУДЭНТЫ Ў ЕЎРОПЕ

Школы і калегіюмы

Вялікае Княства Літоўскае мела разгалінаваную сістэму адукацыі, у якую ўваходзілі навучальныя ўстановы розных рэгіяў. Гістарычныя крыніцы паведамляюць пра гарадскія школы пры царквах і касцёлах, праваслаўных брацтвах і пратэстанцкіх зборах. Вядома пра існаванне школаў пры каталіцкіх храмах у Гародні, Полацку, Менску, Віцебску, Міры, Нясвіжы, Гайне, Мастах, Паланцы, Трабах, Заслаўі, Лідзе, Слоніме. Шчучыне ды іншых гарадах і мястэчках.

Полацкі [illegible] манастыр [illegible]. Сучаснае фота

Засвоіўшы пачатковыя веды, вучні [illegible] «сямі вызвольных мастацтваў», якія падзяляліся на «трывіум» (граматыка, рыторыка, дыялектыка) і «квадрывіум» (арыфметыка, геаметрыя, астраномія і музыка). [illegible]

[illegible] Кракаўскага ўніверсітэта [illegible] XVII–XVIII ст.

ХРАНАЛОГІЯ

1348 г. — Заснаванне Карлавага ўніверсітэта ў Празе

1364 г. — Заснаванне Кракаўскага ўніверсітэта

[illegible]

[illegible]

[illegible]

[illegible] 2007 г.

Славілася сваімі выкладчыкамі брацкая школа Полацкага праваслаўнага Богаяўленскага манастыра, дзе пачынаў шлях у навуку Сімяон Полацкі. Навучальныя ўстановы дзейнічалі таксама ў Вільні, Магілеве, Берасці, Менску, Слуцку.

Выданая ў Амстэрдаме карта Еўропы. [illegible]

[illegible]

[illegible]

Найбольшую актыўнасць у пашырэнні асветы выяўляла Таварыства Ісуса, як афіцыйна называўся Ордэн езуітаў. Беларусь была пакрытая шчыльнай сеткаю іх школаў і калегіюмаў. Раней за іншыя былі заснаваныя калегіюмы ў Вільні (1570 г.), Полацку (1581 г.), Гародні (1584 г.) і Нясвіжы (1586 г.).

У XVII ст. такія ўстановы дзейнічалі ў Амсціславе, Берасці, Віцебску, Воршы, Драгічыне-Набужскім, Магілеве, Менску, Навагрудку, Пінску, Смаленску, Хвойніках (Хойніках). У калегіюмы прымалі дзяцей з розных станаў і неабавязкова каталіцкага веравызнання. Навучанне было бясплатнае і доўжылася шэсць-сем гадоў. За гэты час школяры атрымлівалі класічную гуманітарную адукацыю, авалодвалі лацінскай і грэцкай мовамі. Калегіюмы вышэйшага тыпу мелі яшчэ трохгадовы курс філасофіі і чатырохгадовы – тэалогіі.

У сваёй педагагічнай практыцы выкладчыкі ўжывалі прагрэсіўныя метады і прынцыпы: засяроджвання на адной праблеме, індывідуальнага падыходу, паступовага ўскладнення заданняў, заглыблення ў моўную стыхію. Некаторыя з вынаходак тагачасных педагогаў увайшлі ў арсенал іх сённяшніх калегаў. Прынцып заглыблення, калі на ўроках лацінскай дазвалялася размаўляць толькі на гэтай мове, цяпер часта выкарыстоўваецца на курсах паскоранага вывучэння замежных моваў.

[illegible]

Мовамі навучання да сярэдзіны XVII ст. як у езуіцкіх, так і ў іншых навучальных установах былі беларуская і лацінская. Па меры паланізацыі шляхты адбываўся пераход на польскую.

[illegible]

[illegible]

[illegible]

[illegible]

Ліцьвіны ў заходніх універсітэтах

Юнакі з беларускіх земляў пракладалі шлях на асвету ў навучальныя ўстановы Еўропы яшчэ ў XIV ст. Дзясяткі нашых суайчыннікаў здабывалі веды ў Карлавым універсітэце ў Празе, заснаваным у 1348 г. Метрычныя кнігі гэтай альма-матэр толькі за XV – першую палову XVI ст. захавалі імёны 33 студэнтаў з Вялікага Княства Літоўскага. Некаторыя гісторыкі лічаць, што сярод іх быў адзін з папярэднікаў Скарыны Ян (Іван) Ліцьвін, што ў 1480 г. адчыніў першую друкарню ў Лондане.

Ад 1364 г. адлічвае сваю гісторыю Кракаўскі ўніверсітэт, які пасля праведзеных Ягайлам рэформаў стаў навучальнай установай як Польшчы, так і Вялікага Княства. Для «ліцьвіноў і русінаў» у Кракаве дзейнічала адмысловая студэнцкая бурса. На працягу XV–XVI стст. там вучылася каля 500 выхадцаў з нашых земляў, прычым прыкладна палова выпускнікоў атрымала навуковую ступень бакалаўра. Пры канцы XV ст. магістр Ян з Полацка чытаў у Кракаўскім універсітэце курс лекцый «Лісты Цыцэрона», а яго калега Ян з Мастоў выкладаў «Этыку» і «Метафізіку» Арыстоцеля. Адначасова з Францішкам Скарынам у гэтай альма-матэр авалодвалі навукамі Ян і Павел з Гародні, Станіслаў з Клецка, Вінцэсь з Слуцка, Мікола з Ашмяны, Марка з Нямігі. Сярод студэнтаў былі не толькі дзеці мяшчанаў і шляхты, але і сялянаў.

Пазней, у сувязі з пашырэннем рэфармацыйных ідэй, колькасць ліцьвіноў, што вучыліся ў даўняй польскай сталіцы, пачала скарачацца. Большую папулярнасць набыло навучанне ў пратэстанцкіх краінах. Арыстакратыя шчодра пасылала сыноў у старажытныя прэстыжныя ўніверсітэты. Перавага аддавалася Італіі, асабліва Балонні і Падуі, што былі цэнтрамі рэнесансавай думкі. Ліцьвіны штурмавалі навукі ў Вітэнбергу, Франкфурце, Каралеўцы (Кёнігсбергу). У Лейпцыгскім універсітэце вучыўся будучы вялікі канцлер Леў Сапега, у Страсбургскім і Цюбінгенскім – вялікі маршалак, мецэнат і пісьменнік Мікалай Радзівіл Сіротка.

[illegible]

[illegible]

[illegible]

ВІЛЕНСКАЯ АКАДЭМІЯ

Пячаткі Віленскага манастыра і Віленскай акадэміі, а таксама жазло рэктара. З Музея старажытнасцей у гмаху Вялікага Княства. Літаграфія другой паловы XIX ст.

Магчымасць атрымліваць вышэйшую адукацыю на радзіме ў ліцвінскай моладзі з'явілася пасля адкрыцця Віленскай акадэміі. У 1579 г. калегіум, які дзейнічаў у сталіцы дзяржавы, прывілеем вялікага князя Стэфана Батуры быў ператвораны ў першую ва Усходняй Еўропе акадэмію з усімі правамі ўніверсітэта. Новая навучальная ўстанова, такім чынам, вызвалялася ад падаткаў і набывала права прысвойваць вучоныя ступені, мець уласнае выбарнае кіраўніцтва і сваю юрысдыкцыю.

Прывілей Стэфана Батуры аб стварэнні Віленскай акадэміі.

Да заснавання акадэміі прычынілася Таварыства Ісуса, якое стварыла самую перадавую для таго часу сістэму адукацыі.

Першым рэктарам акадэміі стаў Пётра Скарга – знакаміты прапаведнік, пісьменнік і красамоўца, які нарадзіўся ў Польшчы, але добра валодаў беларускай мовай і напісаў на ёй шэраг твораў.

Вялікі князь і кароль Стэфан Батура абвяшчае пра заснаванне Віленскай акадэміі. Мастак Вінцэнт Смакоўскі. Сярэдзіна XIX ст.

Першы рэктар акадэміі Пётр Скарга. Невядомы мастак XVII ст.

ХРАНАЛОГІЯ

1579 г. – Віленскі калегіюм ператвораны ў акадэмію.

1586 г. – Адкрыццё акадэмічнай друкарні.

1753 г. – Стварэнне астранамічнай абсерваторыі.

1781 г. – Акадэмія ператворана ў Галоўную школу Вялікага Княства Літоўскага.

Выкладанне ва ўніверсітэце. Гравюра XVI ст.

Астранамічная абсерваторыя Віленскай акадэміі. Акварэль Станіслава Вогушэвіча. Пачатак XIX ст.

Вялікі двор Віленскай акадэміі. Мастак Францішак Смуглевіч. 1786 г.

Мемарыяльная дошка ў гонар Стэфана Батуры ў Віленскім універсітэце

Герб Віленскага ўніверсітэта

Сучасны выгляд Віленскага ўніверсітэта. Фота Дзяніса Рамашэвіча. 2008 г.

Напачатку віленская альма-матэр мела тэалагічны і філасофскі факультэты, а з 1641 г. – і юрыдычны. Студэнтамі, як і выкладчыкамі, былі пераважна выхадцы з беларускіх земляў. У 1632 г. у акадэміі навучаліся каля 1200 юнакоў.

У розны час тут чыталі лекцыі Пётра Скарга; славуты паэт, філосаф і тэарэтык літаратуры XVII ст. Мацей Казімір Сарбеўскі; яго сучаснік, вядомы ў Еўропе знаўца рыторыкі Жыгімонт Лаўксмін; правазнавец Арон Алізароўскі; гісторык Альберт Каяловіч; паэт Міхал Карыцкі; астраном і асветнік Марцін Пачобут-Адляніцкі ды шмат якія іншыя знакамітыя вучоныя, педагогі, дзеячы мастацтва. Многія з іх, у тым ліку М. Сарбеўскі, А. Каяловіч і А. Алізароўскі, самі былі выхаванцамі акадэміі. Сярод найбольш знаных яе выпускнікоў пісьменнік і філолаг Мялет Сматрыцкі; педагог, пісьменнік і асветнік Сімяон Полацкі; філосаф Марцін Смігліцкі; архітэктар Лаўрын Гуцэвіч.

[illegible] XVII ст. Мацей Казімір Сарбеўскі. [illegible] XVIII ст.

У Віленскай акадэміі вучыліся дзеці беларускай шляхты і магнатаў Радзівілаў, Сапегаў, Хадкевічаў, Валовічаў, Пацаў, Тышкевічаў, Пузынаў, Завішаў ды іншых. Арыстакратыя падтрымлівала акадэмію шчодрымі ахвяраваннямі. Сын Льва Сапегі – Казімір Леў падараваў багатую бібліятэку і стаў фундатарам юрыдычнага факультэта. На сродкі амсціслаўскай кашталянкі Лізаветы Пузыны тут была заснавана адна з першых у Еўропе навуковых астранамічных абсерваторый. Князь Мікалай Радзівіл Сіротка перадаў акадэміі друкарскае абсталяванне і шрыфты.

У першай палове XVII ст. вядомасцю навучэнцаў Віленскай акадэміі не саступала суседнім універсітэтам у Каралеўцы і Кракаве або у Лейпцыгу. Паводле звестак акадэмічнага архіва, за час свайго існавання наша альма-матэр падала вучоныя ступені 4076 сваім выпускнікам.

Адкрытая ў 1586 г. акадэмічная друкарня выдавала на некалькіх еўрапейскіх мовах падручнікі, слоўнікі, тэалагічную, філасофскую, юрыдычную літаратуру, гістарычныя даследаванні, мастацкія творы. Тут, у прыватнасці, убачылі свет трактаты Арыстоцеля і Пётры Скаргі, некалькі выданняў «Гісторыі Вялікага Княства Літоўскага», «Гісторыя Англіі», «Радзівілаўскія хронікі з кароткім зместам подзвігаў роду князёў Радзівілаў». З друкарняй супрацоўнічалі славутыя беларускія гравёры Тамаш Макоўскі, Аляксандр і Лявон Тарасевічы.

У 1781 г. акадэмія была пераўтвораная ў Галоўную школу Вялікага Княства Літоўскага, а пазней – у Віленскі ўніверсітэт.

ЛІТАРАТУРА ЭПОХІ РЭНЕСАНСУ

Галоўнай тэмай паэмы Яна Вісліцкага «Пруская вайна» [illegible] Грунвальдам. Юбілейнае выданне [illegible] «Песня пра Грунвальд» 1910 г.

Адным з першых здабыў славу на радзіме і ў Еўропе паэт-лацініст Ян Вісліцкі. Галоўнай тэмай яго выдадзенай у 1516 г. паэмы «Пруская вайна» была Грунвальдская перамога над Тэўтонскім ордэнам. Вісліцкі добра разумеў яе эпахальнае значэнне для лёсу краіны. У паэме ўслаўляліся гераічнае мінулае Вялікага Княства, гаспадар Вітаўт, нашы воіны, «славутыя сваёй мужнасцю на вайне». Паэт з гонарам згадваў іншыя бліскучыя перамогі нашай зброі – над татарамі пад Клецкам і над маскоўцамі пад Воршай.

Еўрапейскіх вышынь у эпоху Рэнесансу дасягнула беларуская літаратура і найперш паэзія, якая тады стваралася пераважна на лаціне – міжнароднай мове літаратурнай творчасці і навукі.

«Пруская вайна» Яна Вісліцкага запачаткавала ў беларускай літаратуры жанр гістарычнай паэмы.

Тытульны аркуш кнігі Міколы Гусоўскага «Песня пра зубра». Кракаў. 1523 г.

Праз некалькі гадоў пабачыла свет паэма Міколы Гусоўскага «Песня пра аблічча, дзікасць зубра і паляванне на яго», або скарочана «Песня пра зубра». Гэты геніяльны твор, напісаны ў Рыме і выдадзены ў Кракаве, прагучаў як сапраўдны гімн нашай дзяржаве, яго гісторыі і народу. Паэт паказаў Вялікае Княства Літоўскае як бастыён змагання з турэцка-татарскай пагрозай, якая тады навісла над Еўропай, і разам з тым як абаронны заслон ад агрэсіўнай Масковіі.

Тытульны аркуш «Песні пра зубра», перавыдадзенай у 2009 г. на лацінскай мове ў Італіі. Мастак Юрый Якавенка

ХРАНАЛОГІЯ

Каля 1470 г. – пасля 1533 г. – Жыццё і дзейнасць Міколы Гусоўскага.
1480–1520 гг. – Жыццё і дзейнасць Яна Вісліцкага.
1516 г. – Выданне паэмы Я. Вісліцкага «Пруская вайна».
1523 г. – Выхад у свет паэмы М. Гусоўскага «Песня пра зубра».
1547 г. – пасля 1590 г. – Жыццё і дзейнасць Мацея Стрыйкоўскага.
Каля 1560 г. – 1625 г. – Жыццё і дзейнасць Саламона Рысінскага.
1582 г. – Надрукавана «Хроніка польская, літоўская, жамойцкая і ўсёй Русі» М. Стрыйкоўскага.
1595–1640 гг. – Жыццё і дзейнасць Мацея Казіміра Сарбеўскага.
1625 г. – Першае выданне «Лірык» М. Сарбеўскага.

«Паэт». Партрэт Міколы Гусоўскага. Мастак Юрый Якавенка. 2009 г. Афорт, акватынта.

Геніяльнай «Песні пра зубра» Міколы Гусоўскага была наканавана еўрапейская слава.

Ратнікі нашы з Палінаўкі аж па Граніцы
Маюць адбыту ў лясах – паляванне на звера.
Мабыць, свой зменай і Марс перакуў у [illegible]
І ў адпачынках мячы [illegible] на [illegible]...
Воіны! Знешняя справа – вайна вялікая
Гнеў мой, і слёзы, і боль. Без падтрымкі, бясконца
Воіны ладзём між адзін на адзін за сямейныя
Браты свае хрысціянскія з нашай і ўсходу...

У прысвячэнні вялікай княгіні літоўскай і каралеве польскай Боне Сфорца, з дапамогай якой выйшла згаданая паэтычная кніга, Гусоўскі пісаў: «Дзяржавы абапіраюцца больш на мужнасць духу, чым на сілу цела, пра што сведчаць як грэкі, так і рымляне. Яны былі наймагутнейшыя якраз тады, калі квітнелі навукі і мастацтвы».

Помнік выдатнаму беларускаму паэту эпохі Рэнесансу Міколу Гусоўскаму ў скверы Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Скульптар Уладзімір [illegible]. [illegible] г.

Герб канцлера Льва Сапегі і прысвечаная яму эпіграма Андрэя Рымшы. Старонка Статута Вялікага Княства Літоўскага 1588 г.

У еўрапейскіх краінах чыталі і творы іншых беларускіх пісьменнікаў – «Дэкатэрас» Андрэя Рымшы, «Радзівіліяду» Яна Радвана, «Пасольства да вялікага князя маскоўскага» Гальяша Пельгрымоўскага. А. Рымша складаў паэтычныя творы па-беларуску ды па-польску і стаў заснавальнікам у нашай тагачаснай літаратуры жанру панегірычнай паэзіі. Лацініст Я. Радван, які атрымаў універсітэцкую адукацыю ў Падуі, быў паслядоўнікам Вергілія. На беларускай, лацінскай і польскай мовах пісаў Г. Пельгрымоўскі.

Ян Радван, Андрэй Рымша і згоны сябар і калега Ян Казаковіч, падпісваючы свае творы, звычайна дадавалі да імя і прозвішча патрыятычнае ўдакладненне – Ліцвін.

M. Сарбеўскі. Вільня. 1635 г.

Выпускнік Віленскай акадэміі паэт-лацініст Мацей Казімір Сарбеўскі заслужыў у сучаснікаў найменне «хрысціянскага Гарацыя». Першы з славянаў ён быў увянчаны лаўровым вянком на Капіталійскім пагорку у Рыме, дзе з антычных часоў ушаноўвалі найталенавіцейшых паэтаў.

MATHIAE CASIMIRI SARBIEVII
SOCIETATIS IESV
LYRICORVM
LIBER PRIMVS.
AD
VRBANVM VIII
PONT. OPT. MAX.
ODE I

Тытульны аркуш і першая старонка з кнігі «Лірыка». Антверпен. 1632 г. Ілюстрацыя Пітэра Паўля Рубенса.

Кніга Мацея Казіміра Сарбеўскага «Лірыка» вытрымала пры жыцці аўтара ў розных гарадах Еўропы шэсць выданняў, адно з якіх, антверпенскае, ілюстраваў Пітэр Паўль Рубенс. (Да канца XX ст. агульная колькасць перавыданняў гэтай славутай кнігі дасягнула 60.) «Чалавек – сімвал свету, бо ўтрымлівае ў сабе дасканаласць усяго існага», – пісаў Сарбеўскі. Паэзію ён лічыў сферай духоўнай свабоды, а створаны ёю мастацкі свет – ідэальный рэальнасцю, што існуе побач з светам, які нарадзіла Божая воля.

Паэт і перакладчык Саламон Рысінскі быў першым збіральнікам беларускіх прыказак, прымавак і прыпавесцяў, пісаў выдатныя эпітафіі, пераклаў для Віленскай пратэстанцкай супольнасці псалмы цара Давіда.

Гамерам Вялікага Княства называлі Мацея Стрыйкоўскага. Паляк паводле нараджэння, ён у 16-гадовым веку пераехаў у нашую краіну і стаў яе адданым патрыётам. Вялікую папулярнасць мелі згоныя гістарычныя вершаваныя і празаічныя творы, дзе апавядалася «аб мужнасці, справах рыцарскіх і хатніх слаўнага народа літоўскага, рускага і жамойцкага». Галоўнай працай М. Стрыйкоўскага стала «Хроніка польская, літоўская, жамойцкая і ўсёе Русі» – першая друкаваная гісторыя Вялікага Княства. Цікава, што ў творах Стрыйкоўскага сустракаецца назоў «Белая Русь», але ён выкарыстоўваецца ў дачыненні да Масковіі.

MATTIAS STRICO
VIUS OSOSTEVICIUS

Тытульны аркуш «Хронікі польскай, літоўскай, жамойцкай і ўсёй Русі» Мацея Стрыйкоўскага. Каралявец (Кёнігсберг). 1582 г.

Старонка Баркулабаўскай хронікі, створанай на пачатку XVII ст.

Працягваліся традыцыі летапісання. Найбольш значнымі і цікавымі творамі гэтага жанру былі напісаныя па-беларуску «Хроніка Быхаўца» і «Баркулабаўская хроніка». Іх аўтараў адрозна ад ранейшых летапісцаў усё больш вабіла не толькі гісторыя краіны, але і лёс асобнага чалавека. Побач з хронікамі з'явілася літаратура зусім новага жанру – дыярыушы (дзённікі) і мемуары. Напісаныя жывой мовай, насычаныя дасціпнымі назіраннямі і разважаннямі былі ўспаміны навагрудца Хвёдара Еўлашоўскага і Самуэля Маскевіча, «Лісты» аршанскага старасты Філона Кміты-Чарнабыльскага, «Дыярыюш» праваслаўнага манаха Афанаса Філіповіча.

Каля 20 выданняў у перакладах на розныя еўрапейскія мовы вытрымала кніга «Перэгрынацыя». Яе аўтар Мікалай Крыштоф Радзівіл Сіротка апісаў сваё падарожжа ў Святую зямлю, пад час якога ён наведаў таксама Крыт, Кіпр, Сірыю і Егіпет.

Папулярная ў Еўропе XVI ст. кніга Бальдасара Кастыльёнэ «Прыдворны» ў Вялікім Княстве Літоўскім выйшла ў вольным перакладзе Лукаша Гурніцкага. 1566 г.

[illegible] кнігі Мікалая Крыштофа Радзівіла «Перэгрынацыя» [illegible] у Святую зямлю [illegible]

«Касмаграфія» С. Мюнстэра [illegible] Вялікага Княства [illegible] 1552 г.

[illegible] «Гіпікі» Крыштофа Мікалая Дарагастайскага. 1647 г.

[illegible] Вялікага Княства [illegible] Крыштофа Мікалая Дарагастайскага [illegible] «Гіпіка, або Кніга пра коней» [illegible] 1603 г.

Творы многіх пісьменнікаў XVI – пачатку XVII ст. сталі неадʼемнай часткай еўрапейскай літаратуры эпохі Рэнесансу.

Унікальным літаратурным помнікам той эпохі, калі часам папросту было правесці мяжу паміж мастацкім творам і навуковым трактатам, ёсць праца Крыштофа Мікалая Дарагастайскага «Гіпіка, або Кніга пра коней». Упершыню надрукаваная ў 1603 г. у Кракаве, яна цягам XVII–XVIII стст. выходзіла яшчэ сем разоў. Гэта была першая ў Еўропе і свеце энцыклапедыя, прысвечаная коням.

[illegible] XVII ст. Міхалона Літвіна «Аб норавах татараў, літоўцаў і масквіцянаў». Базель. 1615 г.

Гуманіст і мысляр Міхалон Літвін, які быў паслом Вялікага Княства да крымскага хана, блізу 1550 г. стварыў на лацінскай мове трактат «Пра норавы татараў, літвінаў і маскоўцаў». Ён разважаў над тым, як пераадолець «саслабанасць нораваў» і зрабіць грамадства больш справядлівым. Падзяляючы ідэі тагачасных еўрапейскіх утапістаў, М. Літвін марыў пра свет без маёмаснай няроўнасці, раскошы і марнатраўства.

Герб [illegible] у кнізе Мялеція Смятрыцкага «Трэнас». 1610 г.

Вялікае пашырэнне ў нашай дзяржаве атрымала публіцыстычная літаратура ў выглядзе трактатаў, прамоваў і пасланняў, якія ствараліся пераважна па-беларуску. Выдатнымі майстрамі гэтага жанру былі Францішак Скарына, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі, Андрэй Волан, Леў Сапега, Мялет Смятрыцкі, Іпат Пацей.

Наша пісьмовая мова ў гэты час вызвалялася ад даўнейшых рысаў царкоўна-славянскай. Пачалі ўсё часцей з'яўляцца беларускія тэксты лацінкаю (лацінскім алфавітам). У такім выглядзе, да прыкладу, дайшоў да нас адзіны вядомы спіс «Хронікі Быхаўца». Лацінкаю напісаны і такі помнік нашай літаратуры XVII ст., як «Ліст да Абуховіча». Вялікая колькасць беларускіх тэкстаў лацінкаю захоўваецца ў Шведскім дзяржаўным архіве. Сярод іх – 150-старонкавы дыпламатычны дыярыюш з апісаннем перамоваў з маскавітамі.

АРХІТЭКТУРА І МАСТАЦТВА

Помнік архітэктару Яну Марыя Бернардоні ў Нясвіжскім парку. Скульптар Сяргей Гумілеўскі. 1993 г.

Царква ў вёсцы Мураванка Шчучынскага раёна – адзін з яскравых узораў беларускага абарончага дойлідства. Пачатак XVI ст. Сучаснае фота

Касцёл Божага Цела, збудаваны ў Нясвіжы Янам Марыя Бернардоні па ўзоры рымскага храма Эль Джэзу, стаў самым раннім помнікам архітэктуры барока ў Літве-Беларусі. Фота Анатоля Клешчука. 2002 г.

Паступова ў беларускае манументальнае дойлідства пранікаў стыль барока. Самым раннім яго помнікам у Вялікім Княстве Літоўскім стаў збудаваны ў 1586–1593 гг. у Нясвіжы езуіцкі касцёл. Запрошаны Мікалаем Радзівілам Сіроткам з Італіі архітэктар Ян Марыя Бернардоні ў сваёй працы ўзяў за ўзор знакаміты храм Эль Джэзу ў Рыме.

Дойлідства

На эпоху Рэнесансу прыпадае росквіт беларускага храмавага дойлідства. У гарадах, мястэчках, замках і манастырах будаваліся храмы розных тыпаў. Іх адметнымі рысамі былі спалучэнні архітэктурных стыляў готыкі і рэнесансу, абарончыя элементы, багатая аздоба фасадаў і інтэр'ераў. Выдатнымі помнікамі таго часу засталіся на нашай зямлі Сынкавіцкая (Зэльвенскі раён), Мураванкаўская (Шчучынскі раён) і Супрасльская (Беласточчына) цэрквы-фартэцыі, касцёл абарончага тыпу ў вёсцы Камаі (Пастаўскі раён), Чарнаўчыцкі Траецкі касцёл (Берасцейскі раён) і касцёл Дзевы Марыі ў вёсцы Вішнева на Валожыншчыне. Рэнесанснымі формамі вызначаліся пратэстанцкія храмы ў Смаргоні, Заслаўі, у вёсцы Дзераўная (Стаўбцоўскі раён), а таксама першыя мураваныя сінагогі ў Берасці і Горадні.

Унікальная царква-фартэцыя ў вёсцы Сынкавічы Зэльвенскага раёна спалучае ў сваім архітэктурным абліччы рысы готыкі і рэнесансу. Канец XV – пачатак XVI ст. Рэканструкцыя Аляксандра Сямёнава. Пачатак XXI ст.

Перліна беларускай архітэктуры царква-фартэцыя ў Супраслі (зараз Польшча). Была пабудавана ў 1503–1511 гг. на фундацыю маршалка Вялікага Княства А. Хадкевіча і мітрапаліта кіеўскага І. Солтана. Знішчана ў 1944 г. і адбудавана ў 1999 г. Фота Зьмітра Герасімовіча. 2005 г.

[illegible]

[illegible]

[illegible]

[illegible]

Спалучэнне заходнееўрапейскіх уплываў з мясцовымі архітэктурнымі традыцыямі дало Беларусі велічныя палацава-замкавыя комплексы ў Міры, Геранёнах, Смалянах, Нясвіжы, Гальшанах. Новае, адпаведнае часу аблічча набывалі нашыя гарады. Трапіўшы ў тагачаснае беларускае места, падарожнік з Заходняй Еўропы знаходзіў вялікае падабенства з тым, што бачыў на радзіме. Спачатку ў Слуцку, Нясвіжы, Быхаве, а потым і ў іншых гарадах адбываўся пераход ад сярэднявечнай радыяльна-кальцавай планіроўкі да рэгулярнай забудовы з кварталамі і архітэктурным ансамблем цэнтральнага пляца. Паўсюль узводзіліся мураваныя ратушы, палацы, шпіталі, дамы цэхавых брацтваў.

[illegible]

[illegible]

[illegible]

[illegible]

[illegible]

Маці Божая з святымі Кацярынай і Даротай. Скульптурны алтар-трыпціх [illegible]

Святая сям'я з Францішкам. Абраз XVII ст. Касцёл [illegible] Дзевы Марыі ў Пінску

Выяўленчае мастацтва

Пад уздзеяннем рэнесансавай культуры новая плынь з'явілася ў беларускім іканапісе. Ствараючы абразы, іх аўтары смела ўводзілі ў біблейныя сюжэты побытавыя і этнаграфічныя дэталі.

У XVI ст. склалася самастойная беларуская іканапісная школа.

Важныя перамены адбыліся ў свецкім жывапісе, дзе галоўнае месца заняў партрэт. У ім адлюстроўвалася рэнесансавая ўвага да асобы чалавека, яго псіхалагічнага стану. Асобны жанр сармацкага партрэта ўслаўляў рыцарскую мужнасць і годнасць [illegible] шляхты.

Сярод самых шанаваных у Беларусі ікон быў абраз «Маці Божая Адзігітрыя» [illegible] Мядзельскага раёна

Маці Божая Адзігітрыя. Абраз першай паловы XVII ст. Беларуская школа. [illegible]

знаёмыя архітэктурныя краявіды. Святыя часта нагадвалі рэальных зямных асобаў або фальклорных герояў. Цікава, што сюжэт «Страшнага суда» ў беларускіх абразах практычна адсутнічаў, а найбольш пашыранымі былі выявы Маці Божай Адзігітрыі.

Вялікі князь і кароль Жыгімонт Аўгуст. [illegible] Кранах Малодшы. Музей Чартарыйскіх у Кракаве. [illegible]

Вялікая княгіня і каралева Ганна, дачка Жыгімонта Старога і жонка Стэфана Баторыя. Невядомы мастак [illegible]. Канец XVI ст.

Партрэт [illegible]. Невядомы мастак. Канец XVI – пачатак XVII ст.

Вялікі князь і кароль Жыгімонт Стары. Мастак Лукас Кранах Малодшы. Каля 1571 г.

Евангелле ад Яна. Беларускі рукапіс XVI ст.

У палацах арыстакратыі, а часам і ў дамах багатых мяшчан з'яўляліся партрэтныя галерэі знакамітых продкаў. Найбагацейшы такі збор захоўваўся ў Нясвіжскай рэзідэнцыі Радзівілаў. У часы вялікіх князёў Жыгімонта Старога і Жыгімонта Аўгуста беларускія магнаты часта запрашалі да сябе мастакоў з Заходняй Еўропы, найперш з Італіі. Іх вучні – мясцовыя жывапісцы звычайна не падпісвалі сваіх карцін, але таксама стваралі сапраўдныя шэдэўры.

Высокамастацкія творы пакінулі беларускія гравёры Тамаш Макоўскі, Пётра Мсціславец, Максім Вашчанка... Яны не толькі аздаблялі кнігі, але і стваралі графічныя партрэты, геральдычныя кампазіцыі, карты, складаныя ілюстрацыі да навуковых трактатаў.

Скульптарам той эпохі належаць дасканалыя ўзоры шматфігурнай арнаментальнай скульптуры і складаных алтарных кампазіцый. З каменю рабілі партрэтныя надмагіллі магнатаў.

Музыка і тэатр

Шматлікімі асяродкамі царкоўнай і свецкай музычнай культуры ў XVI–XVII стст. былі брацкія школы, а таксама музычныя бурсы пры калегіумах і манастырах, якія існавалі ў Вільні, Полацку, Віцебску, Магілеве, Гродні, Жыровічах (над Слонімам) ды ў шмат якіх іншых гарадах і мястэчках. Бурсы мелі свае капэлы, ставілі музычныя спектаклі.

З будаўніцтвам новых каталіцкіх храмаў звязана з'яўленне арганаў і папулярызацыя арганнай музыкі. Захаваліся звесткі аб прыдворным арганісце вялікага князя Ягайлы, які ў першай палове XV ст. падарожнічаў па Літве-Беларусі. Больш за 50 арганаў налічваюць даследчыкі на землях Княства ў XVI–XVII стст. Адметнасцю беларускай арганнай культуры было выкарыстанне гэтага музычнага інструмента ў літургіях не толькі ў рымска-каталіцкіх, але і ў грэка-каталіцкіх (уніяцкіх) храмах. Каштоўныя помнікі музычнай культуры той эпохі – рукапісныя зборнікі «Полацкі сшытак» і «Куранты». Творы з іх часта ўключаюць у свой рэпертуар сучасныя беларускія выканаўцы.

Высокапрафесійных вакалістаў і музыкантаў утрымліваў на еўрапейскі ўзор велікакняскі двор у Вільні. Побач з айчыннымі талентамі тут выступалі капельмайстры і музыканты з іншых краін.

Вялікае значэнне музыцы ў выхаванні асобы надавалі лепшыя тагачасныя культурныя элиты Сымон Будны, Васіль Цяпінскі, Андрэй Рымша. Францішак Скарына ў сваёй прадмове да кнігі «Прамудрасць Ісуса Сына Сірахава» заклікаў вучыцца «мусікіі, то ест пеўніцы».

Пры калегіумах ды іншых навучальнях у XVI ст. узнікаюць гэтак званыя школьныя тэатры. Адзін з найдаўнейшых пачаў сваю дзейнасць у 1585 г. у Полацкім езуіцкім калегіуме. Першым спектаклем, які ўбачылі палачане, стала трагікамедыя «Навухаданосар» з інтэрмедыямі, балетнымі і опернымі фрагментамі. Актрыс у школьных тэатрах не было, жаночыя ролі выконвалі юнакі ў масках. Удзельнікам усіх сцэнічных відовішчаў быў хор.

Вялікую папулярнасць сярод простых людзей меў лялечны тэатр – батлейка (ад біблейскага Бэтлеема, дзе нарадзіўся Ісус Хрыстос). Рэпертуар батлейкі звычайна складаўся з двух частак: рэлігійнай і свецкай. Батлейшчык часта спалучаў у сваёй асобе драматурга і актора, мастака і музыку.

Не толькі на радзіме, але і ў замежжы мелі славу нашы скамарохі, якія вандравалі з горада ў горад з «вучонымі» мядзведзямі. Школы мядзведжай «адукацыі» ў XVI–XVII стст. «Смаргонская акадэмія».

БЕЛАРУСКАЯ БІБЛІЯ. ФРАНЦІШАК СКАРЫНА

Волат беларускага і ўсяго еўрапейскага Рэнесансу нарадзіўся ў сям'і купца ў старажытным Полацку. Адтуль у 1504 г. ён выправіўся па навуку ў Кракаўскі ўніверсітэт, філасофскі факультэт якога скончыў з ступенню бакалаўра. Пазней Скарына стаў доктарам «вольных навук» (філасофіі), а ў 1512 г. з'явіўся ў Падуанскім універсітэце – самым аўтарытэтным у тагачаснай Еўропе. Бліскуча вытрымаўшы там экзамены, ён першы сярод усходніх славянаў атрымаў вучоную ступень доктара медыцыны (якую, напэўна, вывучаў раней у Капенгагене). Сёння выяву нашага знакамітага суайчынніка можна ўбачыць у Падуі ва ўніверсітэцкай мемарыяльнай зале сярод партрэтаў сарака выдатных дзеячаў навукі і мастацтва, што выйшлі з сценаў гэтай альма-матар.

ХРАНАЛОГІЯ

Каля 1490 г. – каля 1551 г. – Жыццё і дзейнасць Францыска Скарыны.
1506 г. – Заканчэнне Ф. Скарынам Кракаўскага ўніверсітэта.
1512 г. – Скарына атрымаў у Падуанскім універсітэце ступень доктара медыцыны.
6 жніўня 1517 г. – У Празе выйшла першая друкаваная беларуская кніга «Псалтыр».
1517–1519 гг. – Скарына выдаў у свет у сваім перакладзе 23 кнігі Бібліі.
Каля 1520 г. – Заснаванне Ф. Скарынам Віленскай друкарні.
1522 г. – Выданне «Малой падарожнай кніжкі».
1525 г. – Ф. Скарына надрукаваў кнігу «Апостал».

Замест спакойнага жыцця на пасадзе лекара пры двары якога-небудзь князя ці магната Скарына як сапраўдны сын эпохі Рэнесансу абраў іншы шлях. Ён вырашыў даць свайму народу «лекі духоўныя» – друкаваную Біблію на зразумелай мове.

Першая з яго кніг – Псалтыр – пабачыла свет 6 жніўня 1517 г. у чэшскай Празе. У прадмове да яе гуманіст пісаў: «Я, Францішак Скарынін сын з Полацка, у лекарскіх навуках доктар, павялеў Псалтыру цісnуці... наперад ка чці і к пахвале Богу ў Тройцы адзінаму і прачыстай яго маці Марыі... а потым к пажытку паспалітага, добрага, найболей з тае прычыны, іжэ мя міласцівы Бог з таго языка на свет пусціў». Такім чынам, беларусы першыя сярод усходніх славянаў і ўсіх усходнееўрапейскіх народаў атрымалі друкаваную кнігу на роднай мове.

Скарына надрукаваў пачаткам 23 перакладзеныя і выдадзеныя на старабеларускую біблейныя кнігі і гэтым увёў Вялікае Княства і беларускую кніжнасць у сям'ю перадавых еўрапейскіх народаў. Друкаваная беларуская Біблія Францішка Скарыны – чацвёртая ў свеце, выдадзеная на жывой мове народа (пасля нямецкага, італійскага і чэшскага перакладаў).

[illegible]

Скарынава Кніга кніг выйшла раней за Лютэраву. Яна была першай друкаванай Бібліяй ва ўсходне- і цэнтральнаславянскіх народаў і значна на паўстагоддзе апярэдзіла польскую. Скарына выдаў свой пераклад раней, чым з'явіліся французскі і англійскі. Яго «Псалтыр» убачыў свет за 47 гадоў да «Апостала», з якога пачалося расійскае кнігадрукаванне. Сама ж Біблія па-расійску ўпершыню была выдадзена ў 1876 г.

[illegible]

[illegible]

Вярнуўшыся на радзіму, Скарына бачу 1520 г. з дапамогаю заможных віленскіх мяшчанаў Якуба Бабіча, Багдана Анькавіча (Онькава) і Юр'я Адверніка, якія, відаць, падтрымлівалі яго і раней, заснаваў друкарню ў сталіцы нашай дзяржавы – Вільні.

У 1522 і 1525 гг. там выйшлі «Малая падарожная кніжка» і «Апостал». Віленская друкарня Францішка Скарыны была першай на Усходняй Еўропе.

Ён увайшоў у гісторыю не толькі як беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар, але і як філосаф, чый светапогляд спалучаў хрысціянскія, антычныя і гуманістычныя ідэі. Як пісьменнік-прозаік і паэт, што служыў не эліце або нейкаму стану, а ўсяму народу. Як выдатны перакладчык з некалькіх старажытных і новых моў, як рэдактар і выдавец, што дасягнуў найвялікшай гармоніі слова і друкарскага мастацтва. (На думку спецыялістаў, сваёй прыгажосцю і дасканаласцю Скарынавы кнігі пераўзыходзяць як ранейшыя царкоўнаславянскія выданні, так і большасць слынутых у той час венецыянскіх.)

Пяру Скарыны належаць геніяльна простыя і самы прыгожы ў нашай гісторыі патрыятычны гімн-услаўленне любові да Бацькаўшчыны: «Понеже од прирожения звери, ходящие в пустыни, знают ямы своя, птицы, летающие по воздуху, ведают гнезда своя, рыбы, плывающие по морю і ў реках, чують виры своя, пчелы і тым подобная боронять ульев своих, – тако ж і люди, игде зродилися і ускормлены суть по Бозе, к тому месту великую ласку имають».

[illegible]

[illegible]

[illegible]



[illegible]

Сын народа, што жыве ў геаграфічным цэнтры Еўропы, Скарына бліскуча спалучыў у творчасці традыцыі візантыйскага Усходу і лацінскага Захаду. Ён аздобіў свае кнігі шматлікімі высокамастацкімі гравюрамі, па якіх можна вывучаць тагачасныя жыццё – побыт, адзенне, тэхніку будоўлі, вайсковую справу. Смела адступаючы ад царкоўных канонаў, ён змясціў у Бібліі ўласную выяву – першы ў гісторыі сусветнага мастацтва партрэт кнігавыдаўца.

Скарынавыя выданні мелі шырокую папулярнасць не толькі ў нашай дзяржаве. Іх ведалі ў Польшчы, Чэхіі, Нямеччыне. Шэдэўры першадрукара слынутага беларуса захоўваюцца ў бібліятэках Расіі і Украіны, а таксама ў кнігазборах Кракава, Варшавы, Лондана, Кембрыджа, Капенгагена, Любліна, Прагі. Невядомы раней асобнік Скарынавай Бібліі знойдзены нядаўна ў Нямеччыне.

У жыцці першадрукара адбілася ўся напружаная, віраваая і авантурная эпоха пераходу ад Сярэднявечча да Новага часу. На думку некаторых гісторыкаў, ён нейкі час працаваў сакратаром дацкага караля Ганса. Скарына сустракаўся з рэфарматарам Лютэрам і медыкам ды алхімікам Парацэльсам. Браў удзел у складанні агульнадзяржаўнага збору законаў – першага Статута Вялікага Княства Літоўскага 1529 г. Быў сакратаром і прыдворным лекарам у віленскага біскупа Яна. Скарыну запрашаў да сябе на службу магістр Тэўтонскага ордэна Альбрэхт Брандэнбургскі, які надаў яму шляхоцтва.

Калі за братавы даўгі крэдыторы кінулі Скарыну ў вязніцу, яго вызваліў сам вялікі князь Жыгімонт Стары. На знак прызнання асаблівых заслуг перад Айчынаю манарх выдаў вучонаму палачаніну адмысловы ахоўны прывілей.

Вядома, што Масковія не мае сваіх друкароў. Францішак Скарына прывёз у яе сталіцу партыю сваіх кніг і прапанаваў наладзіць выдавецкую справу. Але і свецкія, і духоўныя ўлады паставіліся да гэтага варожа. Маскоўскі князь Васіль III загадаў скласці з Скарынавых кніг вогнішча. Іх публічнае паленне сталася яшчэ адным сведчаннем велізарнай розніцы ў культурных роўнях Вялікага Княства Літоўскага і Масковіі.

Земны шлях выдатнага гуманіста завяршыўся ў Празе, дзе да яго некалі прыйшла еўрапейская слава. У старажытнай частцы чэшскай сталіцы, на Градчанах, панаваць нашага суайчынніка ўшанавалі помнікам.

[illegible]

КНІГАДРУК

Пасля Скарыны кнігадрукаванне ў Вялікім Княстве аднавілася ў сярэдзіне XVI ст. і ўжо не спынялася. Адразу некалькі друкарняў дзейнічалі ў 1550-х – 1570-х гадах у Берасці пад апекаю канцлера Мікалая Радзівіла Чорнага. Толькі ў адной з іх, якой кіраваў Цыпрыян Базылік, выйшла больш за 40 выданняў рознага зместу. Значная частка была адрасавана простаму, «паспалітаму» чытачу. Сярод гэтых кніг «Размова паляка з літвінам», дзе разглядаўся дзяржаўны і палітычны лад у Вялікім Княстве і Польскім Каралеўстве напярэдадні Люблінскай уніі 1569 г. Тамсама пабачыла свет так званая Берасцейская, або Радзівілаўская, Біблія, якая лічыцца выдатным помнікам польскамоўнага кнігадрукавання ў Беларусі.

Смецыянне вонкавага культурнага развіцця Вялікага Княства Літоўскага ў эпоху Рэнесансу было існаванне шматлікіх друкарняў. У іх выпускаліся неабходныя для патрэбаў дзяржавы і не менш рознастайная літаратура: рэлігійныя кнігі, зборы законаў, палемічныя трактаты, падручнікі і слоўнікі, мастацкія творы.

ХРАНАЛОГІЯ

Заснаванне друкарняў пасля Францыска Скарыны

1553 г. — Берасце.
1562 г. — Нясвіж.
каля 1563 г. — Масква.
1569 г. — Заблудаў.
1572 г. — Лоск.
1574 г. — Вільня.
1570-я гады — Цяпіна.
1573 г. — Альбоў (Львоў).
каля 1578 г. — Астрог.
1580 г. — Вільня.
[illegible] — Вільня.
[illegible] — Вільня.
[illegible] — Еўе.
[illegible] — Любча.
[illegible] — Магілёў.
1625 г. — Мінск.
1630 г. — Кутэйна.
[illegible] — Буйнічы.
каля [illegible] — Супрасль.

У Нясвіжскай друкарні, якую ўзначальвалі Сымон Будны, Мацей Кавячынскі і Лаўрын Крышкоўскі, выйшлі па-беларуску кнігі «Пра апраўданне грэшнага чалавека перад Богам» і «Катэхізіс». Скарынаўскую традыцыю кірылічнага кнігадрукавання працягваў Васіль Цяпінскі, што заснаваў друкарню ў родавым маёнтку Цяпіна пад Чашнікамі. Вялікую ролю ў жыцці дзяржавы адыгравала Віленская друкарня братоў Мамонічаў, дзе па-беларуску быў выдадзены Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588 г. і яшчэ больш за 50 кніг кірыліцай.

У сярэдзіне XVI ст. беларусы заснавалі кнігавыдавецкую справу ў Маскве. Гэта былі Пётра Мсціславец родам з Амсціслава ды Іван Федаровіч (Фёдараў), які належаў да шляхецкага роду герба «Шрэнява». Усё друкарскае начынне яны прывезлі з радзімы, дзе кнігі выходзілі ўжо некалькі дзесяцігоддзяў. Аднак кансерватыўнае маскоўскае духавенства і пэўнае баярства паставіліся да беларускіх асветнікаў варожа. Неўзабаве пасля выдання першай расійскай кнігі «Апостал» (1564 г.) Мсціславец і Федаровіч былі абвінавачаныя ў «іншаверчай ерасі», а іхнюю друкарню разбурыў раз'юшаны натоўп. Вярнуўшыся на Бацькаўшчыну, нашыя суайчыннікі працягвалі працу ў Заблудаўскай друкарні пад Беластокам, якую фундаваў беларускі магнат Рыгор Хадкевіч. Там выйшлі вядомыя «Евангелле вучыцельнае» і «Псалтыр» з «Часасловцам».

Друкарні пры брацтвах, манастырах, навучальных установах, дварах магнатаў існавалі ў Менску, Полацку, Кутэйне (каля Воршы), Магілеве, Буйнічах, Любчы, Супраслі. У Еўескай друкарні пабачыла свет у 1619 г. славутая «Граматыка» Мялеція Сматрыцкага, якая доўгі час служыла за ўзор усходнеславянскім складальнікам падручнікаў царкоўнаславянскай мовы.

Праз колькі гадоў Іван Федаровіч пераехаў у Альбоў (так беларусы даўней называлі Львоў), дзе заснаваў першую друкарню на Украіне. Там былі выдадзеныя першая дакладна датаваная ўкраінская кніга «Апостал» (1574 г.) і першы друкаваны ўсходнеславянскі падручнік «Азбука». Неўзабаве Федаровіч адчыніў друкарню і ў горадзе Астрозе. Шрыфты і гравюры для альбоўскіх і астрожскіх выданняў рабіў беларус Грынь Іванавіч.

Наступнік Скарыны Іван Федаровіч стаў пачынальнікам кнігадрукавання ў Расіі і Украіне.

Тытульны аркуш «Евангелля», выдадзенага Свята-Духаўскай брацкай друкарняй у Вільні. 1644 г.

Сярод іншай літаратуры дзякуючы нашым друкарам тады пабачыла свет славутая Астрожская Біблія – першае поўнае выданне Святога Пісьма кірыліцай.

«Евангелле вучыцельнае». Еўе 1616 г.

Увагаю да антычнай спадчыны вызначалася дзейнасць беларускага друкара Яна Карцана, якога з гэтае прычыны параўноўвалі з славутым венецыянскім выдаўцом Альдам Мануцыем. Спачатку Карцан друкаваў кнігі ў Лоску (каля Крэва), а ў 1580 г. заснаваў друкарню ў Вільні. Дзякуючы яму прыйшлі да чытача больш за сто выданняў, што ў большасці мелі свецкі характар. Адным з першых быў трактат Цыцэрона «Пра абавязкі». Вялікую папулярнасць здабыла кніга «Апафегматы» – зборнік афарызмаў і кароткіх апавяданняў з жыцця знакамітых людзей старажытнага свету. Побач з «Гісторыяй Юдэйскай вайны» Флавія, творамі Эразма Ратэрдамскага ды іншых заходнееўрапейскіх гуманістаў Карцан друкаваў кнігі тагачасных беларускіх пісьменнікаў Сымона Буднага, Андрэя Рымшы, Андрэя Валана, Яна Казаковіча, Бенеша Буднага. Шырока разыходзіліся медычныя трактаты, падручнікі, календары, палемічныя выданні.

Ірмалой – зборнік рэлігійных спеваў для набажэнства. Супрасльская друкарня. Канец XVI ст.

Святадухаўская царква Куцеінскага Богаяўленскага манастыра ў Оршы. Першая палова XVII ст.

«Евангелле вучыцельнае». Еўе 1616 г.

Выданыя Спірыдонам Собалем «Апостал». 1630 г.

Разварот кнігі «Новы Запавет і Псалтыр». Куцеін. 1652 г.

У Куцеінскім Богаяўленскім манастыры (перадмесце Оршы) плённа працавала друкарня асветніка Спірыдона Собаля. Шырокую вядомасць атрымалі выдадзеныя ім кнігі «Малітваслоў», «Часаслоў», «Новы Запавет і Псалтыр» і асабліва «Буквар». Пазней С. Собаль працягваў сваю выдавецкую дзейнасць у Буйнічах і Магілёве.

Куцеінская друкарня выпускала кнігі на царкоўнаславянскай і старабеларускай мовах і была ў XVII ст. асноўным цэнтрам беларускага кірылічнага кнігадрукавання.

Друкар віленскага праваслаўнага брацтва Самуіль Рагаля ў 1643 г. стварыў першую друкарню ў Малдове і выдаў там кірыліцай першую друкаваную малдаўскую кнігу «Карте дэ інвецатурэ» («Евангелле вучыцельнае»).

Кнігі нашых друкароў эпохі Рэнесансу не толькі пашыралі веды, але і служылі маральнаму ўдасканаленню жыхароў краіны, выхоўвалі патрыятычныя ідэалы. Вялікі попыт на літаратуру засведчыў высокую для таго часу адукаванасць беларускага грамадства.

ІНФЛЯНЦКАЯ ВАЙНА. СЦЯПАН БАТУРА

Прагнучы прарвацца да Балтыйскага мора, Маскоўская дзяржава ў 1558 г. напала на Інфлянты (Лівонію) – канфедэрацыю з пяці прыбалтыйскіх княстваў. Войскі Івана IV захапілі Нарву і Дорпат (Тарту). Спадзеючыся на падтрымку, інфлянцкі магістр прызнаў сябе васалам Вялікага Княства Літоўскага. Гетман Мікалай Радзівіл Руды павёў літвінскія палкі на дапамогу суседзям.

У 1562 г. маскоўскія ваяводы ўступілі на тэрыторыю нашай дзяржавы і, ужываючы тактыку выпаленай зямлі, дайшлі да Віцебска, Дуброўны, Воршы, Копысі і Шклова. Пра наезд на Віцебск маскоўскі летапісец занатаваў: «Астрог узялі ды папалілі, і пасады ў горадзе ўсе папалілі, і людзей у астрозе многіх пабілі, і вёскі з сёламі папалілі ды павыпальвалі». Ад таго часу галоўным тэатрам баявых дзеянняў у Інфлянцкай вайне сталі беларускія землі.

Захоп Полацка

Прапанова гаспадара Жыгімонта Аўгуста пра ўзаемны адвод войскаў не задаволіла Івана IV, які меў намер захапіць Полацак – тады найбуйнейшы і найбагацейшы горад Вялікага Княства. На пачатку 1563 г. асноўныя сілы маскоўцаў на чале з Іванам Жахлівым узялі яго ў аблогу. 60-тысячнай варожай арміі з 200 гарматамі супрацьстаяў зусім невялікі гарнізон ваяводы Станіслава Давойны.

Гетман Радзівіл меў толькі 3,5 тысячы кавалерыі з 20 гарматамі і не мог дапамагчы палачанам. Нягледзячы на гэта, абаронцы адважваліся скласці зброю. Яны гераічна трымаліся больш за два тыдні і аднойчы нават наважыліся на начны вылаз, каб адбіць у непрыяцеля гарматы. Аднак сілы былі занадта няроўныя. Ваявода Давойна спярша мусіў вярнуць сваіх людзей у замак, а пасля свайго варожага прыступу капітуляваць.

Парушыўшы абяцанні, Іван IV абвясціў палоннымі не толькі жаўнераў, але і ўсіх жыхароў. Італьянец Аляксандр Гваніні, які тады быў віцебскім ваенным камендантам, пісаў у кнізе «Хроніка Еўрапейскай Сарматыі», што заваёўнікі вывелі з Полацка ў Масковію 50-тысячны палон, у тым ліку ўсю шляхту. Некалькі тысяч не вытрымалі дарогі і загінулі ад марозу і голаду. Расейскія стральцы вынішчалі ў горадзе ўсіх каталікоў, а жыдоў – ад старых да немаўлятаў – пятапілі пад лёдам Дзвіны і Валовага возера.

Страта Полацка была для Вялікага Княства Літоўскага надзвычай цяжкім ударам. Распачаліся перамовы аб міры, але яны не далі плёну: Масква не хацела вяртаць Полаччыну, а Вільня не згаджалася на яе адмоўшча.

Звесткі фармаваць еўрапейскай грамадскай думкі і жорсткасць ... у абароне ... і мірнымі жыхарамі Полацка ... [illegible] ... у іншых краінах. «Лятучыя лісткі» з апісаннем трагедыі выходзілі па-нямецку, па-італьянску, па-французску, па-чэшску, па-лацінску, па-польску ў розных гарадах Еўропы ад Любека да [illegible].

[illegible]

ХРАНАЛОГІЯ

1558–1582 гг. – Інфлянцкая (Лівонская) вайна.
1562 г. – [illegible] Вялікага Княства Літоўскага.
1563 г. – Войскі Івана IV захапілі Полацак.
[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]

[illegible]

Бітва на Вуле

У студзені 1564 г. вораг распачаў новую ваенную кампанію. Дзве расейскія арміі з боку Полацка і з-пад Смаленска павінны былі злучыцца пад Воршай і рушыць на Менск, Навагрудак і Вільню. Але захопніцкія планы сарвалі вялікі гетман Мікалай Радзівіл Руды і палявы гетман Рыгор Хадкевіч.

25-тысячнае войска маскоўцаў на чале з Пятром Шуйскім рухалася левабярэжжам ракі Вулы быццам па сваёй зямлі, нават не высылаючы наперад дазораў. Ваявода быў упэўнены, што ліцвінскія харугвы, у якіх агулам было не болей за 8 тысяч вояроў, не адважацца ўступіць у бітву. Аднак увечары 26 студзеня каля вёскі Іванск паблізу Чашнікаў гетман Радзівіл з аддзелам адборнай конніцы атакаваў маскоўскі авангард.

Удзельнік пераможнай бітвы на Вуле Раман Сангушка. Невядомы мастак пачатку XIX ст.

Пасля кароткай сечы ліцвіны пачалі адступаць, завабліваючы праціўніка за сабой. Гэта адкрыла прастору для раптоўнага ўдару нашых галоўных сілаў па варожай калоне. Стральцы не паспелі ні надзець брані, ні стаць у баявыя шыхты. Кінуўшы абоз, яны ў паніцы рассеяліся па полі і спрабавалі ратавацца ўцёкамі. Адна наша кавалерыя сякла маскоўцаў, не даючы ім апамятацца.

У месячным святле ліцвіны некалькі міляў пераследвалі рэшткі разгромленага войска. Дабіваць захопнікаў дапамагалі тамтэйшыя жыхары. Пад сякерай простага селяніна з Іванска скончылася жыццё самога ваяводы Шуйскага. Ад куляў, шабляў і кійкаў у бітве на Вуле (яе называюць таксама бітвай на Іванполлі) палегла дзесяць тысяч акупантаў і гэтулькі сама патанула ў рацэ. У Полацак вярнулася толькі пятая частка маскоўцаў. З нашага боку страты склалі некалькі сотняў памерлымі і паранёнымі. Сярод камандзіраў вылучыліся ваяры з славутых беларускіх родаў Ян Хадкевіч, Раман Сангушка, Багдан Саламярэцкі, Мікалай Сапега, Юрай Тышкевіч, Богуш Карэцкі, Юрай Зяновіч.

У выніку зімовай кампаніі 1564 г. была [illegible] паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Маскоўшчынай і пачалося пазіцыйнае супрацьстаянне з лакальнымі сутычкамі.

[illegible]



[illegible]

[illegible]

На падзеі 1564 г. гісторык і паэт Мацей Стрыйкоўскі адгукнуўся паэмай «Бітва на Вуле». Гэты твор апісвае [illegible]

[illegible]

[illegible]

Праз тыдзень пасля тае перамогі адбылася яшчэ адна важная для далейшага ходу вайны бітва. Пад Воршай амсціслаўскі ваявода Юрай Осцікавіч і аршанскі староста Філон Кміта-Чарнобыльскі малымі сіламі здзейснілі імклівую атаку на перадавы полк 50-тысячнага войска ваяводы Пятра Абаленскага-Серабранага. Ваеннай хітрасцю нашы камандзіры здолелі пераканаць ворага, што на іх напала ўсё пераможнае войска Радзівіла. Маскоўцы пакінулі абоз на 25 тысяч вазоў з тысячамі коней і сенам і адступілі да Смаленска.

Вялікі князь Сцяпан Батура

Дарма што была падпісаная Люблінская унія, палякі не спяшаліся на дапамогу Княству. Пералом у Інфлянцкай вайне надышоў толькі тады, калі ў 1576 г. вялікім князем літоўскім і каралём польскім быў абраны вугорац Іштван Баторы, якога ў нас называлі Сцяпанам Батурам.

Новы гаспадар паходзіў з старажытнага вугорскага роду Баторыяў Шомлё. З пятнаццаці гадоў ён знаходзіўся на вайсковай службе ў караля Чэхіі і Вугоршчыны Фердынанда, разам з ім быў у Італіі і вучыўся ў славутым Падуанскім універсітэце. Трапіўшы ў палон да немцаў, Батура тры гады няволі прысвяціў навукам, у тым ліку вывучэнню прац антычных гісторыкаў. Да абрання нашым манархам ён уладарыў у Трансільванскім княстве (цяпер тэрыторыя Румыніі).

Сцяпан Батура прыйшоў да ўлады пасля таго, як у цяжкіх умовах вайны Вялікае Княства Літоўскае мусіла падпісаць Люблінскую унію 1569 г. з Польскім Каралеўствам. Павёўшы мудрую палітыку, ён паспяхова стрымліваў прэтэнзіі палякаў на падпарадкаванне нашай дзяржавы. На думку гісторыкаў, сам манарх браў удзел у падрыхтоўцы будучага Статута Вялікага Княства 1588 г. – найдасканалейшага збору законаў у Еўропе XVI ст.

Караначаваўшыся, Батура цвёрда гарантаваў самастойнасць і раўнапраўнасць Княства ў хаўрусе з Польшчай. Ён абавязаўся не прызначаць палякаў военачальнікамі, дбаць пра вяртанне страчаных земляў, склікаць агульныя Соймы па чарзе ў Княстве і Каралеўстве. Батура зацвердзіў найвышэйшы апеляцыйны суд Вялікага Княства – Галоўны трыбунал, што значна ўмацавала яго суверэнітэт.

Паходы Сцяпана Батуры

Вялікая пячатка С. Батуры, 1576–1586 гг.

Вялікі князь быў не толькі здатным дыпламатам і рэфарматарам, але і мецэнатам, апекуном навукі. Высока цэнячы створаную езуітамі агульнаеўрапейскую сістэму адукацыі, ён падтрымліваў дзейнасць Таварыства Ісуса ў Вялікім Княстве.

IN NOMINE DOMINI AMEN

У часы Батуры была заснавана першая ў дзяржаве вышэйшая навучальная ўстанова – Віленская акадэмія, а затым Полацкі калегіюм. Пра шырокія погляды манарха кажа яго блізкае сяброўства з Каспарам Бекешам – філосафам-вальнадумцам і таленавітым военачальнікам, які нейкі час быў гарадзенскім ваяводам.

Гародню вялікі князь абраў сваёй галоўнай рэзідэнцыяй. Для яго там стары замак Вітаўта перабудавалі ў раскошны рэнесансавы палац. У ім Батура прымаў замежныя пасольствы, склікаў дзеля разгляду дзяржаўных спраў Раду. Улюбёны горад гаспадара атрымаў ад яго нямала прывілеяў. Паводле аднаго з іх значныя сродкі выдзяляліся штогод на ўтрыманне Гарадзенскай саборнай Прачысценскай царквы. Батура быў ініцыятарам заснавання ў Гародні езуіцкага калегіюма.

У горадзе над Нёманам і завяршыўся зямны шлях Сцяпана Батуры. Цікава, што і сваім сконам ён паслужыў развіццю навукі. Дыягназы розных лекараў моцна разыходзіліся, і дзеля высвятлення сапраўднай прычыны смерці манарха яго цела ўскрылі. Гэта было першае паталага-анатамічнае даследаванне ва Усходняй Еўропе.

Гародня. Гравюра 1568 г.

GRODNA

Вяртанне Полацка

Сцяпан Батура меў шматстайныя таленты дзяржаўнага дзеяча, але найперш застаўся ў нашай гісторыі як выдатны палкаводзец.

Адразу пасля каранацыі ён прысягнуў, што зброяй будзе асабіста ўзначальваць войска і верне захопленыя Маскоўшчынай землі. Дарэчы, Батура паслаў Івану IV выклік на дуэль, але маскоўскі князь паладушна адмовіўся, спасылаючыся на тое, што не лічыць абранага манарха роўным яму, які сеў на трон «по божию изволению».

Галоўнай мэтаю гаспадара было вяртанне Полацка. Добра падрыхтаваўшыся да паходу, Батура з 40-тысячнай арміяй улетку 1579 г. падышоў да старажытнай крывіцкай сталіцы. Пасля трох тыдняў напружанай цяжкай аблогі і некалькіх прыступаў Полацак быў вызвалены. Пад камандаваннем вялікага князя знаходзіліся таксама вугорскія, нямецкія і польскія палкі, аднак найбольшую мужнасць выявілі ліцвінскія аддзелы Сцяпана Збаражскага, Мікалая Дарагастайскага, Юр'я Зіновіча і Яна Глябовіча. Адборную конніцу прывёў пад полацкія сцены сын героя Аршанскай бітвы 1514 г. князь Канстанцін Канстанцінавіч Астрожскі.

Неўзабаве нашае войска авалодала ўсімі пабудаванымі на поўначы Беларусі варожымі фартэцамі, якія маскавіты лічылі непрыступнымі. Затым Батуравы ваяры ўзялі Веліж, Невель, Усвят, Вялікія Лукі.

Далейшыя наступальныя дзеянні былі спынены пад Псковам. Зняўшы з яго аблогу, Сцяпан Батура пайшоў на перамовы з Масквой.

Вынікі вайны

Падпісанае ў 1582 г. Ям-Запольскае замірэнне засведчыла цяжкую паразу Маскоўскай дзяржавы. Яна адмаўлялася ад захопленых раней інфлянцкіх і беларускіх абшараў, вяртаючы пры гэтым сорак гарадоў. У складзе Вялікага Княства Літоўскага замацоўваліся не толькі Полаччына, але і іншыя нашы землі, прыкладам Невель і Веліж, захопленыя маскоўцамі яшчэ ў часе вайны 1500–1503 гг.

Разам з тым для Вялікага Княства Інфлянцкая вайна мела нялёгкія наступствы. Яна сталася прычынай вымушанай уніі з Польшчай, што несла небяспеку страты суверэнітэту.

РЭЧ ПАСПАЛІТАЯ АБОДВУХ НАРОДАЎ

[illegible]

Абмяркаванне ўмоваў аб'яднання пачалося яшчэ ў 1563 г. на Варшаўскім сойме, у пасяджаннях якога ўдзельнічала дэлегацыя Вялікага Княства. Польскі бок, спасылаючыся на старыя акты часоў Ягайлы, дамагаўся поўнай інкарпарацыі (уключэння) Княства ў склад Польшчы. Нашыя дэлегаты не прызнавалі гэтых дакументаў, называючы іх фальшыўкамі, і паслядоўна выступалі за раўнапраўны саюз дзвюх краінаў. Паны-Рада ўсяляк зацягвалі час, пакідалі агульныя Соймы, давалі сваім паслам адпаведныя інструкцыі. Захаванне незалежнасці было прынцыповай пазіцыяй Радзівілаў, Валовічаў, Хадкевічаў ды іншых беларускіх магнатаў.

Вострыя спрэчкі доўжыліся не адзін год, а тым часам ваенная сітуацыя ўсё больш абвастралася. Шляхта, якая найперш цярпела ад маскоўскіх захопнікаў, была гатовая пагадзіцца на польскія ўмовы. Яе прываблівалі таксама шырокія вольнасці, што меў шляхецкі стан у Польскім Каралеўстве. Пра неабходнасць уніі заявілі на Берасцейскім вальным сойме паслы занятага маскоўцамі Віцебскага ваяводства. Праз год на Гарадзенскім сойме шляхта зноў прасіла вялікага князя Жыгімонта Аўгуста паскорыць аб'яднанне.

Супольны Сойм Вялікага Княства і Польскага Каралеўства распачаў пасяджанні ў Любліне 10 студзеня 1569 г. і адразу ж выявіў прынцыповую розніцу пазіцый. Радзівілы супрацьпаставілі польскаму праекту уніі свой — з прадугледжаннем для Княства асобнымі дзяржаўнымі органамі і ўласным Соймам. Нашы сенатары і дэпутаты праводзілі нарады асобна ад палякаў. Тыя запатрабавалі ад Жыгімонта Аўгуста (які, згодна з персанальнай уніяй, з'яўляўся і польскім каралём), каб ён прымусіў ліцвінаў прыняць неабходныя ўмовы. 1 сакавіка наша абураная дэлегацыя пакінула Люблін.

Карыстаючыся адсутнасцю Паноў-Рады і літвінскіх паслоў, палякі падступна дамагліся ад манарха ўказаў пра далучэнне да Польшчы вялізарных і багатых тэрыторый Вялікага Княства. 5 сакавіка Люблінскі сойм прыняў акт пра інкарпарацыю Падляшша, 27 траўня — Валыні, потым былі далучаныя Кіеўскае і Брацлаўскае ваяводствы. Адбывалася знішчэнне вялікай часткі нашай дзяржавы. Шляхта, службоўцы і гараджане гэтых абшараў пад ціскам ваенных абставінаў вымушаныя былі прысягаць Кароне Польскай. Найбольш супраціўляліся магнаты, але ўрэшце пачалі даваць прысягу і яны. Рашуча не прыняў уключэння ў Польшчу толькі соймік Мазырскага павета, які, хоць і ўваходзіў у Кіеўскае ваяводства, застаўся ў складзе Княства.

[illegible]

ХРАНАЛОГІЯ

10 студзеня 1569 г. — Пачатак пасяджанняў Люблінскага сойма.
5 сакавіка 1569 г. — Сойм прыняў пастанову пра далучэнне да Польшчы Падляшша.
Красавік–чэрвень 1569 г. — Да Польшчы далучаны Валынь, Кіеўшчына і Брацлаўскае ваяводства.
7 чэрвеня 1569 г. — Соймік Мазырскага павета Кіеўскага ваяводства выступіў супраць далучэння да Польшчы.
1 ліпеня 1569 г. — Аб'яднанне Вялікага Княства Літоўскага і Польскага Каралеўства ў Рэч Паспалітую.

[illegible]

Люблінскі сойм.
[illegible]

Вільня адгукнулася на навіны бурай пратэстаў. Паны-Рада абвясцілі аб падрыхтоўцы да вайны з Польшчай, але змаганне на два франты непазбежна прывяло б краіну да гібелі. Не заставалася нічога іншага, як працягваць перамовы.

У чэрвені дэлегацыя Вялікага Княства вярнулася ў Люблін. Найвыдатнейшыя ўрадоўцы, найперш Астафей Валовіч, Ян Хадкевіч, Леў Сапега, Мікалай Радзівіл Руды, намагаліся вярнуць страчаныя ваяводствы і рабілі ўсё магчымае, каб захаваць самастойнасць сваёй дзяржавы. Урэшце ўдалося дасягнуць кампрамісу, на аснове якога 1 ліпеня 1569 г. Люблінская унія была падпісаная.

Акт уніі абвяшчаў, што Вялікае Княства і Польскае Каралеўства злучаюцца ў адно «непадзельнае цела» і складаюць цяпер «адну агульную Рэч Паспалітую» з агульным Соймам і манархам, які будзе як каралём польскім, так і вялікім князем літоўскім. На абшары ўсёй дзяржавы дэкларавалася поўнае раўнапраўе шляхты. Палякі атрымлівалі магчымасць свабодна набываць у нашай краіне зямлю і займаць дзяржаўныя пасады. Прадугледжвалася адзіная знешняя палітыка і адзіная грашовая сістэма. Заканадаўства Вялікага Княства трэба было прывесці ў адпаведнасць з польскім.

Аднак у сапраўднасці ўсё адбылося інакш. Ужо сам кампрамісны і даволі супярэчлівы акт Люблінскай уніі ўтрымліваў нормы, паводле якіх дзве дзяржавы захоўвалі значную частку суверэнітэту. Выканаўчая ўлада (з войскам асобна манарха) разам з усімі дзяржаўнымі пасадамі заставалася ў Вялікім Княстве Літоўскім асобнай.

[illegible]

Акт Люблінскай уніі, які абвясціў утварэнне Рэчы Паспалітай

Сойм мусіў прымаць асобныя законы для Княства і асобныя для Польшчы. Акт уніі пакідаў нашай краіне права на выпуск сваёй манеты. Дзяржаўнай моваю заставалася беларуская.

Абедзве часткі Рэчы Паспалітай захоўвалі ўласныя войскі, якія падпарадкоўваліся асобным гетманам. Соймавыя пастановы неаднаразова забаранялі ім парушаць межы Літвы і Польшчы: «Пастанаўляем, каб жаўнер літоўскі за межы, да Кароны, не прыходзіў і ў Кароне не спыняўся, ані таксама жаўнер каронны ў Вялікім Княстве».

Вільня праводзіла самастойную замежную палітыку і нярэдка ўчыняла міждзяржаўныя дамовы без уліку меркавання палякаў, а часам і насуперак ім. Так адбывалася пад час вайны з Швецыяй у першай палове XVII ст., калі Вялікае Княства Літоўскае падпісала замірэнне, а Польшча працягвала баявыя дзеянні, віначацічы ліцьвіноў у скасаванні уніі.

Насуперак Люблінскаму акту віленскія палітыкі пастанавілі, што манарх мусіць даваць Вялікаму Княству асобную прысягу і асобна пацвярджаць недатыкальнасць яго правоў.

Вялікі князь літоўскі і кароль польскі Стэфан Батура на гравюры пачатку XVII ст. М. Да Каэрыя. Амстэрдам. 1611 г.

Самастойнасць нашай краіны ў Рэчы Паспалітай яшчэ больш умацавалася, калі ў 1576 г. новым вялікім князем стаў Стэфан Батура. Сваім першым прывілеем ён скасаваў усе пастановы Люблінскага сойму, якія ўтрымлівалі нормы, неспрыяльныя ў дачыненні да Вялікага Княства. Адмысловая камісія ўдакладніла межы паміж дзвюма дзяржавамі. У гэтым часе былі вернутыя акупаваныя маскоўскімі войскамі ўсходнія беларускія землі.

Урэшце Статут 1588 г. канчаткова замацаваў палітычны, эканамічны і культурны суверэнітэт Княства. Тым не менш Люблінская унія спрыяла паскарэнню пачатай ужо раней паланізацыі вярхоў ліцвінскага грамадства.

Юбілейны медаль у гонар 300-годдзя Люблінскай уніі. Медальер П. Тасэ. Мінск. Аверс

Старонка дзённіка Люблінскага сойму. Сакавік 1569 г.

Ацэньваць умовы падпісанага ў Любліне акта можна па-рознаму, але нельга забываць, што унія перадухіліла захоп Масковіяй усяго Вялікага Княства Літоўскага, які ў Інфлянцкай вайне быў вельмі рэальным. Ці не напаткаў бы ў такім разе нашую дзяржаву і наш народ лёс Ноўгарадскай рэспублікі? Пасля яе далучэння да Маскоўшчыны адбылося знішчэнне цэлага самабытнага ўсходнеславянскага этнасу з развітой культурай і дэмакратычнымі вечавымі традыцыямі.

Анексія ўкраінскіх земляў, якія ў 1569 г. перайшлі да Польшчы, была для Вялікага Княства надзвычай цяжкою стратай, найперш з эканамічнага гледзішча. Аднак яе таксама не варта разглядаць толькі адмоўна. Па-першае, пасля гэтага якраз на Польшчу лёг цяжар абароны паўднёвых межаў ад нясцішных нападаў крымскіх татараў. Па-другое, Літва-Беларусь пазбаўлялася ад шматлікіх праблемаў, звязаных з прысутнасцю ў межах дзяржавы іншага вялікага этнасу, што ўсё больш аслабляла, а не ўмацоўвала Княства.

Вялікае Княства Літоўскае пасля Люблінскай уніі не спыніла свайго існавання. Абедзве дзяржавы захавалі вельмі значную самастойнасць. Разам з тым на палітычнай карце Еўропы з'явілася новае ўтварэнне – Рэч Паспалітая Абодвух Народаў, якое было, па сутнасці, канфедэрацыяй.

Рэч Паспалітая (назоў цалкам адпавядае лацінскаму res publica) была тады адной з самых вялікіх і магутных еўрапейскіх краінаў. Вялікае Княства Літоўскае знаходзілася ў яе складзе да канца XVIII ст.

Люблінская унія. Мастак Ян Матэйка. 1869 г.

СТАТУТЫ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА

Першы Статут Вялікага Княства Літоўскага. Спіс XVI ст. Старабеларуская мова

Першы і другі Статуты дзяржавы

Папярэднікам зборау нашых дзяржаўных законаў, якія ўвайшлі ў гісторыю як Статуты Вялікага Княства Літоўскага, быў Статут вялікага князя Казіміра, уведзены пасля ўзгаднення з Панамі-Радай у 1468 г. Ён датычыў найперш дзейнасці судоў і рэгламентаваў паўнамоцтвы земскіх улад.

У сферы заканадаўства і кадыфікацыі права Вялікае Княства займала адно з першых месцаў у тагачаснай Еўропе.





Статут, зацверджаны Віленскім соймам у 1529 г., складаўся з 13 раздзелаў і 282 артыкулаў

Збор законаў быў напісаны на дзяржаўнай беларускай мове, таму некаторыя гісторыкі называюць яго таксама «беларускім Статутам».

Аднак розныя землі Вялікага Княства працягвалі выкарыстоўваць поруч з Статутам даўнейшыя мясцовыя законы. Дзеля ўмацавання адзінства дзяржавы быў патрэбны грунтоўны кодэкс з адзінымі юрыдычнымі нормамі. Прапановы пра яго стварэнне перад гучалі на соймавых паседжаннях. Добра разумеў неабходнасць агульнадзяржаўнага збору законаў і вялікі князь Жыгімонт Стары.

ХРАНАЛОГІЯ

1529 г. — Першы Статут Вялікага Княства
1566 г. — Другі Статут Вялікага Княства
1588 г. — Трэці Статут Вялікага Княства

Першы Статут набыў афіцыйную сілу пасля зацвярджэння на Віленскім сойме ў 1529 г. Ён складаўся з 282 артыкулаў, аб'яднаных у 13 раздзелаў, і распаўсюджваў сваю прававую моц на ўсіх жыхароў Вялікага Княства (з выняткам мяшчанаў, якія жылі паводле магдэбургскага права). Статут утрымліваў добра распрацаваныя нормы дзяржаўнага, цывільнага, сямейнага, крымінальнага і працэсуальнага права. Адмысловыя артыкулы гарантавалі захаванне абшару і палітычнай незалежнасці дзяржавы.

Уводзіліся перадавыя на той час юрыдычныя прынцыпы: персанальная адказнасць за злачынства, роўнасць усіх перад законам, асаблівая абарона правоў жанчыны. (Да прыкладу, за згвалтаванне прадугледжвалася смяротная кара.)

Службовыя асобы мусілі прыносіць прысягу і кіравацца ў сваёй дзейнасці законам ды інтарэсамі дзяржавы.

Статут 1529 г. засведчыў высокі ровень прававой культуры Вялікага Княства параўнальна з большасцю еўрапейскіх дзяржаваў. З нашых суседзяў свае зборы законаў раней стварылі толькі чэхі і вугорцы, а Польскае Каралеўства яго іншча не мела.

Юрыдычныя здабыткі першага Статута працягнуў і развіў новы збор законаў, ухвалены ў 1566 г. Калі дагэтуль у палітычным жыцці дзяржавы пераважалі магнаты, князям і панам, то цяпер права ўводзіць і змяняць законы меў выключна вальны Сойм.

Другі Статут, прыняты ў часы цяжкой Інфлянцкай вайны з Маскоўскай дзяржавай, пацвярджаў захаванне тэрытарыяльнай цэласнасці Вялікага Княства і абавязваў гаспадара вяртаць страчаныя землі.

Вяршыняй еўрапейскай юрыдычнай думкі XVI ст. стаў трэці Статут Вялікага Княства.

Праз усе 14 раздзелаў і 488 артыкулаў новага збору законаў праходзіла ідэя праўнай дзяржавы, у якой усе органы і службовыя пасады дзейнічалі толькі ў адпаведнасці з законам. Нормы і патрабаванні Статута мусілі выконваць як жыхары Вялікага Княства, так і чужаземцы, што знаходзіліся на яго зямлі.

Статут 1588 г. замацоўваў ідэю рэлігійнай талерантнасці і бараніў інтарэсы жыхароў краіны незалежна ад веравызнання.

Статут 1588 года

Камісіяй найлепшых правазнаўцаў, якая ствярала збор законаў, кіравалі канцлер Астафей Валовіч і падканцлер Леў Сапега. У працы бралі ўдзел віленскі біскуп Валяр'ян Пратасевіч, сакратар гаспадара Аўгусцін Ратундус, жамойцкі кашталян Мельхіёр Шэмет і па адным шляхціцы ад кожнага ваяводства: ад Полацкага – князь Павел Сакалінскі, ад Віцебскага – Ян Сколка, ад Менскага – Марцін Валадковіч, ад Берасцейскага – Кірдзей Крычэўскі, ад Навагрудскага – Бенядзікт Юрага... Праект Статута абмяркоўвалі павятовыя соймікі, Рада і вальныя Соймы. Да яго падрыхтоўкі меў дачыненне ўвесь «палітычны народ» дзяржавы.

Ва ўступе да збору законаў Леў Сапега, згадваючы словы Цыцэрона, пісаў: «Есць мы нявольнікамі праў дзеля таго, абы вольнасці ўжываці маглі».

Адрозна ад заканадаўчых кодэксаў іншых еўрапейскіх краін Статут быў напісаны і выдадзены на зразумелай абсалютнай большасці жыхароў Княства беларускай мове. Ён меў адмысловы артыкул, які пацвярджаў яе дзяржаўнасць і шырокія правы. У сярэдзіне XIX ст. пра гэта з гонарам казаў, чытаючы лекцыі ў Парыжы, у Калеж дэ Франс, наш суайчыннік Адам Міцкевіч.

Грунтоўна было распрацавана ў Статуце крымінальнае права. Закон уводзіў прэзумпцыю невінаватасці для ўсіх станаў, прадугледжваў адказнасць шляхціча за забойства простага чалавека, гарантаваў удзел у судовым працэсе адваката. Ад крымінальнага пераследу вызваляліся дзеці і падлеткі, а часам і тыя, што ўчынілі злачынства «па глупстве». Забаранялася караць смерцю цяжарных жанчын. Наогул сістэма пакаранняў параўнаўча з іншымі еўрапейскімі дзяржавамі мела больш гуманны характар.

Разам з тым Статут адлюстроўваў няроўнасць жыхароў краіны. Галоўшчына (грашовая кара) за забойства шляхціча складала 100 копаў грошай, войта або бурмістра – 50 копаў, звычайнага месціча – 30 копаў. Мяшчане не мелі права ўдзельнічаць ні ў агульнадзяржаўных Соймах, ні нават у павятовых сойміках.

Закон ахоўваў прыродныя багацці краіны, у прыватнасці каштоўныя віды звяроў і птушак. Паводле раздзела X «Аб пушчах, аб паляванні, аб дрэвах бортных, аб азёрах і сенажацях» за разбурэнне сакалінага або лебядзінага гнязда вінаваты плаціў ад трох да шасці копаў грошай, за адлоў ці адстрэл бабра – ад дзвюх да чатырох. (Дзеля параўнання: рабочы вол ці жарабец каштавалі тады дзве копы.)

Тым часам як у іншых еўрапейскіх краінах панаваў антысемітызм, існаваў рэлігійны і этнічны ўціск, у Вялікім Княстве Літоўскім габрэі і татары не толькі былі абаронены законам, але і мелі магчымасць зрабіць вайсковую і палітычную кар'еру.

Паводле закону асабіста свабодных людзей ні за якое злачынства нельга было аддаць у вечную няволю. Кожны вольны чалавек меў права выехаць за мяжу, абы гэта не рабілася на шкоду Бацькаўшчыне.

Юрыдычна замацоўваючы незалежнасць краіны, новы Статут не пацвярджаў шэраг пунктаў Люблінскай уніі і нават не згадваў яе.

Шляхта на сойме. Гравюра паводле малюнка Яна Матэйкі. Другая палова XIX ст.

Сойм у замку. Малюнак Жана П'ера Норбліна. Канец XVIII ст.

Польскі бок рашуча пярэчыў прыняццю новага Статута, але Жыгімонт Ваза мусіў зацвердзіць яго, бо інакш Вялікае Княства адмаўлялася прызнаць Вазу сваім манархам. У XVI–XVII стст. палякі неаднаразова патрабавалі «папраўляць» або скасаваць «неўгодныя законы», але ўсе гэтыя спробы засталіся безвыніковымі.

Пры канцы XVIII ст. вядомы вучоны і палітычны дзеяч Гуга Калантай, выступаючы на Сойме, даў нашаму збору законаў такую характарыстыку: «Статут робіць гонар чалавечаму розуму. Ён складзены так разумна, што яго можна лічыць найдасканалейшай кнігай законаў ва ўсёй Еўропе».

У расейскае «Собрание узаконений» шмат якія артыкулы трэцяга Статута перайшлі без аніякіх зменаў. Нашыя прававыя нормы карысталіся на Украіне, у судах Латвіі і Эстоніі.

Усе найважнейшыя дзяржаўныя справы (вайны і міру, склікання паспалітага рушэння) меў вырашаць толькі вальны Сойм Вялікага Княства. Адмысловы дазвол патрабаваўся нават на тое, каб правесці праз нашу тэрыторыю польскае войска. Статут захоўваў свае ўласныя дзяржаўныя ўстановы, армію, фінансавую сістэму, мытную службу. У Рэчы Паспалітай не існавала ніводнага агульнага для Княства і Каралеўства міністра.

Абвешчанае Люблінскай уніяй раўнапраўе літвінскай і польскай шляхты скасоўвалася. Палякі разглядаліся ў Статуце як чужаземцы і не мелі права займаць дзяржаўныя пасады і набываць зямлю. Новы збор законаў фактычна не прызнаваў тэрытарыяльных стратаў на карысць Польшчы і вымагаў ад гаспадара вярнуць іх у склад Княства.

Міжнародны ўплыў трэцяга Статута

Надрукаваны адразу пасля свайго зацвярджэння ў Віленскай друкарні Мамонічаў, Статут 1588 г. шмат разоў перакладаўся з беларускай на еўрапейскія мовы: нямецкую, французскую, лацінскую, польскую, украінскую, расейскую. Гэта было прызнаннем вычарпальнасці і дасканаласці нашага збору законаў, які выкарыстоўвалі ва ўдасканаленні свайго заканадаўства Польшча, Прусія, Расея ды іншыя краіны.

Сёння трэці Статут Вялікага Княства лічыцца ў Еўропе выдатным помнікам юрыдычнай думкі. Яго, напрыклад, цягам цэлага семестра вывучаюць на спецыяльным курсе студэнты-юрысты Сарбоны.

На абшарах Вялікага Княства Літоўскага Статут 1588 г. дзейнічаў нават пасля захопу нашых земляў Расеяй: ва ўсходніх губернях Беларусі – да 1831 г., а ў Менскай, Гарадзенскай і Віленскай – да 1840 г.

Тытульны аркуш польскамоўнага перакладу трэцяга Статута. Віленская друкарня Мамонічаў. 1614 г.

Statut Wielkiego Księstwá Litewskiego/ Od Naiiaśnieyszego Hospodárá Krolá Iego Mośći ZYGMVNTA III. NA KORONACYEY W Krakowie/ Roku 1588. wydány.

КАНЦЛЕР ЛЕЎ САПЕГА

[illegible]

Выдатным дзяржаўным дзеячам перыяду Вялікага Княства Літоўскага быў Леў Сапега — патрыёт, мудры палітык і таленавіты дыпламат.

Леў Сапега паходзіў з старажытнага беларускага роду, які лічыўся ў дзяржаве другім паводле значнасці пасля Радзівілаў. Будучы канцлер нарадзіўся ў вёсцы Астроўна (цяпер у Бешанковіцкім раёне). Шаснаццацігадовага хлопчыка бацька завёз у Нясвіж. Там яго апекуном стаў адзін з прыхільнікаў незалежнасці Вялікага Княства Мікалай Радзівіл Чорны.

Спачатку ў Нясвіжскай пратэстанцкай школе, а затым у Лейпцыгскім універсітэце, куды Радзівіл паслаў трынаццацігадовага Льва разам з сваімі сынамі, Сапега атрымаў выдатную адукацыю. У Лейпцыгу ён грунтоўна вывучаў гісторыю, філасофію і права, што зрабіла яго добра падрыхтаваным да палітычнай дзейнасці. Гэтаму спрыяла і вольнае валоданне пяццю мовамі. Пад час навучання Сапега перайшоў у кальвінізм, але талерантнасць, якая панавала пры двары Радзівіла, з дзяцінства заклала ў яго душу і розум непрыманне рэлігійнага фанатызму.

[illegible]

Вярнуўшыся з Нямеччыны, ён быў прыняты на службу да вялікага князя і караля Стэфана Батуры. Манарха ўразіла адукаванасць Сапегі і дасканалае веданне ім лацінскай мовы. Апекуны Радзівілы параілі маладому палітыку застацца пры двары, каб бараніць інтарэсы дзяржавы пасля Люблінскай уніі.

У дваццаць тры гады Леў ужо займаў высокую пасаду сакратара Вялікага Княства. Ён вёў паслядоўную палітыку, накіраваную супроць імкнення Польшчы да гегемоніі над нашай краінай. Становішча Сапегі яшчэ больш умацаваў яго ўдзел у Інфлянцкай вайне. Сваім коштам ён сфарміраваў і ўзброіў гусарскі полк, на чале якога выявіў мужнасць і вайсковыя здольнасці ў бітве пры Вялікіх Луках і аблозе Пскова.

Батура накіраваў Льва Сапегу з надзвычайнай адказнай дыпламатычнай місіяй у Маскву. У выніку быў падпісаны вельмі выгадны для нашай дзяржавы «вечны мір», які сведчыў, што Масква прызнае за Вялікім Княствам Полаччыну і Інфлянты. Дыпламатычныя ўдачы паспрыялі кар'еры таленавітага палітыка. У 1585 г. Сапега заняў пасаду падканцлера, а праз чатыры гады стаў канцлерам — другім чалавекам у дзяржаве, які выконваў функцыі міністра унутраных і замежных спраў.

[illegible]

ХРАНАЛОГІЯ

4 красавіка 1557 г. – 7 ліпеня 1633 г. — Жыццё і дзейнасць Льва Сапегі

1570–1572 гг. — [illegible]

1579–1582 гг. — Леў Сапега [illegible]

1589 г. — [illegible]

1625 г. — Леў Сапега [illegible]

[illegible]

Выдатная заслуга Льва Сапегі ў тым, што ён дамогся ў 1588 г. зацвярджэння нашага трэцяга Статута, самага перадавога на той час у Еўропе збору законаў. Падрыхтаваны з удзелам Сапегі, ён гарантаваў палітычную і эканамічную незалежнасць краіны. Сам канцлер няўхільна трымаўся 12-га артыкула III раздзела Статута, які забараняў раздаваць польскай шляхце маёнткі і пасады ў нашай дзяржаве. Статут быў выдадзены пад асабістым наглядам Сапегі, з яго прадмовай і ягоным коштам.

Перайшоўшы ў каталіцтва, канцлер стаў прыхільнікам аб'яднання праваслаўнай і каталіцкай цэркваў, якое заклікана было ўмацаваць дзяржаву. У 1596 г. ён як прадстаўнік вялікага князя і караля выступаў за унію каталікоў і праваслаўных на Берасцейскім царкоўным саборы. У сваіх лістах да духоўных уладаў Сапега перасцерагаў іх ад гвалтоўных дзеянняў у дачыненні да суайчыннікаў іншага веравызнання.

[illegible] галоў. Леў Сапега вызначаў палітыку Вялікага Княства Літоўскага. Ён быў паслядоўным прыхільнікам не абсалютнай манархіі, а моцнай прававой дзяржавы, дзе пануюць законы, а не асобы. Асноўным ягоным клопатам заўсёды заставалася ўмацаванне дзяржаўнага суверэнітэту краіны. З удзелам Сапегі быў створаны Трыбунал Вялікага Княства — галоўны апеляцыйны суд, рашэнні якога мелі сілу соймавай пастановы.

Вызначальная роля належала Сапегу ў ваенных кампаніях з Масковіяй у 1609–1611 і 1617–1618 гг. Тады Княства значна пашырыла межы, вярнуўшы сабе Смаленск, Дарагабуж, Старадуб, Себеж ды іншыя землі. Пры канцы жыцця Леў Сапега восем гадоў быў вялікім гетманам, паказаўшы сябе таленавітым военачальнікам. І тут інтарэсы Айчыны ён ставіў вышэй за ўсё. У часе вайны з Швецыяй гетман і ягоны сын Ян ахвяравалі на змаганне з ворагам вялікую частку сваёй маёмасці.

Леў Сапега меў таксама заслужаную славу шчодрага мецэната, апекуна мастакоў і пісьменнікаў. Паэт XVI ст. Андрэй Рымша ў панегірыку на герб вялікага канцлера пісаў:

Пры каторых з аружжам конны яго стаіць,
Знакам тым, іж ся з іх ні адзін не баіць
Служыць сваім спадаром ку каждай патрэбе,
Не літуючы скарбаў, ні самога себе.

Дзякуючы дзейнасці Льва Сапегі нашая дзяржава ў складаных гістарычных абставінах не толькі захавала незалежнасць, але і перажыла перыяд гаспадарчага і культурнага росквіту. Гэты час гісторыкі з поўным правам называюць «эпохай Сапегі».

Сапега спрыяў развіццю беларускага кнігадрукавання. Ён сам быў вялікім аматарам кніг і сабраў у сваім палацы ў Ружанах вялікую бібліятэку. На загад нашага знакамітага палітыка былі спарадкаваныя і перапісаныя некалькі сотняў тамоў Літоўскай Метрыкі — архіва дзяржавы, які ў выніку зберогся для нашчадкаў. Перад смерцю Леў Сапега шчодра адарыў зафундаваныя ягоным родам храмы і быў пахаваны ў адным з іх — віленскім касцёле святога Міхала.

РЭФАРМАЦЫЙНЫ РУХ

Рэфармацыя (ад лацінскага слова reformatio – пераўтварэнне, выпраўленне) – гэта шырокі сацыяльны і рэлігійны рух у еўрапейскіх краінах, які набыў асаблівы размах у XVI ст. Ён узнік як пратэст супраць каталіцкай царквы і яе ролі ў грамадстве (адсюль яго другая назва – пратэстантызм). Яго прыхільнікі былі абураныя масавым продажам індульгенцый (якія нібыта пазбаўлялі ад грахоў), маральнай разбэшчанасцю іерархаў, выступалі супраць жорсткай царкоўнай дысцыпліны і падпарадкаванасці папу рымскаму. У Вялікім Княстве Літоўскім, як і ў іншых дзяржавах Еўропы, Рэфармацыя была шчыльна звязаная з Рэнесансам.

Ідэі і праграма рэфарматаў

У першай палове XVI ст. большасць жыхароў Княства вызнавалі праваслаўе. Старой «грэцкай» веры трымаліся 23 князёў і большасць панскіх родаў. За вялікім князем Жыгімонтам Старым у сталічнай Вільні на чатырнаццаць праваслаўных храмаў прыпадала сем каталіцкіх, а ў Магілёве, Амсціслаўе і Оршы першыя касцёлы з'явіліся толькі на пачатку XVII ст.

Тым часам каталіцтва няўхільна ўмацоўвала пазіцыі. Маючы падтрымку вялікіх князёў, актыўна дзейнічалі манаскія ордэны. Касцёл рабіўся буйным землеўласнікам: да прыкладу, Віленскае біскупства валодала 11500 сялянскімі «дымамі». Гэта выклікала незадавальненне магнатаў і набліжанай да іх шляхты.

ХРАНАЛОГІЯ

[illegible]

Праваслаўная царква ў Вялікім Княстве перажывала глыбокі крызіс. Яна была занадта кансерватыўнай і не прымала пераменаў, што адбываліся ў еўрапейскай адукацыі і культуры. Святары звычайна мелі нізкі ровень асветы, часта не разумелі нават царкоўнаславянскай мовы, на якой маліліся, і не здольныя былі канкураваць з добра адукаваным каталіцкім духавенствам. Глыбокія карані ў асяроддзі праваслаўнага духавенства пусціла паланізацыя. З іншага боку, у брацкіх школах выкарыстоўвалася «простая» (беларуская) мова. Да таго ж прыхадскія і брацкія праваслаўныя навучальні не маглі даць вышэйшай адукацыі. Па яе даводзілася выпраўляцца на Захад.

Якраз з Заходняй Еўропы ў Літву-Беларусь і прыйшлі ідэі Рэфармацыі. Упершыню гэта здарылася яшчэ ў часы Яна Гуса, калі ў нашай краіне прапаведаваў яго найбліжэйшы паплечнік Геранім Пражскі.

Праграма новай царквы была дэмакратычнай і прывабнай для ўсіх сацыяльных станаў. Рэфарматы адмаўлялі царкву як пасярэдніка паміж Богам і чалавекам, спрашчалі набажэнствы, адмовіліся ад багатага аздаблення храмаў. Адзінай крыніцай веры прызнавалася Біблія (усе акты царкоўных сабораў, папскія пасланні ды іншыя дакументы такога кшталту адмаўляліся). Святароў замянілі настаўнікі. Правадыры Рэфармацыі асуджалі тыранію і выступалі за прававую дзяржаву, дзе чалавек меў бы магчымасці свабоднай працы, духоўнага і фізічнага развіцця.

У сярэдзіне XVI ст. рэфармацыйны рух у Вялікім Княстве набыў агульнадзяржаўны характар. Асабліва магутным ён стаў пасля таго, як пра падтрымку пратэстантаў афіцыйна заявіў канцлер Мікалай Радзівіл Чорны.

[illegible]

Да рэфармацыйнага руху далучыліся амаль усе магнацкія і княскія, а таксама шматлікія шляхецкія роды Вялікага Княства. У 1572 г. у Радзе з 22 сенатараў 16 (або 3/4) былі пратэстантамі, і толькі 6 месцаў належалі каталікам і праваслаўным.

Прыхільнікі новай царквы

Арыстакраты-пратэстанты заходнееўрапейскіх краінаў імкнуліся да перадзелу на сваю карысць велізарных царкоўных землеўладанняў. У нашай дзяржаве, дзе такія ўладанні былі значна меншыя, існавала іншая сітуацыя. Падтрымаўшы Рэфармацыю, магнацкія роды Радзівілаў, Сапегаў, Хадкевічаў, Глябовічаў, Кішкаў, Храптовічаў, Валовічаў, Саламярэцкіх, Корсакаў разлічвалі адасобіцца ад каталіцкай Польшчы і замацаваць суверэнітэт Княства.

У новае веравызнанне пераходзіла і шмат мяшчанаў у Віцебску, Менску, Полацку ды іншых гарадах. На землях паноў-пратэстантаў шэрагі іх паслядоўнікаў папаўняліся за кошт сялянаў. Але параўнаўча з Заходняй Еўропай у нас гэты рух не паспеў ператварыцца ў народны.

Рэфармацыя ўключала некалькі плыняў – лютэранства, кальвінізм, сацыніянства (арыянства). Найбольшае пашырэнне ў Вялікім Княстве атрымаў кальвінізм. У 1550-х гадах кальвінісцкія супольнасці дзейнічалі ў Нясвіжы, Берасці, Клецку, Навагрудку, Койданаве, Ляхавічах, крыху пазней з'явіліся ў Віцебску, Менску, Полацку, Ворнях, Глыбокім, Івянцы, Смаргоні. У 1557 г. пратэстанты Вялікага Княства правялі ў Вільні свой устаноўчы сінод (з'езд). Пры канцы XVI ст. з 207 пратэстанцкіх святыняў у нашай краіне 189 былі кальвінісцкімі.

[illegible]

[illegible]

[illegible]

[illegible]

Культурна-асветная дзейнасць пратэстантаў

[illegible]

У другой палове XVI ст. пратэстантам належала больш дзесяці друкарняў, найбуйнейшымі з якіх былі Берасцейская, Нясвіжская, Лоская і Любчанская. Дзякуючы ім выйшлі ў свет сотні твораў айчынных і замежных аўтараў на беларускай, польскай, лацінскай ды іншых мовах. Сярод гэтых кніг – выдадзеная ў Берасці ў 1563 г. славутая пратэстанцкая Біблія. Тэхнічнае абсталяванне рэфармацкіх друкарняў, мастацкае афармленне і разнастайнасць іх выданняў адпавядалі тагачаснаму еўрапейскаму узроўню.

Евангелікі заснавалі некалькі дзясяткаў школаў, у тым ліку знакамітую Слуцкую кальвінісцкую гімназію, якая праіснавала два з паловаю стагоддзі і дала такіх вядомых дзеячоў культуры, як паэт і філосаф Андрэй Белабоцкі, асветнік Гальяш Капіевіч, вучоны-славяназнаўца Зарыян Далэнга-Хадакоўскі, астраном Вітаўт Цэраскі. Стварылі свае самыя лепшыя на той час школы. Таварыства Ісуса шмат што перайняла якраз у пратэстантаў. Напачатку годнае месца ў рэфармацкіх навучальнях з іх гуманістычнай сістэмай выкладання займала беларуская мова, на якой праводзілі казанні, пісалі творы. Разам з тым большасць кніг выдавалася пратэстантамі-ліцвінамі па-польску.

Рэфармацыя спрыяла развіццю ўсяго духоўнага жыцця грамадства. Культура Вялікага Княства Літоўскага ўзбагачалася здабыткамі еўрапейскай філасофскай думкі. Беларускія мысляры і асветнікі станавіліся ўпоравень з заходнееўрапейскімі братамі па духу.

Рэфармацыя пакінула глыбокі след у нашай гісторыі і культуры. Евангелікі (так называлі рэфарматараў) збудавалі ў Вялікім Княстве больш 250 сваіх збораў (храмаў). Некаторыя з іх, да прыкладу у Заслаўі, Койданаве, Смаргоні, сталі адметнымі помнікамі беларускай архітэктуры.

[illegible]

[illegible]

[illegible]

[illegible]

Аднічы Рэфармацыі

Сымон Будны стаў ідэйным правадыром беларускай Рэфармацыі. Ён выступаў за творчую свабоду асобы, за абмежаванне прыгонніцтва і роўнасць усіх станаў перад законам. [illegible]

Адным з лідараў рэфармацыйнага руху быў надзвычай адораны дзяржаўны дзеяч і мецэнат, перакананы прыхільнік незалежнасці Вялікага Княства Мікалай Радзівіл Чорны, які займаў высокія пасады канцлера і віленскага ваяводы. У сваіх уладаннях ён зачыніў 187 каталіцкіх храмаў, пераўтварыўшы шмат якіх у кальвінскія. Канцлер шчодра фундаваў пратэстанцкія друкарні ў Берасці і Нясвіжы, адчыняў кальвінскія зборы і школы.

Пад апекаю Радзівіла Чорнага пэўны час працаваў адзін з найвыдатнейшых людзей той эпохі філосаф-гуманіст Сымон Будны. Ён скончыў Кракаўскі ўніверсітэт, ліставаўся з ангельскім гісторыкам Дж. Фоксам ды іншымі вядомымі еўрапейскімі вучонымі. У заснаванай Будным Нясвіжскай друкарні выйшлі напісаныя па-беларуску яго кнігі «Катэхізіс» і «Пра апраўданне грэшнага чалавека перад Богам».

У Лоскай друкарні, якую заснаваў прыхільнік плыні арыянства магнат Ян Кішка, Будны выпусціў Новы Запавет з сваімі каментарамі, а таксама трактаты «Аб дзвюх прыродах Хрыста» і «Аб свецкай і духоўнай уладзе». На думку шмат якіх даследчыкаў, навукова-крытычны разгляд выдадзенага С. Будным Новага Запавету – самы высокі сярод вядомых на той час аналагічных выданняў у Еўропе.

Аднадумцам і прадаўжальнікам гуманістычнай традыцыі Сымона Буднага быў Васіль Цяпінскі. У сваёй друкарні ў маёнтку Цяпіна на Полаччыне ён выдаў беларускі пераклад Евангелля, у прадмове да якога бараніў родную мову, гісторыю і звычаі народа. Асноўнай мэтаю чалавечага жыцця Цяпінскі лічыў служэнне радзіме.

Біблія Сымона Буднага.

Выпускнік Кракаўскага ўніверсітэта, мысляр, пісьменнік і таленавіты прамоўца Ян Ляцкі Намыслоўскі надрукаваў у Лоску рэфармацкі падручнік «Зброя вучэння Арыстоцеля» і зборнік вершаваных маральна-павучальных выслоўяў «Сентэнцыі, неабходныя ў грамадскім жыцці», якія былі напісаны па-лацінску, па-польску і па-нямецку і сталі першым у Вялікім Княстве падручнікам замежных моў. Вялікі розгалас мела яшчэ адна яго кніга – «Анатомія і гармонія цела хрысціянскага чалавека». Доўгі час Намыслоўскі ўзначальваў славутую арыянскую школу ў Іўі.

Тытульны аркуш «Катэхізіса» Сымона Буднага. Нясвіж, 1562 г.

Да ліку ўсіх іншых рэфармацыйных плыняў належалі шмат якія палітыкі, філосафы, пісьменнікі – Астафей Валовіч, Аўгусцін Ротундус, Саламон Рысінскі, Андрэй Волан, Андрэй Рымша, Галляш Пельгрымоўскі.

Рэфармацыя ў Еўропе і ў Вялікім Княстве змянілася перыядам Контррэфармацыі. Каталіцкая царква перайшла ў наступ. Але ў нашай традыцыйна талерантнай дзяржаве змаганне з рэфарматамі не магло набыць такіх жорсткіх формаў, як у заходнееўрапейскіх краінах, дзе адбываліся працяглыя рэлігійныя войны. У нас немагчыма было нават уявіць крывавай Варфаламееўскай ночы, калі з згоды караля каталікі перарэзалі ў французскай сталіцы больш за тры тысячы пратэстантаў-гугенотаў.

У час Контррэфармацыі амаль уся літвінская арыстакратыя прыняла каталіцтва. (Да ранейшай праваслаўнай веры вярнуўся толькі Астафей Валовіч.) Гэты працэс пагоршыў паланізацыю вышэйшых слаёў грамадства.

БЕРАСЦЕЙСКАЯ ВУНІЯ. ЯДНАННЕ ЦЭРКВАЎ

Ідэя аб'яднання праваслаўнай і каталіцкай цэркваў з'явілася ў Вялікім Княстве яшчэ ў часы Вітаўта. З мэтаю ўмацавання адзінства дзяржавы ее падтрымлівалі ўсе вялікія князі. Першая спроба ўвесці вунію была звязана з пастановай аб'яднаўчага Фларэнційскага царкоўнага сабора 1439 г., але тады яна не атрымала належнай падтрымкі. У XVI ст. для гэтага ўзніклі больш спрыяльныя ўмовы.

Утварэнне Рэчы Паспалітай несла пагрозу ўзмацнення ў Вялікім Княстве польскіх уплываў. Тым часам у 1589 г. у Маскве з'явілася свая патрыярхія, якая абвясціла сябе пераемніцаю ўлады заняволенага туркамі Канстанцінопаля і прэтэндавала на ўсе населеныя праваслаўнымі землі. Патрыярхі падтрымлівалі заканадаўцаў імкненні ўладароў Масковіі, што называлі нашую краіну сваёй вотчынай. Разам з тым і праваслаўная, і каталіцкая цэрквы Княства мелі агульную патрэбу супрацьстаяць рэфармацыйнаму руху.

У Рым накіраваліся пераканаўчыя прыхільнікі вуніі епіскап уладзімірска-берасцейскі Іпат Пацей і епіскап луцкі Кірыла Тэрлецкі. Ад імя праваслаўных іерархаў яны выказалі згоду на аб'яднанне пры ўмове прызнання вяршэнства рымскага папы, але захавання ранейшых «грэцкіх» абрадаў і літургіі. Таленавіты палітык і высокаадукаваны пісьменнік-палеміст Іпат Пацей здолеў прыцягнуць на свой бок шматлікіх свецкіх, у тым ліку і праваслаўнага кіеўскага мітрапаліта Міхаіла Рагозу.

ХРАНАЛОГІЯ

1533–1613 гг.	— Жыццё і дзейнасць Іпата Пацея.
1574–1637 гг.	— Жыццё і дзейнасць Язэпа Руцкага.
1577–1633 гг.	— Жыццё і дзейнасць Мялеція Сматрыцкага.
1580–1623 гг.	— Жыццё і дзейнасць Язафата Кунцэвіча.
9 кастрычніка 1596 г.	— Сабор у Берасці абвясціў унію праваслаўнай і каталіцкай цэркваў Рэчы Паспалітай.
1633 г.	— [illegible]
12 лістапада 1623 г.	— Забойства полацкага архіепіскапа Язафата Кунцэвіча.

У 1596 г. быў склікаਨы Берасцейскі царкоўны сабор. Ён адбываўся ў складанай сітуацыі. У Берасце з'ехалася шмат дэлегатаў з Украіны, дзе шляхта адкрыта выступала супраць вуніі. Да гэтага лагера належаў і князь Канстанцін Канстанцінавіч Астрожскі. Тым не менш большасць праваслаўных епіскапаў, у тым ліку Іпат Пацей, уладыка полацкі Герман і пінскі Іона, 9 кастрычніка паставілі пад актам вуніі свае подпісы.

Аб'яднанне цэркваў не было вынікам «падступных езуітаў» і «гвалту над праваслаўнымі», як пра гэта часта пішуць расейскія гісторыкі. Прынятая вуніі мела важкія ўнутраныя прычыны, а канфлікт вакол яе выклікала рознае разуменне ўмоваў альянсу.

Усталяванне вуніяцкай, або грэка-каталіцкай, веры, якая спалучала традыцыйную ўсходнюю абраднасць з каталіцкімі царкоўнымі догматамі, напачатку ішло нялёгка. Вострая палеміка адбывалася на Соймах і ў літаратуры. Да сярэдзіны XVII ст. у Вялікім Княстве было надрукавана блізу 150 выданняў «за» і «супраць» вуніі. Яны выходзілі далёка за межы царкоўнай дагматыкі, закраналі агульнадзяржаўныя і культурныя праблемы. Гэтыя палемічныя трактаты, пасланні, памфлеты, лісты, казанні (сярод іх варта адзначыць «Казанні» Лявона Карповіча) утварылі цэлую літаратурную плынь.

На жаль, змаганне прыхільнікаў і праціўнікаў вуніі не заўсёды захоўвала мірныя формы, што адлюстравалася ў трагічным жыццёвым шляху грэка-каталіцкага арцыбіскупа Язафата Кунцэвіча.

Ён нарадзіўся на Украіне ў сям'і перасяленцаў з Беларусі і прыехаў на навуку ў Вільню. Мітрапаліт Іпат Пацей накіраваў здольнага юнака вучыцца ў Віленскую акадэмію, а потым сам пастрыг яго ў манахі. Кунцэвіч быў таленавітым прапаведнікам і энергічным царкоўным дзеячом. За пераход у вуніяцтва тысяч вілянчукоў ён атрымаў біскупскую катэдру, а ў 1618 г. стаў полацкім арцыбіскупам.

Не шкадуючы сябе, уладыка, аднак, бываў нецярпімым і да іншых. Яму супрацьстаялі аб'яднаныя ў брацтвы праваслаўныя мяшчане, якіх падтрымлівала значная частка праваслаўнай шляхты. Увосень 1623 г. Кунцэвіч прыехаў у Віцебск, дзе яго супернік, праваслаўны архіепіскап, адлучыў полацкага ўладыку ад царквы. Натоўп узброеных бунтаўнікоў учыніў над вуніяцкім іерархам жорсткую расправу. Пазней Язафат Кунцэвіч быў прылічаны да святых. Цяпер яго мошчы спачываюць у галоўным каталіцкім храме свету – рымскім саборы святога Пятра.

[illegible]

[illegible]



[illegible]

Але паступова новая царква ўмацоўвала свае пазіцыі. Шмат зрабіў дзеля гэтага наступнік Іпація Пацея на мітрапаліцкім пасадзе пісьменнік, педагог і прапаведнік Язэп Руцкі. Ён заснаваў уніяцкі манаскі Ордэн базыльянаў, назоў якога паходзіць ад імя аднаго з айцоў царквы святога Васіля (Базыля) Вялікага. Базыляне актыўна займаліся кнігадрукаваннем, адчынялі пры кляштарах школы і калегіюмы. Руцкі патрабаваў, каб сябры ордэна звычайна прамаўлялі казанні на «народнай» (беларускай) мове і рабілі на ёй усе свае публічныя выступы. У пастанове VI Генеральнай кангрэгацыі (з'езду) базыльянаў у 1636 г. было запісана: «Мы настойваем, каб айцы і браты прамаўлялі слова Божае не інакш, як на мове народа нашага».

Існуе думка, нібыта базыляне і наагул уніяты «скакалі пад езуіцкую дудку». Дакументы сведчаць пра іншае. Да прыкладу, базыляне судзіліся з езуітамі за крыж святой Еўфрасінні Полацкай і не аддалі святыню. Вядомы выпадак, калі Таварыства Ісуса падавала на суполыніцкаў Ордэна базыльянаў у суд за тое, што яны сцвярджалі, быццам «рэлігія рымская не пагаджаецца з святым Евангеллем».

[illegible]

[illegible]

За Язэпам Руцкім уніяцкая царква пачала істотна адрозніваццa ад традыцыйных праваслаўя і каталіцтва і набыла самабытны нацыянальны характар. У грэка-каталіцкіх храмах і манастырах гучала жывая беларуская мова, якой карысталіся ў казаннях, у школьным навучанні, царкоўных спевах.

[illegible]

Па-беларуску выходзіла уніяцкая літаратура: творы самога Язэпа Руцкага, Пятра Скаргі, Іпата Пацея, Язафата Кунцэвіча. Дарэчы, у дзейнасці праваслаўных брацкіх школаў і сярод праваслаўнага духавенства ў гэты перыяд, наадварот, усё шырэй выкарыстоўвалася польская мова.

Новая царква пастаянна пераменила як сапраўды народная. Так яе расцэньвалі пазней Кастусь Каліноўскі, Максім Багдановіч, Вацлаў Ластоўскі, Адам Станкевіч, а таксама Фрыдрых Энгельс, які грунтоўна вывучаў гісторыю Рэчы Паспалітай.

У праваслаўным асяроддзі краіны не ставала адукаваных асобаў, якія на роўных маглі б весці высокаінтэлектуальную палеміку з уніятамі. Выняткам стаў полацкі архіепіскап Мялет Сматрыцкі. Ён скончыў Віленскую акадэмію, а затым удасканальваў веды ў Лейпцыгскім і Вітэмбергскім універсітэтах. Пяру Сматрыцкага, які быў здольным пісьменнікам, належыць шмат твораў у абарону праваслаўя. Асаблівую славу прынесла яму выдадзеная па-польску ў 1610 г. кніга «Трэнас, альбо Лямант адзінай святой усходняй царквы». У ёй аўтар ад імя «маці-царквы» заклікаў народы Беларусі і Украіны аб'яднацца супроць каталіцтва. Аднак на схіле гадоў Сматрыцкі перайшоў на бок грэка-католікоў і ў новых творах пераконваў чытачоў у царкоўнай і дзяржаўнай мэтазгоднасці уніі.

[illegible]

Напружанасць у канфесійных стасунках была зьнятая нязначна пастановамі Соймаў, якія гарантавалі правы «ўсходняй» царквы, а таксама зацверджанымі ў 1633 г. «Артыкуламі супакаення рэлігіі грэцкай». Праваслаўныя атрымалі дазвол будаваць храмы, школы, шпіталі, адчыняць друкарні. Яшчэ раней аднавілася іерархія праваслаўнай царквы.

Тым часам унія заваёўвала ўсё больш прыхільнікаў. У другой палове XVII ст. з [illegible] мужчынскіх манастыроў праваслаўным застаўся толькі адзін. Грэка-каталіцкімі былі славутыя Жыровіцкі манастыр і Полацкая Сафія, якая зрабілася Меккаю уніяцкіх палемікаў.

[illegible]

[illegible]

Пры канцы XVIII ст. грэка-каталікамі былі ўжо тры чвэрці ўсіх жыхароў Беларусі. (Праваслаўныя складалі ўсяго 6 %.) Уніяты добра ведалі, што яны не палякі і не расейцы. Таму так ненавідзелі унію маскоўскія цары і вярхі расейскага праваслаўя.

[illegible]

УЛАДАРАННЕ ЖЫГІМОНТА ВАЗЫ

[illegible] Жыгімонта Вазы

На пачатку свайго кіравання Жыгімонт выдаў прывілей, якім зацвердзіў трэці Статут Вялікага Княства Літоўскага. Гэта адбылося ў студзені 1588 г. на каранацыйным Сойме і было звязана з патрабаваннем літоўскай шляхты, якая ў адваротным выпадку адмаўлялася прызнаць манарха. Новы збор законаў скасоўваў [illegible] Люблінскай уніі з Польшчай і замацоўваў суверэнітэт Княства ў канфедэрацыйнай Рэчы Паспалітай.

¹ [illegible]

Партрэт вялікага князя і караля Жыгімонта Вазы. [illegible] мастак. 16[illegible] г.

Пасля смерці Стэфана Батуры вялікім князем літоўскім і каралём польскім быў абраны Жыгімонт Ваза – сын караля Швецыі Юхана і Кацярыны, дачкі Жыгімонта Старога. Новы манарх уладарыў 45 гадоў, пад час якіх у нашай дзяржаве адбываліся вельмі значныя падзеі.

Жыгімонт Ваза падтрымаў Берасцейскую царкоўную унію, але не дапусціў грэка-каталіцкіх біскупаў у Сенат. Гаспадар абкружыў сябе вузкім колам магнатаў, чужаземцаў і езуітаў. Ён быў прыхільнікам узмацнення каталіцкай царквы, але разам з тым дзеля захавання рэлігійнай талерантнасці выдаў некалькі прывілеяў, якія забяспечвалі правы вернікаў-праваслаўных.

Спробы вялікага князя і караля ўвесці ў Рэчы Паспалітай абсалютную манархію ў 1606 г. выклікалі ў краіне рокаш – збройнае выступленне шляхты. Сярод іншага яна дамагалася і разрыву нявыгаднага для дзяржавы хаўрусу Жыгімонта з Габсбургамі і Святой Рымскай імперыяй. Змаганне з шляхтай скончылася кампрамісам і амністыяй. Сойм пацвердзіў, што і надалей манархі ў дзяржаве будуць выбірацца, а не атрымліваць трон у спадчыну.

Знешняя палітыка Жыгімонта Вазы была актыўнай, але непаслядоўнай. Калі ў 1592 г. памёр яго бацька, наш манарх адначасова стаў і каралём Швецыі. Аднак ён уступіў у востры канфлікт з шведскай пратэстанцкай шляхтай, якая праз сем гадоў скінула яго з каралеўскага пасаду. Намагаючыся вярнуць карону, Жыгімонт уцягнуў Вялікае Княства ў працяглую вайну з паўночнай суседкай.

ХРАНАЛОГІЯ

1587–1632 гг. – Уладаранне вялікага князя і караля Жыгімонта Вазы.
1588 г. – Гаспадар зацвердзіў трэці Статут дзяржавы.
1592–1599 гг. – Жыгімонт Ваза адначасова з'яўляецца каралём Швецыі.
1605–1606 гг. – Царстванне ў Маскве Дзмітрыя I.
1608–1610 гг. – Авантура Дзмітрыя II (Самазванца).

Генеалагічнае дрэва Жыгімонта Вазы [illegible]. Гравюра [illegible]. 16[illegible] г.

На ўсходнім кірунку вялікі князь плана-ваў на добраахвотнай аснове далучыць да Рэчы Паспалітай Расею і стварыць там царскую унію. Дзеля гэтага ён імкнуўся пасадзіць у Крамлі свайго стаўленіка або зрабіць царом сына Уладзіслава.

Расійскі цар Барыс Гадуноў. Ілжэдзмітрый I. Невядомы мастак. XVII ст.

Сустрэча Жыгімонта Вазы і Дзмітрыя I. Мастак М. Неўрэў. 1874 г.

Ад Жыгімонта атрымаў дапамогу Дзмітр I, які называў сябе малодшым сынам цара Івана IV, што насуперак афіцыйнай версіі нібыта не загінуў, а застаўся жывы. (Дарэчы, ёсць звесткі, што ў магіле царэвіча Дзмітра ў 1990-х гадах сапраўды знайшлі не царскія цела, а «лялку».) Існуе версія, што прэтэндэнтам на крамлёўскі пасад быў Рыгор Атрэп'еў з шляхецкага беларускага роду. Ён меў добрую адукацыю, валодаў некалькімі мовамі і ведаў вайсковую справу. На чале аддзелаў літвінскай і польскай шляхты падпарадкаваў сабе значную частку Расейскай дзяржавы і заняў Маскву. Але, каранаваўшыся ў 1605 г. як цар Дзмітр I, ён адмовіўся перадаць у склад Рэчы Паспалітай абяцаныя раней за падтрымку Смаленскую і Северскую землі.

Неўзабаве новага маскоўскага ўладара забілі баяры-змоўшчыкі. Яму на змену прыйшоў Дзмітр II, у мінулым – настаўнік у Шклове. Як і папярэднік, ён з войскам, што складалася пераважна з нашых суайчыннікаў, авалодаў на ўсходзе вялікімі абшарамі, але ўзяць Масквы не здолеў і быў забіты.

У 1609 г. Жыгімонт пачаў з Расеяй вайну, у ходзе якой маскоўскі ўрад згушана абвясціў каралевіча Уладзіслава царом. Аднак неўзабаве на крамлёўскі трон быў абраны Міхаіл Раманаў.

Вялізныя вайсковыя падаткі і спустошанні вялі нашую краіну да заняпаду.

Нядальнабачнасць Жыгімонта Вазы ў выбары еўрапейскіх хаўруснікаў выклікала шматлікія напады на Рэч Паспалітую крымскіх татараў і туркаў. У 1621 г. наш вялікі гетман Ян Караль Хадкевіч атрымаў бліскучую перамогу над туркамі пад Хоцінам, але нерашучыя дзеянні манарха не дазволілі напоўніцу выкарыстаць яе.

Палітыка Жыгімонта Вазы шмат у чым прывяла да змяншэння ролі Рэчы Паспалітай у Еўропе.

ВАЙНА З ШВЕЦЫЯЙ

Гетман Ян Караль Хадкевіч [illegible] Невядомы мастак [illegible] XVII ст.

Пазбаўлены ў 1599 г. шведскага трону, вялікі князь і кароль Жыгімонт Ваза не пагадзіўся з гэтым і распачаў цяжкую і зацятую вайну за панаванне на Балтыйскім моры. Зачэпкаю для яе стала ўключэнне Эстляндыі ў склад Рэчы Паспалітай. У часе вайны асабліва вызначалася войска Вялікага Княства Літоўскага на чале з Янам Каралем Хадкевічам, які паходзіў з старажытнага ліцвінскага роду.

Гетман Хадкевіч

Дзяцінства будучага славутага ваяра прайшло ў родавым замку-палацы ў маёнтку Мыш недалёка ад Баранавічаў. З малых гадоў Янка выяўляў цікавасць да вайсковай справы. Ён добра ездзіў на кані, страляў з лука і агнястрэльнай зброі. Вучыўся Хадкевіч у Віленскай акадэміі, а потым у Нямеччыне і італьянскіх універсітэтах Падуі і Венецыі. Ян Караль грунтоўна вывучаў гісторыю, геаграфію, матэматыку, дасканала валодаў лацінай. Разам з тым ён настойліва спасцігаў вайсковае майстэрства: штудзіраваў кнігі знакамітых палкаводцаў, вывучаў на востраве Мальта досвед змагання тамтэйшых рыцараў з туркамі.

Камандуючы ўласным аддзелам конніцы, Ян Караль Хадкевіч атрымаў першыя перамогі пад час ваенных экспедыцый у Малдавію і Валахію. Гэты поспех неўзабаве прынёс яму высокую пасаду польнага гетмана.

Дзякуючы выдатнаму вайсковаму таленту Хадкевіч звычайна дасягаў перамогі над значна большымі непрыяцельскімі сіламі. (Трэба ўлічыць, што шведскае войска было адным з найлепшых у Еўропе.) Так, наш гетман разбіў шведаў пад Кокенгаўзенам (1601 г.) і Дэрптам (1603 г.). У бітве пад Белым Каменем у 1604 г. дзве тысячы нашых жаўнераў разграмілі 7-тысячны варожы корпус. У наступным годзе Хадкевіч атрымаў булаву вялікага гетмана.

Ягоным улюбёным родам войскаў былі гэтак званыя крылатыя гусары. Да іх панцыраў мацаваліся вялізныя крылы з пёраў, якія пад час атакі сваім гулам наводзілі на ворага жах. Менавіта беларускія гусары з бел-чырвона-белымі сцяжкамі на дзідах прынеслі ў тыя гады нашай арміі найбольшую славу. Яны дапамаглі Хадкевічу здабыць фантастычную перамогу пад Кірхгольмам.

Ад самага пачатку вайны з шведамі Хадкевіч быў у Інфлянтах. Ён усталяваў у войску суровую дысцыпліну, [illegible] пра ўмацаванне і забеспячэнне падначаленых. Калі дзяржаўных грошай на заробак жаўнерам [illegible], гетман [illegible] утрыманне арміі на сябе, хаця часта [illegible] ўласныя маёнткі.

ХРАНАЛОГІЯ

1560–1621 гг. – Жыццё і дзейнасць Яна Караля Хадкевіча
1600–1629 гг. – Вайна Рэчы Паспалітай і Швецыі
1601 г. – Шведы разбітыя пад Кокенгаўзенам
1603 г. – Перамога над шведамі пад Дэрптам
1604 г. – [illegible] пад Белым Каменем
1605 г. – [illegible] Я. Хадкевіча [illegible] гетманам
27 верасня 1605 г. – [illegible] Карла IX пад Кірхгольмам
Сакавік 1609 г. – [illegible] шведскага флоту [illegible]
1620 г. – Пачатак вайны з Турцыяй
Верасень 1621 г. – Бітва пад Хоцімам

Беларускі [illegible] гусар [illegible] Гравюра XIX ст.

Шведскі кароль Карл IX [illegible] Невядомы мастак. 1600 г.

Кірхгольмская бітва

27 верасня 1605 г. 4-тысячны корпус Хадкевіча на беразе Дзвіны каля вёскі Кірхгольм (цяпер латвійскі Саласпілс) сустрэўся з арміяй шведскага караля Карла IX, якая налічвала 14 тысяч жаўнераў. Нашае войска складалася цалкам з ліцвінаў-беларусаў. Імі былі і ўсе камандзіры: Ян Пётра Сапега, Вінцэнт Война, Ян Кішка, Тамаш Дуброва, Марцін Гедройц...

Гетман вымусіў шведаў атакаваць першымі. Ён загадаў нашай лёгкай конніцы ўвязацца ў бой і адступіць. Карл IX, паверыўшы ў блізкую перамогу, кінуў у наступ і кавалерыю, і сваю праслаўленую пяхоту, якая разам з гарматамі спусцілася з зручных пазіцый на ўзвышшы. Шведы нечакана апынуліся пад моцным агнём нашых пяхотнікаў. І тут з флангаў на ворага абрынулася гусарская конніца ліцвінаў...

Польскія падручнікі называюць разгром шведаў пад Кірхгольмам трыумфам польскай зброі. Аднак у сапраўднасці, як давёў польскі даследчык Анджэй Рахуба, палякаў там не было. На дапамогу войску Вялікага Княства прыйшлі толькі 300 райтараў курляндскага герцага.

Гусарскі афіцэр у Кірхгольмскай бітве. Фрагмент карціны П. Снайерса. 1610 г.

План бітвы пад Кірхгольмам, у якой [illegible] войскі Вялікага Княства на чале з гетманам Янам Каралем Хадкевічам. Гравюра XVII ст.

Пад Кірхгольмам шведы, паводле розных звестак, страцілі ад 6 да 9 тысяч жаўнераў, [illegible] артылерыю і 60 сцягоў. З войска Вялікага Княства Літоўскага загінула ўсяго толькі 100 жаўнераў і 200 былі параненыя. Слава пра перамогу разнеслася па ўсім свеце. Віншаванні вялікаму гетману прыслалі папа рымскі і большасць еўрапейскіх манархаў. Бліскучы трыумф Хадкевіча, які [illegible], увайшоў у [illegible] тактычных перамог у сусветнай гісторыі.



Марская перамога пад Салісам

Пад час кампаніі 1608 г. шведская армія з 12 тысяч жаўнераў высадзілася на ўзбярэжжы Латвіі і, выкарыстаўшы часовую адсутнасць Хадкевіча ў Інфлянтах, заняла вялікую тэрыторыю. Маючы ўсяго 2 тысячы кавалерыстаў і невялікую артылерыю, наш гетман пастанавіў адказваць стратэгіяй. Ён штурмам вызваліў Парнаву (Пярну) у Эстоніі, а затым рушыў на дапамогу абложанай шведамі Рызе. Атрымаўшы звесткі, што недалёка знаходзіцца шведскі флот, Хадкевіч распрацаваў і здзейсніў бліскучы план.

Паблізу горада Саліс (цяпер Салацгрыва ў Латвіі) вялікі гетман пасадзіў сваіх ваяроў на некалькі караблёў, захопленых раней у непрыяцеля і набытых у марскіх гандляроў. Рыга размясцілася проста на лодках. Натхнёныя Хадкевічам спешаныя коннікі, сярод якіх шмат хто раней нікол і не бачыў мора, рушылі на ворага. Іх вялі адвага і вера ў майстэрскі геній гетмана.

Уначы ў вусці ракі Салацы ліцвіны раптоўна з'явіліся перад варожым флотам і накіравалі на яго некалькі падпаленых брандэраў (суднаў з выбуховымі і палкімі рэчывамі). Два шведскія караблі загарэліся і пачалі тануць. У святле пажару нашыя гарматы трапна ўдарылі па астатніх. Ратуючыся, непрыяцельскія маракі панічна выходзілі ў адкрытае мора.

Марская бітва пад Салісам увайшла ў летапіс беларускай вайсковай славы. Вядомы пісьменнік Юльян Нямцэвіч у XIX ст. напісаў пра «бітваку» гэтай перамогі такія словы: «Толькі геній здольны знаходзіць магчымасці, якіх звычайны розум не заўважае».

Турэцкая кампанія

Адначасова з шведскай вайной Рэч Паспалітая да 1609 г. вяла баявыя дзеянні супраць Расійскай дзяржавы. Дзякуючы Яну Каралю Хадкевічу вайска вярнулася і засталася ў нашай краіне Смаленск.

Пазней разгарэлася яшчэ адна вайна – з Асманскай імперыяй. Турэцкі султан Асман II рыхтаваў вялікі паход на поўнач. Ён заявіў, што разгроміць Рэч Паспалітую і будзе маліцца Аллаху на беразе Балтыйскага мора. Наступ з поўдня даручана было адбіваць Хадкевічу, якога прызначылі камандаваць аб'яднаным войскам Вялікага Княства і Польшчы.

У верасні 1621 г. пад Хоцінам (цяпер Чарнавіцкая вобласць Украіны) наш гетман з 70-тысячнай арміяй, у склад якой уваходзілі і запарожскія казакі, перамог удвая з лішкам большыя сілы туркаў. Абарона ўмацаванага лагера Хадкевіча, які нягледзячы на цяжкую хваробу некалькі разоў асабіста ўзначальваў баявыя вылазкі, доўжылася цэлы месяц. Страціўшы 80 тысяч жаўнераў з 150 000, султан прызнаў паразу. Ян Хадкевіч скончыў у Хоцінскім замку пад час бітвы. Прадчуваючы блізкую смерць, ён забараніў паведамляць пра яе, каб не падарваць баявы дух сваіх ваяроў.

Сучаснікі пісалі, што разам з вялікім гетманам памерла «вялікае шчасце Айчыны нашай». Дзяржава сапраўды развіталася з адным з найвыдатнейшых палкаводцаў у сваёй гісторыі.

Падпісаны ў тым самым 1621 г. мір з Асманскай імперыяй пакінуў ранейшую мяжу нязменнай і выбавіў Рэч Паспалітую з небяспечнай вайны.

Замірэнне з Швецыяй было падпісанае толькі праз восем гадоў. Рэч Паспалітая панесла значныя тэрытарыяльныя страты. У яе ўладанні засталася толькі паўднёва-ўсходняя частка Інфлянтаў.

ВОЙНЫ З РАСЕЯЙ У ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVII СТАГОДДЗЯ

[illegible]

Разгром гетманам С. Жалкеўскім у шмат разоў большых расейскіх сілаў выклікаў у Маскве паніку. Баярскі ўрад пазбавіў Шуйскага улады і запрасіў на трон каралевіча Уладзіслава, якога афіцыйна абвясціў царом. Неўзабаве наша войска заняло расейскую сталіцу. У маскоўскі гарнізон уваходзілі два палкі Вялікага Княства на чале з мазырскім харужым палкоўнікам Янам Будзілам і палкоўнікам Эразмам Стравінскім.

Паходы на Маскву

На пачатку 1609 г. Дзмітрый II (Самазванец) захапіў палову Маскоўскага царства і стаяў каля сцен яго сталіцы. Цар Васіль Шуйскі папрасіў дапамогі ў Швецыі, з якой ваявала Рэч Паспалітая. Гэта сталася падставаю для абвяшчэння вайны Расеі. Вялікае Княства і Польшча мелі на мэце вяртанне захопленых расейцамі земляў і найперш Смаленска.

Улетку 1610 г. беларускія і польскія палкі, якімі камандаваў гетман Станіслаў Жалкеўскі, разбілі пад Клушынам (паблізу Гжацка) 35-тысячную непрыяцельскую армію. У гетмана было ўсяго 6325 кавалерыстаў, 200 пяхотнікаў і чатыры гарматы.

[illegible]

Расейцы аддавалі Маскву толькі праз два гады, пасля чаго царом абралі Міхаіла Раманава. Спроба вялікага гетмана Яна Караля Хадкевіча выратаваць беларуска-польскі гарнізон з аблогі і вярнуць на трон Уладзіслава была запозненай. Наша невялікае 3-тысячнае войска мусіла адысці.

Новы паход на Маскву адбыўся ў 1617–1618 гг. Войска ўзначальваў сам Уладзіслаў, але фактычным кіраўніком выправы быў гетман Хадкевіч. Расейскі гарнізон адбіў штурм, аднак значныя страты ў людзях і вычарпанасць запасаў прымусілі непрыяцеля пайсці на перамовы.

ХРАНАЛОГІЯ

1609–1618 гг. – Вайна Рэчы Паспалітай з Расіяй.
Верасень 1610 г. – Войскі Вялікага Княства Літоўскага і Польшчы занялі Маскву.
1610–1612 гг. – Царкаванне ў Расіі Уладзіслава Вазы.
Чэрвень 1611 г. – У Расіі захоплены Смаленск.
1612 г. – Паход вялікага гетмана Яна Караля Хадкевіча на Маскву.
1617–1618 гг. – Паход на Маскву каралевіча Уладзіслава.
1618 г. – Дэвулінскае замірэнне.
1632–1634 гг. – Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай.
1632–1648 гг. – Уладаранне вялікага князя і караля Уладзіслава Вазы.
1634 г. – Палянаўскае замірэнне.
1648–1651 гг. – Вайна з казакамі.
31 ліпеня 1649 г. – Бітва пад Лоевам.

[illegible] Сярэдзіна XVII ст.

[illegible] Сярэдзіна XVII ст.

Гетман Станіслаў Жалкеўскі, які разбіў расейскую армію, [illegible] XVII ст.

Партрэт вялікага князя і караля Уладзіслава Вазы. [illegible]

Вяртанне Смаленска

Горадам, вакол якога разгарнуліся галоўныя баявыя дзеянні ў той вайне, стаў старажытны беларускі Смаленск, захоплены Масковіяй яшчэ ў 1514 г. Смаленскі замак уяўляў сабой адно з найбуйнейшых абарончых збудаванняў на ўсходзе Еўропы. Даўжыня ягоных мураваных сценаў складала блізу 6,5 кіламетра, вышыня – 10–12 метраў, а таўшчыня сягала 6 метраў. Над муравамі пагрозліва ўзвышаліся 38 вежаў.

У магутнай смаленскай фартэцыі знаходзіўся вялікі царскі гарнізон на чале з Міхаілам Шэінам. Аблога Смаленска доўжылася болей за 20 месяцаў, але ў чэрвені 1611 г. горад быў узяты прыступам і вернуты ў склад Вялікага Княства. У тых падзеях вызначыліся ваяры-ліцвіны Льва Сапегі.

У 1613 г. Смаленск абкружыла расейскае войска, аднак ліцвінскія аддзелы Яна Пятра Сапегі і Аляксандра Лісоўскага змусілі ворага зняць аблогу. Маючы ў тыле смаленскую фартэцу, Княства правяло паспяховыя экспедыцыі на Бранск і Старадуб.

Лісоўчыкі

Еўрапейскую вядомасць у той вайне атрымала лёгкая беларуская кавалерыя, названая паводле імя яе камандзіра лісоўчыкамі. Аляксандар Язэп Лісоўскі, віленскі шляхціч і таленавіты военачальнік, стварыў надзвычай мабільныя аддзелы з адметнай тактыкай. Узброеныя шаблямі, дзідамі, лукамі, а таксама мушкетонамі, лісоўчыкі, якія не мелі абозу, рабілі імклівыя рэйды па глыбокіх варожых тылах.

Ваюючы спачатку на баку Дзмітра II, Лісоўскі з сваімі некалькімі тысячамі вершнікаў браў Каломну, Галіч, здзяйсняў паспяховыя паходы ў Пскоўскую, Ноўгарадскую, Уладзіміра-Суздальскую землі.

Фармаванні лісоўчыкаў захаваліся і пасля раптоўнай смерці іхнага камандзіра (магчыма, атручанага маскоўцамі). Іх ваярскае майстэрства і нястрымны напор звязалі Францыя, Італія, Нямеччына, Чэхія і Вугоршчына, дзе нашы кавалерысты ваявалі пазней як наймітны германскага імператара.

Дзявулінскае замірэнне

Вайна 1609–1618 гг. завяршылася замірэннем, падпісаным у вёсцы Дзявуліна каля Троіцка-Сергіевай лаўры пад Масквой. Абодва бакі былі знясіленыя і спадзяваліся атрымаць перадышку, аднак не збіраліся адмаўляцца ад сваіх планаў. Тут зноў выявіўся выдатны дыпламатычны талент Льва Сапегі, які трымаўся ўпэўнена і бескампрамісна.

Маскоўская дэлегацыя ўрэшце адмовілася ад прэтэнзіяў на Смаленск і Смаленшчыну, а таксама на Чарнігаўскую і Ноўгарад-Северскую землі. Апрача Смаленска ў склад Вялікага Княства вярталіся Мажайск, Дарагабуж, Вязьма – агулам 30 гарадоў. Аднак каралевіч Уладзіслаў не адмаўляўся ад тытула маскоўскага цара. У сваю чаргу не хапала нагоды з вялікімі тэрытарыяльнымі стратамі Расея.

Улетку 1613 г. гетман Хадкевіч, каб адагнаць расейскія сілы ад Смаленска, накіраваў Лісоўскага углыб непрыяцельскіх абшараў. Наша кавалерыя, праходзячы часам 150 кіламетраў за суткі, захапіла горад Карачаў і разграміла там войскі князя Хаванскага. Галоўнай прычынай не дасягнуць стала Панаўка... царскія сілы. Лісоўскі ... Смаленск. «Лісоўчыкам ..., што пажар бушуе», – гаворыцца ў ... XVII ст.

Медаль у гонар перамогі войскаў пад Смаленскам. Бронза. Аверс. 1636 г.

Смаленская кампанія

У студзені 1633 г. ваявода М. Шэін з 20 тысячамі кавалерыі і пяхоты, а таксама моцнай артылерыяй узяў у аблогу Смаленск, захоп якога быў галоўнай мэтаю вайны. Нашая 2-тысячная залога на чале з Самуэлем Друцкім-Сакалінскім трымала гераічную абарону. Палявы гетман Крыштоф Радзівіл здолеў прарваць блакаду і правесці ў горад значнае падмацаванне. Тым часам разам з ваярамі мужна баранілі свае месты палачане і віцябляне.

Старажытныя смаленскія фартыфікацыі. Гравюра XIX ст.

На пачатку верасня 1633 г. пад Смаленск падышла армія новага вялікага князя і караля Уладзіслава Вазы. Ён прывёў 25 тысяч ліцвіноў і палякаў, а таксама некалькі тысяч запарожскіх казакоў. Ваяводу Шэіна адкінулі ад смаленскіх сценаў і абкружылі. У лютым 1634 г. ён падпісаў акт пра капітуляцыю, паводле якога пакінуў пераможцам усе свае 123 гарматы і 129 баявых сцягоў. За гэта Шэіна прысудам расейскай Баярскай думы пакаралі смерцю.

Мірная дамова, падпісаная на рацэ Палянаўцы паміж Вязьмай і Дарагабужам, пацвярджала асноўныя ўмовы Дзявулінскага замірэння.

Смерць вялікага князя і караля Жыгімонта Вазы ў 1632 г. сталася нагодай да пачатку новай вайны, якую часта называюць Смаленскай. Увосень таго самага года царскія ваяводы захапілі Асвею, Друю, Себеж, Невель, Езярышча, Усвят, Веліж, Сураж, Дарагабуж, Рослаў, Амсціслаў, Крычаў... Але на Полаччыне і ў Падняпроўі расейскае войска мусіла весці цяжкія баі, бо гарады ўдавалася браць толькі штурмам.

Капітуляцыя расейскага ваяводы Міхаіла Шэіна перад вялікім князем і каралём Уладзіславам Вазам пад Смаленскам. Невядомы мастак XVII ст.

Вялікі гетман Януш Радзівіл. Невядомы мастак першай паловы XVII ст. Нясвіжская калекцыя Радзівілаў

Бітва войска Рэчы Паспалітай з казакамі. Малюнак з рукапісу ў Сен-Жэрменскім абацтве Парыжа

Удзел у бітве пад Лоевам 21 ліпеня 1649 г. Габелен з Нясвіжскай мануфактуры Радзівілаў. Першая палова XVIII ст.

Вайна з казакамі

У 1648 г. украінскі гетман Багдан Хмяльніцкі выступіў супраць улады Рэчы Паспалітай. Ён накіраваў у Вялікае Княства Літоўскае шматлікія загоны казакоў. Планавалася захоп беларускага Падняпроўя і ўлучэнне яго ў склад казацкай дзяржавы. Частка мясцовых жыхароў падтрымала акупантаў.

Увесь поўдзень нашай краіны трапіў у рукі казакоў, якія разам з пагромамі панскіх маёнткаў рабавалі простых людзей, выразалі габрэяў. На заваёўнікаў рушыў з сваімі аддзеламі палявы гетман Януш Радзівіл. Выдатна ўзброеныя шляхецкія палкі бралі горад за горадам, жорстка караючы казакоў ды іх хаўруснікаў. Пінск на два дні аддалі «на агонь і рабунак», бо ягоныя жыхары бараніліся разам з казакамі. Бабруйцы пад час аблогі папрасілі прыняць капітуляцыю і адпаведна ўмовам выдалі акупантаў ды іншых памагатых. Радзівіл стрымаў слова і не дазволіў сваім жаўнерам пустошыць места. Як сведчаць мемуары ўдзельніка кампаніі, нават за адну ўзятую хустку гетман загадаў павесіць рабаўніка на гарадской браме.

Найбуйнейшая бітва адбылася ўлетку 1649 г. пад Лоевам. Разгромленае арміяй Вялікага Княства казацкае войска страціла 8 тысяч забітымі і 3 тысячы патанулымі ў Дняпры.

У выніку ваенных дзеянняў палова абшараў паўднёва-ўсходняй Беларусі зазнала жудаснае спусташэнне. Сойм Рэчы Паспалітай мусіў вызваліць шэраг павятаў ад выплочвання падаткаў. Вайна 1648–1651 гг. не прынесла ні паўстанцам, ні дзяржаве выйгрышу, апрача крыві ды разбурэнняў.

У 1654 г. на Вялікае Княства Літоўскае абрынулася самая цяжкая ў нашай гісторыі вайна, якую сучаснікі назвалі «крывавым патопам».

КРЫВАВЫ ПАТОП

Гетман Багдан Хмяльніцкі. Невядомы мастак XVII ст.

Маскоўскае нашэсце

У Маскве ўважліва сачылі за вайной з казакамі ў Беларусі і змаганнем Польшчы з войскам Хмяльніцкага на Украіне. Цар пачаў разглядаць украінскага гетмана як хаўрусніка ў сваіх захопніцкіх планах. Казаччына знясільвала Рэч Паспалітую і стварала зручны момант для нападу. Пасля Пераяслаўскай Рады, якая ў студзені 1654 г. прыняла пастанову пра пераход Украіны «пад царскую руку», вайна зрабілася непазбежнай.

Увесну таго самага года на ўсходнія абшары нашай дзяржавы з Вялікіх Лукаў, Вязьмы і Бранска ўварваліся тры вялізныя расійскія арміі. На дапамогу ім з поўдня рушылі на Беларусь пасланыя Хмяльніцкім 20 тысяч казакоў гетмана Івана Залатарэнкі. Разам сілы захопнікаў складалі блізу 100 тысяч.

Ян Казімір Ваза [illegible]

Масква прыкрывалася словамі пра абарону праваслаўных ад уціску «проклятых ляхов». Напачатку абяцанні цара Аляксея Міхайлавіча, што ён захавае правы і маёмасць беларускай шляхты і забяспечыць усім праваслаўным спакойнае жыццё, мелі на памежных з Расеяй землях даволі значны ўплыў.

Вялікае Княства Літоўскае, якое не паспела загаіць раны пасля нядаўняга ваеннага ліхалецця, было дрэнна падрыхтаванае да нападу з усходу. Апрача ўсяго дзяржава не мела вялікага гетмана: новы манарх Ян Казімір марудзіў з прызначэннем на гэтую пасаду Януша Радзівіла, пераканаўчага прыхільніка незалежнасці Княства.

Нарэшце атрымаўшы гетманскую булаву, Радзівіл здолеў сабраць дзеля абароны краіны 10-тысячнае войска. Пад Шкловам ён выйграў вялікую бітву з непрыяцелем, страціўшы ўсяго 700 ваяроў, тым часам як маскоўцы – у дзесяць разоў болей. Але тая перамога не змяніла катастрафічнай сітуацыі. За першыя месяцы вайны царскія стральцы і казакі занялі Полацак, Магілёў, Оршу, Шклоў, Крычаў ды дзясяткі іншых гарадоў і мястэчак. Тым, што адмаўляліся ад капітуляцыі, цар загадаў разбураць, а іх насельніцтва вынішчаць або выводзіць у палон. Не зважаючы на гэта, большасць гарадоў не пагаджаліся здавацца і ўпарта адбіваліся. Віцебск абараняла пераважна мяшчанства. Побач з ваярамі біліся на сценах жыхары Гомеля і Дуброўны. Тры месяцы трымалі аблогу смаляняне, паўтара года – жыхары Старога Быхава.

ХРАНАЛОГІЯ

[illegible]

25 чэрвеня 1660 г. – Разгром царскага войска пад Палонкай.

[illegible]

Вялікі гетман Януш Радзівіл. [illegible]

Захапіўшы Дуброўну, царскія стральцы спалілі горад, зраўнавалі яго з зямлёй, а ўсіх жыхароў забралі ў няволю. Найбольш страшны лёс напаткаў Амсціслаў. Там, як сведчаць расійскія гістарычныя дакументы, «шляхты, поляков, литвы и иных служилых людей побито больше десяти тысяч». Астатніх ваявода Трубяцкой вывеў у палон, папярэдне знішчыўшы места. У руіны ператварыліся Рэчыца, Жлобін, Рагачоў. У 1655 г. была ўзятая Вільня, дзе вусцішную разню ўчынілі казакі Залатарэнкі і стральцы ваяводы Чаркаскага. У кляштарах яны гвалцілі і забівалі манашак. Касцёл святога Міхала ўбачыў рабаванне магілы канцлера Льва Сапегі. «Вызваліцелі праваслаўных» пустошылі і палілі віленскія праваслаўныя храмы. Палова месціцаў загінула, астатнія пакінулі горад.

Вялікае Княства Літоўскае ў XVII ст.

Маскоўскі цар Аляксей Міхайлавіч [illegible] Невядомы мастак XVII ст.

Ужо на другі год вайны амаль уся Беларусь (з выняткам Берасцейшчыны і Піншчыны) апынулася пад акупацыяй. Нескаранымі заставаліся нешматлікія фартэцыі, у тым ліку Стары Быхаў, Ляхавічы і Слуцак, якія пільна ў палоне бараніліся праваслаўныя і вуніяты, пратэстанты і каталікі, а таксама жыды. Адданасць жыхароў Вялікага Княства незалежнасці ад этнічнага паходжання і веравызнання была яскравай праявай дзяржаўнага патрыятызму продкаў.

[illegible]

Прыхільнікі вуніі з Швецыяй [illegible] Вялікага Княства Літоўскага ад агрэсіі з боку Масквы і ад польскай экспансіі. Свае подпісы пад дакументам паставілі блізу 1150 асобаў.

Вайна з Швецыяй

З падзеямі маскоўскага нашэсця пераплялася вайна, якая распачалася ў 1655 г. нападам шведскага караля Карла X Густава на Польшчу. Шведы хутка акупавалі большую частку польскіх земляў з Варшавай і Кракавам і занялі Жамойць. Улетку першага года вайны непрыяцель захапіў Браслаў і Друю, а пазней узяў у аблогу Берасце.

У тых умовах частка магнатаў, каталіцкіх іерархаў і вайсковых чыноў Вялікага Княства на чале з вялікім гетманам Янушам Радзівілам заключылі ў жніўні 1655 г. у Кейданах пагадненне пра вунію з Швецыяй. Кейданскі акт прадугледжваў аб'яднанне Княства і Швецыі на роўных правах (вунія з Польшчай скасоўвалася). Пры гэтым кароль Карл X Густаў абавязваўся спрыяць выгнанню з нашых абшараў расейскага войска, а вызваленыя гарады, замкі і землі вярнуць былым уладальнікам.

Аднак большасць шляхты і войска не прынялі аб'яднання з Швецыяй і захавалі вернасць гаспадару Яну Казіміру Вазу. Супраць Януша Радзівіла ўзбунтавалася ягоная ж армія. Гетман неўзабаве памёр (магчыма, быў атручаны). Акт Кейданскай вуніі не ажыццявіўся.

Для Рэчы Паспалітай гэтая вайна завяршылася падпісаннем у 1660 г. Алівускага замірэння. Паводле яго Ян Казімір Ваза адмаўляўся ад прэтэнзіяў на шведскі трон. Рэч Паспалітая прызнавала за Швецыяй заваёвы на поўнач ад Дзвіны. Курляндскае і Земгальскае герцагствы і Інфлянцкае ваяводства заставаліся супольным уладаннем Вялікага Княства Літоўскага і Польшчы.

[illegible]

[illegible]

У расейскай няволі

На захопленых расейскімі войскамі землях Княства панавалі гвалт і рабункі. У рэлігійнай палітыцы царскія ўлады кіраваліся тут прынцыпамі: «униатам не быть», «костелам не быть, а петь в домах», «жидам в Белой Руси не быть и житья никакого не иметь». Але і прыналежнасць да праваслаўя не ратавала ад марадзёрства і здзекаў. Дакументы захавалі шмат прыкладаў, калі «браты па веры» нішчылі праваслаўныя храмы і забівалі святароў, на месца якіх прысылалі надзейных папоў з Масковіі. «Навошта столькі крыўды, крадзяжоў, пакутаў і забойстваў у гарадах і вёсках, у лясах і на палях, за што ў кожным месцы чуецца плач і ліюцца слёзы?» – у роспачы пісаў да царскіх ваяводаў праваслаўны епіскап полацкі і віцебскі Каліст.

[illegible] XVII ст.

[illegible]

Дзясяткі тысяч нашых продкаў прымусова вывозіліся ў Маскоўшчыну. Цар Аляксей Міхайлавіч не хаваў намеру перасяліць на свае землі 300 тысяч беларусаў. Кожны маскоўскі памешчык мог прыехаць у Беларусь і купіць у царскіх стральцоў колькі заўгодна палонных па 3–5 рублёў за «галаву». Звычайна выбіралі маладых жанчын і дзяцей ад 10 да 16 гадоў. Асобнай групай самых каштоўных перасяленцаў былі рамеснікі, якіх часам заваблівалі абяцаннем высокіх заробкаў, але найчасцей забіралі сілай. Адначасова ў акупаваных гарадах цар спрабаваў сяліць на сталае жыхарства сваіх ратнікаў, якім адводзіліся землі і плаціліся скарбовыя грошы на будаўніцтва.

Цэлыя паветы былі спустошаныя, выпаленыя і знелюджаныя. Ад безлічы непахаваных людзей і жывёлаў пачалася эпідэмія чумы, што суправаджалася голадам.

[illegible] XVII ст.

У 1657 г. Берасце ўзялі ў аблогу шведска-вугорскія войскі.
На гравюры добра відаць старадаўні горад, які ў першай палове XIX ст.
будзе канчаткова зруйнаваны расійскімі ўладамі дзеля будаўніцтва
на яго месцы «Брэсцкай крэпасці».
Мастак Э. Дальберг. Нюрнберг, 1696 г.

Народны супраціў

Першыя сялянскія і мяшчанскія аддзелы самаабароны, якія ахоўвалі вёскі ды мястэчкі, перашкаджаючы рабункам і вывазу людзей у палон, узнікалі ўжо на самым пачатку расейскага ўварвання. Найбольш чынны партызанскі рух разгарнуўся на Смаленшчыне, а таксама ў ваколіцах Полацка, Віцебска, Магілёва і на Амсціслаўшчыне. У ліпені 1654 г., калі ваявода Трубецкой узяў у аблогу Амсціслаў, 15-тысячнае царскае войска атакавала аддзел з трох тысяч беларускіх сялянаў Каменкаўскай воласці. Тады сама ў адкрыты бой з рэгулярнымі маскоўскімі сіламі першы ўступілі партызаны на Полаччыне.

Узімку 1654/55 г., калі наш гетман Януш Радзівіл вёў паспяховае контрнаступленне, партызаны рабілі засады на дарогах, вынішчалі дробныя расейскія аддзелы, узялі ў палон некалькіх варожых ваяводаў. Пазней з сялянамі, што складалі аснову супраціву, нападала і шляхта, з асяродзя якой выйшла большасць партызанскіх камандзіраў.

У 1657–1658 гг. народнае змаганне з захопнікамі пашырылася на Менскае і Навагрудскае ваяводствы. Партызаны фактычна трымалі пад кантролем усю Магілёўшчыну. У шэрагі змагароў уліваліся ўсё больш мяшчанаў і шляхты, якая мела вайсковы досвед, што рабіла ўдары па ворагу адчувальнейшымі.

Імкненне вызваліцца ад захопнікаў і прыгнечаных імі [illegible] ахапіла і беларускія гарады. Па іх пракацілася цэлая хваля антымаскоўскіх паўстанняў, найбуйнейшае з якіх выбухнула ў Магілёве. Ягоныя жыхары, што здалі горад расейскім стральцам без бою, не вытрымаўшы гвалту і бясконцага рабавання, 1 лютага 1661 г. выразалі ўвесь 7-тысячны царскі гарнізон. Тое самае адбылося ў Амсціславе, Шклове, Гомелі, Дзісне, Себежы, Старым Быхаве.

Шырокі народны вызвольны рух спрыяў пераходу войскаў Рэчы Паспалітай да наступальных дзеянняў.

Нашы партызаны вызвалілі Глыбокае, Бешанковічы, Лукомль і заблакавалі расейскі гарнізон у Віцебску. Цар мусіў накіроўваць у Беларусь адмысловыя карныя экспедыцыі з артылерыяй. Яны палілі партызанскія вёскі. [illegible] з узятымі ў палон, але супраціў не спыняўся.

Бітва пад Палонкай

Дзеля кіравання захопленымі землямі ў Маскве быў створаны Прыказ Вялікага Княства Літоўскага. Але Літва-Беларусь упарта не пагаджалася на ролю расейскай правінцыі.

Каб канчаткова падпарадкаваць няскораную краіну, увосень 1659 г. Аляксей Міхайлавіч паслаў сюды вялікую армію пад камандаю князя Івана Хаванскага. Як заўсёды, выкарыстоўваючы на нашых абшарах тактыку выпаленай зямлі, царскія стральцы дайшлі да Горадні і захапілі Берасце.

Аднак пасля падпісання ў 1660 г. міру з Швецыяй на акупантаў рушылі занятыя раней у вайне на поўначы харугвы Вялікага Княства на чале з гетманам Паўлам Янам Сапегам. Пад рукой у яго было 8 тысяч жаўнераў. На дапамогу Сапегу прыйшла 4-тысячная польская дывізія Стэфана Чарнецкага.

Злучанае літоўска-польскае войска вызваліла Слонім і пайшло на дапамогу абаронцам Ляхавіцкага замка, які трымаў у аблозе Хаванскі. Бітва з галоўнымі сіламі маскоўскага ваяводы адбылася 25 чэрвеня 1660 г. каля мястэчка Палонка паміж Слонімам і Ляхавічамі.

На правым крыле непрыяцельскай арміі стаяла конніца самога Хаванскага, на левым – князя Шчарбатага, пасярэдзіне – пяхота і конныя іншаземцы-наймітырэйтары. У цэнтры нашага войска заняла пазіцыі дывізія Чарнецкага, на флангах – харугвы Сапегі, А. Палубінскага і С. Кміціча. Расейцы мелі больш за 20 тысяч ратнікаў, ці двое на кожнага нашага вояра.

Кавалерыйскай атакай бітву пачаў Хаванскі, але контратака гусараў Рэчы Паспалітай атрымалася такой імклівай, што варожая пяхота, якая стаяла перад пераправай праз рэчку Палонку, паспела зрабіць толькі адзін залп, а потым была пасечана і патоплена. Вырваўшыся на другі бераг, нашыя жаўнеры мелі выбар: загінуць або перамагчы. Ваявода Хаванскі даў загад уступіць у бой сваім найлепшым баярскім палкам і нямецкай кавалерыі. Нейкі час зыход гарачай сечы заставаўся няпэўным, але жаўнерам гетмана Сапегі дадавала моцы прага помсты за ранейшыя паразы і паняволеную Айчыну...

Працягам гэтай перамогі стаўся яшчэ адзін разгром князя Хаванскага ў 1661 г. пад Кушлікамі паблізу Полацка. Неўзабаве была вызвалена Вільня. Ход вайны карэнным чынам змяніўся, бо ўзнікла магчымасць перанесці ваенныя дзеянні на тэрыторыю Маскоўскай дзяржавы.

У бітве пад Палонкай загінула 15 тысяч маскоўцаў. Гэта быў сапраўдны разгром галоўнай царскай арміі, што тады дзейнічала ў Вялікім Княстве. Перамога [illegible] стратэгічную ініцыятыву для войска Рэчы Паспалітай.

Смаленск у XVII ст. (гравюра 1687 г.)

Вялікае Княства выйшла з гэтай вайны з катастрафічнымі стратамі. Насельніцтва беларускіх земляў зменшылася больш чым напалову – з 2,9 мільёна чалавек у 1648 г. да 1 мільёна 350 тысяч – у 1667 г. Загінуў або пад прымусам апынуўся ў Маскоўскім княстве кожны другі. У Полацкім, Віцебскім і Амсціслаўскім ваяводствах, якія найдаўжэй знаходзіліся пад акупацыяй, захавалася трэцяя частка насельніцтва. У ваяводскім Менску засталося ўсяго 170 жыхароў.

Андрусаўскае замірэнне

Але знясіленая вайной краіна чакалі перамены, якія замацаваліся падпісаннем у вёсцы Андрусава пад Смаленскам замірэння на трынаццаць з паловай гадоў. Да Масквы адыходзілі ўсходнебеларускія землі – Смаленшчына і заходняя Браншчына. Адначасова паўночныя абшары і Інфлянты вярталіся Вялікаму Княству. Расеі не ўдалося дасягнуць асноўнай мэты – знішчэння нашай дзяржавы.

Тэрыторыя Вялікага Княства Літоўскага паменшылася з 370 да 302 тысяч квадратных кіламетраў. Праз пяць гадоў маскоўскі ўрад перадаў Вялікай беларускія Невель, Себеж і Веліж, пасля чаго мяжа паміж Расейскай дзяржавай і Вялікім Княствам заставалася амаль нязменнай да канца XVIII ст.

Андрусаўская дамова давала палонным права вярнуцца на радзіму, аднак яго атрымалі толькі святары, шляхта, жаўнеры, татары ды габрэі, прычым далёка не ўсе змаглі ім пакарыстацца. Літвінскую шляхту высылалі служыць у сібірскія астрогі за тысячы кіламетраў ад дому. У гарнізоне Табольска, напрыклад, літвіны-беларусы складалі да 30%. Асноўная ж маса вывезеных на ўсход жыхароў нашай дзяржавы – сяляне і мяшчане – заставалася на чужыне назаўсёды без надзеі на вяртанне. Разам з сотнямі тысяч палонных Расея, парушыўшы ўмовы замірэння, пакінула сабе і нарабаваныя за гады вайны велізарныя культурныя каштоўнасці.

Большасць гарадоў і мястэчак былі, як тады казалі, «абернутыя ў нівеч», гэта значыць ператвораныя ў папялішчы. У Полацку з 1500 дамавенных «дамоў» засталося 102 (страты – 93%), у Віцебску гэтыя лічбы складалі адпаведна 983 і 56 (95%). Тысячы беларускіх майстроў мусілі аддабліваць царскія палацы і множыць багацце расейскай знаці. У нашых жа гарадах рамесная вытворчасць больш ніколі не ўзнялася да ранейшага роўню. Глыбокі знішчаны перажывала сельская гаспадарка. З галоўнага экспарцёра збожжа ў Еўропе Вялікае Княства пасля вайны ператваралася ў краіну, якая з цяжкасцю забяспечвала ўласныя патрэбы.

Вайна з Расіяй у сярэдзіне XVII ст. стала сапраўднай нацыянальнай трагедыяй. Яе наступствамі былі не толькі страты дэмаграфічныя, эканамічныя і культурныя абліччы краіны. Да апошняга часу падзеі гэтай катастрофы свядома замоўчваліся, хоць іх наступствы беларускіх адчуваюць.

Пад час той вайны Вялікае Княства Літоўскае страціла і заморскія ўладанні: Гамбію ў Афрыцы і востраў Табага ў Вест-Індыі, якія разам з Польскай Каронай валодала праз агульнага васала – Курляндскае і Земгальскае герцагства.

Даваенай колькасці насельніцтва Беларусь дасягнула толькі праз стагоддзе, але страты ў вышэйшых пластах літвінскага грамадства – шляхце і мяшчанстве, якія пацярпелі найбольш, так і не ўдалося аднавіць. Гаспадарчы занепад і аслабленне міжнароднага становішча Вялікага Княства і Польшчы былі галоўнымі прычынамі таго, што Ян Казімір Ваза ў 1668 г. зрокся пасаду і назаўсёды пакінуў Рэч Паспалітую.

Вялікае Княства Літоўскае. Картограф Ян Блау. Амстэрдам. 1664 г.

ВЯЛІКІ КНЯЗЬ І КАРОЛЬ ЯН САБЕСКІ

Пераемнікам вялікага князя і караля Яна Казіміра Вазы стаў Міхал Вішнявецкі. Пры ім узмацніліся ўсобіцы паміж магнацкімі групоўкамі. Чатыры Соймы з шасці былі сарваныя, і грамадзянскую вайну перадухіліла толькі тое, што ў 1672 г. на Рэч Паспалітую напала Асманская імперыя. Манарх падпісаў ганебны мір, паводле якога туркі атрымлівалі Падолле, але Сойм не зацвердзіў гэтае дамовы і пастанавіў працягваць вайну. У той няпэўны для дзяржавы момант пасля смерці Вішнявецкага на пасад быў абраны вядомы сваім талентам палкаводца Ян Сабескі.

Бітва пад Венай. Фрагмент батальнай карціны невядомага мастака канца XVII ст.

Вялікую славу прынесла Яну Сабескаму бітва 1673 г. пад Хацінам, там, дзе на паўстагоддзя раней разбіў туркаў Ян Кароль Хадкевіч. Цяпер войскі Рэчы Паспалітай знішчылі турэцкую армію Гусейн-пашы, які меў пад сваім камандаваннем 35 тысяч воінаў. Гэтая перамога фактычна і зрабіла Сабескага гаспадаром дзяржавы.

Ён з маладых гадоў удзельнічаў у вайне з казакамі Хмяльніцкага, потым ваяваў супраць шведаў і расейцаў. У дваццаць тры гады Сабескі атрымаў чын палкоўніка, у трыццаць сем – пасаду палявога гетмана. У бітве каля Падгайцаў на Украіне (1667 г.) ён з 3 тысячамі жаўнераў разграміў 30-тысячнае казацка-татарскае войска і праз год быў прызначаны вялікім каронным гетманам. Новыя цяжкія паразы ён панёс крымскім татарам у 1671 і 1672 гг.

Заняўшы трон, новы манарх засяродзіўся на барацьбе з Асманскай імперыяй, якая несла велізарную пагрозу ўсёй Еўропе.

У 1683 г. Рэч Паспалітая падпісала трактат аб дружбе з Аўстрыяй. Калі праз некалькі месяцаў туркі ўзялі ў аблогу Вену, Ян Сабескі з 27-тысячным войскам Рэчы Паспалітай рушыў на дапамогу хаўруснікам. Прызнаючы нашага вялікага князя і караля выдатным палкаводцам, германскі імператар і нямецкія князі даручылі яму камандаваць агульнымі сіламі хрысціянскіх дзяржаў.

ХРАНАЛОГІЯ

1669–1673 гг. – Уладаранне вялікага князя і караля Міхала Вішнявецкага.
1672–1676 гг. – Вайна Рэчы Паспалітай з Турцыяй.
1673 г. – Разгром турэцкай арміі пад Хацінам.
1674–1696 гг. – Уладаранне вялікага князя і караля Яна Сабескага.
1683–1699 гг. – Новая вайна Рэчы Паспалітай з Асманскай імперыяй.
12 верасня 1683 г. – Бітва пад Венай.

12 верасня 1683 г. адбылася генеральная бітва, у якой узялі чынны ўдзел войскі Вялікага Княства Літоўскага. На чале нашай цяжкой кавалерыі стаяў трыццацігадовы надворны маршалак Язэп Багуслаў Слушка, які за праяўленае пад Венай ваеннае майстэрства быў прызначаны палявым гетманам. Нямецкі капітан Эрнст Ленгаф камандаваў брыгадай ліцвінскай пяхоты, што мужна білася на правым фланзе злучаных войскаў хрысціян.

Турэцкая армія была разбітая. Неўзабаве гэты бліскучы поспех Ян Сабескі замацаваў новай перамогай пад Парканамі (цяперашняя Славаччына). Хоць вайна яшчэ працягвалася, пагроза для Рэчы Паспалітай праміпула.

Важным трыумфам Яна Сабескага паспрыялі рэформы, праведзеныя ім у арміі Рэчы Паспалітай. У камплектаванні ўзброеных сілаў дзяржавы ён зрабіў стаўку не на паспалітае рушанне, а на прафесійнае войска. З улікам тагачасных еўрапейскіх дасягненняў былі мадэрнізаваныя пяхота, артылерыя і сапёрныя фармаванні.

Ян Сабескі, які атрымаў добрую адукацыю ў Кракаўскім універсітэце і шмат падарожнічаў па Еўропе, застаўся ў нашай гісторыі таксама як шчодры мецэнат, аматар навукі і мастацтва.

Разгром туркаў пад Венай, [illegible] мелі велізарнае значэнне для лёсу Еўропы. Хрысціянскі свет атрымаў вельмі патрэбны перадых для канцэнтрацыі сілаў у далейшым змаганні з Асманскай імперыяй.

DELINEATIO INSIGNIS VICTORIÆ, AB EXERCITU POLONICO LITHVANICOQ,
PROPE CHOCIMUM À TURCIS REPORTATÆ D. XI NOVEMB. AD M DC LXXIII.

КУЛЬТУРНЫ ЎПЛЫЎ НА РАСЕЮ

[illegible]

Дачыненні Вялікага Княства Літоўскага з Расейскай дзяржавай не абмяжоўваліся выключна войнамі. Знаходзячыся побач, дзве краіны не маглі не ўзаемадзейнічаць у сферы культуры. У XVI–XVIII стст. вызначальным быў уплыў Вялікага Княства. Менавіта дзякуючы нашым суайчыннікам у адсталую Масковію траплялі перадавыя еўрапейскія ідэі, новыя віды мастацтва, прагрэсіўныя тэхналогіі. На жаль, вельмі часта гэта адбывалася не натуральным шляхам, а ў выніку гвалтоўных перасяленняў беларусаў-ліцвіноў на ўсход. Яны пачаліся з першых збройных канфліктаў, але асабліва масавымі зрабіліся пад час вайны 1654–1667 гг.

Масковіты ўрад планаваў вывесці ў сваю дзяржаву з акупаванай тэрыторыі 300 тысяч беларусаў, але ў сапраўднасці колькасць вымушаных перасяленцаў [illegible]. Найбольш [illegible] ў Маскоўшчыну шмат гараджан-рамеснікаў.

[illegible]

Храналогія

[illegible]

[illegible]

[illegible]

[illegible]

[illegible]

[illegible]

Беларускія майстры

Першую партыю рамеснікаў-ліцвіноў маскоўскі патрыярх Нікан загадаў пасяліць пры заснаваным Іверскім манастыры на возеры Валдай. Затым туды прывезлі вялікую групу майстроў з Воршы, Копыся, Шклова і Дуброўны – друкароў, кніжных шытароў, разьбяроў, кахляроў. Разгарнуўшы пад кіраўніцтвам копыскага мешчаніна Ігната Максімава вытворчасць невядомай раней у Маскоўіі шматкаляровай рэльефнай кахлі (расейскія рамеснікі ўмелі рабіць толькі аднакаляровую – зялёную або бурштынавую), нашыя майстры аздобілі ёю ўвесь манастырскі комплекс.

Апроч Іверскага манастыра беларускія кахляры ўпрыгожылі Уваскрасенскі сабор Нова-Ерусалімскага манастыра на Істры (узведзены беларускім дойлідам Якавам Бухвостовым), пярэмны палац Крамля, царкву Рыгора Неакесарыйскага ў Маскве і Пакроўскі сабор у Ізмайлаве. Майстар-беларус Сцяпан Іванаў (па мянушцы Палубес) стварыў унікальныя маёлікавыя рэльефы апосталаў для маскоўскай царквы Успення ў Ганчарах. Супольна з Ігнатам Максімавым ён вырабіў 1170 вялікіх пяцікаляровых кахляў з раслінным арнаментам для галоўнага фасада рэзідэнцыі крупнейшых мітрапалітаў у Маскве.

Некаторыя творы Сцяпана Палубеса цяпер можна пабачыць у музеі народнага мастацтва ў Каломенскім. Там беларусы збудавалі архітэктурны шэдэўр XVII ст. – Каломенскі палац, які наш суайчыннік Сімяон Полацкі называў восьмым цудам свету. Найбольш уражвала сучаснікаў аздабленне інтэр'еру: мастацкая размалёўка сценаў і столі, узорыстыя вокны, аб'ёмная разьба па дрэве. Цікавасць, змяшаную з жахам, выклікалі зробленыя майстрамі-ліцвінамі драўляныя фігуры звяроў, якія дзякуючы асабліваму механізму маглі рухацца і падаваць галасы.

У другой палове XVII ст. вывезеныя на чужыну беларускія майстры складалі пятую частку насельніцтва жыхарства. Палонныя і вымушаныя перасяленцы звычайна сяліліся ў адмысловай Мяшчанскай слабадзе. Перапісная кніга рэгіструе сярод вызваленых рамеснікаў 52 спецыялісты. Многія з іх займаліся збройнай справай або ювелірным мастацтвам, раней у Расіі былі невядомымі.

Менавіта нашыя продкі прынеслі ўсходнім суседзям аб'ёмную разьбу, запачаткаваўшы ў Расіі развіццё скульптуры.

І сёння вернікаў і турыстаў уражвае веліччу і хараством шасціярусны пазалочаны іканастас Смаленскага сабора Новадзявочага манастыра ў Маскве. Гэты геніяльны мастацкі помнік – плён працы арцелі беларускіх майстроў пад кіраўніцтвам шклоўскага разьбяра Кліма Міхайлава, які ўзначаліў крамлёўскую Палату разьбярскіх і сталярскіх спраў.

Найлепшых майстроў збіралі пры царскім двары. У 1660-х гадах у Срэбнай палаце Крамля працавала бліжу шматлікіх «літоўскіх людзей», або беларусаў-ліцейшчыкаў. Многія беларусы служылі ў Залатой і Майстроўнай палатах. 68 ліцейшчыкаў пераважна з Полацка і Віцебска пералічаныя ў спісах Збройнай палаты. Нашыя збройнікі здаўна высока цаніліся ў Маскве. Яшчэ ў 1586 г. беларус з паходжання Андрэй Чохаў (Чохаў) адліў там славутую «Цар-гармату».

У 1678 г. у Мяшчанскай слабадзе жыло 612 беларускіх сем'яў. Іх дзеці вучыліся ў школе, якую трымаў ліцейшчык Якуб Якаўлеў. Манах з Полацка Варлам выкладаў там «лацінскую і польскую граматы». Сучасныя расійскія гісторыкі здзіўлена адзначаюць, што ў той, амаль цалкам непісьменнай, Маскве пад пастановамі склаўшых жыхароў Мяшчанскай слабады стаяла 36% уласнаручных подпісаў, а агульны працэнт пісьменных набліжаўся да 50.

Уклад у духоўнае жыццё

Нашы суайчыннікі ў Маскве працавалі не толькі ў сферы матэрыяльнай культуры, але і плённа ўплывалі на духоўнае жыццё суседняй краіны.

Беларусы з Мяшчанскай слабады сталі акторамі першага ў Расіі прыдворнага тэатра, адкрытага ў 1672 г. У трупу набралі 26 юнакоў і дзяўчат, некаторыя з якіх раней удзельнічалі ў тэатральных школах у Полацку, Віцебску, Воршы ды іншых беларускіх гарадах. Праз некалькі гадоў актораў было ўжо 60. Нават за тэатральную залу, дэкарацыі і касцюмы адказвалі беларусы – Хвёдар Юр'еў з-пад Вільні з сваімі падмайстрамі «делал к комедийному строению всякое плотничное дело». 25 краўцоў і шаўцоў пад кіраўніцтвам белых шклоўцаў Трафіма Дапілава і Сцяпана Фёдарава шылі тэатральныя ўборы.

Шмат ліцейшчыкаў служылі, найчасцей пад прымусам, у крамлёўскіх палацах спевакамі ды музыкамі, якімі ўпадабаюцца на расійскае музычнае мастацтва. Вядомы, напрыклад, захад цара Аляксея Міхайлавіча прыслаць з Полацкага Богаяўленскага манастыра знакамітага «восьмагалоснага» Івана Коклю.

У Іверскім манастыры на Валдаі дзейнічаў «друкарскі завод», заснаваны разам з майстрамі з Куцеінскага Богаяўленскага манастыра пад Воршай. Яны выдалі «Часаслоў», «Святцы», «Акафісты» і шэраг іншых кніг, ілюстрацыі да якіх рабіў аршанскі гравёр Пайсій. Пазней куцеінскіх друкароў перавялі ў падмаскоўны Уваскрэсенскі манастыр, а потым на сталічны «Друкарскі двор». У той час у Масквоўшчыну з занятых беларускіх земляў даправілі ўсе нарабаваныя друкарні з кірылічным шрыфтам, аднак маскоўскія праваслаўныя іерархі перашкаджалі паладжванню шырокай кнігавыдавецкай справы.

Дзякуючы беларусу з паходжання Епіфанію Славінецкаму расейцы атрымалі пераклады шматлікіх твораў айцоў царквы, грэка-славяна-расейскі лексікон. Праз перакладзены гэтым асветнікам трактат заснавальніка навуковай анатоміі А. Везалія «Пра будову чалавечага цела» маскоўскія лекары змаглі далучыцца да дасягненняў еўрапейскай медычнай навукі. Славінецкі ўпершыню пазнаёміў усходніх суседзяў з геліяцэнтрычнай тэорыяй М. Каперніка.

Сімяон Полацкі

Выдатнае месца ў культуры Расеі займу найзнакамітейшы з беларускіх перасяленцаў, асветнік, пісьменнік, педагог і грамадскі дзеяч Сімяон Полацкі (сапраўднае імя славутага палачаніна – Самойла Пятроўскі-Сітняновіч).

Пасля заканчэння Кіева-Магілянскай калегіі (з 1701 г. акадэміі), якую праваслаўныя лічылі найлепшай навучальнай установай Рэчы Паспалітай, ён вучыўся ў Віленскай акадэміі. Там Самойла стаў прыхільнікам пашырэння хрысціянскіх цэркваў і ўступіў у грэка-каталіцкі Ордэн базыльянаў.

«Крывавы патоп» сярэдзіны XVII ст. змусіў Полацкага вярнуцца ў родны горад, дзе ён прыняў пострыг пад імем Сімяон. Пазней у пошуках магутнага мецэната ўжо вядомы за межамі Вялікага Княства паэт, які пісаў па-беларуску, па-лацінску, па-польску і па-царкоўнаславянску, выехаў у Расею. Там Полацкага прызначылі выхавальнікам і настаўнікам царскіх дзяцей, у тым ліку будучага цара-рэфарматара Пятра I. Але абсягі дзейнасці нашага суайчынніка былі непараўнальна шырэйшымі. Як прадстаўнік барочнай культуры ён выступаў за асвечаны абсалютызм і лічыў абавязкам узнімаць культуру суседняй краіны.

Сімяон стаў першым у Расеі прафесійным пісьменнікам і пакінуў пасля сябе вялікую творчую спадчыну. Большасць сваіх вершаў ён сабраў у кнігі «Рифмологион, или Стихослов» і «Вертоград многоцветный». «Вертоград» увабраў сабой своеасаблівую энцыклапедыю, адкуль чытач мог атрымаць звесткі з розных галін ведаў. Вялікую славу прынёс Полацкаму яго вершаваны пераклад Псалтыры, які стаў літаратурнай асновай сотняў музычных твораў.

Сімяон заснаваў перад, незалежную ад патрыяршай цэнзуры друкарню. Пра значнасць гэтай падзеі кажа той факт, што колькасць друкарняў у Расеі адразу павялічылася (замест адной стала дзве). Тым часам у Рэчы Паспалітай дзейнічалі 134 друкарні.

Пасля смерці Сімяона застаўся найбагацейшы ў Маскве кнігазбор: трактаты Цыцэрона, Тамаша Аквінскага, Эразма Ратэрдамскага, граматыкі, слоўнікі, зельнікі...

Маскоўская праваслаўная царква абвясціла Сімяонавым творам анафему і забараніла згадваць іх як ератычныя. Велізарныя заслугі С. Полацкага перад расейскай культурай былі адроджаны толькі праз некалькі стагоддзяў.

Полацкі склаў праект першай у Расеі вышэйшай навучальнай установы, паводле якога стваралася Маскоўская Славяна-грэка-лацінская акадэмія. Ён кульцівіраваў першым у Расейскай дзяржаве тэатр і напісаў для яго першыя п'есы.

Беларусы спрыялі развіццю ў суседняй краіне рамёстваў, пісьменства, мастацтва, прыродазнаўства, медыцыны, філасофскай і грамадскай думкі. Разам з тым наша талерантная краіна давала прытулак уцекачам і вымушаным перасяленцам з Расеі, дзе ўсякае вальнадумства або адступленне ад «истинно православной» веры бязлітасна каралася. У другой палове XVI ст. у Вялікім Княстве Літоўскім жылі і прапаведвалі вядомыя расейскія рэлігійныя мысляры Феадосій Касой і яго вучань Фама. Ратуючыся ад жорсткага пераследу, дзясяткі тысяч сяліліся на нашых землях расейскія стараверы.

ПАЎНОЧНАЯ ВАЙНА. ХАЎРУСНІКІ ЦІ ЗАХОПНІКІ?

[illegible]

Пасля смерці Яна Сабескага вялікім князем і каралём быў абраны саксонскі курфюрст Аўгуст. Ён стаў хаўруснікам Пятра I у Паўночнай вайне з Швецыяй, куды ўцягнуў і Рэч Паспалітую. Вялікае Княства зноў зрабілася тэатрам баявых дзеянняў. Частка магнатаў на чале з Сапегамі і Пацамі падтрымала шведаў. Іх прыхільнікі ўзвялі на трон Станіслава Лешчынскага, пасля чаго ў дзяржаве распачалася грамадзянская вайна.

На нашых землях дзейнічала 70-тысячная расейская армія. Каб пазбавіць непрыяцеля правіянту, фуражу і прытулку, Пётр I у ваеннай кампаніі супраць Карла XII выкарыстоўваў тактыку выпаленай зямлі. У сваіх паводзінах хаўруснікі больш нагадвалі захопнікаў. Прыклады нялюдскай жорсткасці ў абыходжанні з беларускім насельніцтвам даваў сам цар.

Здзекі і рабункі зазналі ад «саюзнікаў» шмат вялікіх гарадоў і мястэчак Вялікага Княства. У Менску царская кавалерыя з калмыкамі і казакамі абчысціла грэка-каталіцкі кляштар Святой Тройцы, Свята-Духаўскую царкву на Высокім рынку ды яшчэ некалькі уніяцкіх і праваслаўных манастыроў і храмаў. Менскае праваслаўнае брацтва заклікала менчукоў да зброі, і на Нямізе мараўдзёры атрымалі адпор.

[illegible]

Улетку 1705 г. разам з князем А. Меншыкавым і некалькімі афіцэрамі Пётр I асабіста ўдзельнічаў у забойстве пяці уніяцкіх святароў у Полацкім Сафійскім саборы. Пасля гэтага наш найстаражытнейшы храм быў абрабаваны і ў ім зрабілі вайсковы склад з парахавым сховішчам у сутарэннях. Напярэдадні адыходу з горада расейцы ўзарвалі парахавыя запасы і ператварылі сабор у руіны.

[illegible]

[illegible]

ХРАНАЛОГІЯ

[illegible]

[illegible]

[illegible]

Адступаючы ў верасні 1708 г. на Украіну, расейскія войскі спалілі Воршу, Амсціслаў, Дуброўну... Зрабаваны дашчэнту і выпалены быў Магілёў, які датуль лічыўся адным з найпрыгажэйшых гарадоў Еўропы. Царскія казакі аддалі агню Віцебск, дзе згарэлі замкі, ратуша, чатыры касцёлы і 12 цэркваў. Менавіта Пётр I аддаў загад знішчыць замак у Смалянах пад Воршай.

[illegible]

[illegible]

Беларускія землі пакут нацярпелі і ад шведаў, якія займалі Вільню, Гродню, Навагрудак, Нясвіж, Клецак, Докшыцы, Карэлічы, Пінск, Магілёў... Жаўнеры Карла XII таксама руйнавалі нашыя замкі, да прыкладу Гальшанскі і Ляхавіцкі, вывозілі бібліятэкі, архівы ды іншыя культурныя скарбы.

[illegible]

Карта [illegible] Амстэрдам. 1696 г.

«[illegible]».
[illegible] XVIII ст. [illegible]

[illegible] у 1710 г. [illegible] XVIII ст. у стылі віленскага барока.
Фота [illegible], 2007 г.

[illegible]

[illegible]

Увосень 1708 г. пад вёскай Лясной каля Прапойска расейскае войска разбіла корпус А. Левенгаўпта, які рухаўся на злучэнне з галоўнымі сіламі шведаў. На Украіну, да Карла XII, як сцвярджалі царскія генералы, прыйшло толькі 5 тысяч жаўнераў, а 9 тысяч назаўсёды засталіся ў беларускай зямлі. Пётр I называў бітву пад Лясной «маці Палтаўскай баталіі».

Перамога пад Палтавай аддала поўную перавагу Расеі. Шведы ды аддзелы іх хаўруснікаў Сапегаў былі выгнаныя з усёй тэрыторыі Рэчы Паспалітай. Аўгуст пры падтрымцы Пятра I вярнуў сабе трон. Аднак, хоць на гэта не было ніякай ваеннай патрэбы, расейская армія працягвала заставацца на тэрыторыі Вялікага Княства.

Спроба Аўгуста ўмацаваць сваю ўладу ў дзяржаве, абапіраючыся на саксонскае войска, выклікала супраціў у Польшчы і Княстве. У сакавіку 1716 г. на з'ездзе ў Вільні ўтварылася канфедэрацыя (збройнае аб'яднанне) літоўскай шляхты. Яна падтрымала абвешчаную ў Польшчы Тарнагродскую канфедэрацыю. Праціўнікі Аўгуста запатрабавалі захавання шляхоцкіх вольнасцяў і вываду з Рэчы Паспалітай саксонскай арміі, супраць якой былі распачатыя ваенныя дзеянні. Выкарыстоўшы сітуацыю, «міратворац» Пётр I яшчэ больш павялічыў у Княстве расейскую вайсковую прысутнасць. За «сяброўскую дапамогу» давялося заплаціць дарагую цану.

[illegible]

[illegible]

[illegible]

[illegible]

[illegible]

[illegible]

[illegible]

[illegible]

[illegible]

[illegible]

[illegible]

За гады вайны Беларусь страціла ад баявых дзеянняў, голаду і эпідэмій 700 тысяч жыхароў – кожнага трэцяга. Усяго 10% насельніцтва засталася ў Шклоўскім графстве. Зноў апынуліся ў глыбокім заняпадзе гаспадарка, рамёствы, гандаль.

У 1717 г. Варшаўскі сойм моўчкі (за што быў названы «нямым») прыняў навязаныя Расеяй умовы пагаднення паміж канфедэратамі і Аўгустам, паводле якіх цар рабіўся прагарантам Рэчы Паспалітай. Яе войскі скарачаліся да 24 тысяч (18 тысяч у Польшчы і 6 тысяч у Вялікім Княстве Літоўскім). Тым часам арміі бліжэйшых суседзяў былі шматкроць большымі: у Расеі – 350 тысяч, Аўстрыі – 280 тысяч, Прусіі – 200 тысяч. Царскае войска пакінула беларускія землі толькі ў 1719 г.

Выйграўшы Паўночную вайну, Расея замацавала сваю гегемонію ва Усходняй Еўропе, а Рэч Паспалітая ўсё больш нагадвала не хаўрусніка, а прыдатак царскай імперыі.

Вялікі князь і кароль Аўгуст найперш клапаціўся пра гаспадарчыя і культурныя інтарэсы роднай Саксоніі. Сваю мянушку Моцны ён атрымаў не за ўмацаванне незалежнасці дзяржавы, а за фізічную дужасць і шматлікія любоўныя прыгоды.

Калі ў 1733 г. манарх памёр, абсалютнай большасцю галасоў Сойм зноў абраў вялікім князем і каралём Станіслава Ляшчынскага. Аднак у Пецярбургу вырашылі, што не дапусцяць яго да ўлады. Штыкі расейскіх і аўстрыйскіх жаўнераў узвялі на трон сына Аўгуста Моцнага – Аўгуста III. Як пісаў у сваіх дзённых аднін тагачасны царскі генерал, «присутствие наших солдат придает соответствующее направление мыслям здешних жителей».

Межы Рэчы Паспалітай у першай палове XVIII ст. заставаліся без змен, але ж рэальны суверэнітэт яе быў амаль страчаны.

Карта Рэчы Паспалітай, створаная Г. Молем. 1736 г.

ЗАНЯПАД ВЯЛІКАГА КНЯСТВА

[illegible]

Войны сярэдзіны XVII і пачатку XVIII ст. давялі нашую дзяржаву да глыбокага заняпаду ва ўсіх сферах жыцця.

У жудасным стане знаходзілася гаспадарка. Палова раней апрацаванай ворыва ляжала пусткаю. Тыповай карцінай былі зарослыя пустазеллем і лесам палі, пакінутыя вёскі і маёнткі. Гарады Вялікага Княства, якія некалі сваім выглядам і ўзроўнем матэрыяльнай культуры не адрозніваліся ад заходнееўрапейскіх, цяпер палохалі падарожнікаў руінамі і папялішчамі. Дзясяткі гарадоў і мястэчак Сойм мусіў вызваліць ад падаткаў у дзяржаўны скарб.

[illegible]

Агульныя чалавечыя страты Беларусі ў вайне 1654–1667 гг. і Паўночнай вайне складаюць 2,5 мільёна чалавек. Гэта была дэмаграфічная катастрофа, якой не перажывала, бадай, ніводная еўрапейская краіна.

[illegible]

[illegible]

Адыходзілі ў мінулае часы рэлігійнай талерантнасці. Прававое становішча праваслаўных і пратэстантаў хутка пагаршалася. Да абвастрэння міжканфесійнай напружанасці прычыніліся і супрацоўніцтва часткі праваслаўнага духавенства з расейскімі захопнікамі.

ХРАНАЛОГІЯ

[illegible]

Рэшта ліцвінскай шляхты пераходзіла ў каталіцтва. Пасля смерці ў 1667 г. праваслаўнага троцкага кашталяна Аляксандра Агінскага ў складзе Сената засталіся толькі каталікі. Калі ў першай палове XVII ст. Соймы зазвычай бралі некаталікоў пад абарону, дык цяпер, наадварот, яны пачалі прымаць дыскрымінацыйныя пастановы. У 1673 г. праваслаўных пазбавілі права атрымліваць шляхецтва. Праз тры гады былі скасаваныя ранейшыя прывілеі праваслаўных брацтваў. Іншаверцы страчвалі магчымасць удзельнічаць у соймавых пасяджэннях. На талерантнасць некаталікі маглі разлічваць толькі ў межах штодзённага жыцця.

[illegible]

Праўда, трэба заўважыць, што на той час большасць насельніцтва Княства ўжо вызнавала грэка-каталіцкую веру. На пачатку XVIII ст. у дзяржаве засталася ўсяго адна праваслаўная епархія – Амсціслаўска-Магілёўская, але і на Магілёўшчыне уніяты мелі колькасную перавагу. Расейскія гісторыкі сцвярджаюць, нібыта унія служыла мостам для пераходу беларусаў «у лацінскі касцёл», але гэта не адпавядае фактам. Насамрэч грэка-каталіцкая царква з яе народнымі традыцыямі і беларускай мовай у казаннях, навучанні і кнігадрукаванні стала своеасаблівым бар'ерам для пераходу ў рыма-каталіцтва. Аднак уніяцтва было верай сялянаў і мяшчанаў, а вяршкі грамадства, якія вызначалі дзяржаўную палітыку, ужо цалкам належалі да рыма-каталікоў.

Умацаванне пазіцыяў каталіцтва вяло за сабой паланізацыю, бо касцёл у Вялікім Княстве падпаў пад моцныя польскія ўплывы. У 1696 г. канфедэрацыйны Сойм замяніў дзяржаўную беларускую мову Княства на польскую. Пасля гэтага ўсе дакументы дзяржаўнага справаводства павінны былі выдавацца па-польску. Тым не менш гэта не касавала магчымасці выкарыстання ўрадоўцамі дзяржаўных актаў, выдадзеных дагэтуль па-беларуску. Соймавая пастанова адлюстроўвала рэальныя поспехі паланізацыі. У тым часе польскую мову часта ўжывалі нават праваслаўныя святары і брацтвы. Яшчэ ў 1630 г. Віленскае праваслаўнае брацтва выдала па-польску школьны лемантар (азбуку).

Каб захаваць жыццяздольнасць, дзяржава мела вострую патрэбу ў рэформах. Аднак для іх правядзення адсутнічала моцная цэнтральная ўлада. Шляхта не хацела адмаўляцца і ад малой часткі сваіх «залатых вольнасцяў», якія вялі да палітычнай анархіі. Дзейнасць Сойму была паралізаваная шляхоцкім правам «ліберум вета» (ад лацінскага liberum veto – «свабода забароны»). У адпаведнасці з ім соймавая пастанова не прымалася, калі супраць не выступіў хоць адзін дэпутат.

[illegible]

[illegible]

[illegible]

У 1652–1764 гг. чатыры з кожных пяці Соймаў былі сарваныя. Тое самае адбывалася на павятовых сойміках, дзе шляхта ўсчынала ўзброеныя сутычкі і палітычных апанентаў проста забівалі. Шляхта лічыла права «ліберум вета» сваёй вялікай заваёвай, але яго парадаваліся замежныя ворагі, каб забяспечыць сваё панаванне...

З канфедэрацыі дзвюх дзяржаваў Рэч Паспалітая ператварылася фактычна ў канфедэрацыю асобных паветаў, дзе ўладарылі свае «манархі» – магнаты. У сярэдзіне XVIII ст. у Вялікім Княстве дамінаваў род Радзівілаў. «Кароль у Варшаве, а Радзівіл у Нясвіжы», – казалі яны, падкрэсліваючы сваё поўнае самаўладдзе, забяспечанае не толькі велізарнымі багаццямі, але і вялікім прыватным войскам. Да прыкладу, Каралю Станіславу Радзівілу, вядомаму пад мянушкаю «Пане Каханку», належала 16 гарадоў і 683 вёскі. Як сведчаць сучаснікі, на сесію Галоўнага Літоўскага трыбунала ў Мінск ён прыязджаў з вайсковым аддзелам на 300 шабляў (што складала толькі 1/30 частку прыватнага войска князя). Радзівілы, Сапегі, Агінскія ды іншыя арыстакратычныя роды, не лічачыся з дзяржаўнымі інтарэсамі, вялі паміж сабой сапраўдныя войны.

Рэч Паспалітая страціла міжнародны прэстыж і ператварылася ў «[illegible] картку» для войскаў суседніх дзяржаў.

У захаванні такога становішча былі зацікаўленыя краіны-суседзі. Дамова 1764 г. паміж Расіяй і Прусіяй змяшчала сакрэтны артыкул, які абавязваў падтрымліваць у Рэчы Паспалітай шляхоцкія вольнасці і «лібэрум вэта». Гэта сталася адказам на першыя спробы рэформаў, скіраваных на абмежаванне феадальнай анархіі.

За вялікім князем Аўгустам III Княства трыццаць гадоў жыло без вайны. Але мірны перыяд не быў выкарыстаны на ўмацаванне дзяржавы. Манарх вёў супярэчлівую і недальнабачную палітыку, прычым большую частку свайго ўладарання правёў у роднай Саксоніі. За кошт падаткаў, сабраных з нашых продкаў, ён набываў творы мастацтва для славутай цяпер Дрэздэнскай галерэі.

ПЕРШЫ ПАДЗЕЛ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

На пачатку 1764 г. Сойм Рэчы Паспалітай разгледзеў праграму рэформаў, закліканых змяніць дзяржаўны лад і вывесці краіну з крызісу. Прадугледжвалася павелічэнне войска з 24 да 50 тысяч. Пры вырашэнні эканамічных пытанняў скасоўвалася права «лібэрум вета». Дэпутаты вызваляліся ад абавязковых наказаў соймікаў.

Намаганні рэфарматараў выклікалі трывогу ў Расіі і Прусіі. Імператрыца Кацярына II і прускі кароль Фрыдрых II узаемна абавязаліся не дапускаць у Рэчы Паспалітай прагрэсіўных пераўтварэнняў, а ў выпадку неабходнасці выкарыстоўваць зброю.

У верасні 1764 г. пры падтрымцы Расіі вялікім князем і каралём быў абраны былы каханак і фаварыт Кацярыны II Станіслаў Аўгуст Панятоўскі. Папярэдне ён атрымаў ад паслоў з Пецярбурга таемную інструкцыю, паводле якой павінны быў «во все время своего государствования интересы нашей империи собственными почитать, их остерегать и им всеми силами по возможности поспешествовать». Пагадзіўшыся на такія ўмовы, Панятоўскі прадвызначыў лёс дзяржавы і сваю асабістую трагедыю як апошняга манарха.

Вялікі князь і кароль Станіслаў Аўгуст рэдагаваў пад прыгнётам Пецярбурга праводзіў рэформы, каб утаймаваць магнатаў і выратаваць Рэч Паспалітую ад Прусіі, якую ён лічыў галоўным ворагам дзяржавы. Аднак насамрэч значна больш небяспечнай была ўсходняя суседка.

У 1766 г. Расія запатрабавала ад Сойму і Станіслава Аўгуста ўраўнаваць у правах з каталікамі праваслаўных і пратэстантаў. Для Кацярыны II і яе ўрада гэта была толькі зачэпка для ўмяшання ў унутраныя справы нашай дзяржавы. Сам кіраўнік расійскай дыпламатыі граф М. Панін шчыра прызнаваўся, што сапраўднае паляпшэнне становішча праваслаўных у Рэчы Паспалітай прынесла б імперыі толькі шкоду, бо выклікала б масавыя ўцёкі сялянаў у Вялікае Княства Літоўскае. Рэч у тым, што прыгоннае права ў Расіі вызначалася значна больш жорсткай эксплуатацыяй і нагадвала рабства.

Апрача таго, паслы імператрыцы Кацярыны II пратэставалі на Сойме супраць абмежавання права «лібэрум вета». Пад моцным ціскам дэпутаты пакінулі гэтую «шляхецкую вольнасць» некранутай, але патрабаванне наконт «дысідэнтаў» (іншаверцаў) засталося невыкананым, што Пецярбург таксама выкарыстаў у сваіх інтарэсах.

Пры падтрымцы Расіі ў Слуцку была створаная канфедэрацыя (збройнае аб'яднанне) праваслаўнай і пратэстанцкай шляхты. Яе ўзначалілі праваслаўны магілёўскі епіскап Георгі Каніскі і кальвініст граф Грабоўскі. Акт канфедэрацыі падпісалі ўсяго 270 шляхціцаў, але гэтага хапіла, каб Расія пад хоўрусам абароны «іншаверцаў» увяла ў Вялікае Княства 40-тысячнае войска.

Адначасова дзясяткі тысяч шляхціцаў-каталікоў з ліку праціўнікаў рэформаў аб'ядналіся ў сваю генеральную канфедэрацыю на чале з Каралем Станіславам Радзівілам (па мянушцы «Пане Каханку»). Яны звярнуліся да расійскай імператрыцы з просьбаю захаваць асновы даўнейшага дзяржаўнага парадку.

ХРАНАЛОГІЯ

1764–1795 гг. — Уладаранне вялікага князя і караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага.
1767 г. — Слуцкая [illegible] канфедэрацыя.
1768 г. — Утварэнне каталіцкай Барскай канфедэрацыі.
1769 г. — Войскі канфедэратаў разбіты расійскімі пад Бераставіцай, Слонімам і [illegible].
1771 г. — Разгром войскаў на чале з А. Суворавым [illegible] пад Сталовічамі гетмана М. К. Агінскага.
5 жніўня 1772 г. — Першы падзел Рэчы Паспалітай.

Зямлі Вялікага Княства Літоўскага, захопленыя Расеяй у выніку першага падзелу Рэчы Паспалітай. Карта Т. Лотара. 1779 г.

Барскія канфедэраты разлічвалі на дапамогу Заходняй Еўропы, але падтрымка датула практычна абмяжоўвалася накіраваннем вайсковых інструктараў. Тым не менш у першых змаганнях з расійскімі рэгулярнымі войскамі аддзелы патрыётаў у 1769 г. выйгралі бітвы пад Берасцейшай, Слонімам і Мышшу (каля Баранавічаў). Пазней Менскам і Мядзелам паставалі аддзелы канфедэратаў Сымона Касакоўскага, які панет рэйды на тэрыторыю Расеі.

Сойм 1767 г., маршалкам якога стаў Караль Радзівіл, задаволіў усе ўмовы Расеі. Асновы дзяржаўнага ладу (у тым ліку і права «ліберум вета»), якія ўсё больш падточвалі Рэч Паспалітую, былі названыя «вечнымі і нязменнымі». Гарантам іх захавання прызнавалася Кацярына II. Цяпер мяняць нутраны парадак дзяржавы можна было толькі тады, калі на тое згаджаліся Расея і Прусія. Каб захаваць карону, Станіслаў Аўгуст мусіў зацвердзіць соймавыя пастановы.

Праціўнікі расейскай гегемоніі ў 1768 г. стварылі сваю канфедэрацыю ў мястэчку Бар на Украіне. Да патрыётаў далучыліся значныя сілы літоўскай шляхты, а таксама частка мяшчанаў і сялян Вялікага Княства. Змаганне супраць царскіх войскаў і прыхільнікаў Панятоўскага ахапіла Полацкае, Амсціслаўскае, Берасцейскае ваяводствы, Ваўкавыскі, Ашмянскі, Браслаўскі паветы, наваколле Гомеля... Расейскія ўлады афіцыйна прызнавалі, што «мятежников» падтрымлівае мясцовы люд.

Пасля доўгіх ваганняў на бок паўстанцаў стаў Радзівіл «Пане Каханку», прыватнае войска якога налічвала 10 тысяч пяхоты і кавалерыі. У вёсцы Лань ягоныя жаўнеры разбілі расейцаў пад камандаю князя Мяшчэрскага, але штурм царскімі войскамі Нясвіжа так напалохаў Радзівіла, што ён згадзіўся на капітуляцыю.

Увосень 1771 г. да барскіх канфедэратаў перайшоў вялікі гетман Міхал Казімір Агінскі з войскам. Ён разграміў расейцаў пад вёскай Бездзеж паблізу Драгічына, але неўзабаве каля Сталовічаў, непадалёку Баранавічаў, пацярпеў цяжкую паразу ад выдатна ўзброеных і загартаваных у захопніцкіх паходах войскаў А. Суворава. Пасля гэтага барацьба канфедэратаў пачала згасаць. У сакавіку 1772 г. на ўсходнім Палессі склаў зброю іх апошні аддзел.

Тысячы ўдзельнікаў Барскай канфедэрацыі, сярод якіх болей 70% складалі сяляне, былі асуджаныя на сібірскую катаргу. Нашая дзяржава аказалася безабароннай перад магутнымі суседзямі.

5 жніўня 1772 г. Расея, Аўстрыя і Прусія падпісалі ў Санкт-Пецярбургу канвенцыю пра першы падзел Рэчы Паспалітай. Царская імперыя «прырэзала» сабе ўсходнія землі Вялікага Княства Літоўскага — усё Амсціслаўскае ваяводства, амаль усё Віцебскае, Полацкае да правага берага Дзвіны, частку Менскага ваяводства і Інфлянты. На захопленых абшарах плошчаю 92 тысячы квадратных кіламетраў жыло 1 мільён 300 тысяч чалавек.

У красавіку 1773 г. у Горадні для зацвярджэння падзелу быў сабраны Сойм Рэчы Паспалітай. З рашучым пратэстам на ім выступіў удзельнік Барскай канфедэрацыі, пасол ад Навагрудскага павета Тадэвуш Рэйтан. Яго падтрымалі толькі двое: яшчэ адзін навагрудскі дэпутат Самуэль Корсак і менскі пасол Станіслаў Багушэвіч. Згодніцкая большасць ратыфікавала акт першага падзелу.

РЭФОРМЫ. КАНСТЫТУЦЫЯ 1791 ГОДА

Эканамічны рост

Першы падзел Рэчы Паспалітай паскорыў у ёй прагрэсіўныя пераўтварэнні. Іх прававядзенню спрыяла тое, што Расея на нейкі час вывела з тэрыторыі нашай дзяржавы свою армію.

Ва ўладаннях магнатаў, дзе жыла трэцяя частка насельніцтва краіны, сялянаў пераводзілі на чынш (грашовы аброк), пачыналі выкарыстоўвацца сельскагаспадарчыя механізмы і больш рацыянальныя метады працы. Збожжа вывозілася на продаж у Гданьск, Каралявец, Рыгу ды іншыя гандлёвыя цэнтры Усходняй і Цэнтральнай Еўропы.

Урад Вялікага Княства рабіў захады для развіцця гандлю. Былі ўведзеныя агульнадзяржаўныя меры вагі, даўжыні і аб'ёму, а таксама адзінае мыта. Праз палескія балоты пракладаліся пінска-слонімскі і пінска-валынскі тракты. Агінскі суднаходны канал, збудаваны на сродкі вялікага гетмана Міхала Казіміра Агінскага, праз Шчару і Ясельду злучыў басейн Дняпра з Нёманам. Гэта зрабіла значна больш зручным перавоз збожжа ў балтыйскія порты. Тады ж распачалося пракладанне яшчэ адной унікальнай воднай магістралі – Днепра-Бугскага, або Каралеўскага, канала, што па Прыпяці і Мухаўцы, а затым па Бугу выводзіў з Дняпра ў Віслу.

У гарадах і мястэчках, магнацкіх уладаннях ствараліся мануфактуры – перадавыя для свайго часу прадпрыемствы, заснаваныя на падзеле працы. Радзівілы, да прыкладу, адкрылі 23 мануфактуры. Найбольш вядомай з іх была закладзеная ў Нясвіжы суконная мануфактура, пераўтвораная потым у «персіярню», дзе выраблялася персідская тканіна. Паняй стала найбуйнейшае ў Вялікім Княстве прадпрыемства перанеслі ў Слуцак, і яно праславілася знакамітымі слуцкімі паясамі. У краіне і за яе межамі карысталася попытам прадукцыя шмат якіх радзівілаўскіх мануфактураў: габеленавых у Міры і Аліве, фаянсавай у Свержані, шкляных гутаў у Налібаках і Урэччы. Да буйных прадпрыемстваў належалі «люстэрная фабрыка» Язэпа Храптовіча ў Вішневе, фаянсавая мануфактура Агінскіх у Целяханах пад Пінскам.

Да сярэдзіны XVIII ст. у Вялікім Княстве, як у гарадах, так і ў вёсках, пачалося ажыўленне эканомікі. Пра гэта сведчыла павелічэнне экспарту, у якім палоўнае месца займалі прадукты земляробства і лясных промыслаў.

У другой палове XVIII ст. на тэрыторыі сучаснай Беларусі працавалі 53 мануфактуры.

ХРАНАЛОГІЯ

1765–1780 гг. — Рэформы Антонія Тызенгаўза.
1765–1784 гг. — Будаўніцтва Агінскага канала.
1775 г. — Пачатак будаўніцтва Днепра-Бугскага канала.
1788–1792 гг. — Чатырохгадовы сейм Рэчы Паспалітай.
3 траўня 1791 г. — Сейм ухваліў першую ў Еўропе Канстытуцыю.
22 кастрычніка 1791 г. — Прыняцце Сеймам закона «Узаемнае запэўненне Абодвух Народаў».

Рэформы Тызенгаўза

Прыкладам патрыятычна настроеных дзеячоў, што верылі ў вялікую сілу навукі і рэформаў, стаў падскарбі (міністр фінансаў) Вялікага Княства Антоні Тызенгаўз.

У падначаленых яму каралеўскіх эканоміях падскарбі памяншаў апрацоўку зямлі, увёў шматпольную сістэму, выкарыстоўваў заходнееўрапейскую тэхніку. Для сялянаў ствараліся «камунальныя касы» – своеасаблівае страхаванне на выпадак неўраджаю або стыхійнага бедства. Рэформы прадугледжвалі добраўпарадкаванне вёсак, утрыманне дактароў і фельчараў, а таксама касавых радзільняў. Уводзіліся санітарныя правілы дзеля засцярогі людзей і жывёлы ад эпідэмій.

У Гарадзенскай эканоміі Тызенгаўз заснаваў 21 мануфактуру, дзе выраблялі самую розную прадукцыю – ад гарматаў і карэтаў да посуду, карункаў і картаў для гульні. Выпісаныя з-за мяжы спецыялісты вялі навучанне мясцовых майстроў. Цэнтрам эканамічных пераўтварэнняў падскарбія было гарадзенскае прадмесце Гарадніца. Там размяшчаліся школы мернікаў, бухгалтараў і будаўнікоў, гандлёвая і камерцыйная кантора...

Дзейнасць падскарбія сягала далёка за межы гаспадарчых рэформаў. Ён пасадзейнічаў стварэнню ў нашай дзяржаве Адукацыйную камісію – першае ў Еўропе міністэрства адукацыі. З ініцыятывы Тызенгаўза ў Гародні былі адкрытыя медыцынская акадэмія, кадэцкі корпус, тэатр і тэатральна-музычная школа, пачала выходзіць газета.

Аднак рэформы А. Тызенгаўза сутыкнуліся з вялікімі цяжкасцямі. Работнікамі на заводах, як і на іншых мануфактурах, былі пераважна прыгонныя сяляне, што не мелі зацікаўленасці ў выніках сваёй працы. З другога боку, у дзяржаве яшчэ не існавала развітога рынку для рэалізацыі мануфактурных тавараў. Пасля адхілення падскарбія ад пасады амаль усе яго прадпрыемствы былі зачыненыя як стратныя.

Рэформы, распачатыя Чатырохгадовым соймам, мелі рысы буржуазных пераўтварэнняў. Іх працягам сталася прыняцце Канстытуцыі.

Чатырохгадовы сойм

Калі ў 1788 г. Расея занялася вайной з Турцыяй і аслабіла свой пратэктарат над Рэччу Паспалітай, быў скліканы вальны Сойм, які потым назвалі Вялікім, або Чатырохгадовым. Большасць ягоных удзельнікаў сталі дэпутатамі ўпершыню і належалі да прыхільнікаў рэформаў. Сярод іх вылучаліся падканцлер Яўхім Храптовіч, берасцейскі староста Казімір Нестар Сапега, пасол ад Пінскага павета Матвей Бутрымовіч. Дэпутаты распрацавалі цэлую праграму зменаў у дзяржаўным ладзе. На пачатку паседжанняў паслы ўтварылі канфедэрацыю «дзеля найдакладнейшага гарантавання бяспекі і палягчэння Айчыны».

Сойм часткова ўраўнаваў правы шляхты і мяшчанаў. Гарадскія жыхары атрымалі магчымасць набываць зямлю і маёнткі, а шляхта – займацца гандлем і рамяством. Невялікім гарадам, што былі пазбаўленыя перад тым самакіравання, вярнулі іх магдэбургскія правы.

Войска Вялікага Княства Літоўскага павінна было павялічыцца з 6 да 32 тысяч. Абмяркоўваўся праект аднаўлення незалежнасці праваслаўнай царквы ад расейскіх духоўных уладаў. Грэка-каталіцкаму мітрапаліту надалі годнасць сенатара, што сталася прызнаннем ролі уніяцкай царквы, прыхільнікамі якой ужо была пераважная большасць насельніцтва Вялікага Княства.

Канстытуцыя 1791 года

3 траўня 1791 г. большасць дэпутатаў Сойма аддала свае галасы за першую ў Еўропе і другую ў свеце (пасля Злучаных Штатаў Амерыкі) Канстытуцыю.

Адпаведна з ёю ствараўся адзіны ўрад, які павінен быў служыць «усяму грамадству, Кароне Польскай і Вялікаму Княству Літоўскаму». Абвяшчаліся свабода друку і сумлення, галоснасць і незалежнасць суда. Мяшчанам гарантавалася недатыкальнасць асобы. Дзяржава абвяшчала захоўваць рэлігійную талерантнасць.

Канстытуцыя скасоўвала выбарнасць караля і права «ліберум вета», тым самым ліквідуючы феадальную анархію.

Канстытуцыя выводзіла краіну на шлях буржуазнага развіцця, давала ёй шанец супрацьстаяць знешняй пагрозе. Адным дзяржава ў тэксце Канстытуцыі называлася «Польшчай». Нічога не гаварылася пра захаванне ўласных дзяржаўных органаў Вялікага Княства Літоўскага. Гэта давала некаторым гісторыкам падставы сцвярджаць, што Княства ўвайшло ў склад Польшчы.

Насамрэч справа выглядала інакш. Віленскі, гарадзенскі, лідскі ды большая частка іншых павятовых соймікаў пад час працы Чатырохгадовага сойма патрабавалі ад сваіх пасолаў захаваць для Вялікага Княства асобную Скарбовую камісію, Статут 1588 г., права правядзення кожнага трэцяга вальнага Сойму ў Вільні або Гародні.

Медаль у гонар Канстытуцыі 3 траўня 1791 г. Аверс і рэверс.

20 кастрычніка 1791 г. дэпутаты-ліцвіны правялі праз Вялікі сойм ухвалу пад назвай «Узаемнае заручэнне Абодвух Народаў», якая замацоўвала федэрацыйную аснову Рэчы Паспалітай. У прынятым дакуменце пастанаўлялася, што Вялікае Княства Літоўскае павінна мець «такую самую колькасць міністраў і нацыянальных пасадаў ды з такімі самымі тытуламі і паўнамоцтвамі, як і Карона».

Паводле новага адміністрацыйнага падзелу агульная дзяржава ўтварала тры часткі: Вялікапольшча, Малапольшча і Літва, ці Вялікае Княства Літоўскае, якое ў сваю чаргу складалася з Віленскага, Троцкага, Полацкага, Берасцейскага і Менскага ваяводстваў, а таксама Інфлянцкага і Жамойцкага княстваў.

Канстытуцыя 3 траўня 1791 г.

У другой палове XVIII ст. Вялікае Княства Літоўскае перажывала эканамічны і грамадска-палітычны крызіс. Але час быў упушчаны. Далейшы лёс краіны трымалі ў сваіх руках замежныя манархі.

У адрозненне ад палітычнага жыцця краіны культура ў другой палове XVII – XVIII ст. не зазнала глыбокага заняпаду. Вялікае Княства Літоўскае адчула на сабе дабратворны ўплыў еўрапейскай эпохі Асветніцтва, якая сцвярджала ў жыцці грамадства і дзяржавы прыярытэт навукі і розуму.

АДУКАЦЫЯ І НАВУКА Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVII – XVIII СТАГОДДЗІ

Асвета

На пачатку XVIII ст. адукацыя ў дзяржаве па-ранейшаму заставалася ў руках царквы. Пачатковыя веды давалі школы пры манастырах і кляштарах, праваслаўных і вуніяцкіх брацтвах. Дзейнічалі навучальныя ўстановы Таварыства Ісуса (езуітаў), дамініканцаў, кармелітаў ды іншых каталіцкіх ордэнаў. Езуіцкія калегіюмы існавалі ў Полацку, Пінску, Амсціславе, Берасці, Вільні, Віцебску, Ворпе, Гародні, Драгічыне-Набужскім, Магілеве, Менску, Навагрудку, Нясвіжы, Жодзішках (Ашмянскі павет), Юравічах (Мазырскі).

Пасля Паўночнай вайны шмат навучальняў у гарадах і мястэчках краіны адчынілі Ордэн піяраў. Падабенства навучальнай праграмы піярскіх школаў да праграмы езуіцкай, але менш суровая дысцыпліна рабілі іх вельмі папулярнымі. У піяраў мелі магчымасць бясплатна навучацца дзеці бедных пластоў насельніцтва, у тым ліку сялянства. Пад кіраўніцтвам асветніка і педагога Станіслава Канарскага ў сярэдзіне XVIII ст. была праведзеная рэформа піярскіх школаў, у праграме якіх значнае месца занялі прыродазнаўчыя і свецкія гуманітарныя навукі, а таксама замежныя мовы. Найбольш вядомыя піярскія калегіюмы працавалі ў Вільні, Віцебску, Вороннаве, Лідзе, Полацку, Шчучыне, Дуброўне, Герванях на Ашмяншчыне, Лужках (Дзісенскі павет), Любешаве на Берасцейшчыне.

Шырокую сетку школаў, якія спаборнічалі з езуітамі і піярамі, меў вуніяцкі Ордэн базыльянаў. Адрозна ад каталіцкіх навучальняў тут захоўвала свае пазіцыі беларуская мова.

Атрымаўшы сярэднюю адукацыю, моладзь Вялікага Княства магла працягваць вучобу ў Віленскай акадэміі або ва ўніверсітэтах Заходняй Еўропы.

Шмат выхадцаў з Літвы-Беларусі вучыліся ў Кіева-Магілянскай акадэміі, якую лічылі вышэйшай навучальнай установай для праваслаўных Рэчы Паспалітай.

Адукацыйная камісія

Важныя змены ў эканоміцы і грамадска-палітычным жыцці дзяржавы вымагалі карэннага рэфармавання сістэмы адукацыі. Гэтым занялася створаная ў 1773 г. Адукацыйная камісія Рэчы Паспалітай – фактычна першае ў Еўропе міністэрства асветы. У яго стварэнні ўдзельнічалі педагогі, вучоныя, палітыкі Гуга Калантай, Ян Снядэцкі, Ігнат Масальскі... У Вялікім Княстве дзейнасцю камісіі кіраваў падканцлер Яўхім Храптовіч, які наведаў шэраг еўрапейскіх краінаў і быў добра знаёмы з ідэямі Асветніцтва.

Статут камісіі ставіў перад выкладчыкамі задачу імкнуцца, каб іх выхаванцы «дасягалі поспехаў разважаннямі, а не завучваннем на памяць». Ад рэлігійных навук перавага ў праграмах пераходзіла да прыродазнаўчых і грамадскіх. Новая сістэма асветы павінна была рыхтаваць адукаваных і карысных для дзяржавы грамадзян-патрыётаў.

Адукацыйная камісія мела на мэце вызваленне асветы ад бясспрэчнага ўплыву царквы і надаць навучанню свецкага характару.

ХРАНАЛОГІЯ

Каля 1600 г. – пасля 1651 г. – Жыццё і дзейнасць Казіміра Семяновіча.
1634–1689 гг. – Жыццё і дзейнасць Казіміра Лышчынскага.
1650 г. – Выхад у Амстэрдаме кнігі К. Семяновіча «Вялікае мастацтва артылерыі».
1660–1714 гг. – Жыццё і дзейнасць [illegible].
1758 г. – [illegible]
1728–1810 гг. – Жыццё і дзейнасць Марціна Пачобута-Адляніцкага.
1740–1805 гг. – Жыццё і дзейнасць Габрыэля Грубера.
1773–1794 гг. – Дзейнасць у Вялікім Княстве Літоўскім Адукацыйнай камісіі – першага ў Еўропе міністэрства адукацыі.
1775 г. – Заснаванне Гарадзенскай медыцынскай акадэміі.

Віленская езуіцкая акадэмія пасля рэфармавання атрымала назву Галоўнай школы Вялікага Княства Літоўскага.

На пачатку 1780-х гадоў у той частцы Беларусі, што засталася ў Рэчы Паспалітай, Адукацыйная камісія адчыніла 200 пачатковых школаў. Там займаліся 2500 вучняў, прычым трэціну іх складалі дзеці сялянаў. У Горадні, Ваўкавыску, Навагрудку, Паставах, Пінску, Мазыры, Бабруйску, Берасці ды іншых гарадах і мястэчках былі створаныя 20 сярэдніх школаў, заканчэнне якіх давала магчымасць паступаць у вышэйшыя навучальныя ўстановы.

Значную ролю ў пашырэнні навуковых ведаў адыграла Гарадзенская медычная акадэмія, адчыненая падскарбіем Антонам Тызенгаўзам, што падтрымліваў Адукацыйную камісію. Акадэміяй кіраваў вядомы вучоны-натураліст, хірург і анатам Жан-Эмануэль Жыліберт. Гэтая першая ў Вялікім Княстве навучальная ўстанова па падрыхтоўцы медычнага персаналу мела тры аддзяленні: «сучасных лекараў для гарадоў», «правінцыйных лекараў і хірургаў» і «павівальнага мастацтва». Большасць студэнтаў паходзіла з прыгонных сялянаў і ўтрымлівалася за дзяржаўны кошт.

Пры акадэміі дзейнічалі анатамічны тэатр, музей, першы ў Рэчы Паспалітай батанічны сад, які разнастайнасцю і колькасцю раслінаў не саступаў найлепшым садам Еўропы.

Пазней выкладчыкі акадэміі разам з абсталяваннем былі накіраваныя ў Вільню, у Галоўную школу Вялікага Княства, дзе на гэтай базе адчыніўся медычны факультэт.

Полацкі езуіцкі калегіюм

Тым часам на захопленых Расеяй усходнебеларускіх землях Таварыству Ісуса ўдалося захаваць свае калегіюмы. Самым значным з іх быў Полацкі, дзе налічвалася каля трохсот студэнтаў. Праграмы гэтых навучальняў таксама ўдасканальваліся ў адпаведнасці з дасягненнямі еўрапейскай адукацыі. У 1770-х гадах у Полацкім калегіюме выкладаліся польская, расейская, беларуская, французская, нямецкая, лацінская і грэцкая мовы, антычная літаратура, гісторыя, фізічная і палітычная геаграфія, алгебра, тэарэтычная і практычная механіка, цывільная і вайсковая архітэктура, тэорыя жывапісу, этыка, псіхалогія, логіка, касмалогія, астраномія, эксперыментальная фізіка, вышэйшая матэматыка...

Выпускнікамі Полацкага калегіюма былі адзін з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры Ян Баршчэўскі, польскі пісьменнік і гісторык Нікадзім Мусніцкі, беларускі мастак Валянцін Ваньковіч, выдавец і рэдактар першага ў Вялікім Княстве інфармацыйнага тыднёвіка «Літоўскі кур'ер» Францішак Пашкоўскі, расейскі скульптар і гравёр Фёдар Талстой... Каб даць сваім дзецям прыстойную адукацыю, расейская знаць часта прывозіла іх у Беларусь.

Полацкі калегіюм быў своеасаблівай філіяй Віленскай акадэміі. Высокі ровень выкладання і вядзення навуковых работ калегіюма прымусілі сталіцай да яго пераўтварэння ў акадэмію з універсітэцкім статусам.



Бясспрэчна трактат Казіміра Семяновіча «Вялікае мастацтва артылерыі», які стаў сёння адной з вяршынь навуковай думкі, неаднаразова перавыдаваўся ў розных краінах і да канца XVIII ст. заставаўся адзіным у Еўропе грунтоўным падручнікам (аналітычным і глыбокім даследаваннем) у галіне артылерыі і ракетабудавання.

Навуковыя дасягненні

У другой палове XVII–XVIII ст. Вялікае Княства Літоўскае дало Еўропе шмат знакамітых навукоўцаў і асветнікаў.

Лідзянін Казімір Семяновіч вынайшаў шматступеньчатую ракету і стаў аўтарам шэрагу рэвалюцыйных вынаходак у гэтай сферы, што дае ўсе падставы лічыць яго папярэднікам славутых вучоных і вынаходнікаў К. Цыялкоўскага, А. Бінга і Р. Годарда. У 1650 г. у Амстэрдаме выйшла напісаная на лацінскай мове кніга К. Семяновіча «Вялікае мастацтва артылерыі», якая была перакладзена пазней на англійскую, французскую, нямецкую, галандскую, дацкую ды іншыя еўрапейскія мовы. Па кнізе нашага суайчынніка вучыўся Айзек Ньютан. Ёсць сведчанні, што ёю часта карыстаўся Напалеон Банапарт.

Старэйшым сучаснікам Семяновіча быў філосаф Казімір Лышчынскі. Ён выступіў супраць рэлігійнага светаразумення, сцвярджаючы, што свет існуе вечна, а прырода развіваецца паводле ўласных законаў. Мысляр стаў адным з першых у Вялікім Княстве прыхільнікам ідэяў утапічнага сацыялізму. Будучыня чалавецтва ўяўлялася яму заснаванай на свабодзе і сацыяльный роўнасці. За напісанне трактата «Аб неіснаванні бога» К. Лышчынскага, якога называюць беларускім Джардана Бруна, пакаралі смерцю.



ГЕОМЕТРІА
СЛАВЕНСКИ
ЗЕМЛЕМѢРІЕ
Петра Алексіевича


GRAMMATICAM

Пазней займаўся выдавецкай дзейнасцю ў Амстэрдаме асветнік і перакладчык, выпускнік Слуцкай кальвінскай школы Ілья Капіевіч. Яму належаць вялікія заслугі ў развіцці друкарскай справы ў Расіі. Дзякуючы Капіевічу выйшлі першыя ў гісторыі расійскамоўныя падручнікі арыфметыкі, граматыкі, рыторыкі, астраноміі, марской справы – цэлая бібліятэка з двух дзясяткаў кніг навуковага і асветніцкага характару.

CALCULUS

У навуковым свеце добра ведалі імя вучонага-прыродазнаўцы Марціна Пачобута-Адляніцкага, выхаванца Гарадзенскага езуіцкага калегіума і Віленскай акадэміі, які потым удасканальваў веды ў Пражскім універсітэце і астранамічных абсерваторыях Францыі, Англіі, Італіі, Нямеччыны. Пачобут-Адляніцкі стаў дырэктарам найстарэйшай на Усходзе Еўропе Віленскай абсерваторыі, заснаванай у 1753 г., а затым узначаліў Галоўную школу Вялікага Княства (былую Віленскую акадэмію). Еўрапейскую славу вучонаму прынеслі складзеныя ім табліцы руху Меркурыя і адкрыццё новага сузор'я, названага Цялцом Панятоўскіх.

За выдатныя навуковыя дасягненні вучонага-прыродазнаўцы Марціна Пачобута-Адляніцкага быў абраны сябрам Каралеўскай акадэміі навук у Лондане і сябрам-карэспандэнтам Французскай акадэміі. Яго імем названы кратэр на Месяцы.

Вялікі ўклад у развіццё навукі і культуры ў нашай дзяржаве зрабіў вучоны-энцыклапедыст, славеснік і нараджэнец Габрыэль Грубэр, які выкладаў у Полацкім езуіцкім калегіуме прыродазнаўчыя і матэматычныя дысцыпліны, а таксама маляванне і архітэктуру. Дзякуючы Грубэру калегіум меў абсталяваныя на еўрапейскім роўні астранамічны, фізіка-матэматычны, хімічны і мінералагічны кабінеты. З ініцыятывы вучонага там былі адчыненыя друкарня, музей і карцінная галерэя. Разам з полацкімі механікамі Грубэр удзельнічаў у стварэнні ўнікальных для таго часу робатаў. Менавіта ён падрыхтаваў умовы для пераўтварэння калегіума ў акадэмію.

HORATII

Значны ўплыў на светапогляд дзеячаў нашай навукі і культуры зрабілі ідэі французскіх асветнікаў Вальтэра, Д. Дзідро, Ш. Мантэск'ё, Ж.-Ж. Русо. Вядома, што Русо цікавіўся па прапанову А. Тызенгаўза пасяліцца ў Беларусі, і толькі выпадак не дазволіў яму зрабіць гэта.

[illegible] 1561 г. [illegible]

Бібліятэка Віленскага ўніверсітэта. Сучаснае фота

Бібліятэкі

Важную ролю ў распаўсюджванні новых ідэй і дасягненняў навукі адыгрывалі бібліятэкі. Яны існавалі пры калегіюмах і навучальных у Вільні, Полацку, Гродне, Берасці, Менску, Слуцку, Навагрудку, Бабруйску, Мазыры, Пінску, Паставах ды ў іншых гарадах Вялікага Княства.

Найбуйнейшы кнігазбор сярод навучальных установаў меўся Віленская акадэмія.

Аснову бібліятэкі Полацкага езуіцкага калегіюма складалі выданні XVI–XVIII стст. на лацінскай, беларускай, польскай, французскай, нямецкай мовах, у тым ліку творы антычных аўтараў, еўрапейскіх гуманістаў і энцыклапедыстаў. Разам з імі зберагаліся старажытныя манускрыпты, каля ста друкаваных на розных мовах Біблій.

У Нясвіжскім замку Радзівілаў захоўваліся тысячы кніг і старадаўніх рукапісаў. Гравюра [illegible] XIX ст.

Кніга з фамільнай бібліятэкі Сапегаў, якая налічвала [illegible] тысяч [illegible] выданняў. [illegible] «Ліс»

Славіўся сваім багаццем кнігазбор Сапегаў, які апрача разнастайнай літаратуры па юрыспрудэнцыі, гісторыі, геаграфіі, тэалогіі, мовазнаўстве ўлучаў архіў старажытных актаў і ўнікальную калекцыю гравюраў. Бібліятэкі, што належалі гэтаму славутаму магнацкаму роду, існавалі ў Слоніме, Ружанах, Дзярэчыне.

У маёнтку Шчорсы на Навагрудчыне стварыў знакамітую бібліятэку на некалькі тысяч тамоў падканцлер Яўхім Храптовіч, які ў часе падарожжаў па Францыі, Нямеччыне і Галандыі набыў калекцыю еўрапейскіх выданняў XVI–XVII стст., а потым імкнуўся сабраць усе значныя кнігі эпохі Асветніцтва.

Ганарыліся прыватнымі кнігазборамі полацкія уніяцкія архібіскупы Фларыян Грабніцкі і Ясон Юнаша-Смагарэўскі.

Самай багатай прыватнай бібліятэкай не толькі Вялікага Княства Літоўскага, але і ўсёй Рэчы Паспалітай заслужана лічылася Нясвіжская, заснаваная Мікалаем Радзівілам Чорным. У 1772 г. яна налічвала больш за 20 тысяч тамоў. Там захоўваліся інкунабулы (найстаражытнейшыя друкаваныя кнігі, выдадзеныя ў XV ст.), антычная і рэнесансавая літаратура, гістарычныя і юрыдычныя выданні, рэфармацыйныя творы.

Рэдкія выданні з калекцыі Яўхіма Храптовіча: [illegible]

У палацы былога канцлера Яўхіма Літавора Храптовіча ў Шчорсах каля Навагрудка знаходзілася бібліятэка [illegible] Гравюра сярэдзіны XIX ст. [illegible] Напалеона Орды

Багатым кнігазборам ганарыўся полацкі уніяцкі архібіскуп Ясон Юнаша-Смагарэўскі. Гравюра канца XVIII ст.

Вялікае Княства Літоўскае на рознай [illegible] выконвала ролю [illegible] моста паміж Еўропай і Расіяй.

КУЛЬТУРА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА Ў ЭПОХУ АСВЕТНІЦТВА

Віленскі кафедральны касцёл у 1786–1801 гг. быў перабудаваны ў стылі класіцызму паводле праекта архітэктара Лаўрына Гуцэвіча. Акварэль [illegible] 1790-х гг.

Архітэктура і мастацтва

Значныя здабыткі мела ў XVII–XVIII стст. архітэктура Вялікага Княства. Паводле праектаў вядомых дойлідаў Я. Глаўбіца, Дж. Сака, К. Спампані ды іншых узводзіліся і перабудоўваліся кляштары, магнацкія рэзідэнцыі. Да найлепшых архітэктурных узораў таго часу належаць збудаваныя ў стылі барока віленскія касцёлы святога Казіміра, святой Тэрэзы, святых Пятра і Паўла, касцёлы і кляштары езуітаў, бернардзінцаў, брыгітак у Горадні, францысканцаў у Пінску, бернардзінцаў і бернардзінак у Слоніме, касцёл і кляштар езуітаў у Менску, Мікалінскі касцёл аўгусцінцаў, Магілёўская Мікалаеўская царква, Віцебская ратуша...

Маёнтак у Залессі каля Смаргоні, які на пачатку XIX ст. належаў палітыку, кампазітару і мецэнату Міхалу Клеафасу Агінскаму, сучаснікі называлі «Паўночнымі Афінамі». Гравюра з малюнка Леанарда Ходзькі. 1822 г.

Барока зрабіла адчувальны ўплыў на беларускую школу іканапісу, якая разам з тым па-ранейшаму вызначалася глыбокай сувяззю з народным светапоглядам і фальклорнымі матывамі.

Сабор святой Сафіі ў Полацку. Сярэдзіна XVIII ст. Узарваны ў 1964 г. Фота пачатку XX ст.

Фрагмент інтэр'ера Полацкай Сафіі. Другая палова XVIII ст.

ХРАНАЛОГІЯ

1705–1753 гг. – Жыццё і дзейнасць Францішкі Уршулі Радзівіл.
1718 г. – пасля 1760 г. – Жыццё і дзейнасць Саламеі Пільштыновай (Русецкай).
1724–1808 гг. – Дзейнасць Нясвіжскай капэлы.
1738–1750 гг. – Перабудова Полацкага Сафійскага сабора ў стылі віленскага барока.
1740–1791 гг. – Дзейнасць Нясвіжскага тэатра Радзівілаў.
1745–1807 гг. – Жыццё і дзейнасць Францішка Смуглевіча.
1754 г. – Выйшла кніга Францішкі Уршулі Радзівіл «Камедыі і трагедыі».
1756–1790 гг. – Дзейнасць Нясвіжскай балетнай школы.
1762–1835 гг. – Жыццё і дзейнасць Яна Рустэма.
1769–1780 гг. – Дзейнасць Гарадзенскага тэатра А. Тызенгаўза.
1787 г. – Прэм'ера «Камедыі» Канстанціна Марашэўскага.

Гарадзенскі касцёл святога Францішка Ксаверыя. Канец XVII ст. Сучаснае фота.

Выдатнымі помнікамі віленскага барока сталі перабудаваныя Полацкі Сафійскі сабор, Беразвецкі манастыр базыльянаў, Глыбоцкі касцёл і кляштар кармелітаў, Івянецкі касцёл і кляштар францысканцаў. Важную ролю ў станаўленні школы гэтага своеасаблівага кірунку барока адыграў Ян Глаўбіц.

У другой палове XVIII ст. з'явіліся збудаванні, у якіх спалучаліся рысы барока і класіцызму, – Гарадзенскі каралеўскі палац, Ружанскі палацавы комплекс. Палацава-паркавыя ансамблі існавалі ў Слоніме, Шчорсах (Навагрудчына), Азярэчаве (паблізу Зэльвы). Найбольш старадаўнія помнікі садова-паркавага мастацтва, якія захаваліся да нашых дзён, – рэгулярныя паркі ў Бачэйкаве (Бешанковіцкі раён) і ў вёсцы Дубай (Пінскі раён). Надзвычай цікавы італійскі парк быў створаны ў маёнтку Залессе паблізу Смаргоні, які належаў Агінскім.

Палацы і замкі магнатаў аздабляліся высокамастацкімі габеленамі і партрэтамі. Апісанне Нясвіжскай рэзідэнцыі Радзівілаў за 1770 г. пералічвае 984 творы выяўленчага мастацтва на палатне і дрэве.

У сярэдзіне XVIII ст. склаўся і атрымаў пашырэнне адметны стыль віленскага барока. Ён вызначаўся вытанчанасцю прапорцый, скульптурнай пластычнасцю фасадаў і інтэр'ераў, маляўнічасцю франтонаў і ажурных вежаў. У гэтым стылі ствараліся шматлікія вуніяцкія храмы.

Касцёл [illegible] Дзевы Марыі ў мястэчку [illegible] Маладзечанскага раёна. XVII – другая палова XVIII ст. Фота Дзмітрыя Герасімовіча. 2007 г.

Францысканскі касцёл Узнясення Дзевы Марыі ў Пінску. Першая чвэрць XVIII ст. Сучаснае фота

У жывапісе перажываў свой росквіт жанр партрэта. У ім, а таксама ў гістарычным, батальным, пейзажным жанрах плённа працаваў прадстаўнік класіцызму Францішак Смуглевіч. У другой палове XVIII ст. пачаўся творчы шлях майстра партрэта Яна Рустэма.

Мастацтва графікі папоўнілі працы Аляксандра і Лявона Тарасевічаў, Васіля Вашчанкі, Гершкі Лейбовіча.

У скульптуры пад уплывам барока нашыя майстры стварылі з дрэва ўнікальныя алтарныя ансамблі ў Гарадзенскім касцёле езуітаў і Пінскім касцёле францысканцаў. Узнікла свецкая скульптура – бюсты магнатаў, гістарычных дзеячоў, мастацкія надмагіллі.

Шырокую вядомасць у краіне і за яе межамі набылі творы дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва, асабліва слуцкія паясы, карэліцкія шпалеры, урэцка-налібакскае шкло.

Пад уплывам эстэтыкі барока і ідэяў Асветніцтва пашыраліся жанравая разнастайнасць твораў, якія набывалі выразны свецкі характар і набліжаліся да жыцця. Узнікла інтымная лірыка, грамадзянская паэзія, пародыйна-сатырычная проза і драматургія.

Літаратура

Пасля соймавай пастановы 1696 г., якая замяніла нашу дзяржаўную мову на польскую, сфера выкарыстання беларускай мовы болей звузілася. У гэты перыяд літаратура ў Вялікім Княстве Літоўскім стваралася пераважна на польскай, а часам на лацінскай мовах.

Прыхільнік класіцызму паэт Міхал Карыцкі пісаў на лаціне. Самым папулярным яго творам была паэма «Пгушыны сойм» – сатыра на шляхту і магнатаў Рэчы Паспалітай. Творчасць Карыцкага паўплывала на лацінамоўную паэзію эпохі Асветніцтва ў Польшчы і Украіне.

Паэт, драматург і перакладчык Францішак Дыянізій Князьнін. Малюнак невядомага мастака другой паловы XVIII ст.

HISTORYA JANA KAROLA CHODKIEWICZA

WOIEWODY WILENSKIEGO HETMANA WIELKIEGO W. X. L.

TOM I.

w WARSZAWIE

R. MDCCLXXXI

Кніга Адама Нарушэвіча «Гісторыя Яна Кароля Хадкевіча». Варшава. 1781 г.

Прадстаўніком сентыменталізму быў паэт і драматург Францішак Князьнін. Яго пяру належаць напісаныя па-лацінску і па-польску байкі, любоўная і рэлігійная лірыка, пастаралі з элементамі беларускага фальклору.

Паэт, гісторык і асветнік Адам Тадэвуш Станіслаў Нарушэвіч. Мастак Ян Пётр Норблін. Літаграфія першай паловы XIX ст.

Польскамоўны паэт, перакладчык і гісторык Адам Нарушэвіч пакінуў у сваёй творчай спадчыне палітычныя оды, пераклады з французскай і лацінскай моваў, дзённікі з апісаннем падарожжаў вялікага князя і караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага па падуладных яму землях.

Драматург Каятан Марашэўскі здабыў славу найперш сваёй беларуска-польскай «Камедыяй», галоўны герой якой – прыгонны селянін Дзёмка. Аўтар сцвярджаў у п'есе асветніцкую думку, што шчасце залежыць не ад лёсу, а ад чалавечых учынкаў. «Камедыя» Марашэўскага ў сучаснай апрацоўцы і цяпер у рэпертуары беларускіх тэатраў.

Папулярнасцю карысталіся і драматургічныя творы Міхала Цяцерскага: камедыі «Шлюб, перакуплены хлапцы штучкамі арлекіна» і «Лекар па прымусе» (на вядомы сюжэт Мальера, але з беларускімі героямі і мясцовым каларытам), лібрэта оперы «Апалон-заканадаўца, або Рэфармаваны Парнас».

Партрэт вялікага князя і караля Станіслава Аўгуста. Мастак М. Бачарэлі. 1780-я гады

Аўтаркай шматлікіх арыгінальных п'ес і перакладаў была княгіня Францішка Уршуля Радзівіл, першая жанчына-драматург у Рэчы Паспалітай, а таксама таленавітая паэтка. У 1754 г. асобнай кнігаю выйшлі яе «Камедыі і трагедыі».

Надзвычай каларытныя мемуары, якія нагадваюць прыгодніцкі раман, стварыла ў 1760 г. ліцвінка з Навагрудчыны, падарожніца і лекарка Саламея Пільштынова (у дзявоцтве Русецкая). Яна дасціпна апісала побыт і норавы Вялікага Княства, Турцыі, Расеі, Аўстрыі. Польскамоўныя ўспаміны нашай таленавітай суайчынніцы перасыпаныя беларусізмамі, народнымі прыказкамі і прымаўкамі. У 1993 г. кніга С. Пільштыновай пад назвам «Авантуры майго жыцця» выйшла ў перакладзе на беларускую мову і, нягледзячы на вялікі наклад, хутка стала рарытэтам.

Фрагмент [illegible] Джавы Марыі [illegible] XVIII ст. Фота [illegible] 2007 г.

Сцэны з [illegible] Францішкі Уршулі Радзівіл у пастаноўцы Нясвіжскага тэатра: «[illegible]», «[illegible]», «[illegible]» – [illegible]. Гравюры Міхала Жукоўскага. Сярэдзіна XVIII ст.

[illegible] Францішкі Уршулі Радзівіл. Скульптар [illegible]. 2008 г.

Выдатнай з'явай нашай культуры ў гэтую эпоху сталі прыватныя тэатры, якія дасягнулі прафесійнага роўню. Найбольшую вядомасць у Вялікім Княстве і далёка за яго межамі мелі тэатры Радзівілаў у Нясвіжы і Слуцку, Тызенгаўза ў Гародні, Агінскага ў Слоніме. 80 акцёраў налічвала тэатральная трупа ў маёнтку Дзярэчын, што належаў Сапегам. Разам з тэатрамі звычайна ствараліся капэлы.

Арган [illegible] XVIII ст.

Тэатр і музыка

Пры Нясвіжскім тэатры існавала балетная, музычная і вакальная школы. Спектаклі адбываліся ў адмысловым будынку «камедыхаўзе» ў суправаджэнні Нясвіжскай капэлы – прыдворнага аркестра князёў Радзівілаў. У рэпертуар уваходзілі камедыі, трагедыі, оперы Францішкі Уршулі Радзівіл, творы Мальера, Вальтэра, балеты і пантамімы. Нясвіжскія акторы з поспехам выступалі ў іншых гарадах краіны.

Слонімскі тэатр, заснаваны вялікім гетманам Міхалам Казімірам Агінскім, меў выключныя тэхнічныя магчымасці. Да прыкладу, пад час спектакляў маглі біць два вялікія фантаны, асветленыя бенгальскімі агнямі. Існавала таксама размешчаная на Агінскім канале плавучая сцэна на баржах для водных феерый і тэатралізаваных баталій з удзелам кавалерыі. У чатырох'ярусных ложах тэатра маглі змясціцца дзве тысячы гледачоў. Славілася майстэрствам Слонімская капэла. Рэпертуар тэатра Агінскага ўключаў 60 опер (у тым ліку «Цыганы» на лібрэта Ф. Князьніна), 18 балетаў, тры музычныя камедыі, 253 сімфоніі. Музыку да некаторых сцэнічных твораў пісаў сам Агінскі, які, дарэчы, падказаў Гайдну сюжэт яго найзнакамітай араторыі «Стварэнне свету».

Вядомасць як кампазітар атрымаў пазней яшчэ адзін Агінскі – Міхал Клеафас, аўтар папулярных паланэзаў (у тым ліку славутага «Развітання з Айчынай»), рамансаў, фартэпіянных п'ес і напісанай на ўласнае лібрэта оперы «Зеліда і Валькур, або Банапарт у Каіры». Мелодыя каваціны Фігаро ўпершыню прагучала за восем гадоў да стварэння Моцартам оперы «Вяселле Фігаро» ў вакальным цыкле Міхала Клеафаса Агінскага «Да Касі».

Нашы кампазітары ўзбагацілі музычнае мастацтва Еўропы шэрагам адкрыццяў. Да іх належыць выкарыстанне вакальных цыклаў задоўга да «афіцыйнага» пачынальніка гэтага жанру Бетховена. Творы Мацея Радзівіла сталі першымі еўрапейскімі аркестровымі ўзорамі паланэзаў. Крыху пазней першую оперу «Фауст» у супрацоўніцтве з Гётэ напісаў Антон Генрык Радзівіл.

Магнаты Вялікага Княства запрашалі да сябе прызнаных майстроў тэатральнага і музычнага мастацтва з Заходняй Еўропы, але большасць трупы або аркестра звычайна складалі акторы і музыкі з мясцовых сялянаў і мяшчанаў. Гарадзенскі балет і слонімскія танцоры сталі пазней асновай каралеўскага Варшаўскага балета.

Побач з прыватнымі працягвалі сваю традыцыю гэтак званыя школьныя тэатры, што існавалі пры навучальных установах. Шырока вядомы быў тэатр Забельскага дамініканскага калегіума (каля вёскі Валынцы Верхнядзвінскага раёна), дзе выкладалі знаныя драматургі К. Марашэўскі і М. Цялерскі. Там была пастаўлена «Камедыя» Марашэўскага – першая беларуская камедыя, дзе галоўныя персанажы гавораць па-беларуску.

Міхал Клеафас Агінскі [illegible] Канец XVIII ст.

Культурныя дасягненні нашай краіны ў эпоху Асветніцтва ў сваіх лепшых праявах сталі ўзорамі з здабыткамі заходнееўрапейскай культуры і значна ўплывалі на расійскае мастацтва.

[illegible] Гарадзенскага бернардынскага кляштара. XVIII ст.

ДРУГІ ПАДЗЕЛ ДЗЯРЖАВЫ

Вялікую занепакоенасць Канстытуцыя 3 траўня выклікала у Расіі. Для інтэрвенцыі была падрыхтавана 160-тысячная армія. Утвораная Тарговіцкая (ад назвы мястэчка Тарговіца на Украіне) канфедэрацыя незадаволеных рэвалюцыйнымі пераменамі ў дзяржаве дала падставу для расійскага ўварвання.

Станіслаў Аўгуст у каранацыйным строі. Мастак М. Бачарэлі. 1792 г.

Большасць «палітычнага народа» Вялікага Княства Літоўскага падтрымала прынятую Соймам Канстытуцыю. Увосень 1792 г. усе 11 яе артыкулаў былі ўхвалены на 32 з 34 павятовых соймікаў. Але супраць рэформаў Чатырохгадовага сойму выступілі кансерватыўныя колы магнатаў і шляхты, незадаволеных умацаваннем цэнтральнай улады.

Санкт-Пецярбургу запатрабаваў ад урада Рэчы Паспалітай скасаваць Канстытуцыю. Кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі звярнуўся па падтрымку да прускага караля Фрыдрыха Вільгельма II, з якім у 1790 г. падпісаў абарончую дамову. Аднак той пакінуў нашую дзяржаву ў адзіноце, бо ўжо меў таемнае пагадненне з Расіяй пра новы падзел надзейнай хаўрусніцы.

Злучыўшыся з канфедэратамі, велізарныя расійскія войскі перамаглі аддзелы патрыётаў і ўлетку 1792 г. занялі тэрыторыю Княства. Сучаснік тых падзей пісаў: «Увесь край, дзе вялася вайна, ад маскоўцаў і сваіх стаў дашчэнту спустошаны, так што засталіся нам толькі неба і зямля». Кароль Станіслаў Аўгуст далучыўся да Тарговіцкай канфедэрацыі. Канстытуцыя і рэформы Вялікага сойму скасоўваліся.

ХРАНАЛОГІЯ

- [illegible] 1792 г. – Стварэнне Тарговіцкай канфедэрацыі [illegible]
- [illegible] 1792 г. – Пачатак інтэрвенцыі Расіі на тэрыторыю Вялікага Княства.
- 23 студзеня 1793 г. – Другі падзел дзяржавы.
- [illegible] – Апошні Сойм Рэчы Паспалітай [illegible]

У Гродні быў скліканы Сойм Рэчы Паспалітай. Ён не адлюстроўваў сапраўдных настрояў у дзяржаве, бо патрыятычныя сілы абвясцілі яму байкот. Месца пасяджэнняў абкружылі расійскія войскі. Упартых дэпутатаў-незалежнікаў арыштавалі, астатнія, запалоханыя і падкупленыя, галасавалі так, як загадваў расійскі пасол.

Сойм, якому наканавана было стаць апошнім у гісторыі дзяржавы, узаконіў чарговы захоп земляў і афіцыйна скасаваў Канстытуцыю 1791 г. Цяпер урад Рэчы Паспалітай мог мець усяго 15-тысячную армію і канчаткова страціў магчымасць весці самастойную палітыку.

У зняважанай, разарванай на часткі краіне выспяваў пратэст.

Каралеўскі палац у Гродне. [illegible]

На пачатку 1793 г. на тэрыторыю Рэчы Паспалітай уварвалася прускае войска. 23 студзеня Расія і Прусія падпісалі акт аб другім падзеле нашай дзяржавы. Царская імперыя далучыла цэнтральныя беларускія землі прыкладна па лініі Друя–Пінск, а таксама ўсходнюю Валынь, Кіеўскае і Брацлаўскае ваяводствы на Украіне – разам 250 тысяч квадратных кіламетраў.

ПАЎСТАННЕ ТАДЭВУША КАСЦЮШКІ. ТРЭЦІ ПАДЗЕЛ

Прыжыццёвы партрэт Тадэвуша Касцюшкі, створаны невядомым мастаком другой паловы XVIII ст.

Нацыянальна-вызвольнае паўстанне, якое выбухнула ў 1794 г., было накіраванае супраць расейскіх і прускіх акупантаў. Паўстанцы мелі на мэце аднаўленне незалежнасці Рэчы Паспалітай у межах 1772 г., вяртанне Канстытуцыі 3 траўня 1791 г. і працяг рэформаў Чатырохгадовага сойму. На чале змагароў стаў Андрэй Тадэвуш Банавентура Касцюшка, які 24 сакавіка абвясціў у Кракаве Акт паўстання.

Касцюшка быў нашчадкам беларускага шляхоцкага роду і заўсёды падкрэсліваў сваё ліцвінскае паходжанне. Ён прыйшоў на свет у фальварку Марачоўшчына паблізу Косава (цяпер Івацэвіцкі раён). Пасля навучання ў Варшаўскім кадэцкім корпусе і Парыжскай вайсковай школе Тадэвуш добраахвотна ўдзельнічаў у вайне за незалежнасць Злучаных Штатаў Амерыкі, дзе яму было нададзенае званне генерала. За шэраг перамогаў, атрыманых рэспубліканцамі дзякуючы яго таленту вайсковага інжынера, Касцюшка стаў нацыянальным героем ЗША. Нашаму выдатнаму суайчынніку пастаўленыя помнікі ў Вашынгтоне, Клīўлендзе, Чыкага, а ў штаце Місісіпі яго імем названы горад.

Сядзібы ў Полацкай у красавіку 1794 г. паўстала Вялікае Княства. У ноч з 22 на 23 красавіка патрыёты вызвалілі Вільню, дзе ўладу ўзяў у свае рукі часовы ўрад – Найвышэйшая Літоўская Рада.

Вярнуўшыся на радзіму, Тадэвуш ваяваў супраць прарасейскай Таргавіцкай канфедэрацыі, а як толькі пачалося паўстанне, узначаліў яго.

Сядзіба Касцюшкаў у Марачоўшчыне (цяпер Івацэвіцкі раён). На другім плане – Косаўскі палац Пуслоўскіх. Літаграфія паводле малюнка Напалеона Орды. Сярэдзіна XIX ст.

ХРАНАЛОГІЯ

1746–1817 гг. – Жыццё і дзейнасць Тадэвуша Касцюшкі.
1761–1794 гг. – Жыццё і дзейнасць Якуба Ясінскага.
24 сакавіка 1794 г. – Тадэвуш Касцюшка абвясціў у Кракаве Акт паўстання.
23 красавіка 1794 г. – Ажыццяўлены паўстанцкі ўзброены выступ у Вільні. Стварэнне Найвышэйшай Літоўскай Рады.
Красавік–травень 1794 г. – Паўстанцы ўзялі Гародню, Берасце, Навагрудак, Слонім, Пінск, Ваўкавыск, Кобрынь, Ашмяны, Ліду, Браслаў.
9 траўня 1794 г. – [illegible] Я. Ясінскі і разбіта расійскае войска каля вёскі [illegible].
Чэрвень 1794 г. – Рэйд Міхала Клеафаса Агінскага ў Мінскую губерню.
Ліпень–жнівень 1794 г. – Рэйд Кароля Серакоўскага па Берасцейскім і Навагрудскім ваяводствах.
Жнівень 1794 г. – Рэйды М. К. Агінскага на Дынабург і Стафана Грабоўскага на Міншчыну.
17 верасня 1794 г. – Крупчыцкая бітва паўстанцаў з войскамі А. Суворава.
24 кастрычніка 1795 г. – Трэці падзел Рэчы Паспалітай.
25 лістапада 1795 г. – Караль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі адрокся ад трона.

[illegible] Т. Касцюшкі

На абшары Княства арганізатарам і кіраўніком паўстання стаў трыццацігадовы палкоўнік Якуб Ясінскі. Яго паплечнікамі былі Тамаш Ваўжэцкі, Міхал Клеафас Агінскі, Стафан Грабоўскі, Кароль Серакоўскі.

Ясінскі скончыў кадэцкі корпус у Варшаве, браў удзел у ваенных дзеяннях супраць расейскіх войскаў у 1792 г., а потым увайшоў у канспірацыйную групу, якая рыхтавала паўстанне. Ён належаў да «віленскіх якабінцаў» – прыхільнікаў ідэяў Французскай рэвалюцыі, што выступалі з патрабаваннямі рэспубліканскага дзяржаўнага ладу, роўнасці станаў і адмены прыгону. Артыкулы «якабінскага» характару друкавала «Віленская нацыянальная газета», што была органам Найвышэйшай Літоўскай Рады.

Маючы літаратурныя здольнасці, Ясінскі пісаў палітычныя і патрыятычныя творы, а ў часе паўстання – вершаваныя прокламацыі на беларускай мове.

Напачатку ініцыятыва знаходзілася ў руках інсургентаў (паўстанцаў), якія ў Княстве налічвалася блізу 40 тысяч. Яны вызвалілі Берасце, Гародню, Навагрудак, Слонім, Пінск, Ліду, Браслаў... Паўстанцкі рух ахапіў усю тэрыторыю Вялікага Княства Літоўскага ў межах 1793 г.

Правадыр паўстанцаў у Літве-Беларусі Якуб Ясінскі. Партрэт невядомага мастака канца XVIII ст.

Пячатка Якуба Ясінскага

Найвышэйшая Рада прызначыла Якуба Ясінскага камандзірам арміі Вялікага Княства. У паўстанцкае войска ішлі людзі ўсіх станаў – шляхта, мяшчане, святары, узброеныя косамі сяляне-касінеры. У аддзелах Ясінскага спявалі «Песню беларускіх жаўнераў»:

Нашто землю нам забралі?
Пашто ў путы заканалі?
Дакуль будзем так маўчаці?
Годзе нам сядзець у хаце!
Возьмем косы ды сякеркі,
Пойдзем гордыя ляцець карку!
Пойдзем жыва да Касцюшкі,
Рубаць будзем маскалюшкі!

Тадэвуш Касцюшка – жаўнер свабоды. Прыжыццёвы партрэт. Мастак Ёзеф Пешка. Пачатак XIX ст.

Касцюшка заклікаў пра ўраўнанне правоў каталікоў і вернікаў іншых канфесій, называў праваслаўных «братамі і суграмадзянамі». Вуніяцкія і праваслаўныя святары ўваходзілі ў склад паўстанцкіх камітэтаў і камісій. Палітыка талерантнасці, а таксама абяцанне скасаваць прыгонныя правы прывялі да актыўнай падтрымкі паўстанцаў беларускім сялянствам. «Уся зямля знаходзіцца супраць нас», – гаварылася ў адным з расійскіх вайсковых рапартаў.

Андрэй Тадэвуш Банавентура Касцюшка. Невядомы мастак.

У траўні 1794 г. Ясінскі з дывізіяй, дзе большасць складалі сяляне, разграміў расейцаў каля Палянаў паблізу Ашмяны. За гэтую перамогу ды іншыя вайсковыя поспехі камандзір інсургентаў літоўскіх атрымаў ранг генерал-лейтэнанта. З мэтаю пашырэння абсягу паўстання ён загадаў ствараць конныя фармаванні для ваенных экспедыцыяў на землі, захопленыя Расеяй у выніку першага і другога падзелаў Рэчы Паспалітай.

Найбольш значнымі былі рэйды аддзела Міхала Клеафаса Агінскага (не толькі здольнага камандзіра, але і аўтара «Маршу паўстанцаў 1794 года» ды іншых папулярных баявых песняў) на Вілейшчыну і Івянец, а пазней на Дынабург, а таксама экспедыцыя Стафана Грабоўскага. У жніўні 3-тысячны аддзел Грабоўскага прайшоў праз Івянец, Ракаў, Койданаў, Пухавічы, Асіповічы, Бабруйск, дзе знішчыў расейскі гарнізон, але мусіў адступаць і пад Любанню быў разбіты. Паспяховы рэйд па маршруце Ваўкавыск–Шарашова–Пружаны–Ружаны–Слонім здзейсніў у ліпені-жніўні 4-тысячны корпус Караля Серакоўскага.

Расея кінула на інсургентаў Вялікага Княства Літоўскага 30-тысячную рэгулярную армію. Тым часам у паўстанцкім кіраўніцтве не было адзінства. Касцюшка пабойваўся абапірацца на просты народ і нічога не зрабіў дзеля вызвалення прыгонных. Выкарыстаўшы гэта, царскія ўлады разгарнулі сярод сялянства прапаганду, абяцаючы ягоную забраную ў «паноў-бунтаўнікоў» зямлю.

Пад ціскам варшаўскіх кансерватараў, напалоханых рэвалюцыйнай праграмай «віленскіх якабінцаў» і намерам аднавіць незалежнасць Вялікага Княства Літоўскага, Касцюшка адхіліў Якуба Ясінскага ад камандавання паўстаннем у Княстве. Яго замяніў польскі генерал Міхал Вяльгорскі, што вызначаўся паслухмянасцю, але не вайсковымі здольнасцямі. Найвышэйшая Літоўская Рада была абвінавачаная ў сепаратызме, дзеяннях супраць «уніі братніх народаў» і распушчаная. Замест яе ўтваралася падпарадкаваная Цэнтральная дэпутацыя Вялікага Княства. Усё гэта паслабляла і без таго невялікія нацыянальныя сілы паўстанцаў.

У сярэдзіне жніўня чатыры расейскія дывізіі захапілі Вільню. На пачатку восені на поўдні Беларусі з'явіліся войскі генерала А. Суворава, якое Санкт-Пецярбург перакінуў сюды пасля замірэння з Турцыяй. 17 верасня каля вёскі Крупчыцы пад Кобрынам адбылася самая буйная за час паўстання бітва. Сувораву супрацьстаялі аддзелы інсургентаў на чале з генералам К. Серакоўскім. З абодвух бакоў ваявалі блізу 20 тысяч чалавек. У шэрагах паўстанцаў мужна змагаліся з карнікамі тры тысячы сялян-касінераў, якія амаль цалкам загінулі. Бітва завяршылася арганізаваным адыходам корпуса Серакоўскага пад Берасце, але там праз два дні ён быў разбіты.

Найдаўжэй інсургенты трымаліся ў Гродне, якую 30 верасня наведаў Тадэвуш Касцюшка. На вялікі жаль, нашыя паўстанцы адступілі да Варшавы. 10 кастрычніка ў бітве пад Мацеёвіцамі Касцюшка пацярпеў паразу і трапіў у палон. Пасля гэтага кіраўніком паўстання на ўсім абшары Рэчы Паспалітай стаў ліцвін Тамаш Ваўжэцкі родам з Браслаўшчыны.

Паводле [illegible] у 1795 г. за трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай, Прусія і Аўстрыя далучылі да сваіх уладанняў рэшту тэрыторыі Польшчы і суседнія землі Заходняй Украіны. Расія захапіла частку заходнеўкраінскага абшару і землі Літвы-Беларусі – 120 тысяч квадратных кіламетраў з 1,2 мільёна жыхароў. Толькі Беластоцкая акруга, населеная пераважна беларусамі, адышла да Прусіі, аднак у 1807 г. і яна трапіла пад царскую ўладу. Такім чынам, [illegible] ад [illegible] ([illegible]) да ўкраінцаў і Каралеўца (Кёнігсберга) у [illegible] Беласток страціў магчымасць стаць асяродкам беларускага адраджэння.

[illegible]

Карта трэцяга падзелу Польшчы і Княства Літоўскага і Польскага Каралеўства. Гравюра Дж. Кэры. Лондан. 1799 г.

Пад сцягамі Якуба Ясінскага адважна ваявалі беларускія татары. Полк Аляксандра Улана ў складзе корпуса Стафана Грабоўскага ўдзельнічаў у рэйдзе на Меншчыну. У бітвах пад Крупчыцамі і Мацеёвіцамі вызначыўся полк Мустафы Ахматовіча. Пры канцы паўстання нашыя татары разам з братамі па зброі гераічна баранілі Варшаву.

4 лістапада салдаты Суворава штурмам узялі варшаўскае прадмесце Прагу (на правабярэжжы Віслы) і з нечалавечай лютасцю знішчылі ўсіх не абаронцаў і жыхароў – блізу 25 тысяч чалавек. У гэты дзень загінуў у баі і Якуб Ясінскі.

Польскі гісторык Г. Масцінскі пісаў пра тыя падзеі: «Расейцы не шкадавалі нікога. У немаўлят вырывалі ад грудзей немаўлятак, каб не выраслі і не адпомсцілі. Манашак, што былі ў кляштары бернардзінак, згвалцілі і зарэзалі. З дамоў выкідвалі для п'янай уцехі ганчачасных кабетаў, гвалцілі і забівалі... Плошчы былі заслатыя трупамі. Разам з людскімі целамі гніюшчыліся трупы коней, сабак, катоў, бо раз'юшаныя выглядам крыві расейскія салдаты не выпускалі жывымі нават жывёлаў».

6 лістапада Варшава здалася. Частка паўстанцаў трапіла ў расейскі і прускі палон, іншыя перайшлі на нелегальнае становішча і падаліся ў выгнанне.

25 лістапада 1795 г. кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі зрокся свайго пасаду.

Рэч Паспалітая знікла з палітычнае карты свету. Разам з ёю спыніла сваё існаванне і дзяржава нашых продкаў – Вялікае Княства Літоўскае, ператворанае ў частку Расейскай імперыі. Нашыя землі ўвайшлі ў тры створаныя ў 1795 г. генерал-губернатарствы: Беларускае (Полацкая і Магілеўская губерні), Літоўскае (Слонімская і Віленская губерні, а таксама Ковенская і Гарадзенская вобласці) і Падольскае (Менская, Валынская і Падольская губерні).

[illegible] у Беларусі. [illegible] 2005 г.

A NEW MAP of POLAND, [illegible] GRAND DUCHY of LITHUANIA, [illegible] AUSTRIA, RUSSIA and PRUSSIA [illegible]

BALTIC or EAST SEA

ПАД РАСЕЙСКАЙ УЛАДАЙ

У царскай, а потым у савецкай імперыі захоп нашых земляў называўся не інакш як уз'яднаннем, хоць ніколі раней Літва-Беларусь у складзе Расеі не знаходзілася. Продкі гаманілі за «уз'яднанне» нагамі. За два дзесяцігоддзі пасля трагічнага 1772 года, калі адбыўся першы падзел, з захопленай тэрыторыі Полацкага, Віцебскага і Амсціслаўскага ваяводстваў за мяжу, у Вялікае Княства Літоўскае, перайшло больш за 30 тысяч сялянаў. У сваіх нотах расейскі ўрад называў гэтыя масавыя ўцёкі «незразумелай эміграцыяй», ацэньваючы агульную колькасць перасяленцаў у 300 тысяч «голов».

Кацярына II і яе сын імператар Павел I раздалі сваім дваранам на далучаных абшарах 208,5 тысячы «душ мужеска полу». Такім чынам, блізу паўмільёна беларусаў зрабіліся прыгоннымі расейскіх памешчыкаў, прычым пераважная большасць гэтых сялянаў раней жылі на дзяржаўных землях і былі асабіста вольныя. Кіраўнік задушэння паўстання Тадэвуша Касцюшкі А. Суворaў атрымаў ва ўзнагароду цэлае Кобрынскае староства ды іншыя землі з 25 тысячамі душаў.

У выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай даўняя мара расейскіх цароў здзейснілася: Вялікае Княства Літоўскае стала часткаю Расейскай імперыі. Маркс і Энгельс трапна назвалі гэтую краіну жандарам Еўропы, а Азіяй – турмой народаў.

Феадальная гаспадарка ў Расеі вызначалася прымітыўнасцю, а формы эксплуатацыі былі больш цяжкія, чым тыя, што існавалі ў нашай дзяржаве. Гаспадары атрымалі права прадаваць сялянаў без зямлі.

ХРАНАЛОГІЯ

1772 г. – [illegible]

1793 г. – [illegible]

1794 г. – [illegible]

1795 г. – [illegible]

1797 г. – [illegible]

1802–1809 гг. – [illegible]

1811 г. – [illegible]

Прыгонных, якія раней пераважна плацілі грашовы аброк, пагналі на паншчыну. Памешчыкі тысячамі здавалі сялянаў на будаўнічыя работы ў далёкія расейскія губерні. Неўпападдкова адразу пасля канчатковага захопу Вялікага Княства пачаліся сялянскія бунты. Вяскоўцы часта ўцякалі з праваслаўнай Расеі-«вызвалгельніцы» на Беласточчыну, пад уладу пратэстанцкай Прусіі.

Пагоршылася і становішча гарадскога насельніцтва. Мяшчанаў таксама абклалі падушным падаткам і ў вайсковай павіннасці прыраўнялі да сялянаў. Падаткі ў беларускіх губернях да 1811 г. заставаліся ў чатыры-пяць разоў цяжэйшымі, чым у расейскіх.

Прафесійнае войска Вялікага Княства Літоўскага было расфармаванае. На змену яму прыйшлі невядомыя раней у нашай краіне рэкруцкія наборы. У рэкруты бралі маладых, здаровых мужчынаў ад 19 да 35 гадоў. Спачатку яны служылі ўсё жыццё, а ў 1793 г. тэрмін абмежавалі «ўсяго» чвэрткай стагоддзя. Мірным часам Пецярбург вымагаў ад 500 душаў аднаго салдата, у вайну – чатырох, пяці і нават васьмі. Тым часам рэкруцкая павіннасць не накладвалася на Латвію, Эстонію, Бесарабію, Грузію, Фінляндыю, а пазней і Украіну, якая пасылала на службу казацкія палкі.

У іншых гарадох і мястэчках адабралі старыя гербы і скасавалі магдэбургскае права на самакіраванне.

Апошнія рабіліся гарматным мясам у заваёўніцкіх царскіх паходах. Толькі ў 1811 г. беларускія губерні далі ў расейскую армію 14750 рэкрутаў.

Царскія асігнацыі вартасцю 25 і 10 рублёў

Захоп Вялікага Княства Расеяй адбываўся пад выглядам абароны правоў праваслаўных. Між тым яны складалі прыканцы XVIII ст. усяго 6% насельніцтва нашай краіны і ніякіх выгодаў, трапіўшы ў імперыю, не атрымалі. Каталікоў налічвалася значна болей, але Пецярбург не чыніў ім асаблівых перашкодаў. Гэта была вера вярхоў мясцовага грамадства, з якімі новая ўлада намагалася ўсталяваць ладныя стасункі. На далучаных да Расеі землях нават працягваў дзейнічаць скасаваны папам рымскім у 1773 г. Ордэн езуітаў.

Вуніяты ж, да якіх у гэты час належала больш за 3/4 жыхароў краю, трапілі пад жорсткі пераслед царскай адміністрацыі. Прычынаю было тое, што грэка-каталіцкая вера захоўвала мову і традыцыі народа, перашкаджаючы рабіць ліцвіноў-беларусаў расейцамі. У адказ на гвалт і здзекі значная частка вернікаў перайшла ў каталіцтва. Толькі ў 1795 г. на Меншчыне рымска-каталікамі сталі 200 тысяч вуніятаў.

Партрэт расійскага імператара Аляксандра I. Мастак Ф. Крюгер. 1812 г.

Кацярына II выдала ўказ аб пагалоўным пераводзе вуніятаў у праваслаўе.

Расейская імперыя ніколі не ведала рэлігійнай і нацыянальнай талерантнасці. Беларусаў наогул не прызнавалі за асобны народ, а лічылі папсаванымі палякамі расейцамі. Адпаведным было стаўленне і да мовы. Нашых продкаў нават пазбавілі права на ўласныя імёны і прозвішчы. Пасля захопу ўсходніх земляў Вялікага Княства царскія пісары ў дакументах перайначвалі Язэпаў у «Иосифов», Тамашоў – у «Фомов», Якубаў – у «Яковов»...
Да беларускіх прозвішчаў дадаваліся расейскія канчаткі, а сялянаў часта запісвалі па прозвішча памешчыка.

Ліцвінаў пазбавілі права навучацца ў замежных універсітэтах.

З манастырскіх, царкоўных і прыватных бібліятэк былога Княства ў Расею вывозілі летапісы і архівы славутых шляхоцкіх родаў.

Пільны нагляд уводзіўся над навучальнымі ўстановамі. Моваю выкладання ў школах і навучальнях у першыя дзесяцігоддзі была польская. Якраз тады, ужо ў Расейскай імперыі, паланізатары дасягнулі вялікіх поспехаў. У Пецярбургэ спачатку меркавалі, што на захопленых землях лепей мець справу з адпымі палякамі. Імператар Павел I і ўвогуле палічыў Літву-Беларусь польскім краем, што неадкладна выкарысталі для паланізацыі насельніцтва польскія нацыяналісты.

З другога боку, праводзілася русіфікацыя. Не было даверу нават мясцоваму праваслаўнаму духавенству. Святароў-беларусаў накіроўвалі служыць углыб імперыі, а на іх месца ехалі расейцы, што не ведалі ні мовы, ні традыцыяў прыхаджанаў. Яны не прызнавалі беларускіх святых, змагаліся з калядаваннем, Купаллем ды іншымі спрадвечнымі звычаямі. «Присланные священники не способны к поддержанию хороших отношений с людьми, этот край населяющими. Они стали ненавистны народу», – дакладвалі ў Пецярбург губернатары.

Мяшчане, купцы і рамеснікі каля...

Расейскія ўлады ўстанавілі для габраяў «мяжу аселасці», за якой ім нельга было сяліцца. Але і на дазволенай тэрыторыі, што прыкладна супадала з межамі былога Вялікага Княства, яўрэі не маглі жыць па-за гарадамі і мястэчкамі.

Былі ўведзены абмежаванні для жанчын. У Рэчы Паспалітай шляхцянкі і мяшчанкі валодалі маёмаснымі правамі, у Расійскай імперыі – не. Гэта рэзка звужала эканамічныя магчымасці асабіста вольных ліцвінак і паніжала іх статус у грамадстве.

Панарама Шклова. Канец XVIII ст.

Шляхта і магнаты, якія далі прысягу на вернасць царскаму трону, захавалі маёнткі і атрымалі ўсе тыя правы, што і расійскае дваранства. Аднак шляхта была незадаволеная скасаваннем ранейшых шырокіх прывілеяў і ставілася да новай улады варожа. Тая, у сваю чаргу, бачыла небяспеку ў існаванні вялікага шляхоцкага стану, удзельная вага якога ва ўсім насельніцтве захопленых земляў даходзіла да 12%. Імператар Аляксандр I пачаў гэтак званы разбор шляхты, якая мусіла дакументальна пацвердзіць свае правы. У адваротным выпадку шляхцічу прапаноўвалі запісацца ў падатковыя станы сялянаў або мяшчанаў.

Аннексія вялікіх земляў палітычна і эканамічна адсталай Расіяй вырвала іх з агульнаеўрапейскага руху цывілізацыі. Становішча пераважнай большасці насельніцтва пагоршылася. Перапыніўся гістарычны пераход да парламенцкай да дэмакратычнай рэспублікі. Рэзка абмежавалася свабода чалавечай асобы і ўмацоўваўся прыгон. Без сваёй дзяржавы запавольвалася нацыянальнае самаўсведамленне народа.

Былы «палітычны народ» страціў уладу, але яшчэ меў надзеі на адраджэнне ў нейкіх формах дзяржаўнага жыцця. У 1811 г. група магнатаў пад кіраўніцтвам Міхала Клеафаса Агінскага прапанавала Аляксандру I праект аднаўлення Вялікага Княства Літоўскага разам з будучай канстытуцыяй. Паводле праекта яно складалася з васьмі заходніх губерняў: Віленскай, Віцебскай, Валынскай, Гарадзенскай, Менскай, Магілеўскай, Падольскай і Кіеўскай. Такім чынам рабілася спроба не проста аднавіць Вялікае Княства, але і вярнуць яму землі, страчаныя ў выніку Люблінскай уніі з Польшчай у 1569 г. Агінскі ўключыў у праект параграф пра паступовае вызваленне сялянаў ад прыгону. Ішлі перамовы, аднак яны сутыкнуліся з супрацівам расійскага дваранства. Апрача таго, неўзабаве пачалася вайна 1812 г., якая адкрывала іншыя магчымасці аднавіць Вялікае Княства.

План сярэднявечнага Полацка пасля другога падзелу Рэчы Паспалітай. 1793 г.

ВАЙНА 1812 ГОДА. СПРОБА АДНАВІЦЬ ДЗЯРЖАВУ

Сустрэча Напалеона і Аляксандра I у Тыльзіце ў 1807 г. [illegible]

На пачатку XIX ст. напалеонаўская Францыя ў барацьбе за гегемонію ў Еўропе сутыкнулася з кааліцыяй Расеі, Аўстрыі і Прусіі. У вайне 1805–1807 гг. Напалеон атрымаў перамогу і стварыў на польскіх землях, якія раней належалі Прусіі, падуладнае яму Варшаўскае княства.

Расея рыхтавалася да рэваншу: на абшарах колішняга Вялікага Княства былі сканцэнтраваныя царскія арміі М. Барклая дэ Толі і П. Баграціёна агульнай колькасцю 157 тысяч салдатаў і афіцэраў. Утрыманне гэтага велізарнага кантынгенту непасільным цяжарам легла на плечы мясцовага насельніцтва. Яго коштам у шасьці беларускіх гарадах на загад вайсковых уладаў ствараліся буйныя склады правіянту на 58 476 чалавек (чатыры пяхотныя і дзве кавалерыйскія дывізіі) кожны. У артылерыйскія часціны забіралі найлепшых коней. Уводзіліся дадатковыя пастаўкі гарэлкі і свойскай жывёлы «для салдацкіх вінных і мясных порцыяў». Разлік за харчаванне адбываўся не грашыма, а аблігацыямі. Апрача таго, за адзін толькі перадваенны год у нашых губернях набралі амаль 15 тысяч рэкрутаў. Такім чынам расейскі ўрад імкнуўся максімальна выкарыстаць людскія і матэрыяльныя рэсурсы Літвы-Беларусі ў сваіх імперскіх мэтах. Гэткая палітыка працягвалася і ў XIX, і ў XX стст.

Вайна 1812 года ў расійскай гісторыі называецца Айчыннай, але для нашых продкаў яна мела хутчэй іншы характар. З Напалеонам звязваліся надзеі на адраджэнне Вялікага Княства Літоўскага.

Вайна зрабілася непазбежнай, але Прусія ў апошні момант адмовілася дапамагчы Расеі нанесці першы ўдар. Перахапіўшы ініцыятыву, Банапарт у 1812 г., у ноч на Янаў дзень, перайшоў з сваім паўмільённым войскам расейскую мяжу на Нёмане.

Сутычка з французамі пад Гарадняй 25 кастрычніка 1812 г. З узораў расейскай зброі. А. Адам [illegible]

ХРАНАЛОГІЯ

24 чэрвеня 1812 г. – Пераправа Напалеона праз Нёман
28 чэрвеня 1812 г. – Французскі імператар уваходзіць у Вільню
1 ліпеня 1812 г. – Утварэнне Часовага ўрада Вялікага Княства Літоўскага
8 ліпеня 1812 г. – Урачыстая сустрэча маршала Даву ў Менску
1 жніўня 1812 г. – [illegible] войска Вялікага Княства Літоўскага
26–28 лістапада 1812 г. – Пераправа рэшткаў Вялікай арміі праз Беразіну

[illegible] Пётр Іванавіч [illegible]

Ужо праз чатыры дні пасля пачатку баявых дзеянняў французы раласнула віталі Вільня. Першымі ў былую сталіцу пад бел-чырвона-белымі сцягамі ўвайшлі жаўнеры князя Дамініка Радзівіла, які сваім коштам сфармаваў і ўзброіў уланскі полк. Шмат ліцвінаў ваявала і ў палках польскага генерала Юзафа Панятоўскага. Горад грымеў воклічамі: «Слава імператару!», «Слава вызваленню!» Жаданне служыць у напалеонаўскім войску выказалі амаль усе студэнты Віленскага ўніверсітэта.

Не менш урачыстая сустрэча была наладжаная ў Менску маршалу Даву. Віншавальная прамова ў гонар вызваліцеляў гучалі ў Магілеве, дзе Напалеону прысягнуў праваслаўны епіскап Варлаам. Расейскія чыноўнікі ўцякалі на ўсход, і ліцвінская шляхта з дазволу французскіх уладаў стварала свае камісіі дзеля кіравання паветамі і губернямі. Сяляне таксама чакалі французаў з надзеяй, бо чулі, што ў Варшаўскім княстве Банапарт скасаваў прыгон. Вызваленне абяцалі і пракламацыі, у тым ліку на беларускай мове, якія закідваліся перад пачаткам вайны ў заходнія губерні Расеі.

Царскія арміі дасягнулі поспеху ў некалькіх лакальных бітвах, але, не маючы магчымасці злучыцца, адыходзілі ўглыб Расейскай імперыі, пакідаючы напрызволле спустошаныя беларускія гарады і вёскі. У выніку перамогі расейцаў над французамі пад Кобрынем у горадзе з 630 дамоў ацалела толькі 82. Без бою быў пакінуты Дрысенскі ўмацаваны лагер – пабудаваная перад вайной фартэца, разлічаная на 100-тысячны гарнізон.

Паблізу мястэчка Клясціцы пад Полацкам корпус маршала Удзіно быў пераможаны Якавам Кульневым, але горад застаўся ў руках французаў, а сам расейскі генерал загінуў. У полацкім наваколлі бai ішлі фактычна за сталіцу імперыі – Санкт-Пецярбург, шлях на які прыкрываў корпус генерала П. Вітгенштэйна.

[illegible]

[illegible] Пятра Вітгенштэйна [illegible] 1844 г.

Да жніўня Банапарт заняў амаль усе беларускія землі, з выняткам Рэчыцкага, Мазырскага і частак Бабруйскага і Беліцкага (Гомельскага) паветаў. Бабруйскую фартэцу з 5-тысячным гарнізонам напалеонаўскія войскі проста абмінулі і пакінулі ў тыле.

Нашыя землі афіцыйна называліся «вызваленымі ад расійскага прыгнёту». Напалеон абвясціў пра аднаўленне Вялікага Княства Літоўскага з сталіцай у Вільні. Яно складалася з Гарадзенскай, Віленскай, Мінскай губерняў і Беластоцкай вобласці, перайменаваных у дэпартаменты. Кожны дэпартамент меў свайго намесніка губернатара-француза.

Ваенная ўлада ў адноўленым Вялікім Княстве Літоўскім належала генерал-губернатару, цывільная – Часоваму ўраду. Ён складаўся з сямі камітэтаў: харчавання і складоў, паліцыі, фінансаў, вайсковага, судовага, унутраных справаў, народнай асветы і рэлігіі. Камітэты ўзначалілі вядомыя ў краі дзеячы: былы літоўскі маршалак Станіслаў Солтан, граф Язэп Серакоўскі, князь Аляксандр Сапега, рэктар Віленскага ўніверсітэта Ян Снядэцкі.

Дзеля падтрымання ў краіне парадку па загадзе імператара фармаваліся аддзелы нацыянальнай гвардыі і літоўскай (паводле назову дзяржавы) жандармерыі, а затым пачалося стварэнне ўзброеных сілаў Княства. Ліцьвінскія шляхцічы-добраахвотнікі склалі ў імператарскай гвардыі кавалерыйскі полк. Паспяхова дзейнічаў эскадрон вершнікаў з беларускіх татараў.

За абяцанне вярнуць незалежнасць Напалеон патрабаваў стотысячнага войска і велізарных пастаўкі фуражу і харчу. Сяляне не дачакаліся вызвалення ад прыгону. Пачаліся бясконцыя рэквізіцыі, якія нагадвалі сапраўдныя рабункі.

У гісторыкаў існуе меркаванне, што на выпадак палітычнага гандлю з расійскім імператарам Аляксандрам I Банапарт меў намер стварыць у Падняпроўі і Прыдзвінні жыццяздольную незалежную яму дзяржаву пад назовам Беларусь.

Аднак валадара Еўропы мала цікавіла рэальнае адраджэнне нашай краіны. Выкарыстоўваючы настроі значнай часткі насельніцтва, ён пераследаваў свае мэты.

Часовы ўрад Вялікага Княства не меў права прымаць пастановаў без згоды французскага камісара і найперш мусіў займацца зборам падаткаў для Вялікай арміі. У жніўні быў падпісаны ўказ, паводле якога нашыя губерні павінны былі даць Вялікай арміі 528 тысяч тонаў збожжа, 100 тысяч тонаў мяса і 53 тысячы кароў. Гэта пагражала краіне голадам.

Французы пад Віцебскам у ліпені 1812 г. Менавіта ў Віцебску Напалеон вырашыў ісці на Маскву. Тагачасная літаграфія

Праз месяц пасля Вільні французскі імператар уступіў у Віцебск. Не зважаючы на цяжкія страты і ваенныя няўдачы пад Кобрынам, Мірам і Полацкам, Напалеон прайшоў ад Нёмана сотні вёрстаў і набыў пяць мільёнаў новых падданых. У Віцебску ён тэатральна адшпіліў шпагу і заявіў, што кампанія 1812 г. завершаная, але ўжо праз некалькі дзён прыняў фатальнае рашэнне ісці на Маскву.

Між тым настроі ў грамадстве змяняліся не на карысць Напалеона, што істотна блытала яму карты. Патрыёты Вялікага Княства перажывалі расчараванне. З Часовага ўрада выйшаў нядаўні заўзяты банапартыст Аляксандр Сапега, які няраз выконваў асабістыя даручэнні «валадара Еўропы». Сяляне стваралі партызанскія аддзелы. Перад Барадзінскай бітвай Банапарт накіраваў 30 тысяч жаўнераў на дапамогу 12-тысячнаму віцебскаму гарнізону, які партызаны фактычна трымалі ў аблозе.

Адступленне былой Вялікай арміі з Масквы ўвосень 1812 г. хутка ператварылася ва ўцёкі. У кастрычніку–лістападзе расійскія войскі авалодалі Полацкам, Віцебскам, Менскам, Магілёвам, Барысавам. Рашучым контрударам Банапарту ўдалося выбіць генерала Чычагова з Барысава і каля вёскі Студзёнкі пераправіць свае войскі праз Бярэзіну. Адтуль яны бязладна адступалі на Вільню. У мястэчку Смаргонь імператар, пераапрануўшыся ў мундзір польскага ўлана, пакінуў армію. Яе рэшткі ў снежні перайшлі Нёман.

Часовы ўрад Вялікага Княства Літоўскага яшчэ больш года працаваў у Варшаве, Кракаве і Дрэздэне, марна спадзеючыся, што Напалеон распачне новую кампанію ў Расіі.

[illegible], прысвечаны 100-годдзю кампаніі 1812 г.

Частка літоўскіх палкоў Вялікай арміі, у якіх налічвалася 25 тысяч нашых суайчыннікаў, была разбітая, частка адступіла і змагалася не за свае інтарэсы. За чужую Айчыну загінулі і дзясяткі тысяч ліцвінаў, найперш шляхецкіх рэкрутаў, што служылі тады ў расійскім войску. Паводле падлікаў некаторых гісторыкаў, на пачатку вайны іх было 130 тысяч. Браты ўрымаліся (?) будаў з братамі.

[illegible]

На ўсёй занятых землях Вялікага Княства расійцы паводзілі сябе як на варожай тэрыторыі, займаючыся з жыхароў і займаючыся рабаваннем. Слаўны камандзір расійскіх партызанаў Дзяніс Давыдаў «вызначыўся» такім чынам у Горадні, дзе сярод іншага прымушаў каталікоў у храмах хрысціцца «правільна», па-праваслаўнаму. З Нясвіжскага замка Радзівілаў генерал Чычагоў адправіў у Пецярбург і Маскву сорак вазоў культурных каштоўнасцяў і архіваў. Кутузаў прапанаваў цару перадаць героям вайны маёнткі тых абшарнікаў, што падтрымалі Напалеона. Каб заміраецца з мясцовай арыстакратыяй, Аляксандр I на гэта не пагадзіўся, але ўсялякія перамовы пра адраджэнне Вялікага Княства пад пратэктаратам Расеі былі спыненыя.

Наша краіна заплаціла за напалеонаўскую авантуру страшную цану. У баявых дзеяннях, ад голаду і пошасцяў загінуў мільён чалавек, кожны чацверты. Трупы спальвалі на вогнішчах да вясны 1813 г. У асобных гарадах насельніцтва скарацілася ў тры разы. Нягледзячы на тое, што шмат сялянаў змагаліся з французамі ў партызанскіх аддзелах, прыгон пасля вайны ўзмацніўся.

[illegible]

На востраве Святой Алены, у выгнанні, Банапарт прыйшоў да высновы, што прычынаю яго разгрому ў 1812 г. сталі праблемы на нашай зямлі. Памылкі – не столькі ваенныя, як палітычныя.

Помнік ахвярам 1812 г. у Полацку. [illegible]

[illegible]

Такія шаблі былі на ўзбраенні кавалерыі ў пачатку XIX ст.

ВЫЗВОЛЬНАЯ БАРАЦЬБА

Таемныя таварыствы

Цэнтрам патрыятычнага руху заставалася Вільня, дзе канцэнтраваліся грамадскія і навукова-культурныя сілы краю. Магутным асяродкам вальналюбівых памкненняў быў Віленскі ўніверсітэт. Менавіта там з ініцыятывы студэнтаў Тамаша Зана, Адама Міцкевіча, Язэпа Яжоўскага, Ануфрыя Петрашкевіча і Францішка Малеўскага ўзнікла таемнае таварыства філаматаў, якое атрымала назву ад грэцкага слова philomathes (той, хто імкнецца да ведаў).

Напачатку сябры таварыства ставілі перад сабой толькі культурніцкія мэты, выступаючы за палепшэнне асветы, але ва ўмовах наступу рэакцыі маладыя людзі неўзабаве авалодалі палітычныя ідэі. У праграме з'явіліся патрабаванні нацыянальнай незалежнасці народаў і скасавання прыгону. Ідэйным натхняльнікам філаматаў быў гісторык і грамадскі дзеяч Іахім Лялевель. (Гэта яму належаў зварот да дэмакратыі Расіі крылаты заклік «За нашу і вашу свабоду!»)

Спадзяванні на аднаўленне Рэчы Паспалітай патрыёты звязвалі найперш з «сярэднім класам», як яны называлі шляхту. Дзеля пашырэння сваіх ідэй філаматы стварылі своеасаблівыя філіі – «праменістых» і філарэтаў (ад грэцкага philaretos – той, хто любіць дабрачыннасць). Кіраўніком больш радыкальнага таварыства філарэтаў, якое налічвала блізу трохсот удзельнікаў, абралі Тамаша Зана. Арганізацыі філаматаў дзейнічалі ў Полацкім ліцэі піяраў, а таксама ў сярэдніх навучальных установах Свіслачы і Віцебска.

Стварэнне царскай каланіяльнай імперыяй дзяржавы [illegible]

ХРАНАЛОГІЯ

[illegible]
1817–1823 гг. – Дзейнасць тайнага студэнцкага таварыства філаматаў.
1820–1823 гг. – Дзейнасць таварыства філарэтаў.
[illegible]

Сябры таемных таварыстваў маюць вялікія заслугі ў вывучэнні гісторыі і культуры нашага народа. Яны збіралі фальклор, пад час пасяджэнняў чыталі навуковыя рэфераты і мастацкія творы.

У сустрэчах, якія ладзілі «праменістыя» ў ваколіцах Вільні, бралі ўдзел сотні маладых людзей. Там вяліся палітычныя дыспуты, гучалі патрыятычныя вершы і народныя песні. У дакументах філаматаў гаварылася пра неабходнасць захоўваць традыцыі продкаў, любіць і вывучаць сваю «прыродную мову», якою для большасці была беларуская.

Шмат хто з былых філаматаў і філарэтаў здабыў славу ў розных галінах дзейнасці. І. Дамейка ў эміграцыі праславіўся як выдатны вучоны-геолаг і мінералаг, даследчык Чылі, Я. Кавалеўскі – як прызнаны мангаліст, Я. Чачот, Т. Зан, А. Ходзька, А. Адамовіч сталі вядомымі паэтамі. Большасць твораў яны пісалі па-польску, але нязменна падкрэслівалі адданасць роднай зямлі – Літве-Беларусі.

У 1823 г. таварыства філаматаў і яго філіі раскрыла паліцыя. Адам Міцкевіч, Тамаш Зан, Ян Чачот, Ігнат Дамейка, Антон Адамовіч, Аляксандр Ходзька ды іншыя апынуліся за кратамі. Тамаш Зан быў асуджаны да зняволення ў фартэцыі, потым да высылкі і змог вярнуцца на радзіму толькі амаль праз дзесяць гадоў. Пазней Міцкевіч апісаў гэтыя падзеі ў неўміручай паэме «Дзяды».

На дзейнасць патрыятычных арганізацый мелі значны ўплыў масоны («вольныя муляры») – сябры міжнароднага таемнага таварыства, якія абвяшчалі пошук шляхоў «духоўнага абнаўлення грамадства». У першым дзесяцігоддзі XIX ст. на абшарах былога Вялікага Княства налічвалася блізу трыццаці масонскіх ложаў, куды ўваходзілі сотні «вольных муляраў», у тым ліку вельмі вядомыя ў краі асобы.

«Браццямі» віленскай ложы «Руплівы літвін» былі філосаф Анёл Доўгірд, мастак Ян Рустэм, кампазітар Ян Голанд. У 1827 г. Тамаш Зан стаў сябрам іншай віленскай ложы «Школа Сакрата», якой кіраваў шляхціч Ян Ходзька, пазней зняволены за сувязь з філаматамі.

У снежні 1825 г. «Вайсковыя сябры» сарвалі прысягу Мікалаю I у сапёрным батальёне, дзе служыў у ротах камандзір К. Ігельстром. Ён разам з М. Рукевічам і А. Вягелінам апрацаваў сакрэтныя прысягі, якія захавалі дакументальны матэрыял.

[illegible]

У Навагрудку дзейнічала ложа «Вузел адзінства», у Горадні – «Сябар чалавека», у Слуцку – «Уладзіслаў Ягайла». Болып за 200 «братоў» збірала на таемныя паседжанні менская «Паўночная паходня», блізу 150 – нясвіжская «Святыня спакою». Але ў 1823 г. выйшаў указ імператара Аляксандра I пра забарону ўсіх масонскіх ложаў.

Колішні філарэт Міхал Рукевіч у 1825 г. заснаваў нелегальнае таварыства «Вайсковыя сябры», якое мела на мэце змаганне за «вольнасць» і «ўсеагульны дабрабыт». Яно дзейнічала ў дыслакаваным у Гарадзенскай губерні і Беластоцкай вобласці Літоўскім асобным корпусе царскай арміі, дзе значную частку афіцэраў складалі ліцвіны. Апрача вайскоўцаў паплечнікамі М. Рукевіча сталі мясцовыя шляхціцы, чыноўнікі, гімназісты і студэнты.

Паводле палітычных ідэалаў «Вайсковыя сябры» былі даволі блізкія да Паўночнага таварыства дзекабрыстаў. Сувязь з ім падтрымлівалася праз капітана Канстанціна Ігельстрома, знаёмага з расейскім дваранскім рэвалюцыянерам Вільгельмам Кюхельбекерам. Аднак лёс Літвы-Беларусі не цікавіў дзекабрыстаў, якія лічылі царскую імперыю часткай расейскай дзяржавай. Да прыкладу, кіраўнік Паўднёвага таварыства Павел Пестэль у сваёй «Рускай Праўдзе» сцвярджаў, што беларусы «должны отказаться от права особой народности». Наймення «нерусских народов» імперыі ён праціўнікаў проста сказаваць.

У 1827 г. у Віленскім універсітэце ўтварылася новае нелегальнае студэнцкае таварыства «Патрыёты Айчыны», або «Племя сарматаў». Галоўнай сваёй мэтай яно абвясціла вызваленне земляў былой Рэчы Паспалітай з-пад расейскай улады. Неўзабаве арганізацыя была выкрыта і яе кіраўнікоў Канстанціна Заху, Адама Трасковскага і Фелікса Лісоўскага выслалі шараговымі салдатамі ў дзейную армію на Каўказ.

У Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі з ініцыятывы студэнта Францішка Савіча у сярэдзіне 1830-х гадоў узнікла нелегальнае «Дэмакратычнае таварыства», што выступала за вызваленне сялян, роўнасць саслоўяў і народную ўладу народа. Праз тры гады арганізацыя была разгромлена, а яе кіраўнік высланы ў салдаты на Каўказ.

[illegible]

[illegible]

[illegible]

Дэмакратычная рэспубліка бачылася ў будучым самаўрадным сябрам Шымана і братам Аляксандру і Францішку Даленгам «Брацкага саюза літоўскай моладзі» і «Саюза свабодных братоў» з цэнтральнай секцыяй у Вільні і аддзяленнямі ў Мінску, Горадні, Навагрудку, Слоніме, Лідзе

[illegible]

Нелегальны «Брацкі саюз літоўскай моладзі» аб'ядноўваў некалькі сотняў студэнтаў і вучняў, шляхціцаў, чыноўнікаў і рамеснікаў. Рыхтуючы антыўрадавае паўстанне, удзельнікі арганізацыі наладзілі сувязі з салдатамі Менскага гарнізона і Бабруйскай фартэцы. У фальварку Бараўляны пад Менскам нарабляліся зброя і адліваліся кулі. Жандарам удалося разграміць і гэтае таварыства, але змаганне супроць імперскага прыгнёту працягвалася.

Нелегальныя патрыятычныя арганізацыі стваралі і ліцвіны-беларусы, якія навучаліся ў расейскіх універсітэтах. У 1829 г. за прыналежнасць да таемнага таварыства быў арыштаваны студэнт Пецярбургскай медыка-хірургічнай акадэміі ігуменскі шляхціч Казімір Чарноўскі. У казематах Петрапаўлаўскай і Шлісельбургскай цытадэляў ён стварыў унікальны праект металёвай субмарыны, а таксама распрацаваў канструкцыю рухомага перыскопа і стаў аўтарам шэрагу іншых вынаходак. Але гэта не змяніла лёс вязня: пасля шасці гадоў у адзіночнай камеры Казіміра чакала высылка на паўночы і смерць у далёкім Сарапуле.

[illegible]

Найбольшая колькасць змагароў рыхтавалася на Віленшчыне, а таксама – у наваколлі Белавежскай пушчы. У Ашмянскім, Браслаўскім, Лідскім і Віленскім паветах колькасць змагароў дасягнула 10 тысяч. Увогуле на землях колішняга Вялікага Княства ў 1831 г. узялі ў рукі зброю каля 35 тысяч патрыётаў.

Паўстанне 1831 года

Вальналюбівы дух Тадэвуша Касцюшкі і Якуба Ясінскага па-ранейшаму натхняў патрыётаў краю. Увесну 1831 г. услед за Польшчай Літва-Беларусь зноў паўстала. Правадыры паўстання – як радыкалы-рэспубліканцы, прыхільнікі Яўхіма Лялевеля, так і кансерватары-арыстакраты на чале з Адамам Чартарыйскім – дамагаліся ўзнаўлення Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. Інсургентаў падтрымлівала каталіцкае і уніяцкае святарства. Інтарэсы сялянаў амаль не ўлічваліся, а таму асноўнай сілаю паўстанцаў была шляхта.

Вільня апынулася ў паўстанцкай блакадзе, але вызваліць горад не ўдалося. Тым не менш напачатку інсургенты атрымалі некалькі перамогаў. 3-тысячны шляхоцка-сялянскі аддзел заняў і колькі дзён утрымліваў Ліду.

Добра ўзброеныя рэгулярныя царскія войскі ў траўні перамаглі паўстанцаў у Менскай і Віленскай губернях, але барацьба разгарэлася на Гарадзеншчыне – у Белавежскай пушчы і [illegible]. Нацыянальны ўрад у Варшаве накіраваў на дапамогу інсургентам-ліцвінам моцны аддзел генерала Д. Хлапоўскага, які разбіў у пушчы царскіх карнікаў. Ён злучыўся з мясцовымі партызанамі і 12-тысячным корпусам генерала А. Гелгуда. Аднак у чэрвені на Панарскіх гарах пад Вільняй аб'яднаныя сілы інсургентаў прайгралі бітву 26-тысячнаму расейскаму войску. Карнікі страцілі там 365 салдатаў і афіцэраў, дакументаў пра нашых палеглых не захавалася.

Генерал Г. Дэмбінскі з чатырма тысячамі змагароў здолеў адарвацца ад ворага і праз Жолдзішкі, Смаргонь, Дзятлава, Дзярэчын, Зэльву, Пружаны і Белавежскую пушчу адступіў на захад. Гэты паход выклікаў паўстанне ў Навагрудскім і Слонімскім паветах. Інсургентаў узначаліў там удзельнік вайны 1812 г. на баку Напалеона павятовы маршалак Ян Каныч. Ягоны аддзел амаль да тысячы вояраў, якія сярод іншых удалых дзеянняў вызвалілі мястэчка Беліцу, а ў Навагрудку разброілі расейскую вайсковую каманду і выпусцілі з астрога арыштаваных паплечнікаў. У ліпені іскры паўстання перакінуліся на поўдзень – у Рэчыцкі, Мазырскі і Пінскі паветы, але і гэтыя выступленні былі асуджаныя на паразу. У жніўні расейскія карнікі задушылі апошнія агмені супраціву.

Тысячы патрыётаў мусілі пакінуць краіну. Сярод іх знаходзіўся Генрык Дмахоўскі, які стаў вядомым скульптарам і стварыў для Кангрэса ЗША бюсты Т. Касцюшкі і Т. Джэферсана. Тры дзесяцігоддзі пражыў на чужыне яшчэ адзін удзельнік паўстання паэт, фалькларыст і мастак Аляксандр Рыпінскі. Эмігрантамі зрабіліся інсургент, у будучым вучоны з сусветным імем Ігнат Дамейка і прыхільнік паўстанцаў Адам Міцкевіч. У Парыжы выдаваў творы А. Міцкевіча, Ю. Славацкага, Я. Лялевеля адзін з арганізатараў паўстання ў Ашмянскім, Навагрудскім і Слуцкім паветах Яўстах Януш[illegible]віч, які пакінуў надзвычай цікавыя мемуары.

Дзеля аднаўлення збройнага змагання выгнанцы падрыхтавалі ў Францыі экспедыцыю на чале з актыўным удзельнікам мінулага паўстання Юзафам Заліўскім. Невялікія групы эмісараў разлічвалі перайсці расейскую мяжу і стварыць партызанскія фармаванні. У экспедыцыі браў удзел вядомы дзеяч вызвольнага руху Сымон Канарскі, якога пазней схапілі і расстралялі ў Вільні.

Паўстанне 1831 г. мела і міжнароднае значэнне. Гераічная барацьба нашых продкаў не дазволіла Расеі паслаць войскі на задушэнне рэвалюцыі ў Францыі.

КАЛАНІЯЛЬНЫ ЎЦІСК. РУСІФІКАЦЫЯ

Карта Еўропы з сатырычнай выявай [illegible] 1870 г.

Улады канфіскоўвалі маёнткі, пазбаўлялі паўстанцаў дваранскіх правоў (шляхта адабралі ў 10 тысяч нашых суайчыннікаў). На далучаным да імперыі абшары хутка пашыралася землеўладанне расейскіх дваранаў і чыноўнікаў, якія дзеля гэтага атрымлівалі шматлікія прывілеі. На плячах гараджанаў і сялянства ляжаў велізарны цяжар падаткаў і паншчыны. Разам узятыя даходы Менска, Віцебска, Магілева, Горадні, Полацка, Берасця, Пінска і Бабруйска былі ў 2,5 раза меншыя за гадавы даход, які расейскі князь Паскевіч атрымліваў з аднаго толькі Гомельскага маёнтка.

У 30-х гадах XIX ст. праводзілася чыстка дзяржаўных установаў, судоў, органаў асветы ад службоўцаў мясцовага паходжання. Месцы звольненых займалі выхадцы з цэнтральных расейскіх губерняў, якіх вабілі вялікія даплаты да заробкаў. Усё справаводства было пераведзенае на расейскую мову.

Пасля паўстання 1831 г. каланіяльны ўціск на землях Літвы-Беларусі рэзка ўзмацніўся. Пры расейскім урадзе быў створаны адмысловы Камітэт па справах заходніх губерняў, чыя дзейнасць якога стала поўная русіфікацыя краю.

[illegible] Паскевіч. Мастак [illegible]

Гомельскі палац [illegible]

ДѢЛО

ХРАНАЛОГІЯ

- 1820 г. — Закрыццё Полацкай акадэміі.
- 1831 г. — Скасаванне дзеяння Статута Вялікага Княства Літоўскага ў Віцебскай і Магілёўскай губернях.
- 1831–1864 гг. — Дзейнасць Камітэта па справах заходніх губерняў.
- 1832 г. — Закрыццё Віленскага ўніверсітэта.
- 1836 г. — [illegible] на расійскую мову.
- 1839 г. — Скасаванне Берасцейскай царкоўнай уніі і далучэнне грэка-каталікоў да расійскай праваслаўнай царквы.
- 1840 г. — Царскі ўказ пра забарону выкарыстання ў афіцыйных дакументах назваў «Літва» і «Беларусь» і іх замену на «Северо-Западный край». Скасаванне дзеяння Статута Вялікага Княства Літоўскага ў Мінскай, Гродзенскай і Віленскай губернях [illegible]
- 1842 г. — Закрыццё Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі.
- 1859 г. — Забарона выкарыстання ў беларускім друку лацінскага шрыфту.
- 1864 г. — Забарона размаўляць у навучальных установах на роднай (не расійскай) мове. Закрыццё Горы-Горацкага земляробчага інстытута.

У ажыццяўленні сваіх імперскіх планаў каланізатары шырока выкарыстоўвалі інтарэсамі нашых людзей. Адным з самых красамоўных прыкладаў гэтага стаў драматычны лёс Берасця. Дзеля пабудовы вайсковай фартэцы расейскія ўлады знішчылі ўвесь горад, які лічыўся адным з найпрыгажэйшых на Усходняй Еўропе. Берасцейцаў перасялілі за тры кіламетры, а на месцы іхных зруйнаваных дамоў, старажытных храмаў, манастыроў, палацаў у 1830–1840-х гадах была ўзведзеная царская цытадэль.

Ад 1837 да 1867 г. у шасці беларускіх губернях дзейнічала палажэнне, паводле якога нават асоба дваранскага стану вольна перамяшчацца магла толькі па сваёй губерні, а каб выехаць за яе межы, трэба было мець адмысловы дазвол.

Спачатку ў Віцебскай і Магілёўскай губернях, а потым і на ўсёй тэрыторыі колішняга Вялікага Княства было скасаванае дзеянне Статута 1588 г.

У школах усіх роўняў расейская мова замяніла польскую, якую наогул забаранілі выкладаць. Разам з тым за ўвесь перыяд свайго панавання ў Беларусі царскія ўлады не дазволілі адчыніць ніводнай беларускай школы.

Каланіяльныя ўлады мэтанакіравана расправіліся з навучальнымі ўстановамі, што зрабіліся моцнымі асяродкамі апазіцыі царызму. Яшчэ ў 1820 г. была зачыненая Полацкая акадэмія, якая мела ўніверсітэцкі статус. Трэцяя частка студэнтаў Віленскага ўніверсітэта ўдзельнічала ў паўстанні 1831 г. Гэта сталася падставаю для закрыцця галоўнай вышэйшай школы нашай краіны. На аснове ўніверсітэцкага медычнага факультэта ўлады стварылі Віленскую медыка-хірургічную акадэмію, але і яна праіснавала ўсяго дзесяць гадоў. Пасля гэтага ў краі зусім не засталося вышэйшых навучальных установаў. (Заснаваны ў 1848 г. Горы-Горацкі земляробчы інстытут царскія ўлады ў 1864 г. таксама зачынілі за ўдзел выкладчыкаў і студэнтаў у новым вызвольным паўстанні.) Каланізатары ставілі за мэту пазбавіць Літву-Беларусь сваёй інтэлігенцыі.

Русіфікатары кіраваліся меркаваннем, што расейская школа зробіць для замацавання краю, напэўна, болей за расейскую армію.

У правядзенні палітыкі русіфікацыі і знішчэння ўсяго [illegible] найбольш вызначыўся былы дзекабрыст Міхаіл Мураўёў, які з 1832 г. служыў магілёўскім віцэ-губернатарам. Звяртаючыся да беларускага дваранства, ён папярэджваў: «Помните, что если вы не станете по своим мыслям и чувствам русскими, то вы будете здесь иностранцами и должны тогда покинуть этот край».

На правым беразе Свіслачы [illegible]

Навучальныя карпусы Горы-Горацкага земляробчага інстытута [illegible] 1864 г. [illegible]

Актыўная падтрымка паўстання 1831 г. грэка-каталіцкім духавенствам узмацніла наступ на уніятаў, што складалі больш за тры чвэрці беларускага насельніцтва. Імператар Мікалай I загадаў зачыніць сорак базыльянскіх кляштараў, якія ён называў «неприятельскими крепостями».

Але нават за ўмовах жорсткага пераследу ў Беларускай уніяцкай дыяцэзіі (царкоўнай акрузе) у 1838 г. з 680 святароў за далучэнне да праваслаўя падпісаліся толькі 186. Тым не менш у наступным годзе пад апекаю каланіяльных уладаў адбыўся Полацкі царкоўны сабор, што прыняў пастанову пра вяртанне грэка-католікаў «в лоно прародительской веры, дабы пребывать отныне в послушании Святейшего Правительствующего Всероссийского Синода».

Апошніх уніятаў пераводзілі ў праваслаўе з шыпцікімі здзекамі, пра што абурана пісалі Леў Талстой і Аляксандр Герцэн.

Былыя уніяты супраціўляліся ўвядзенню ў набажэнствы расейскай мовы. Запісы фалькларыстаў сведчаць, што ўжо ў другой палове XIX ст. у праваслаўных парафіях вернікі на загад святара спяваць «Господи, помилуй!» адказвалі: «Мы не маскалі, каб так спяваць!»

Падзяліўшы нашых суайчыннікаў на праваслаўных і каталікоў, царскія ўлады атрымалі магчымасць даводзіць, нібыта каталікі – гэта выключна палякі, а праваслаўныя – рускія.

Падрыхтаваўшы глебу забаронай народнае веры, царызм зрабіў новы удар па нацыянальным быцці ліцвінаў-беларусаў. У 1840 г. Мікалай I адмысловым загадам забараніў ужываць у афіцыйных дакументах найменні «Літва», «літоўскі» і «Беларусь», «беларускі». Замест іх у дачыненні да Віленскай, Віцебскай, Гарадзенскай, Ковенскай, Магілёўскай і Менскай губерняў уводзіўся тэрмін «Северо-Западный край». Праз тыдзень царскім указам Статут Вялікага Княства на ўсёй гэтай тэрыторыі быў заменены на расейскае заканадаўства.

З яшчэ большым размахам працягвалася рабаванне нашых культурных і гістарычных скарбаў, каб сцерці ў будучых пакаленняў памяць пра былую незалежную дзяржаву. На ўсход вывезлі Галоўны архіў Вялікага Княства з сотнямі тамоў Літоўскай Метрыкі, які падзялілі паміж пецярбургскімі і маскоўскімі ўстановамі. Архіў зачыненага Віленскага ўніверсітэта быў перададзены расійскаму міністэрству народнай асветы. Адправілі ў расейскія сталіцы багатыя бібліятэкі нашых арыстакратаў і навучальных устаноў.

Кнігазбор Віленскай альма-матар, які налічваў 52 тысячы тамоў, перадалі па частках у Пецярбург, Харкаў і Кіеў.

Полацак развітаўся з бібліятэкай колішняй акадэміі, дзе захоўваліся 40 тысяч кніг і рукапісаў, у тым ліку, магчыма, полацкі Полацкі летапіс ці яго копія. Публічная бібліятэка ў Пецярбургу выбрала сабе «все редкие и роскошные издания, коих она не имеет и, следовательно, могущие служить ее украшением». У бібліятэку Пецярбургскага ўніверсітэта трапілі 6274 кнігі. Следам за імі ў Пецярбургскую акадэмію мастацтваў паехалі ўнікальныя калекцыі створанага полацкімі айцамі-езуітамі музея і найлепшыя творы карціннай галерэі.

Такое раскраданне нашых нацыянальных каштоўнасцяў адбывалася скрозь. Сёння ў адной толькі Дзяржаўнай бібліятэцы Расіі ў Маскве знаходзіцца 82 скарынаўскія выданні (прычым ёсць дублетныя). У нашай жа Нацыянальнай бібліятэцы іх толькі дзесяць, а на радзіме першадрукара, у полацкім Музеі беларускага кнігадрукавання, няма ніводнага. На пальцах адной рукі можна злічыць славутыя слуцкія паясы (пераважна іх фрагментаў), якія пашчасціла застацца ў Беларусі. Між тым у расейскіх музейных зборах іх налічваюцца дзесяткі, а магчыма, і сотні (да прыкладу, 14 – у Музеі этнаграфіі ў Пецярбургу).

У Расею была вывезеная большая частка мастацкіх калекцыяў ліцвінскай арыстакратыі. Унікальныя творы, сабраныя ў Нясвіжскім замку Радзівілаў, аздобілі сабой пецярбургскія і маскоўскія музейныя экспазіцыі. Мастацкі збор Сапегаў цяпер можна ўбачыць у Смаленскім гістарычна-археалагічным музеі.

У Пецярбургу вырашалася нават тое, колькі гарадоў дазволена мець Беларусі. Калі ад 1861 да 1905 г. у расейскіх губернях статус гарадоў атрымалі блізу 400 паселішчаў, то на нашых землях толькі два – Горы-Горкі і Смаргонь.

Каланіяльныя ўлады навязалі краю монакультуру – бульбу, каб стаць гарадку жыць не для ўсёй імперыі. Літва-Беларусь трапіла ў жудасную водкупную сістэму, што прыносіла расейскаму бюджэту велізарныя даходы. Чалавек, які адкупляў сабе права гандляваць на якой-небудзь тэрыторыі скарбовай гарэлкай, фактычна займаўся спойваннем насельніцтва, карыстаючыся ў гэтым дзяржаўнай падтрымкай.

Каланізатары высмоктвалі як матэрыяльныя багацці, так і інтэлектуальныя сілы краю. Адсутнасць вышэйшых навучальных установаў, забарона беларускай мовы ў навучанні і кнігадрукаванні спрычыніліся да таго, што шмат нашых суайчыннікаў рабіліся дзеячамі расейскай навукі і культуры.

Беларусамі-ліцвінамі з паходжання былі вядомыя літаратары XIX ст. Тадэвуш (Фадзей) Булгарын і Фёдар Глінка, кампазітары Язэп (Восіп) Казлоўскі, Міхаіл Глінка, Мадэст Мусаргскі, скульптар Міхаіл Мікешын... Таленавітых прыгонных артыстаў з Беларусі прадавалі імператарскім тэатрам Пецярбурга і Масквы. На іх сцэнах з бліскучым поспехам выступалі прыгоннаыя Пелагея і Кацярына Азарэвічы, а потым дзве дачкі Кацярыны – Марыя і Надзея.

У навуковым свеце здабылі сабе славу аўтар першага японска-расейскага слоўніка Язэп Гашкевіч, укладальнік першага слоўніка якуцкай мовы Эдвард Пякарскі, падарожнікі Мікалай Пержавальскі (Пржавальскі) і Рыгор Грум-Гржымайла (Грум-Гржымайла), даследнікі Сібіры Ян Чэрскі і Бенядзікт Дыбоўскі, матэматык Соф'я Кавалеўская (Корвін-Кругкоўская), пісьменнік і падарожнік, аўтар грунтоўнага апісання тагачасных Казахстана і Кіргізіі Адольф Янушкевіч, заснавальнікі сучаснага глебазнаўства Васіль Дакучаеў і выдатнейшы палеантолаг Уладзімір Кавалеўскі...

Нашчадкамі беларускаў-паўстанцаў 1863 г. былі славуты пісьменнік Аляксандр Грын (Грынеўскі) і кампазітар Дзмітрый Шастаковіч. Дарэчы, з ліцвінскіх шляхецкіх родаў, якія апынуліся ў Расіі, паходзілі пісьменнікі Фёдар Дастаеўскі, Іван Бунін і Юры Алеша, а паэт і актор Уладзімір Высоцкі, як вядома, вёў свой радавод з насельнікаў беларускай Мяшчанскай слабады ў Маскве.

ПАЎСТАННЕ КАСТУСЯ КАЛІНОЎСКАГА

У 1863 г. Літва-Беларусь зноў паўстала супроць імперскага прыгнёту. Змагароў узначаліў выдатны сын нашага народа Вінцэнт Канстанцін Каліноўскі.

Яго радзіма – вёска Мастаўляны Гарадзенскага павета (цяпер у Падляшскім ваяводстве Польшчы). Каліноўскі паходзіў з шляхоцкага роду, вядомага ад XVII ст. Першапачатковую адукацыю ён атрымаў у Свіслацкай павятовай навучальні, а затым скончыў юрыдычны факультэт Пецярбургскага ўніверсітэта. Ужо ў студэнцтве ён разам з братам Віктарам далучыўся да палітычнай барацьбы з царызмам і ўвайшоў у рэвалюцыйны гурток Зыгмунта Серакоўскага і Яраслава Дамброўскага. Вярнуўшыся на Бацькаўшчыну, Каліноўскі стварыў у Горадні і Гарадзенскай губерні нелегальную арганізацыю, а ўвосень 1861 г. стаў сябрам Камітэта руху (пазней перайменаванага ў Літоўскі правінцыяльны камітэт) – віленскага цэнтра падрыхтоўкі вызвольнага паўстання ў Літве-Беларусі.

[illegible]

ХРАНАЛОГІЯ

[illegible] – 22 сакавіка 1864 г. – Жыццё і дзейнасць Кастуся Каліноўскага.
1862–1863 гг. – Выданне нелегальнай «Мужыцкай праўды» – першай газеты на беларускай мове.
[illegible] 1863 г. – Маніфест Часовага ўрада Літвы з заклікам да паўстання.
[illegible] 1863 г. – [illegible]
[illegible] 1863 г. – [illegible]
[illegible] 1863 г. – Паўстанцы ўзялі горад Горы-Горкі.
[illegible] 1863 г. – Бітва паўстанцаў з царскімі войскамі каля [illegible].
[illegible] 1864 г. – Арышт К. Каліноўскага.

ULAŃSKA PIKA.

Справе будучага збройнага змагання служыла і нелегальная беларуская газета «Мужыцкая праўда», што Каліноўскі пачаў выдаваць у 1862 г. сумесна з паплечнікамі па рэвалюцыйнай арганізацыі Валерам Урублеўскім, Феліксам Ражанскім і Станіславам Сангінам. Надзелены яскравым публіцыстычным і літаратурным талентам, Кастусь Каліноўскі быў аўтарам і рэдактарам большасці нумароў газеты, якую нязменна падпісваў псеўданімам «Яська-гаспадар з-пад Вільні».

«Мужыцкая праўда» пашыралася па ўсім абшары краю. Яна выкрывала русіфікатарскую палітыку, вяла гаворку пра рэкруцкія наборы і рэлігійны прыгнёт, імкнулася развеяць ілюзіі сялянаў, звязаныя з царскім маніфестам пра скасаванне прыгоннага права. «У нас, дзецюкі, адно вучаць у школах, каб ты знаў чытаці па-маскоўску, а то для таго, каб цябе саўсім перарабіці на маскаля...» – звярталася газета да простага люду. Апошні, сёмы, нумар газеты пабачыў свет ужо ў час паўстання. Там гучаў заклік да барацьбы з каланізатарамі: «Падумайце добра да, памаліўшыся Богу, станьма дружна разам за нашу вольнасць!.. Трэба нашым хлопцам спяшаць з віламі ды з косамі там, дзе дабіваюцца волі ды праўды».

Увосень 1862 г. Кастусь Каліноўскі стаў на чале Літоўскага правінцыяльнага камітэта і згуртаваў вакол сябе найбольш паслядоўных рэвалюцыянераў, якіх апраненыя да лібералаў («белых») называлі «чырвонымі». Гэтае крыло паўстанцкага кіраўніцтва выступала за роўныя правы сялянаў, за перадачу зямлі сялянам і ў перспектыве – за дэмакратычную рэспубліку. [illegible]

Праз тыдзень пасля першага збройнага выступлення інсургентаў у Варшаве Літоўскі правінцыйны камітэт быў пераўтвораны ў Часовы ўрад Літвы, які 1 лютага 1863 г. выдаў да жыхароў краю маніфест аб паўстанні. У сакавіку–красавіку пачалося хуткае стварэнне паўстанцкіх аддзелаў, куды пераважна ўступалі шляхта, чыноўнікі, студэнты і навучэнцы. Пятую частку ўзброеных змагароў складалі сяляне, што, адгукнуўшыся на заклік Каліноўскага, браліся за косы і вілы. Некаторыя паўстанцкія аддзелы ўяўлялі сабой даволі вялікую сілу. Да прыкладу, пад камандаю Зыгмунта Серакоўскага дзейнічала створанае на Ковеншчыне 2-тысячнае злучэнне.

Паўстанцкія фармаванні ўзначалілі адданыя ідэалам свабоды патрыёты: Валер Урублеўскі, Рамуальд Траўгут, Людвік Нарбут, Ігнат Будзіловіч, Цітус Далеўскі, Генрык Дмахоўскі, Антон Трусаў, Тамаш Грыневіч, Людвік Звяждоўскі, Фелікс Віславух, Стан Грабніцкі, Юльян Бакшанскі, Баляслаў Кульчыцкі, Ляон Плятэр, Раман Рагінскі, Баляслаў Свентаржэцкі, Зыгмунт Мінейка...

Напачатку паўстанцы атрымалі некалькі значных перамог. Аддзел Людвіка Звяждоўскага заняў горад Горы-Горкі на ўсходзе Беларусі. На захадзе інсургенты авалодалі Пружанамі і мястэчкам Сялец. З бaямі прайшло праз Гарадзенскую губерню да Пінскага павета фармаванне Рамана Рагінскага. Паспяхова ваявалі з расейскімі карнікамі на Лідчыне змагары Людвіка Нарбута.

Але царскія ўлады змаглі падмануць значную частку сялянаў, якія паверылі, нібыта «паны б'юцца за вяртанне прыгону». Шырокага сялянскага паўстання баяўся і лагер «белых». Іх задаволіла б аднаўленне Рэчы Паспалітай. Яны не прымалі дэмакратычнай праграмы Каліноўскага і разлічвалі не на падтрымку сялянства, а на дапамогу заходнееўрапейскіх дзяржаваў. Захапіўшы ў свае рукі цэнтр паўстання ў Польшчы, «белыя» здолелі расфармаваць рэвалюцыйны Часовы ўрад Каліноўскага і стварылі Аддзел кіравання правінцыямі Літвы на чале з буйным абшарнікам Якубам Гейштарам.

У Віцебскай і Магілёўскай губернях рэгулярныя царскія войскі задушылі змаганне ўжо ў траўні. Былі разбітыя і амаль усе аддзелы інсургентаў на Меншчыне. Расейскія карнікі доўга не маглі справіцца з «мяцежнікамі» толькі на Гарадзеншчыне, дзе ваяводскім камісарам стаў Каліноўскі, а ў шэрагах паўстанцаў ваявала шмат сялянаў.

Царскі ўрад выпусціў медаль «За усмирение польского мятежа». Яго наклад быў 368 тысяч 133 шасобнікі, што сведчыла як пра велізарныя сілы, кінутыя супраць паўстанцаў, так і пра маштаб змагання з каланізатарамі.

На тэрыторыі колішняга Вялікага Княства Літоўскага ад лютага да жніўня 1863 г. адбылося больш 100 бітваў і баявых сутычак паўстанцаў з царскай арміяй. Найбольшай была бітва пад Міладзінамі (сёння Баранавіцкі раён), дзе расейцам супрацьстаялі гарадзенскі, навагрудскі, пружанскі, ваўкавыскі і слонімскі паўстанцкія аддзелы. Злучаныя сілы інсургентаў, якімі камандаваў Аляксандр Ленкевіч, былі ўже даволі добра ўзброенымі і вымуштраванымі карпусам. Сёння пра гэту падзею нагадваюць у Міладзінах каплічка-помнік і мемарыяльны камень.

На пачатку лета кіраўніцтва паўстаннем зноў перайшло да «чырвоных». Рэвалюцыйны ўрад (Выканаўчы аддзел Літвы) узначаліў Каліноўскі, які імкнуўся шырэй далучаць да змагання сялянаў і даць яму новае дыханне. Аднак гераічная барацьба ўжо была асуджаная на паразу.

Задушэннем вызвольнага руху з траўня 1863 г. кіраваў новы віленскі генерал-губернатар М. Мураўёў, які атрымаў ад Аляксандра II надзвычайныя паўнамоцтвы. За свае крывавыя «подзвігі» гэты хітры і бязлітасны царскі сатрап атрымаў мянушку Вешальнік. Ён не грэбаваў ніякімі сродкамі: дзейнічаў подкупамі і шантажом, падпісваў смяротныя прысуды і загадваў заліваць магілы паўстанцаў экскрыментамі, каб не дапусціць там патрыятычных маніфестацыяў. Вядомы выпадак, калі Вешальнік асудзіў на смерць маладога слонімскага шляхціча Адама Пуслоўскага, які ўдзельнічаў у паўстанні ўсяго некалькі гадзінаў.

Агульная колькасць ахвяр царызму, падлічаная ў Літве-Беларусі, невядомая. З ліку тых, каго ўзялі ў палон або арыштавалі, 128 былі павешаныя ці расстраляныя, 853 асуджаныя на катаргу, блізу 12,5 тысячы – на высылку ці службу ў арыштанцкіх ротах. Не больш чым 6 тысяч інсургентаў выслалі адміністрацыйным парадкам.

Тым не менш баі на захадзе Літвы-Беларусі працягваліся да пачатку 1864 г. Канцом паўстання можна лічыць арышт Кастуся Каліноўскага і яго пакаранне смерцю на Лукішскім пляцы ў Вільні 22 сакавіка 1864 г.

З царскай вязніцы наш нацыянальны герой перадаў на волю звернуты да народа запавет – «Ліст з-пад шыбеніцы»: «Горка пакінуць зямельку родную і цябе, дарагі мой народзе. Грудзі застогнуць, забаліць сэрца, но не жаль згінуць за тваю праўду... Няма, браткі, большага шчасця на гэтым свеце, як калі чалавек у галаве мае розум і навуку... Но як дзень з ноччу не ходзяць разам, так не ідзе разам навука праўдзівая з няволяй маскоўскай. Да пакуль яна ў нас будзе, у нас нічога не будзе, не будзе праўды, багацтва і ніякай навукі, адно намі, як скацінай, варочаць будуць не для дабра, но на пагібель нашу».

Пасля экзекуцыі цела Каліноўскага перавезлі на Замкавую гару (цяпер вядомая як гара Гедзіміна) і пахавалі разам з іншымі пакаранымі смерцю паўстанцамі на тэрыторыі расейскага гарнізона. Каланізатары баяліся, што магіла паўстанцкага правадыра і яго паплечнікаў зробіцца месцам паломніцтва патрыётаў. Каб як мага надзейней схаваць сляды, там зрабілі пляцоўку для гульні афіцэраў у крыкет.

Царызм святкаваў перамогу. У вялікадзяржаўным чадзе дзейнасць Мураўёва Вешальніка апраўдвала не толькі ліберальная расейская прэса, але нават паэты-дэмакраты, у тым ліку Мікалай Някрасаў, што прысвяціў кату паўстанцаў прывітальную оду.

Каланізатары патапілі паўстанне ў крыві. У нашым краі быў усталяваны рэжым жорсткіх законаў, накіраваных на татальную русіфікацыю. Разам з тым сялянства атрымала ад урада значныя палёгкі ў рэалізацыі рэформы 1861 г. У Віленскай, Гарадзенскай і Менскай губернях выкупная плата за сялянскія надзелы была зменшаная нават на 65–75 %.

У польскай і расейскай гістарыяграфіі паўстанне 1863–1864 гг. лічылася як польскае, але гэта не адпавядае сапраўднасці. І напярэдадні, і ў ходзе збройнай барацьбы на землях былога Вялікага Княства існавала моцная плынь літвінскага (беларускага) нацыянальна-вызвольнага руху на чале з К. Каліноўскім. Супраць царскіх карнікаў ваявалі тысячы нашых суайчыннікаў. Сярод іх знаходзілася ўжо шмат тых, хто гатовы быў ахвяраваць жыццё не за Рэч Паспалітую, а за сваю будучую незалежную дзяржаву. Паўстанцы мелі беларускую газету; у іх шэрагах змагаліся вядомыя пісьменнікі Францішак Багушэвіч, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Арцём Вярыга-Дарэўскі, Фелікс Тапчэўскі.

Апошні вядомы гісторыкам удзельнік таго паўстання Ігнат Абрамовіч памёр у 1944 г. у 105-гадовым веку і пахаваны ў мястэчку Красным пад Маладзечнам.

НАЦЫЯНАЛЬНАЕ АДРАДЖЭННЕ

Расейская імперыя, якая была «турмой народаў», сталася і месцам фармавання новых нацыяў. Насуперак уціску і русіфікацыі ў XIX ст. пачаў набіраць сілу наш нацыянальны рух. Ён быў падрыхтаваны дзейнасцю навукоўцаў, творчай інтэлігенцыі, патрыятычных студэнцкіх арганізацыяў. У гэтым асяроддзі выспявала высновa пра існаванне самабытнага беларускага этнасу.

Адным з пачынальнікаў беларускага Адраджэння былі выхадцы з сем'яў уніяцкіх святароў прафесары Віленскага ўніверсітэта Міхал Баброўскі і Ігнат Даніловіч, якія выступілі супраць вялікадзяржаўных расейскіх і польскіх тэндэнцый. Яны з патрыятычных пазіцыяў асвятлялі гісторыю Вялікага Княства Літоўскага, выказваліся за аднаўленне яго самастойнасці і вяртанне дзяржаўнага статусу беларускай мове. М. Баброўскі, да прыкладу, нанова адкрыў для айчыннай і еўрапейскай навукі імя і справу Францішка Скарыны. І. Даніловіч даследаваў Статуты Вялікага Княства, апісаў і часткова апублікаваў блізу 2500 пісьмовых крыніцаў па гісторыі Літвы-Беларусі.

Пра самастойнасць беларускага этнасу сведчылі матэрыялы, сабраныя і выдадзеныя этнографамі Паўлам Шэйнам, Міхалам Федароўскім, Еўдакімам Раманавым, Мікалаем Нікіфароўскім, Аляксандрам Ельскім...

У 1870 г. быў апублікаваны «Слоўнік беларускай мовы» Івана Насовіча. Канчаткова абгрунтаваў самастойнасць нашай мовы ў сям'і іншых славянскіх моваў, вызначыў межы яе пашырэння і склаў дыялекталагічную карту выдатны вучоны-славіст Яўхім Карскі. Ягонае фундаментальнае (у сямі кнігах) даследаванне «Беларусы» сталася нязменным здабыткам у справе Адраджэння.

ХРАНАЛОГІЯ

1794–1848 гг. – Жыццё і дзейнасць Міхала Баброўскага.
1787–1843 гг. – Жыццё і дзейнасць Ігната Даніловіча.
24 снежня 1798 г. – [illegible] 1855 г. – Жыццё і дзейнасць Адама Міцкевіча.
[illegible] – [illegible] – Жыццё і дзейнасць Яна Баршчэўскага.
[illegible] 1796 г. – 23 жніўня 1847 г. – Жыццё і дзейнасць Яна Чачота.
4 лютага 1808 г. – [illegible] – Жыццё і дзейнасць Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча.
29 верасня 1823 г. – 15 верасня 1862 г. – Жыццё і дзейнасць Уладзіслава Сыракомлі.
21 снежня 1840 г. – 28 красавіка 1900 г. – Жыццё і дзейнасць Францішка Багушэвіча.
[illegible] – [illegible] – Жыццё і дзейнасць Браніслава Эпімах-Шыпілы.
1 студзеня 1861 г. – 29 красавіка 1931 г. – Жыццё і дзейнасць Яўхіма Карскага.
[illegible] 1867 г. – 30 верасня 1934 г. – Жыццё і дзейнасць Мітрафана Доўнар-Запольскага.
[illegible] 1874 г. – [illegible] 1941 г. – Жыццё і дзейнасць Аляксандра Уласава.
[illegible] – 7 снежня 1943 г. – Жыццё і дзейнасць Вацлава Ластоўскага.
9 чэрвеня 1881 г. – 20 жніўня 1919 г. – Жыццё і дзейнасць Івана Луцкевіча.
7 ліпеня 1882 г. – 28 чэрвеня 1942 г. – Жыццё і дзейнасць Янкі Купалы.
3 лістапада 1882 г. – 13 жніўня 1956 г. – Жыццё і дзейнасць Якуба Коласа.
[illegible] – [illegible] 1944 г. – Жыццё і дзейнасць Францішка Аляхновіча.
[illegible] – [illegible] – Жыццё і дзейнасць [illegible].
29 студзеня 1884 г. – 23 [illegible] 1942 г. – Жыццё і дзейнасць Антона Луцкевіча.
[illegible] 1891 г. – 25 траўня 1917 г. – Жыццё і дзейнасць Максіма Багдановіча.
[illegible] – [illegible] – Жыццё і дзейнасць [illegible].
[illegible] – [illegible] – Жыццё і дзейнасць Максіма Гарэцкага.
[illegible] – [illegible] – Жыццё і дзейнасць [illegible].

Набірала сілу новая беларуская літаратура, першымі значнымі творамі якой сталі ананімныя паэмы «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе». Сёння можна лічыць даказаным, што першую напісаў Вікенцій Равінскі, а другую – Канстанцін Вераніцын.

На жаль, не захавалася беларускамоўнай спадчыны нашага выдатнага суайчынніка Адама Міцкевіча, але асноўныя тэмы і вобразы яго паэзіі былі натхнёныя жыццём, гісторыяй, фальклорам і прыродай Літвы-Беларусі. Сябар Міцкевіча Ян Чачот выдаў у Вільні шэсць зборнікаў запісаных ім «Вясковых песняў», дзе апублікаваў і блізу трыццаці сваіх беларускіх вершаў.

На пачатку XX ст. буйнага навукоўца, даследчыка гісторыі Вялікага Княства Літоўскага называлі адзін з заснавальнікаў нашай нацыянальнай гістарыяграфіі Мітрафан Доўнар-Запольскі. Ён сказаў прарочыя словы пра тое, што народ, які меў сваю дзяржаву, будзе мець яе зноў.

Медаль з партрэтам паэта Уладзіслава Сыракомлі (Людвіка Кандратовіча). Медальер [illegible]. Бронза. [illegible] 1857 г.

Па-беларуску і па-польску пісаў свае паэтычныя творы Уладзіслаў Сыракомля (Людвік Кандратовіч). Ён апрацоўваў народныя песні, прысвяціў Літве-Беларусі гістарычна-краязнаўчыя працы «Вандроўкі па маіх былых ваколіцах», «Менск», «Нёман ад вытокаў да вусця».

Велізарны ўклад у новую беларускую літаратуру зрабіў Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, які ў вершаваных апавяданнях, аповесцях і баладах «Вечарніцы», «Купала», «Гапон», «Шчароўскія дажынкі» шырока выкарыстоўваў нацыянальны фальклор, адлюстроўваў побыт і звычаі ліцвінаў-беларусаў. Ён па-беларуску перастварыў паэму А. Міцкевіча «Пан Тадэвуш», але публікацыю перакладу забараніла царская цэнзура. За ўдзел у паўстанні Каліноўскага пісьменніка кінулі ў турму, а потым трымалі пад наглядам паліцыі. У 1866 г. В. Дунін-Марцінкевіч стварыў бліскучую вострасатырычную камедыю «Пінская шляхта».

Выдатнае месца сярод беларускіх пісьменнікаў першай паловы XIX ст. займае Ян Баршчэўскі. Яго галоўны твор – кнігу «Шляхціч Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» сучаснікі параўноўвалі з славутымі арабскімі казкамі «Тысяча і адна ноч».

Беларускія дзяўчаты [illegible]. Фота 1912 г.

Тытульная старонка кнігі В. Дуніна-Марцінкевіча «Дудар беларускі». Мінск. 1857 г.

Класік беларускай літаратуры Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч [illegible] К. Каліноўскага. Фота [illegible] 1863 г.

[illegible] «Віц Баршчэўскі» [illegible] XIX [illegible]. Вільня. 1903 г.

[illegible]

ХРАНАЛОГІЯ

1870 г. – Апублікаваны «Слоўнік беларускай мовы» Івана Насовіча.
1884 г. – Пачаў выходзіць часопіс «Гомон», орган беларускай фракцыі «Народнай волі».
1891 г. – Выдадзена ў Кракаве першая кніга Ф. Багушэвіча «Дудка беларуская».
1903 г. – Утварэнне першай беларускай палітычнай партыі – Беларускай Сацыялістычнай Грамады.
1906 г. – Заснаванне ў Пецярбургу легальнага беларускага выдавецтва «Загляне сонца і ў наша аконца».
23 лістапада 1906 г. – Пачатак выхаду беларускай газеты «Наша Ніва».
1907 г. – Утварэнне Беларускага [illegible] у Вільні.
1907–1913 гг. – Дзейнасць першага прафесійнага беларускага тэатра Ігната Буйніцкага.
1910 г. – Выданне «Кароткай гісторыі Беларусі» В. Ластоўскага.
1911–1921 гг. – Дзейнасць Віленскага беларускага музычна-драматычнага гуртка [illegible].
1913 г. – Заснаванне ў Вільні Беларускага выдавецкага таварыства.
1913–1915 гг. – Выданне газеты «Беларус».

[illegible] Францішка Багушэвіча. [illegible]

Багушэвічава «Дудка беларуская». Пецярбург. [illegible]

«Смык беларускі» [illegible] Ф. Багушэвіча. Вільня. 1910 г.

Выдатную ролю ў нацыянальным Адраджэнні адыграў класік беларускай літаратуры Францішак Багушэвіч.

У 1891 г. у Кракаве, які знаходзіўся ў складзе Аўстра-Вугоршчыны, пабачыла свет кніга Францішка Багушэвіча «Дудка беларуская». Родную краіну паэт называў Беларуссю, а яе мову – беларускай. «Шмат было такіх народаў, што страцілі наперш мову сваю, так як той чалавек прад сканаццем, католаму мову займе, а потым і зусім замёрлі. Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!.. – пісаў Ф. Багушэвіч у прадмове да «Дудкі». – Можа, хто спытае, дзе ж цяпер Беларусь? Там, братцы, яна, дзе наша мова жывець: яна ад Вільна да Мазыра, ад Вiцебска за малым не да Чарнігава, дзе Гродна, Мінск, Магілеў, Вільня...»

Кнігі В. Дуніна-Марцінкевіча і Ф. Багушэвіча выдаваліся па-беларуску лацінкай. І наогул у нашым тагачасным друку лацінскі шрыфт выкарыстоўваўся вельмі шырока. На лацініцы выходзілі шмат якія творы і зборнікі Янкі Купалы, Якуба Коласа, Цёткі... Пазней гэтая традыцыя працягвалася ў Заходняй Беларусі і на эміграцыі.

У другой палове XIX ст. беларускі нацыянальна-культурны рух пачаў перарастаць у палітычны. Ужо К. Каліноўскі быў прыхільнікам стварэння ў будучым на землях былога Вялікага Княства дэмакратычнай рэспублікі, не залежнай ні ад Польшчы, ні ад Расеі.

Паэтэса Цётка (Алаіза Пашкевіч) у беларускім нацыянальным строі. З фотаздымка пачатку XX ст.

Сядзіба-музей Ф. Багушэвіча ў вёсцы Кушляны Смаргонскага раёна. Сучаснае фота.

[illegible] Віцебск. 1900 г.

Увесну 1881 г. беларускі шляхціч Ігнат Грынявіцкі выканаў смяротны прысуд, вынесены цару Аляксандру II падпольнай арганізацыяй «Народная воля». Праз тры гады група «народавольцаў»-студэнтаў з Беларусі пачала выдаваць у Пецярбургу орган сваёй фракцыі нелегальны гектаграфічны часопіс «Гомон». На яго старонках з рэвалюцыйна-дэмакратычных пазіцый абвяшчалася пра існаванне беларускай нацыі.

Ужо з сярэдзіны 1880-х гадоў беларуская мова шырока выкарыстоўвалася навучэнцамі настаўніцкіх семінарый і Віленскага настаўніцкага інстытута. Моладзь збірала фальклор, арганізоўвала «нядзельныя школы», падтрымлівала сувязі з «народавольцамі». У інстытуце склаўся беларускі гурток, які пасля рэпрэсій перайшоў на нелегальнае становішча. Па нейкім часе кіраўнікоў гуртка Мамовіча і Апенчанку арыштавалі і заслалі на тры гады ў дысцыплінарны батальён.

У апошнія дзесяцігоддзі XIX ст. у этнічнай свядомасці жыхароў беларускіх губерняў адбыліся вельмі істотныя змены. На перапісе, праведзеным у Расійскай імперыі ў 1897 г., беларусамі назвалі сябе 5 885 547 чалавек. 74% насельніцтва нашага абшару лічылі роднай мовай беларускую. Яе прызналі роднай 60% настаўнікаў, больш за 50% асобаў дваранскага стану, 40% чыноўнікаў, 30% паштова-тэлеграфных службоўцаў, 20% лекараў. Сярод сялянства найменне «беларусы» выцесніла большасць лакальных саманазоваў. Гэта сведчыла пра замацаванне тэрміну «Беларусь» за ўсёй нашай этнічнай тэрыторыяй.

Рэвалюцыйныя падзеі 1905 г. ліквідавалі забарону на беларускі друк. У наступным годзе ў Пецярбургу пачало дзейнічаць першае беларускае легальнае выдавецкае таварыства «Загляне сонца і ў наша аконца». Неўзабаве выдавецтва было заснавана і ў Вільні.

Вільня зрабілася прызнаным цэнтрам нашага нацыянальнага руху. Яе ўзнёсла называлі «крывіцкай Меккай» і «беларускім Сіёнам». Непарыўна звязаная з Вільняй і ейнай славутай Вострай Брамай неўміручая «Пагоня» Максіма Багдановіча, якая стала адным з нацыянальных беларускіх гімнаў.

На пачатку XX ст. арганізацыйнае, ідэйнае і палітычнае кіраўніцтва нацыянальна-вызваленчым рухам узяла на сябе заснаваная ў 1903 г. першая беларуская палітычная партыя – Беларуская Сацыялістычная Грамада. Яе стваральнікамі былі браты Іван і Антон Луцкевічы, якіх заслужана называюць «бацькамі» беларускага Адраджэння, а таксама Вацлаў Ластоўскі, Алаіза Пашкевіч (Цётка), Вацлаў Іваноўскі, Казімір Кастравіцкі (Карусь Каганец), Алесь Бурбіс. За бліжэйшую мэту Грамада мела знішчэнне царскага самаўладдзя і сцвярджэнне дэмакратычных свабодаў у супольнасці з іншымі народамі імперыі. У нацыянальным пытанні першая праграма партыі прадугледжвала утварэнне незалежнай Беларускай дэмакратычнай рэспублікі. Грамада стала адным з галоўных арганізатараў Першага Усебеларускага з'езда.

Карта заходніх губерняў "Северо-Западного края".

Увосень 1906 г. у Вільні пачала выходзіць «Наша Доля» – першая легальная беларуская газета. Пад ціскам цэнзуры яна мусіла спыніць існаванне, аднак тым часам ужо з'явілася новае нацыянальнае выданне – «Наша Ніва». Гэтаму грамадска-палітычнаму, літаратурна-мастацкаму і навукова-папулярнаму тыднёвіку належаць велізарныя заслугі ў згуртаванні ўсіх сілаў, якія змагаліся за адраджэнне краіны. Заснавальнікамі «Нашай Нівы» былі браты Іван і Антон Луцкевічы ды іх паплечнік Аляксандр Уласаў. Газета выдавалася ў Вільні да жніўня 1915 г., а потым, пасля доўгага перапынку, выкліканага вайной, выходзіла ў 1920 г.

Наша Ніва

NAŠA NIWA

Ад 1906 да 1912 г. газета «Наша Ніва» друкавалася кірыліцай і лацінкай

Рэдакцыя тыднёвіка займалася кнігавыданнем, папулярызацыяй беларускага тэатра, фальклору і ўсёй нацыянальнай культуры. Заслугамі «Нашай Нівы» былі і клопаты пра збіранне нашай даўніны, вяртанне народу ягонай гістарычнай памяці. Пры газеце захоўвалася ўнікальная калекцыя Івана Луцкевіча, што сталася пазней асновай Віленскага Беларускага музея. У 1910 г. газета з нумара ў нумар друкавала «Кароткую гісторыю Беларусі» Вацлава Ластоўскага, якога даследчыкі вобразна называюць «неадменным сакратаром Адраджэння». У прадмове да сваёй кнігі ён пісаў: «Гісторыя – гэта фундамент, на якім будуецца жыццё народу. І нам, каб адбудаваць сваё жыццё, трэба пачаць з фундаменту, каб будынак быў моцны...»

«Наша Ніва» сталася сапраўдным народным, агульнабеларускай газетай, асяродкам і рухавіком нацыянальнага жыцця. Яна інтэнсіўна шмат зрабіла для развіцця беларускай літаратуры, выпрацоўкі нормаў літаратурнай мовы і правапісу. Менавіта тут апавяданнем «Музыка» дэбютаваў Максім Багдановіч. З публікацый у тыднёвіку пачалі творчы шлях Максім Гарэцкі, Алесь Гарун, Канстанцыя Буйла, Зміцер Бядуля, Уладзіслаў Галубок... У «Нашай Ніве» упершыню пабачылі свет урыўкі з «Новай зямлі» Якуба Коласа, паэмы «Курган» і «Бандароўна» Янкі Купалы, які ў 1914–1915 гг. быў рэдактарам газеты.

Паштоўка, [illegible]. Фота пачатку XX ст.

Янка Купала і Якуб Колас. 1920-я гады

Удзельнікі Першага таварыства беларускай драмы і камедыі. [illegible] 1918 г.

Паштоўка з [illegible] Францішка Аляхновіча. 1930-я гады. З калекцыі былога Беларускага музея імя І. Луцкевіча ў Вільні

На пачатку XX ст. быў створаны прафесійны беларускі тэатр, «бацькамі» якога заслужана лічацца Ігнат Буйніцкі, Францішак Аляхновіч, Фларыян Ждановіч, Усевалад Фальскі, Алесь Бурбіс. У станаўленні нашага тэатра і наогул у пашырэнні адраджэнскіх ідэй вялікі плён мелі беларускія вечарыны, дзе разам з пастаноўкамі п'ес дэкламаваліся вершы, выконваліся народныя песні і танцы.

Актор Першага таварыства беларускай драмы і камедыі [illegible]. Фота 1920 г.

Удзельнікі хору Уладзіміра Тэраўскага [illegible] 1918 г.

Важным чыннікам нацыянальнага Адраджэння стаў моладзевы рух. Яго асяродкамі разам з Вільняй і Горадняй былі Маладзечна, Нясвіж, Свіслач ды іншыя гарады, дзе месціліся настаўніцкія семінарыі. Паколькі расейскія каланіяльныя ўлады зачынілі ў Літве-Беларусі ўсе вышэйшыя навучальныя ўстановы, беларускі студэнцкі рух развіваўся ва ўніверсітэцкіх цэнтрах метраполіі.

Прызнанымі лідарамі хрысціянскай дэмакратыі і ўсяго беларускага рэлігійнага руху сталі ксяндзы Адам Станкевіч і Вінцэнт Гадлеўскі.

Беларускае Адраджэнне падтрымлівалі людзі розных веравызнанняў, станаў і сацыяльных груп. Сярод іх была і ліцвінская арыстакратыя. Да прыкладу, княгіня Магдалена Радзівіл фінансавала суполку «Загляне сонца і ў наша ваконца». З матэрыяльнай падтрымкі гэтай ахвярнай жанчыны адчыняліся беларускія школы, выйшлі першыя кнігі М. Багдановіча, К. Буйлы ды іншых аўтараў.

Пад час Першай сусветнай вайны браты Луцкевічы разам з В. Ластоўскім выступілі з праграмай аднаўлення Вялікага Княства Літоўскага з сталіцай у Вільні. Аднак гэтая ідэя не знайшла падтрымкі ў дзеячоў летувіскага адраджэння.

ЛЕТУВІСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ РУХ

Параўнаўча з беларускім нацыянальны рух летувісаў – нашчадкаў балцкай меншасці Вялікага Княства – зазнаў пасля паўстання 1863 г. ажыўляўся ў значна больш спрыяльных умовах. Расійскія ўлады вырашылі падтрымаць яго ў супрацьвагу мясцовым польскім палякаў. Пецярбург зрабіў летувіскую мову адной з моваў навучання ў Марыямпальскай дзяржаўнай настаўніцкай навучальні, якая стала цэнтрам падрыхтоўкі летувіскай эліты. Летувіскую мову выкладалі таксама ў Сейненскай і Сувалкаўскай гімназіях. У той самы час выкладанне па-беларуску ў школах усіх рэўнаў знаходзілася пад забаронай. Вялікую ролю ў нацыянальным руху нашых суседзяў адыгралі летувіскія каталіцкія клір. Яшчэ перад паўстаннем біскуп Мацвеюс Валанчус дамогся дазволу адчыніць пры касцёлах парафіяльныя школы з выкладаннем на роднай мове вучняў. Такім чынам адрозна ад беларусаў малыя летувісы адразу вучыліся чытаць і пісаць па-свойму.

AUSZRA

Выпускнікі Марыямпальскай навучальні Вінцас Кудзірка і Ёнас Басанавічус, «бацькі» летувіскага адраджэння канца XIX – пачатку XX ст., стварылі міф пра Вялікае Княства Літоўскае як выключна «літоўскую» (летувіскую) дзяржаву. З ім не стасавалася ніводная гістарычная крыніца, але гэты міф атрымаў шырокае распаўсюджанне і стаўся падмуркам для адбудовы летувіскамоўнай Літвы. Царская адміністрацыя не пярэчыла таму, што ўсю нашую гісторыю прыпісвалі да нашчадкаў балцкіх плямёнаў – этнічнай меншасці колішняга Вялікага Княства Літоўскага. Для Расіі галоўным тут было зафіксіць гістарычную перспектыву беларусаў, якіх планавалася цалкам зрусіфікаваць, пазбавіўшы спадзеваў на адраджэнне сваёй дзяржавы.

У летувіскай мове не існавала нават слова для абазначэння герба дзяржавы нашых продкаў, і яго прыдумалі толькі ў сярэдзіне XIX ст. («Пагоня» была названая «Vytis»). На свой лад летувісы змянілі імёны гістарычных дзеячоў. Вялікі гетман Канстанцін Астрожскі не мог і ўявіць, што некалі ператворыцца ў Астрагішкіса. Вядомы гісторык Адам Ганоры Кіркор быў перахрышчаны ў АдомасаГанорыса Кіркорыса, Пац стаў Пацасам, Сапегі – Сапегаўскасам... (Прычым такім напісаннем летувісы карысталіся і ў тэкстах на іншых мовах.)

ГОВОРИТЬ ПО ЛИТОВСКИ СТРОГО ВОСПРЕЩАЕТСЯ

AUKSA ALTORIUS

Нашыя суседзі на доўгі час прысвоілі сабе ўсю гістарычную і культурную спадчыну Вялікага Княства ўлучна з яго назовам – «Літва» (у форме «Летува»). Яны здзейснілі свой намер не толькі дзякуючы пэўнай падтрымцы расійскіх імперскіх (а затым і савецкіх) уладаў. Даследчык гэтай праблемы сучасны амерыканскі гісторык Тымаці Снайдэр піша, што ажыццявіць такую «прыватызацыю» суседзям дапамагло і сацыяльнае паходжанне іхніх «абуджальнікаў нацыі». Першае пакаленне інтэлігентаў-летувісаў складалі не шляхціцы, якім ужо само паходжанне і колішні гонар не дазволілі б зайсціся фальсіфікацыям, а выхадцы і нашчадкі – дзеці заможных сялянаў. Ім, на думку Снайдэра, вельмі лёгка было замоўчваючы або ігнаруючы гістарычныя факты, збудаваць «нацыянальную інтэрпрэтацыю гісторыі Літвы», дзе беларусам проста не засталося месца.

Надзвычай важным стаўся ў той сітуацыі моўны фактар. Беларуская мова адрозна ад летувіскай была забароненая як мова вуснай і друку. Па-летувіску ж выходзіла багата рознай літаратуры: буквароў, граматык, календароў, малітоўнікаў, катэхізісаў, кніжак. Нават пасля паўстання 1863 г. расійскія ўлады не забаранялі летувіскага друку на роднай мове. (Праўда, яна мусіла карыстацца не лацінскім, а рускім графічным шрыфтам.)

Апрача таго, калі пасля падзелаў Рэчы Паспалітай усе беларускія землі ўрэшце апынуліся ў Расійскай імперыі, летувісы мелі замежную базу для забеспячэння свайго нацыянальнага руху. У склад Прусіі трапіла гэтак званая «Малая Летува», дзе ў спрыяльных для развіцця ўласнай культуры ўмовах жыло блізу 300 тысяч жамойтаў. Гэта давала магчымасць кантактаў з Еўропай, пашырэння ў свеце звестак пра свае нацыянальныя патрэбы. (Да 1904 г. у Тыльзіце і Кёнігсбергу па-летувіску выйшла блізу 3300 найменняў кніг і блізу 120 перыядычных выданняў агульным накладам некалькі мільёнаў паасобнікаў.) Невыпадкова ў 1918 г. якраз нямецкая падтрымка была вырашальнай у стварэнні Летувіскай дзяржавы з сталіцаю ў Вільні (хоць, паводле звестак перапісу насельніцтва 1897 г., летувісаў налічвалася менш за 2%).

Міф пра Вялікае Княства Літоўскае як летувіскую дзяржаву нашыя суседзі занеслі пастаянна ўкараніць у сусветную гістарыяграфію.

КАНФЕДЭРАЦЫЯ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

[illegible]

Ідэя адназўлення Вялікага Княства Літоўскага – відаць, ужо ў новых формах і на іншай аснове – працягвала жыць і на пачатку XX ст. Спадзяванням на ажыццяўленне такога праекта спрыялі падзеі Першай сусветнай вайны, якая актывізавала на Еўрапейскім кантыненце нацыянальныя рухі паняволеных народаў і іхнае імкненне да незалежнасці.

Беларусі вайна прынесла велізарныя чалавечыя ахвяры і разбурэнні, звязаныя як з баявымі дзеяннямі, гэтак і з тактыкай «выпаленай зямлі», што выкарыстоўвалася тут расейцамі. Пасля гвалтоўнай эвакуацыі насельніцтва ўглыб імперыі на Віленшчыне яго колькасць знізілася на 22 %, на Берасцейшчыне – на 44 %, а на Гарадзеншчыне – больш чым напалову. На ўсход найперш высялялі праваслаўных беларусаў і не набіліванаю ў войска інтэлігенцыю. У выніку тут узніклі спрыяльныя ўмовы для паланізацыі краю праз польскі касцёл. Палякі планавалі далучыць «крэсы» да сваёй будучай дзяржавы, летувісы выношвалі ўласныя тэрытарыяльныя прэтэнзіі.

У такіх умовах беларускія нацыянальныя лідары зрабілі стаўку на рэалізацыю ідэі Канфедэрацыі Вялікага Княства Літоўскага – стварэння на абшары колішняга Княства супольнай дзяржавы. Адным з ініцыятараў стаў выдатны дзеяч беларускага Адраджэння Антон Луцкевіч.

[illegible]

[illegible]

[illegible]

ХРАНАЛОГІЯ

1915 г. – Праект Канфедэрацыі Вялікага Княства Літоўскага.

1916 г. – Беларускі народны камітэт у Вільні прапанаваў [illegible] Беларусі, Летувы, Латвіі і Украіны.

Верасень 1917 г. – [illegible] Беларуска-Летувіскай дзяржавы.

[illegible]

Улетку 1916 г. Беларускі народны камітэт на чале з Антонам Луцкевічам прапанаваў ідэю больш шырокага дзяржаўнага ўтварэння ад Балтыйскага да Чорнага мора. Гэтыя «Злучаныя Штаты» павінны былі складацца з Беларусі, Летувы, Латвіі і Украіны. Замест адной дзяржавы з аўтаномнымі тэрыторыямі планавалася стварыць канфедэрацыйны альянс незалежных дзяржаваў.

У 1917 г. беларускія арганізацыі працягвалі выступаць за ўтварэнне Беларуска-Летувіскай дзяржавы, прычым рабілі гэта, нягледзячы на пазіцыю Летувіскай тарыбы (Рады), што заявіла аб прэтэнзіях на беларускія землі. Ідэю такой дзяржавы падтрымаў у верасні 1917 г. Беларускі нацыянальны камітэт у Менску.

Пры канцы студзеня 1918 г. у Вільні прайшла Беларуская канферэнцыя, якая прыняла рэзалюцыю аб імкненні стварыць незалежную суверэнную дэмакратычную дзяржаву з дзвюх асноўных нацыянальных тэрыторыяў – беларускай і летувіскай, «у найцяснейшай еднасці з Курляндыяй».

Курс беларускіх арганізацыяў на дзяржаўнае адзінства з Летувой, Латвіяй, а ў перспектыве і з Украінай вызначалі найперш эканамічныя прычыны, у прыватнасці неабходнасць мець выйсце да мора, а таксама патрэба нацыянальнай абароны.

Аднак пазіцыі кіраўнікоў летувіскага і беларускага нацыянальных рухаў усё больш разыходзіліся. На пачатку 1918 г. была абвешчаная незалежнасць Летувы, а затым – Беларускай Народнай Рэспублікі, пасля чаго пытанне пра канфедэрацыю ўжо не ўздымалася.

[illegible]

9 снежня 1915 г. быў апублікаваны ўніверсал Канфедэрацыі. Ён паведамляў, што галоўная мэта праекту ў тым, каб беларускія і летувіскія землі, якія калісьці прыналежалі да Вялікага Княства Літоўскага, а цяпер акупаваныя нямецкімі войскамі, сталі ў новых гістарычных умовах [illegible] незалежнасці Летувы і Беларусі як супольнай дзяржавы, [illegible] у [illegible] правы. Вызначэнне [illegible] будучай краіны [illegible] сталіцы – Вільні. У склад дзяржавы мерқаваліся ўлучыць Віленскую і Ковенскую, а таксама часткі Гарадзенскай, Сувалкаўскай, Менскай і Курляндскай губерняў.

АБВЯШЧЭННЕ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ БЕЛАРУСІ І ЛЕТУВЫ

Летувіская Рэспубліка

Летувіская тарыба ў снежні 1917 г. заявіла пра аднаўленне незалежнай Летувіскай дзяржавы (з сталіцай у Вільні) у хаўрусе з Нямеччынай. З яе падтрымкай 16 лютага 1918 г. адбылося абвяшчэнне Дэкларацыі незалежнасці Летувы. Нямеччына прызнала новую дзяржаву, і акупацыйныя ўлады перадалі Тарыбе цывільную ўладу.

Паміж Тарыбай і Віленскай беларускай радай існавала дамоўленасць пра магчымасць стварэння ў будучым федэрацыйнай Беларуска-Летувіскай дзяржавы. У выніку ў склад Тарыбы былі ўлучаныя шэсць прадстаўнікоў Віленскай рады, у тым ліку такія надзвычай аўтарытэтныя ў беларускім руху асобы, як Вацлаў Ластоўскі ды Іван Луцкевіч, а ў кабінеце міністраў незалежнай Летувы з'явілася Міністэрства беларускіх справаў на чале з Язэпам Варонкам.

Першая Летувіская тарыба. 1917 г.

ХРАНАЛОГІЯ

[illegible] 1917 г. — [illegible] Першага Усебеларускага з'езда.
16 лютага 1918 г. — Абвяшчэнне незалежнасці Летувы.
[illegible] 1918 г. — Першая Устаўная грамата [illegible]
[illegible] 1918 г. — Другая Устаўная грамата [illegible]
25 сакавіка 1918 г. — Абвяшчэнне незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі.

Беларуская Народная Рэспубліка

У снежні таго ж 1917 г. у Менску адбыўся Першы Усебеларускі з'езд (кангрэс), на якім прысутнічалі 1872 дэлегаты з усяго беларускага этнічнага абшару – ад Беласточчыны да Смаленшчыны.

Спачатку на кангрэсе, старшынёй якога быў абраны Іван Серада, прагучала прапанова стварыць Беларускую Рэспубліку ў складзе федэратыўнай Расеі. Аднак сярод дэлегатаў усё большую вагу набіралі незалежніцкія настроі. Ім спрыяла і тое, што адначасова бальшавікі вялі ў Берасці перамовы пра мір з немцамі без уліку інтарэсаў Беларусі.

Запрошаныя на з'езд камуністы ад удзелу ў пасяджэннях ухіліліся, але пільна сачылі за падзеямі. Паўночна-Заходні абкам РСДРП(б) на чале з А. Мясніковым (Мяснікянам) не прызнаваў ні права беларусаў на самавызначэнне, ні нават самога існавання беларускай нацыі. Убачыўшы, што кангрэс займае прынцыпова іншую пазіцыю, 18 снежня бальшавікі разагналі яго з дапамогай вайсковай сілы.

Частка дэпутатаў была арыштаваная, але Рада, якой Першы Усебеларускі кангрэс перадаў краёвую ўладу, змагла абраць Выканаўчы камітэт. Яго ўзначаліў адзін з кіраўнікоў Беларускай Сацыял-дэмакратычнай Грамады Язэп Варонка.

[illegible]

[illegible]

Бланк і пячатка Народнага Сакратарыята БНР

Не зважаючы на варожае стаўленне нямецкіх акупацыйных уладаў, Выканкам Рады Усебеларускага з'езда звярнуўся да жыхароў Беларусі з Другой Устаўнай граматай. Яна акрэслівала дзяржаўны лад краіны, а таксама правы і свабоды ее грамадзянаў. Беларусь – у рубяжах рассялення і лічбеннай перавагі беларускага народу – абвяшчалася Народнай Рэспублікай.

З другой паловы лютага 1918 г. пачаўся наступ нямецкіх войскаў, што прывяло да ўцёкаў бальшавікоў з Менска і пераходу Выканаўчага камітэта на легальнае становішча. Камітэт неадкладна выдаў Першую Устаўную грамату да народаў Беларусі, у якой абвясціў сябе часовай уладай і ўзяў курс на скліканне Усебеларускага Устаноўчага Сойму на аснове агульнага выбарчага права.

Быў створаны ўрад – Народны Сакратарыят, узначалены Я. Варонкам. Але Менск захапілі немцы, якія канфіскавалі ўрадавую грашовую касу і разагналі службоўцаў. У адказ на такую палітыку Нямеччыны Народны Сакратарыят неадкладна выступіў з нотамі пратэсту. У іх гаварылася, што акупацыя кайзераўцамі «пазбавіла Беларускі ўрад магчымасці стварыць неабходную ўзброеную сілу для абароны недатыкальнасці сваёй тэрыторыі». У сваіх заявах кіраўніцтва БНР звяртала ўвагу на тое, што «немцы вялі палітыку заігрывання з бальшавікамі, перашкаджаючы стварэнню і развіццю дзяржаўных структураў». Гэтыя факты аспрэчваюць створаны савецкімі гісторыкамі міф аб «пракайзераўскім» і «пранямецкім» характары Беларускай Народнай Рэспублікі.

Ва ўмовах, калі ідэя незалежнасці захапіла ўсё шырэйшыя колы прыхільнікаў, Выканкам Рады Усебеларускага з'езда абвясціў сябе Радаю Беларускай Народнай Рэспублікі. У склад новага органа з Віленскай беларускай рады ўвайшлі Іван ды Антон Луцкевічы і Вацлаў Ластоўскі. 23 сакавіка на паседжанні Народнага Сакратарыята А. Луцкевіч заявіў, што фармальна Беларусь працягвае заставацца тэрыторыяй Расеі, а гэта не адпавядае надзеям і памкненням беларускага народа.

Увечары 24 сакавіка пачалося гістарычнае пасяджэнне Рады БНР, якое доўжылася ўсю ноч і завяршылася пад раніцу прыняццем наступнага дакумента:

[illegible]

3-я Устаўная грамата Рады Беларускае Народнае Рэспублікі

Год таму назад народы Беларусі разам з народамі Расеі скінулі ярмо расейскага царызму, які найцяжэй прыціснуў быў Беларусь, не пытаючыся народу, ён кінуў наш край у пажар вайны, якая чыста зруйнавала гарады і вёскі беларускія. Цяпер мы, Рада Беларускай Народнай Рэспублікі, скідаем з роднага краю апошняе ярмо дзяржаўнай залежнасці, якое гвалтам накінулі расейскія цары на наш вольны і незалежны край. Ад гэтага часу Беларуская Народная Рэспубліка абвяшчаецца незалежнаю і вольнаю дзяржаваю. Самі народы Беларусі ў асобе Устаноўчага Сойму пастановяць аб будучых дзяржаўных звязях Беларусі.

На моцы гэтага трацяць сілу ўсе старыя дзяржаўныя звязі, якія далі магчымасць чужому ўраду падпісаць і за Беларусь трактат у Берасці, што забівае на смерць беларускі народ, дзелячы зямлю яго на часткі. На моцы гэтага ўрад Беларускай Народнай Рэспублікі мае ўвайсці ў зносіны з зацікаўленымі старанамі, прапануючы ім перагледзець тую частку Берасцейскага трактату, якая датычыць Беларусі, і падпісаць мірную ўмову з усімі ваюючымі дзяржавамі.

Беларуская Народная Рэспубліка павінна абняць усе землі, дзе жыве і мае лічбенную перавагу беларускі народ, а ласне: Магілёўшчыну, беларускія часці Меншчыны, Гродзеншчыны (з Гродняй, Беластокам ды інш.), Віленшчыны, Віцебшчыны, Смаленшчыны, Чарнігаўшчыны і сумежных частак суседніх губерняў, заселеных беларусамі.

Беларуская Народная Рэспубліка зацвярджае ўсе тыя правы і вольнасці грамадзян і народаў Беларусі, якія абвешчаны Устаўной Граматай ад 9 сакавіка 1918 году.

Абвяшчаючы аб незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі, Рада яе пакладае свае надзеі на тое, што ўсе любячыя волю народы дапамогуць беларускаму народу ў поўнай меры зрэалізаваць яго палітычна-дзяржаўныя ідэалы.

Рада Беларускай Народнай Рэспублікі
Дана ў Менску-Беларускім
24 сакавіка 1918 году.

Абшар БНР, куды ўваходзілі ўсе этнічныя беларускія землі, складаў каля 400 тысяч квадратных кіламетраў. Там жыло тады прыкладна 15 мільёнаў чалавек. (Для параўнання: тэрыторыя сучаснай Рэспублікі Беларусь – 207,6 тысячы квадратных кіламетраў, насельніцтва – менш за 10 мільёнаў.)

Тэкст Трэцяй Устаўнай граматы БНР у газеце «Вольная Беларусь»

Вольная Беларусь

Першы ўрад Беларускай Народнай Рэспублікі (злева направа, сядзяць): Алесь Бурбіс (1885–1922), Іван Серада (1879–пасля 1943), старшыня Язэп Варонка (1891–1952), Васіль Захарка (1877–1943); (стаяць) Аркадзь Смоліч (1891–1938), Пётра Крэчэўскі (1879–1928), Кастусь Езавітаў (1893–1946), Антон Аўсянік (1886–1937), Лявон Заяц (1890–1932).

Абвяшчэнне незалежнасці БНР было рашучым пратэстам супраць падзелу Беларусі бальшавікамі і кайзераўцамі паводле падпісанай імі Берасцейскай дамовы. Уся наша этнічная тэрыторыя абвяшчалася адзінай дэмакратычнай дзяржавай. Народны Сакратарыят зацвердзіў дзяржаўную пячатку з «Пагоняй» і бел-чырвона-белы сцяг. Наладжваліся палітычныя і эканамічныя сувязі Беларусі з замежжам. Прэс-бюро БНР дзейнічалі ў Берліне, Капенгагене, Рызе, Таліне ды іншых еўрапейскіх сталіцах.

Пячатка Міністэрства унутраных спраў БНР

Пячатка Міністэрства абароны БНР

Незалежную Беларускую Народную Рэспубліку дэ-юрэ або дэ-факта прызналі Арменія, Аўстрыя, Грузія, Латвія, Літва, Польшча, Турцыя, Украіна, Фінляндыя, Чэхаславакія, Эстонія. Ідэю беларускай дзяржаўнасці не змаглі ўжо ігнараваць і бальшавіцкія кіраўніцтва Расіі.

Маркі Беларускай Народнай Рэспублікі 1918–1919 гг.

Пашпарт грамадзяніна БНР

Дом у Менску, дзе было абвешчана незалежнасць Беларускай Народнай Рэспублікі (цяпер вул. Валадарскага, 9). Малюнак ... Віктара Сташчанкова. 1988 г.

Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Том I. Кніга 1. Вільня–Нью-Ёрк–Менск–Прага. 1998 г.

Камандзір Слуцкай брыгады БНР — ... Антон Сокал-Кутылоўскі. 1950-я гады

«Беларуская дзяржаўнасць». Зборнік дакументаў і матэрыялаў ... руху ў 1918–1925 гг. Выданне Беларускага Інстытута Навукі і Мастацтва ў ЗША. Нью-Ёрк. 1988 г.

Ганаровая варта Першага беларускага палка ... у Гародні. Фота ... 1919 г. З ... Беларускага музея імя І. Луцкевіча ў Вільні

БССР І ЛІТБЕЛ

Абвяшчэнне БССР

30–31 снежня ў Смаленску адбылася Паўночна-заходняя абласная канферэнцыя бальшавікоў, якая заявіла пра сябе як пра I з'езд КП(б)Б і прыняла пастанову аб стварэнні Беларускай ССР у межах Смаленскай, Віцебскай, Магілёўскай, Менскай і Гарадзенскай губерняў з тымі часткамі сумежных з імі Сувалкаўскай, Віленскай, Ковенскай і Чарнігаўскай, дзе пераважала беларускае насельніцтва. Не маючы на гэта ніякіх паўнамоцтваў нашага народа, бальшавікі сфармавалі ўрад будучай рэспублікі, спіс якога быў складзены ў Маскве.

5 студзеня ўрад БССР пераехаў у Менск, і неўзабаве хутка пераканаўся, што прызнанне дзяржаўнасці Беларусі ўяўлялася для Масквы не больш чым палітычнай тактычнай гульнёй. Ужо 16 студзеня 1919 г. бальшавіцкае кіраўніцтва загадала «ў сувязі са зменай ваенных абставінаў» перадаць Смаленскую, Магілёўскую і Віцебскую губерні ў склад РСФСР. (Значная частка гэтай тэрыторыі не вернутая і дагэтуль.) Яшчэ праз некалькі дзён выкліканым у Маскву прадстаўнікам марыянеткавай беларускай дзяржавы давялося ад Леніна пра план злучэння «абрэзанай» БССР з таксама створанай бальшавікамі Літоўскай (Літоўскай) Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікай. Гэтае буфернае ўтварэнне, як раней і БССР, патрэбнае было Крамлю дзеля абароны перад пагрозаю вайны з Польшчай.

Сябры першага савецкага ўрада Беларусі Фабіян Шантыр, Усевалад Фальскі і Язэп Дыла былі арыштаваныя чэкістамі (Шантыра неўзабаве расстралялі), а старшыня ўраду Зміцер Жылуновіч пазбег арышту толькі дзякуючы ўцёкам з Менска.

Утварэнне і скон ЛітБела

У лютым 1919 г. адбылося аб'яднанне дзвюх савецкіх марыянеткавых дзяржаваў у Літоўска-Беларускую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку (ЛітБел) з сталіцай у Вільні. У склад ЛітБела ўваходзілі Віленская, Менская, Гарадзенская, часткі Ковенскай і Сувалкаўскай губерняў з насельніцтвам блізу 4 мільёнаў чалавек.

Фармальна такое ўтварэнне ішло ў межах гістарычнай пераемнасці, але насамрэч нічым не адпавядала інтарэсам народаў былога Вялікага Княства Літоўскага і найперш – беларусаў.

ЛітБел рэпрэзентаваў шырокую этнічную тэрыторыю. У гэтай «дзяржаве» нічога нацыянальна-беларускага не было – ні дзяржаўнай мовы, ні нармальных выданняў, ні прысутнасці ў кіраўнічых органах. Урад ЛітБела, які ўзначальваў літовец В. Міцкявічус-Капсукас, не меў у сваім складзе ніводнага беларуса. Усё беларускае, пачынаючы з мовы, лічылася контррэвалюцыйным. Літаратура выдавалася толькі па-літоўску, па-польску і па-расейску. Сялянства ў рэспубліцы, з выняткам беднаты, пазбаўлялася права голасу.

Начальнік адроджанай Польскай дзяржавы Язэп (Юзаф) Пілсудскі ў красавіку 1919 г. выдаў «Зварот да жыхароў былога Вялікага Княства Літоўскага», дзе дэкляраваў не ўмешвацца ў ўнутраныя нацыянальныя і рэлігійныя справы беларусаў і літоўцаў і даць ім права самім выбраць свой лёс. Пілсудскі нават сустракаўся з беларускімі лідэрамі і шчодра раздаваў абяцанні (аж да згоды стварыць беларуска-польскую федэрацыю). У верасні 1919 г. ён выступіў у Менску па-беларуску, якую добра ведаў, бо з паходжання быў ліцвінам-беларусам. Але, як паказалі далейшыя падзеі, пераважала палітыка польскіх шавіністаў, што не прызнавалі Беларусі.

Пазней, апынуўшыся ў складанай ваеннай сітуацыі, Ленін прапанаваў Польшчы ўсю тэрыторыю былога ЛітБела ўзамен на мір. Пілсудскі пайшоў на магчымае пагадненне і не падтрымаў наступу Дзянікіна на Маскву. Ён ратаваў бальшавікоў, каб потым падзяліць з імі беларускія і ўкраінскія землі.

31 ліпеня 1920 г. адбылося другое абвяшчэнне БССР. Узнаўляць буферны ЛітБел было ўжо немагчыма, бо рэальна існавала незалежная Летува. Каб перашкодзіць пераходу ўлады ў рукі нацыянальных сілаў у Беларусі, бальшавікі і пагадзіліся на аднаўленне БССР. Але гэтым разам яе тэрыторыя складалася толькі з шасці паветаў былой Менскай губерні агульнай плошчай усяго 52,4 тысячы квадратных кіламетраў. Якраз тады нарадзілася вядомая дасціпная прымаўка: «У Беларусі тры сталіцы – Менск, Лепель і Плешчаніцы».

ДАЧЫНЕННІ ПАМІЖ БНР І ЛЕТУВОЙ

Міністэрства беларускіх справаў у Летуве

Міністэрства беларускіх справаў у Летуве было ўтворанае ў адпаведнасці з дамовай паміж Віленскай беларускай радай і Летувіскай тарыбай у лістападзе 1918 г. Тады сама ў склад Тарыбы ўвайшлі шэсць прадстаўнікоў Рады, у тым ліку В. Ластоўскі, І. Луцкевіч, Я. Станкевіч.

Юрысдыкцыя міністэрства пашыралася на тэрыторыю былой Гарадзенскай губерні, Лідскі, Ашмянскі і Вілейскі паветы Віленскай і Аўгустоўскі павет Сувалкаўскай губерні. Гэты абшар плошчаю 40 тысяч квадратных кіламетраў і з насельніцтвам блізу 2 мільёнаў чалавек павінен быў мець статус аўтаномнай адзінкі з дзяржаўнай беларускай мовай.

Ва ўмовах нямецкай, а затым польскай акупацыі Беларусі дзейнасць Міністэрства беларускіх справаў, скіраваная на забеспячэнне нацыянальных інтарэсаў, была цалкам апраўданая. У яго кампетэнцыі знаходзіліся пытанні мясцовага самакіравання, прызначэнне школьных інспектараў, суддзяў, следчых ды іншых службоўцаў. Міністэрства накіравала сваіх камісараў у Горадню, Беласток, Бельск, Ліду, Алітава, Белавежу, Саколку і Крынкі. Яно афіцыйна пратэставала супроць уводзінаў на абшар Беларусі польскіх войскаў.

У снежні 1918 г. у Горадню з захопленай бальшавіцкімі войскамі Вільні пераехаў урад Беларускай Народнай Рэспублікі на чале з Антонам Луцкевічам. На пэўны час Горадня стала сталіцай БНР. Там размясцілася таксама створанае Міністэрства беларускіх справаў у Летуве. Першы гарадзенскі беларускі полк.

Міністр Язэп Варонка ў жніўні 1919 г. накіраваў краінам Антанты ноту пратэсту, дзе абгрунтоўваліся правы беларускага народа на тэрытарыяльную цэласць. Аднак усё больш моцнае праціўдзеянне польскіх акупацыйных уладаў прывяло да пераезду міністэрства ў Коўну (Каўнас). Пазней там апынуліся таксама Прэзідыум Рады і ўрад Беларускай Народнай Рэспублікі на чале з Вацлавам Ластоўскім.

У 1920–1930-х гадах у Коўне існаваў Беларускі цэнтр, кіраўніком якога пэўны час быў аўтарытэтны палітычны дзеяч Клаўдзь Дуж-Душэўскі. У тагачаснай сталіцы Летувы выходзіў літаратурна-навуковы і грамадскі часопіс «Крывіч», друкавалася іншая беларуская літаратура. Тут В. Ластоўскі выпусціў такія значныя выданні, як «Падручны расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік» і «Гісторыю беларускай (крыўскай) кнігі», якая ўяўляла сабой агляд больш як 1000 рукапісных кніг, грамат і стадрукаў «з пачатку зараджэння беларускага пісьма да XIX ст.»

ХРАНАЛОГІЯ

1919–1923 гг. – Дзейнасць Міністэрства беларускіх справаў у Летуве.
12 ліпеня 1920 г. – Падпісанне савецка-літоўскай мірнай дамовы.
[illegible]

[illegible]

[illegible]

Перадавочы Летуве Вільняўчыну і Гарадзеншчыну, расійскія бальшавікі палкам ігнаравалі абвешчаны імі ж самімі прынцып свабоднага самавызначэння нацый. Адпаведныя вершыні ўсенагульнага перапісу насельніцтва Расійскай імперыі 1897 г. сведчылі, што, да прыкладу, у Гарадзенскім павеце беларусы складалі 65,7%, летувісы – 1,4%, у Лідскім адпаведна 73,1 і 8,7%, у Ашмянскім – 79,5 і 3,7%.

[illegible] Беларускай Народнай Рэспублікі. 25 сакавіка 1919 г.

Беларуска-летувіскія супярэчнасці

Кіраўніцтва Беларускай Народнай Рэспублікі ад самага пачатку нераз сутыкалася з прэтэнзіямі Летувы на велізарную частку нашага этнічнага абшару. У адказ на заявы ўрада БНР, што Вільня – адвечная сталіца Беларусі, яе палітычны і духоўны цэнтр, летувісы запатрабавалі Гарадзенскую і Віленскую губерні, якія былі большымі за тэрыторыю ўсёй Летувы. Яе ўрад прызнаваў, што на згаданым абшары, у прыватнасці ў Вільні і Віленскім краі, абсалютная большыня насельніцтва не лічыць сябе летувісамі і не ведае летувіскай мовы, але безапеляцыйна сцвярджаў, што гэта – збеларушаная частка Летувіскай дзяржавы.

[illegible]

[illegible]

Новай прычынай абвастрэння стасункаў сталася падпісанне ў ліпені 1920 г. савецка-летувіскай мірнай дамовы, у якой РСФСР прызнавала незалежнасць Летувы. Паводле дададзенай да тэксту гэтага дакумента карты дзяржаўная мяжа Летувы падыходзіла да Валожына, Мядзела, Вілейкі і Маладзечна. На летувіскім баку заставаліся Нарач і Браслаўскія азёры. Аднак летувіская дэлегацыя на перамовах (беларускі бок да ўдзелу ў іх быў наогул адхілены) настойвала на ўлучэнні ў склад сваёй дзяржавы значна большай тэрыторыі – не толькі Віленскай і Гарадзенскай губерняў, але і часткі Менскай.

[illegible]

[illegible] 1930-я гады

Кіраўніцтва БНР 22 ліпеня 1920 г. накіравала ўрадам РСФСР і Летувы, а таксама мірнай канферэнцыі ў Парыжы, «усім дзяржавам і культурным народам свету» ноту пратэсту. «Умовы гэтага міру, – падкрэслівалася ў ёй, – парушаюць самым грубым чынам нацыянальныя, культурна-эканамічныя і суверэнныя правы беларускага народа, бо гэты мір заключаны за кошт гістарычных і этнаграфічных беларускіх земляў з гарадамі Горадняй і Вільняй». Савецкая Расея не адказала на ноту, што давала падставы пэўным сілам у Летуве ўжо ў 1990-х гадах раз-пораз друкаваць карту 1920 г. і ўзгадваць старыя прэтэнзіі.

[illegible]

Пасля падпісання савецка-летувіскай мірнай дамовы стаўленне да беларускіх структураў у Летуве рэзка змянілася. Летувісы ўрад ліквідаваў асобныя беларускія вайсковыя часціны. Міністэрства беларускіх справаў урэшце мусіла спыніць сваё існаванне. У 1923 г. Рада Беларускай Народнай Рэспублікі пераехала з Коўна ў Прагу.

СЯРЭДНЯЯ ЛІТВА

Палітычная сітуацыя

У 1918–1919 гг. савецкая Расея адмоўна ставілася да стварэння летувісамі сваёй дзяржавы. Аднак пасля акупацыі палякамі ЛітБела сітуацыя змянілася, бо Летува рабілася хаўруснікам бальшавікоў у змаганні з Польшчай. Прызнаўшы ў ліпені 1920 г. незалежнасць Летувы, Масква, па сутнасці, падтрымала яе прэтэнзіі на Віленскі край разам з гарадамі Горадняй, Шчучынам, Лідай, Ашмянай, Смаргонню і Браславам. Летувісам была перададзена захопленая Чырвонай арміяй Вільня.

Адначасова на гэтыя тэрыторыі, а потым і на саму этнічную Летуву прэтэндаваў польскі бок. Пад ціскам краінаў Антанты ў кастрычніку 1920 г. Польшча мусіла пайсці на падпісанне дамовы, паводле якой Віленшчына пераходзіла Летуве. Але начальнік Польскай дзяржавы народжаны Віленскага краю Юзэф Пілсудскі не пагадзіўся на перадачу сваёй «малой радзімы» суседзям.

У сваіх палітычных мэтах бальшавікі падтрымлівалі прэтэнзіі Летувы на Віленшчыну, а пасля на Гародню, Ліду, Браслаў ды іншыя беларускія гарады.

ХРАНАЛОГІЯ

7 кастрычніка 1920 г. – Падпісанне польска-летувіскай дамовы аб перадачы Віленшчыны Летуве.

9 кастрычніка 1920 г. – Пачатак «паўстання» Літоўска-беларускай дывізіі генерала Л. Жалігоўскага.

12 кастрычніка 1920 г. – Абвяшчэнне незалежнасці Сярэдняй Літвы.

20 лютага 1922 г. – Сейм Сярэдняй Літвы прыняў пастанову пра далучэнне да Польшчы.

«Паўстанне» дывізіі Жалігоўскага

У той няпэўнай палітычнай сітуацыі Варшава, звязаная абавязкамі перад Антантай, вырашыла разыграць «беларускую карту». Стаўка рабілася на так званых «літоўска-беларускія» дывізіі Польскага войска, што складаліся пераважна з беларусаў заходняй часткі нашай краіны, сярод якіх былі жывыя традыцыі ліцвінскага патрыятызму. Ужо назаўтра пасля падпісання польска-летувіскай дамовы супроць яе ўмоваў «узбунтавалася» Першая літоўска-беларуская дывізія генерала Люцыяна Жалігоўскага.

А. Жалігоўскі нарадзіўся ў 1865 г. у Ашмяне. Быў удзельнікам расейска-японскай вайны, камандаваў палком у Першую сусветную. У 1918–1919 гг. ён ваяваў з бальшавікамі ў складзе польскага корпуса Доўбар-Мусніцкага і Добраахвотніцкай арміі Дзянікіна, а затым яго дывізія далучылася да Польскага войска.

Падначаленыя Жалігоўскаму вайсковыя часткі занялі Вільню і рушылі на Коўна. Яны занялі Кейданы (цяперашні Кедайняй) і былі спыненыя летувісамі толькі ў раёне Шырвінтаса. Польшча заявіла міжнароднай супольнасці, што адбываецца беларуска-летувіскі канфлікт, да якога яна не мае дачынення.

Пры пасярэдніцтве Лігі Нацыяў бакі падпісалі замірэнне. 12 кастрычніка 1920 г. Віленшчына была абвешчаная незалежнай дзяржавай пад назвай Сярэдняя Літва, а яе фактычным кіраўніком стаў Л. Жалігоўскі.

Дывізія Жалігоўскага складалася з Віленскага, Гарадзенскага, Менскага і Сувалкаўскага палкоў. Перад самым «бунтам» Пілсудскі загадаў перадаць гэтай дывізіі яшчэ Лідскі і Ковенскі палкі.

Прамежкавая дзяржава

Сярэдняя Літва займала тэрыторыю больш 37 тысяч квадратных кіламетраў. Апрача сталічнай Вільні найбольшымі буйнымі яе гарадамі былі Ашмяны, Смаргонь і Трокі (Горадню і Ліду Пілсудскі [illegible] далучыць да Польшчы). Сярэдняя Літва мела 530 тысяч насельніцтва. Паводле афіцыйных звестак, беларусаў было тут 40%, але насамрэч — значна болей.

Функцыі дзяржаўнай улады выконвала прызначаная Жалігоўскім Часовая кіруючая камісія на чале з В. Абрамовічам. Яна складалася з «краёўцаў» — прыхільнікаў аўтаноміі Літвы-Беларусі, якія на першае месца ставілі мясцовыя (краёвыя) інтарэсы. Яны не пагаджаліся на інкарпарацыю Сярэдняй Літвы Польшчай і выступалі за федэрацыйную сувязь з Летувой.

Часовая камісія стварыла самастойную судовую сістэму. Краіна мела свае гербы, сімволіку, паштовыя маркі, на якіх змяшчаліся герб «Пагоня», выявы архітэктурных помнікаў Віленшчыны, партрэты гістарычных і культурных дзеячаў, у тым ліку вялікага князя і караля Ягайлы, Тадэвуша Касцюшкі, Адама Міцкевіча.

На тэрыторыі краіны налічвалася некалькі сотняў прамысловых прадпрыемстваў. Улады распрацавалі праекты электрыфікацыі і правядзення зямельнай рэформы.

Асабіста Жалігоўскі заўжды прыхільна ставіўся да беларускай справы, што забяспечвала яму падтрымку Найвышэйшай рады БНР. Ліберальная нацыянальная палітыка Часовай камісіі стварыла спрыяльныя ўмовы для развіцця беларускамоўнай адукацыі. Увосень 1921 г. у Сярэдняй Літве дзейнічала 186 беларускіх школаў, Віленская беларуская гімназія і Барунская настаўніцкая семінарыя. Беларускім сектарам урадавага дэпартамента асветы кіраваў вядомы палітык і культурны дзеяч Браніслаў Тарашкевіч. Ва ўрад увайшоў таксама Вацлаў Іваноўскі, прызначаны «дырэктарам аправізацыі» (адказным за харчовае забеспячэнне краіны).

У Сярэдняй Літве рэпрэсіравалі дзейнасць беларускіх арганізацый. [illegible] Беларускі нацыянальны камітэт у Вільні. Некаторыя прапаноўвалі стварыць дзяржаву «Заходняя Беларусь», але [illegible] польскія [illegible].

[illegible] Пілсудскага [illegible] войска Сярэдняй Літвы ўвайшлі ў склад Польскай арміі, што было [illegible] і Жалігоўскі пакінуў Вільню.

У красавіку 1921 г. у Брусэлі пад эгідай Лігі Нацый адбылася польска-літоўская канферэнцыя, прысвечаная лёсу Сярэдняй Літвы. Рада БНР і ўрад Вацлава Ластоўскага накіравалі старшыні канферэнцыі ліст, дзе падкрэслівалі, што [illegible] Беларускага Ураду».

Далучэнне да Польшчы

Палітычная і эканамічная залежнасць ад Польшчы абумовіла надалейшы гістарычны лёс Сярэдняй Літвы. Польскі ўрад усё больш настойліва патрабаваў ад Жалігоўскага неўхільнага выканання дырэктываў Варшавы. Быў карэнна зменены склад Часовай кіруючай камісіі.

Пытанне палітычнай прыналежнасці краіны канчаткова павінен быў вырашыць Сойм Сярэдняй Літвы. Аднак супраць выбараў у Сойм выступіла Ліга Нацый, якая прыняла пастанову правесці ў Сярэдняй Літве плебісцыт. Дзеля забеспячэння парадку на яе тэрыторыі прадугледжвалася ўвесці замежныя войскі. Рашуча пярэчылі гэтым планам Расія і Летува, якая разарвала з Польшчай дыпламатычныя дачыненні і фактычна знаходзілася з ёю ў стане вайны.

Не падтрымлівалі правядзенне плебісцыту і ўрад Беларускай Народнай Рэспублікі. У меморандуме дэлегацыі БНР Лізе Нацый ад 18 снежня 1920 г. падкрэслівалася, што значная частка беларускага жыхарства пад час нямецкай акупацыі пакінула гэтыя землі і яшчэ не вярнулася. Таксама звярталася ўвага на тое, што беларусы пад ціскам польскай адміністрацыі, болей, не змогуць «праўдзіва выказаць сваю волю».

Працяглыя спрэчкі і перамовы вакол будучыні Сярэдняй Літвы скончыліся тым, што пад ціскам Польшчы ў студзені 1922 г. там усё ж прайшлі выбары ў Сойм. Беларускі нацыянальны камітэт і большая частка беларускага насельніцтва байкатавалі галасаванне.

Беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў сумесна з іншымі антыпольскімі сіламі рыхтавала збройнае паўстанне, але гэтыя планы былі раскрыты дэфензівай.

Як і чакалася, абраны Сойм Сярэдняй Літвы пастанавіў, што «Віленскі край без усякіх умоваў і агаворак робіцца неадлучнай часткай Польшчы». 24 сакавіка 1922 г. польскі Сейм пацвердзіў гэтую пастанову. Сярэднюю Літву пераўтварылі ў Віленскае ваяводства Польшчы, дзе ўсё адно палову былі насельніцтва беларусамі.

У савецкія часы існаванне Сярэдняй Літвы ў падручніках амаль замоўчвалася. [illegible] у Беларусі [illegible] ні ўніверсітэцкіх падручніках. [illegible]

СТАЛІЦА ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

[illegible]

Савецка-польская вайна 1920 г. завяршылася падпісаннем без удзелу беларускіх палітыкаў (іх не дапусцілі на перамовы) Рыжскім мірным трактатам 1921 г. Паводле яго вялікарная частка нашай краіны была далучаная да Польшчы. Гэтыя землі атрымалі назву «Заходняя Беларусь». Дзяржаўная мяжа прайшла зусім побач з Полацкам, Менскам і Слуцкам. (У пэўны момант бальшавікі былі згодныя аддаць палякам усю Беларусь, але на гэта не пагадзілася польская дэлегацыя. Пераважыла меркаванне, што гэтак шмат "праглынуць" не ўдасца.)

Неафіцыйнай палітычнай, культурнай і навуковай сталіцай адрэзаных земляў стала Вільня, якую называлі «сэрцам Заходняй Беларусі».

Беларускі нацыянальны камітэт да 1938 г. каардынаваў дзейнасць заходнебеларускіх грамадскіх арганізацый і ўстаноў. У Вільні знаходзіліся кіраўнічыя органы Беларускай партыі эсэраў, Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі, Беларускай хрысціянскай дэмакратыі (БХД), Беларускай сялянска-работніцкай грамады (БСРГ), Беларускага сялянскага саюза, Таварыства беларускай школы... Нейкі час у Вільні нелегальна працаваў ЦК Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі.

Заходняя Беларусь складалася з 29 паветаў, якія ўваходзілі ў Беластоцкае, Віленскае, Навагрудскае і Палескае ваяводствы. Край меў плошчу 113 тысяч квадратных кіламетраў і насельніцтва больш за 3,5 мільёна чалавек (1921 г.). Найбуйнейшымі гарадамі былі Вільня, Горадня, Беласток, Навагрудак, Пінск, Баранавічы, Ліда, Слонім.

Былая сталіца Вялікага Княства зрабілася найбуйнейшым цэнтрам беларускага друку. Тут дзейнічалі заснаванае яшчэ ў 1913 г. Беларускае выдавецкае таварыства, а таксама выдавецтвы Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры, Беларускага сялянска-работніцкага клуба, Таварыства беларускай школы, выдавецтва У. Знамяроўскага...

[illegible]

[illegible]

[illegible]

ХРАНАЛОГІЯ

[illegible]

У Вільні выходзілі дзясяткі перыядычных выданняў рознастайных кірункаў. Адна толькі БСРГ выпускала газеты «Жывым беларусам», «Беларускі звон», «Беларуская крыніца», «Беларуская ніва», «Беларуская справа», «Наш голас», «Наша справа», «Народны звон», «Народная справа», часопіс «Маланка» ды іншыя перыёдыкі. З мэтаю пашырэння хрысціянскага веравучэння і беларускай ідэі царкоўныя арганізацыі розных канфесій выдавалі газеты і часопісы «Беларуская зарніца», «Праваслаўны беларус», «Студэнцкая думка», «Светач Беларусі», «Хрысціянская думка». Вялікую чытацкую аўдыторыю меў створаны БХД часопіс «Калосьсе». Дзякуючы дачыненай хрысціянскімі дэмакратамі Віленскай друкарні імя Францішка Скарыны чытачы рэгулярна атрымлівалі навуковую, грамадска-палітычную, мастацкую і рэлігійную літаратуру, а таксама папулярны часопіс «Шлях моладзі». Паводле статыстычных звестак, падрыхтаваных Віленскім універсітэтам у 1928 г., па колькасці і накладах перыядычных выданняў у Вільні другое месца (следам за палякамі, якім належала ўлада) займалі беларусы. На трэцім месцы быў габрэйскі друк, на чацвёртым – расійскі і на пятым – літоўскі.

Шматстайным было літаратурна-мастацкае і навуковае жыццё горада. У Вільні дзейнічалі Беларускі народны тэатр ды яшчэ некалькі тэатральных калектываў. Асабліва шмат для папулярызацыі нацыянальнага тэатра зрабіла Беларуская драматычная майстроўня. У 1927 г. маладыя літаратары і мастакі Заходняй Беларусі заснавалі сваю арганізацыю «Бeсiaхoд». Тысячы наведнікаў штомесяц прымаў Беларускі музей імя Івана Луцкевіча. Беларускае навуковае таварыства адзначыла 400-я ўгодкі беларускага кнігадрукавання ў Вільні і Статута Вялікага Княства Літоўскага 1529 г.

[illegible]

У 1920-я – 1930-я гады ў Вільні жылі і працавалі вядомыя дзеячы нашага нацыянальнага Адраджэння, культуры і навукі: Антон Луцкевіч, Браніслаў Тарашкевіч, Уладзімір Самойла, Адам Станкевіч, Ігнат Дварчанін, Рыгор Шырма, Язэп Дыла, Францішак Аляхновіч, Максім Танк, Пятро Сергіевіч...

[illegible]

Урок роднай літаратуры ў Віленскай беларускай гімназіі. 1930-я гады



Паралельна з дзейнасцю беларусаў летувіская прысутнасць у тагачаснай Вільні адчувалася значна слабей. Іначай і не магло быць, бо летувісы складалі тут усяго 1,5% насельніцтва.

Выключная роля ў нацыянальнай адукацыі належала Віленскай беларускай гімназіі, якая была заснавана Іванам Луцкевічам і ягонымі паплечнікамі і дзейнічала ў 1919–1944 гг. У розны час у ёй працавалі Адам Станкевіч, Браніслаў Тарашкевіч, Максім Гарэцкі, Антон Луцкевіч, Аркадзь Смоліч, Рыгор Шырма, Барыс Кіт, Антон Грыневіч, Язэп Драздовіч, Антон Неканда-Трэпка, Францішак Грышкевіч ды іншыя выдатныя вучоныя, літаратары, педагогі. З гімназіі пачалі свой творчы і грамадскі шлях паэты Натальля Арсеньева (аўтарка беларускага рэлігійнага гімну «Магутны Божа»), Хведар Ільляшэвіч, Алесь Салагуб, Валянцін Таўлай, пісьменнік Кастусь Акула, мастак Пётра Сергіевіч, навуковец, старшыня Рады БНР Вінцук Жук-Грышкевіч. Тут вучыліся вучоны-скарыназнавец, дырэктар Беларускага інстытута навукі і мастацтва ў Нью-Ёрку Вітаўт Тумаш, гісторык, аўтар папулярнай кнігі «Беларусь учора і сяньня» Язэп Найдзюк, журналіст і педагог Янка Багдановіч, гісторык і выдавец Вацлаў Пануцэвіч, публіцыст і грамадскі дзеяч Лявон Луцкевіч... Нездарма Віленскую беларускую гімназію называюць нашым нацыянальным універсітэтам.

«Муры старой, каханай Вільні» апяваў паэт Уладзімір Жылка. Свае творы прысвячалі ёй Натальля Арсеньева, Казімір Сваяк, Максім Танк, Вінцук Адважны, дзясяткі іншых беларускіх літаратараў.

Ты, Вільня, мяне ўзгадавала,
Тут сонца я ўбачыла свет!.. –

з удзячнасцю пісаў Францішак Аляхновіч. А Міхась Козыр (Кастусь Акула) у адным з сваіх вершаў падкрэсліваў старажытную крывіцкую гісторыю нашай даўнейшай сталіцы:

Прывітанне табе, Вільня!
Слаўны горад Крывічоў –
Месца памятак магільных
Нашых прадзедаў, дзядоў.

У той час на Віленскім радыё працаваў паэт, будучы нобелеўскі лаўрэат Чэслаў Мілаш, які сімпатызаваў беларусам. Дзякуючы гэтаму ў эфіры гучалі нашы песні, лекцыі на беларускую тэматыку.

Актыўнасць беларускага жыцця ў Вільні не азначала, што яно не сутыкалася з перашкодамі. Наадварот, польскія ўлады ўвесь час рабілі захады, каб абмежаваць, а ў перспектыве і знішчыць беларускі нацыянальны рух. Да прыкладу, з палітычных прычынаў нераз праводзілі звальненні выкладчыкаў Віленскай беларускай гімназіі. Як «недастаткова кваліфікаваны» быў пазбаўлены права выкладаць беларускую літаратуру выдатны публіцыст і літаратурны крытык Антон Луцкевіч. У сумна вядомай віленскай турме Лукішкі прайшлі загартоўку Максім Танк, Піліп Пестрак, Валянцін Таўлай, Міхась Машара ды іншыя заходнебеларускія пісьменнікі. Рэпрэсіі зазналі тысячы актывістаў палітычных партыяў і грамадскіх арганізацый. Тым не менш у гэты перыяд Вільня зрабіла велізарны ўнёсак у беларускую справу, у захаванне нацыянальнай ідэі, мовы і культуры народа.

У Заходняй, як і ў савецкай Беларусі, лічылася ўпэўненасць, што пасля аб'яднання Бацькаўшчыны Вільня абавязкова будзе ў яе складзе.

Ліга Нацыяў фактычна прызнала адыход Віленшчыны з Вільняй да заходнебеларускага абшару. У незалежнай Летуве з сталіцаю ў Коўне шмат хто ўспрымаў гэта як незваротную страту. У 1930-х гадах у летувіскім друку гучалі прапановы памяняць назву дзяржавы на Жамойція, а герб «Пагоня» – на жамойцкага «Мядзведзя». Такія публікацыі адлюстроўвалі не толькі настроі ў грамадстве, але і пазіцыю ўрадавых колаў. Тагачасны прэм'ер-міністр Летувы Ёнас Тубяліс у 1935 г. афіцыйна заявіў пра славянскае паходжанне «Пагоні» і падрыхтоўку новага герба.

Такім чынам, страціўшы Вільню, летувісы гатовыя былі адмовіцца і ад прэтэнзіяў на гістарычную спадчыну Вялікага Княства Літоўскага. Аднак падзеі пачатку Другой сусветнай вайны прынеслі ім нечаканы падарунак з Масквы.

СТРАТА ВІЛЬНІ І ВІЛЕНСКАГА КРАЮ

«Вызваленчы паход» у Заходнюю Беларусь

Бальшавікі СССР 23 жніўня 1939 г. падпісалі з нацысцкай Нямеччынай дамову аб ненападзе, вядомую ў гісторыі па прозвішчах кіраўнікоў замежнапалітычных ведамстваў дзвюх дзяржаў як пакт Молатава–Рыбентропа. Да пакта быў прыкладзены дадатковы сакрэтны пратакол, у якім Сталін і Гітлер дзялілі Польскую дзяржаву на сферы ўплыву. Мяжа павінна была прайсці прыкладна па рэках Нараў, Буг, Вісла і Сан. Летува пакідалася гітлераўцам. У сакрэтным пратаколе адзначалася, што Савецкі Саюз і Нямеччына прызнаюць прэтэнзіі Летувы на Віленскі край. Абодва бакі планавалі выкарыстаць сітуацыю ва ўласных мэтах.

Першай на Польшчу 1 верасня 1939 г. напала Нямеччына. У той час калі палякі абаранялі Варшаву, свае войскі рушыў на захад Сталін. Савецкая прапаганда абвясціла гэта «вызваленчым паходам» на дапамогу заходнім беларусам і ўкраінцам.

ХРАНАЛОГІЯ

23 жніўня 1939 г. – [illegible]

1 верасня 1939 г. – [illegible]

17 верасня 1939 г. – [illegible]

19 верасня 1939 г. – [illegible]

28 верасня 1939 г. – [illegible]

10 кастрычніка 1939 г. – [illegible]

28 кастрычніка 1939 г. – [illegible]

Адрэагаваўшы на гэтыя падзеі, газета «Нью-Ёрк Таймс» ў нумары за 18 верасня 1939 г. назвала нацыстаў «карычневымі камуністамі», а камуністаў «чырвонымі фашыстамі» і пісала, што свет хутка зразумее: у яго ёсць толькі адзін выбар – паміж дэмакратыяй, свабодай і мірам, з аднаго боку, і дэспатызмам, тэрорам і вайной – з іншага.

Аднак сёй-той з беларусаў верыў, што надышоў час вызвалення і далучэння да свабоднай і незалежнай Беларусі. Былі выпадкі, калі пад кіраўніцтвам мясцовых камуністаў жыхары сустракалі чырвонаармейцаў хлебам-соллю і кветкамі. Але большасць насцярожана чакала далейшых падзей.

Пры канцы кастрычніка Народны (Нацыянальны) сход у Беластоку, на які былі сабраны падабраныя дэпутаты, аднагалосна прагаласаваў за абвяшчэнне ў Заходняй Беларусі савецкай улады. Далучаны абшар стаў часткаю БССР. Тут стварыліся пяць новых абласцей – Баранавіцкая, Беластоцкая, Берасцейская, Вілейская і Пінская.

Задзіночанне ў межах адной рэспублікі адпавядала нацыянальным інтарэсам беларусаў і рабіла больш выразнай нашу гістарычную перспектыву. Але за гэта была заплачаная вельмі дарагая цана. Неўзабаве ў былой Заходняй Беларусі пачаліся масавыя дэпартацыі і фізічнае вынішчэнне «антысавецкіх элементаў». Адбывалася рабаванне эканамічнага і культурнага багацця краю. Новая ўлада рэзка абмежавала правы рэлігійных супольнасцяў. У адукацыі хутка быў узяты курс на русіфікацыю. Захоўвалася нават старая савецка-польская мяжа з заставамі, што дало некаторым гісторыкам падставы параўнаць гэты абшар з велізарным канцлагерам.

Апрача таго, па-за межамі БССР засталіся вялікія тэрыторыі з беларускім насельніцтвам. Крывадушная палітыка Крамля красамоўна выявілася ў гісторыі Вільні і Віленшчыны.

Касцёлы святой Ганны і бернардзінцаў у Вільні. Фота Яна Булгака. Пачатак XX ст.

На трэці дзень «вызваленчага паходу», 19 верасня 1939 г., часціны Чырвонай арміі ўвайшлі ў Вільню. У зводцы Генштаба за гэты дзень паведамлялася: «На поўначы – у Заходняй Беларусі – пасля двухгадзіннага бою нашыя войскі занялі Вільню».

Вільня зноў беларуская

Заходнія беларусы лічылі Вільню сваім бясспрэчным духоўным і культурным цэнтрам. У беларускім савецкім грамадстве таксама існавала перакананасць у непарыўнасці лёсаў Вільні і Беларусі. Нацыянальныя колы былі ўпэўненыя, што горад нарэшце апынецца ў складзе беларускай рэспублікі. Узбуйнення не тэрыторыі за кошт Віленшчыны чакалі ў БССР і камуністы. Так больш Камінтэрн у свой час заяўляў, што Заходняя Беларусь улучае ў сябе Вільню і Віленскі край.

15 верасня 1939 г. адбылося пасяджэнне НКВД БССР, дзе Вільня таксама разглядалася як «частка былых польскіх земляў, якія трэба далучыць да Беларускай ССР». (НКВД, відома, вырашаў уласную задачу – «ізаляцыю» заходнебеларускіх «ворагаў савецкай улады».)

ВІЛЕНСКАЯ ПРАЎДА

Да 22 верасня 1939 г. у Вільні выходзіла газета «Віленская праўда» [illegible] Антон Луцкевіч. [illegible] беларускай газеты.

Касцёл над ракой Вільняй. Гравюра Міхала Сяргуна. 1937 г.

Цэнтральныя маскоўскія газеты ў другой палове верасня выйшлі пад загалоўкамі «Вільня – зноў беларуская!» У савецкіх выданнях, прычым не толькі ў БССР, друкаваліся артыкулы, дзе даводзіліся гістарычныя правы Беларусі на Вільню і тлумачылася, што Вялікае Княства Літоўскае было беларускай дзяржавай.

24 верасня ў актавай зале Віленскай беларускай гімназіі адбылася афіцыйная ўрачыстасць з нагоды далучэння Вільні да Беларусі «на векі вякоў». Пра гэта казалі ў сваіх выступах і тагачасны загадчык аддзела прапаганды ЦК КП(б)Б Іван Клімаў, які ўзначальваў савецкую адміністрацыю Заходняй Беларусі, і віленскія беларускія дзеячы на чале з былым прэм'ерам урада БНР Антонам Луцкевічам. Ён, у прыватнасці, заявіў: «Беларусь зноў стала адзінай... Вялікая праца перад намі, праца дзеля адбудовы ўсяго таго, што гадамі паланілася і нішчылася польскімі панамі. Утварэнне адзінай вольнай савецкай Беларусі адкрывае для беларускай культуры шлях да хуткага развіцця пазітыўнага».

Замкавая гара і вежа Гедыміна ў Вільні. Паштоўка 1910 г.

[illegible] беларускаму гораду Вільні? Фота [illegible]. 2003 г.



[illegible] Фота Яна Булгака. 1926 г.

Віленскай і Віленшчынай у тыя тыдні кіравалі пасланцы з Менска. Была створана Віленская вобласць. Беларускую мову прызналі афіцыйнай. На ёй, як і ў іншых абласных цэнтрах рэспублікі, пачала выходзіць газета «Віленская праўда», якая з нумара ў нумар змяшчала матэрыялы аб гістарычным праве беларускага народа на Вільню і Віленскі край. У Вільні знаходзілася і рэдакцыя галоўнай савецкай газеты для Заходняй Беларусі – «Свабодная Беларусь». Адчыняліся беларускія школы і арганізацыі. У беларускую гімназію, якая існавала і за польскім часам, паступілі тысячы заяваў. Каб задаволіць іх, арганізавалі дзесяць паралельных класаў. Але і гэтага было мала, і таму ўлады пастанавілі адчыніць у Вільні Другую беларускую гімназію. Былі створаныя курсы для падрыхтоўкі настаўнікаў беларускай мовы ў вясковых школах.

У Свянцянах (цяпер Швянчоніс у Летуве), Эйшышках (цяпер Эйшышкіс) ды іншых гарадах і мястэчках адбываліся мітынгі, дзе прымаліся рэзалюцыі пра ўваходжанне ў склад БССР. Самы вялікі на ўсёй Заходняй Беларусі мітынг прайшоў у Вільні. На Лукішскім плошчы сабраліся 75 тысяч гараджанаў – трэціна ўсяго насельніцтва. У рэзалюцыі мітынгу, на якім сярод іншых выступаў і А. Луцкевіч, гаварылася, што працоўныя Вільні галасуюць за ўваходжанне ў склад Беларускай ССР.

Аднак горад заставаўся ў Беларусі ўсяго сорак дзён.

На Віленшчыне пачалася падрыхтоўка да выбараў у беларускі «парламент» – Народны сход. З таго часу захаваліся [illegible]. Энтузіязм віленскіх беларусаў нарадзіў шмат чутак пра перанясенне з Менска ў Вільню сталіцы БССР.

[illegible] Свята-Троіцкага манастыра [illegible] Беларуская гімназія. Фота [illegible]. 1930-я гады.

Berliner Illustrirte Zeitung

Планы Масквы і Берліна

Падзеі верасня 1939 г. прывялі СССР і Нямеччыну да неабходнасці ўдакладнення ранейшых намераў. Войскі вермахта захапілі на ўсход ад Варшавы вялікую этнічна польскую тэрыторыю, якая паводле пакта Молатава–Рыбентропа належала да савецкай «зоны ўплыву». Сталін і яговае акружэнне пагадзіліся з гэтым, убачыўшы сваю выгаду. Акупацыя цэнтральнай Польшчы Чырвонай арміяй не дазваляла б маскаваць захопніцкую акцыю пад «вызваленчы паход» і хавала ў сабе небяспеку, што хаўруснікі Польшчы – Англія і Францыя – абвесцяць вайну не толькі Нямеччыне, але і Савецкаму Саюзу.

28 верасня Масква і Берлін падпісалі новы сакрэтны пратакол. Немцам павінны былі пакінуць захопленыя імі Берасцейскую фартэцу (Брэсцкую крэпасць) і Берасце (на яго цэнтральнай плошчы за некалькі дзён да гэтага адбыўся сумесны парад савецкіх і гітлераўскіх войскаў). СССР адмаўляўся на карысць немцаў ад цэнтральнапольскіх земляў, але наўзамен атрымаў Летуву.

У пакуль яшчэ незалежнай Летуве з вялізарнай увагаю сачылі за падзеямі. На самым пачатку Другой сусветнай вайны там не пагадзіліся з прапановай немцаў – Вільня ў абмен на дапамогу ў баявых дзеяннях на тэрыторыі Польшчы. Супраць былі б Брытанія і Францыя, а магчыма, і Савецкі Саюз. Як піша сучасны амерыканскі гісторык Цімаці Снайдэр, летувіскі ўрад «разлічваў, што ў кароткатэрміновай перспектыве нямецкая ўлада будзе горшая за савецкую, у сярэднетэрміновай – што СССР выйдзе пераможцам у будучай вайне з Нямеччынай, а ў доўгатэрміновай – што калі за Вільню давядзецца заплаціць незалежнасцю, то лепей падпісаць гэткае пагадненне з Савецкім Саюзам».

Як толькі чырвонаармейцы заанялі Вільню, летувіскія дыпламаты ў Маскве звярнуліся да савецкіх уладаў з просьбай перадаць горад Летуве. Тады ад звароту проста адмахнуліся, але сітуацыя імкліва мянялася. 3 кастрычніка летувіскі міністр замежных справаў Юзас Урбшыс даведаўся пра змену сфераў уплыву і пра тое, што за Вільню трэба будзе расплочвацца прысутнасцю 20-тысячнага кантынгенту савецкіх войскаў у Летуве. Масква нават не палічыла патрэбным паведаміць пра гэта ў Менск, што лішні раз падкрэслівае марыянетачны характар так званай беларускай савецкай дзяржавы.

10 кастрычніка 1939 г. СССР і Летува падпісалі пагадненне, згодна з якім Віленшчына перадавалася Летуве. У Менску яшчэ нічога не ведалі. У той самы дзень газета «Звязда» апублікавала дзве карэспандэнцыі з Вільні. У адной з іх паведамлялася, як віленчукі рыхтуюцца да выбараў дэпутатаў у Народны сход Заходняй Беларусі. Адметна, што савецка-летувіская дамова пра Віленшчыну не публікавалася, пакуль Вярхоўны Савет СССР не задаволіў «просьбу» Народнага сходу ў Беластоку пра далучэнне «вызваленых земляў» да БССР.

Наркам замежных справаў СССР В. Молатаў даў наступнае тлумачэнне: «Мы ведаем, што большасць насельніцтва гэтага рэгіёну – не летувісы. Але гістарычнае мінулае і памкненні летувіскага народа цесна звязаныя з горадам Вільня, і ўрад СССР палічыў за неабходнае пайсці насустрач гэтым маральным фактарам». Зразумела, што насамрэч ні пра якую мараль гаворкі не ішло. СССР атрымаў за свае «дабрадзействы» права размясціць у Летуве савецкія вайсковыя базы, а ўлетку 1940 г. захапіў усю краіну разам з двума іншымі балтыйскімі рэспублікамі – Латвіяй і Эстоніяй.

Каб знізіць незадаволенасць ужо акупаванай Летувы, савецкі ўрад зрабіў новы «жэст» – перадаў ёй у лістападзе 1940 г. яшчэ 2,6 тысячы квадратных кіламетраў памежнай тэрыторыі БССР. З прымежнымі, населенымі пераважна беларусамі землямі ад нашай рэспублікі былі адарваныя гарады Свянцяны (цяпер Швянчоніс), Салечнікі (цяпер Шальчынінкай) і славуты курорт Друскенікі (цяпер Друскінінкай).

1 лістапада 1939 г. беларусы даведаліся, што Масква адарвала ад Беларусі і перадала Летуве 7120 квадратных кіламетраў з 457000 жыхароў – Віленшчыну разам з Вільняй.

Расправа з беларускай інтэлігенцыяй

Чыстка Вільні ад «антысавецкіх элементаў» распачалася адразу ж пасля заняцця горада Чырвонай арміяй. За справу ўзяўся энкавэдыст у складзе Беларусі было дэпартавана каля 1000 віленчукоў. Як толькі СССР і Летува падпісалі дамову аб перадачы Віленшчыны, савецкая адміністрацыя рэзка змяніла стаўленне да віленскіх беларускіх дзеячоў, якія раней мерkавалі выкарыстоўваць на пасадах у Віленскім Нацыянальным савеце. Іван Клімаў мог загад арыштоўваць іх у адпаведнасці з складзеным у НКВД спісам. У ліку іншых былі схопленыя вядомы публіцыст і вучоны Уладзімір Самойла, аўтар нацыянальнага гімну «Мы выйдзем шчыльнымі радамі» Макар Краўцоў (Касцевіч), рэдактар газеты хрысціянскіх дэмакратаў «Беларуская крыніца» Янка Пазьняк (дзед Зянона Пазьняка), беларускі сенатар Вячаслаў Багдановіч, адзін з кіраўнікоў Слуцкага паўстання Сяргей Бусел, сябры Беларускага навуковага таварыства Вінцук Жук-Грышкевіч і Антон Неканда-Трэпка. Неўзабаве большасць з іх загінулі.

Трагічны лёс чакаў і лідара беларускага руху ў Вільні Антона Луцкевіча. Колішні прыхільнік адраджэння Вялікага Княства Літоўскага і адзін з стваральнікаў БНР ведаў, што такое сталінская дыктатура, але дзеля выратавання беларускай справы і нацыянальнай інтэлігенцыі спрабаваў шукаць кампраміс з бальшавікамі. Усё было марна: Луцкевіча таемна схапілі і адправілі ў мінскую турму. Праз два з паловаю гады жыццё выдатнага сына нашай абарвалася на адным з перасыльных пунктаў.

Тая частка беларускай інтэлігенцыі Вільні, што яшчэ заставалася на волі, сталася сведкай рабавання бальшавікамі нашых нацыянальных культурных каштоўнасцяў. Зборы Беларускага музея імя Івана Луцкевіча спехам грузілі ў вагоны і вывозілі ў Менск. Па дарозе віленскія скарбы раскрадаліся і гінулі.

Але найцяжэйшаю культурнай стратаю была сама перадача Вільні і прылеглых земляў. Па-першае, ва ўмовах таталітарнага рэжыму і асімілятарскай палітыкі летувіскіх уладаў гэта адрывала ад беларускай нацыянальнай ідэі амаль паўмільёна беларусаў. Па-другое, Крэмль, ігнаруючы гістарычныя факты, падтрымаў прэтэнзіі Летувы на тое, што менавіта яна, а не Беларусь выступае спадкаемцай колішняй магутнай еўрапейскай дзяржавы. У выніку, паколькі адбылося злітне старога палітычнага назову і новага этноніма «Летувіс», знікала сувязь паміж сучаснай Беларуссю і Вялікім Княствам Літоўскім.

29 кастрычніка пасля ўрачыстай ўзняцця летувіскага сцяга на гары Гедзіміна ў гарадскім садзе выступіў генерал Вінцас Віткаўскас. Ён казаў пра «радасць летувіскага народа ў сувязі з далучэннем Вільні». Публіка напружана ўслухоўвалася ў гукі незнаёмай мовы. Генерала разумелі пераважна толькі ягоныя падначаленыя вайскоўцы ды ўведзеная ў горад летувіская паліцыя.

Перадача этнічнай беларускай тэрыторыі Віленшчыны ў склад Летувы сталася вынікам злачыннай змовы паміж сталінскім СССР і гітлераўскай Нямеччынай, якія пайшлі на такі крок, кіруючыся выключна сваімі імперскімі інтарэсамі.

Віленскі край стаў першай тэрытарыяльнай стратаю Беларусі ў Другой сусветнай вайне.

ВІЛЕНШЧЫНА Ў 1939–1944 ГАДАХ І ПАВАЕННЫМ ЧАСЕ

Вільня пад летувіскай уладай

Далучэнне Вільні да Летувы прывяло да хуткага росту тут летувіскага насельніцтва, якое раней складала ўсяго 1,5%. З этнічнага летувіскага абшару сюды пераязджала чыноўніцтва, ехалі вайскоўцы, паліцыя, перасялялі рабочых і сялянаў. Іншамоўных жыхароў, якіх па-ранейшаму была значная большасць, новая ўлада абвясціла колішнімі летувісамі, якіх трэба вярнуць да сваіх «сапраўдных каранёў». Такую ідэю і паклалі ў падмурак палітыкі на атрыманых ад Сталіна землях.

У грамадзянстве вельмі часта адмаўлялі нават народжаным у Вільні і на Віленшчыне. Афіцыйная прапаганда і чыноўніцтва сцвярджалі, што беларускае насельніцтва – гэта насамрэч «страчаныя летувісы», якія мусяць даданьць да прозвішчаў канчаткі «-ас», «-іс», «-ус» і вярнуцца да сваёй продкавай нацыянальнасці. Беларусаў цяпер дыскрымінавалі пры ўладкаванні на дзяржаўную службу. Сярод іх значна павялічылася беспрацоўе.

Гэтая палітыка, па сутнасці, не змянілася і пасля абвяшчэння ў ліпені 1940 г. Летувіскай ССР. У тым самым годзе Масква перадала новай «братняй рэспубліцы» частку тэрыторыі БССР плошчаю болей за дзве з паловай тысячы квадратных кіламетраў з насельніцтвам 82 тысячы чалавек, пераважную большасць якога складалі беларусы.

Гэты падарунак Сталіна мусіў падсаладзіць «літоўскім таварышам» іхнюю «радасць» з нагоды ўлучэння Летувы ў склад Савецкага Саюза.

Прэм'ер-міністр незалежнай Летувы Антанас Меркіс, выступаючы перад кіраўніцтвам віленскай адміністрацыі, заявіў, што трэба «прымусіць усіх думаць як летувісы» і «вымесці з Віленскага краю ўсялякі чужародны элемент», пад якім разумелі найперш беларусаў, палякаў і габрэяў.

Новая адміністрацыя зачыніла беларускія школы і культурна-асветныя арганізацыі, усяляк імкнучыся сцерці прыкметы беларускай прысутнасці ў горадзе і на Віленшчыне. На гары Гедыміна быў спілаваны мемарыяльны драўляны крыж, усталяваны ў 1921 г. на месцы пакарання Кастуся Каліноўскага і яшчэ чатырнаццаці пакараных смерцю паўстанцаў. Мармуровая пліта з імёнамі ўсіх змагароў бясследна знікла.

Звесткі пра нацыянальны склад насельніцтва Віленскага краю да 1939 г. (як і пра тое, што напачатку Вільня з прылеглым абшарам знаходзілася ў складзе Беларусі) былі засакрэчаныя.

Нямецкая акупацыя

Пад час акупацыі Летувы гітлераўскай Нямеччынай колькасць беларускіх арганізацый і шэраг свядомых беларусаў у Вільні хутка зніжаліся. З аднаго боку, ініцыятарамі шматлікіх антыбеларускіх акцый выступалі польскія шавіністы. Яны або «здавалі» беларусаў (абвінавачваючы іх у сімпатыях да камуністаў) немцам, або ліквідавалі напрост праз аддзелы падпольнай польскай Арміі Краёвай. У сваю чаргу і летувіскія паліцэйскія фармаванні, якія вылучаліся не меншай жорсткасцю, таксама разглядалі гарадское і вясковае беларускае насельніцтва як сваіх ворагаў. (Большая частка Віленшчыны разам з Вільняй была ў гэты час далучана да генеральнай акругі «Летува».) Трэцяй антыбеларускай сілай былі засыланыя з-за лініі фронту агенты НКВД, што мелі заданне не дапусціць стварэння цэлых незалежніцкіх арганізацый.

Тым не менш у гады вайны ў Вільні працавалі некалькі пачатковых беларускіх школаў, гімназія і настаўніцкая семінарыя. Аднавіў дзейнасць Беларускі музей імя Івана Луцкевіча. Выдавалася беларускамоўная газета «Беларускі голас», якую рэдагаваў славуты драматург Францішак Аляхновіч. Ён жа стаў кіраўніком віленскага камітэта падпольнай Беларускай незалежніцкай партыі (БНП), што мела на мэце ўтварыць адзіны нацыянальны фронт для змагання з нацыстамі і бальшавікамі за незалежную Беларусь. Сярод актывістаў партыі былі Вацлаў Іваноўскі і Станіслаў Грынкевіч.

Беларускі нацыянальны камітэт у Вільні разам з Францішкам Аляхновічам узначальвалі беларускія дзеячы Адам і Янка Станкевічы. У снежні 1944 г. савецкія агенты Е. Пятрайціс ... Аляхновіча ва ўласнай кватэры.

У лютым 1944 г. адбылася адміністрацыйная рэарганізацыя акупаваных украінскіх, беларускіх і прыбалтыйскіх земляў. Паводле ўказу Гітлера з складу рэйхскамісарыята «Украіна» былі выдзеленыя і далучаныя да генеральнай акругі «Беларусь» Берасцейскі, Кобрынскі, Пінскі і Петрыкаўскі раёны. Адначасова у склад акругі «Беларусь» была перададзеная частка акругі «Летува» зь Вільняй. Нацысты дзейнічалі ў сваіх мэтах, але, безумоўна, улічвалі этнічныя і гістарычныя аспекты. Беларускія незалежнікі звязвалі з рэарганізацыяй свае спадзяванні.

У захопленай немцамі Еўропе Летува была адной з першых краінаў, дзе ў масавым маштабе пачаўся генацыд габрэяў. З дапамогаю тысяч летувіскіх добраахвотнікаў нацысты да канца 1941 г. зьнішчылі ў Вільні блізу 22 тысяч габрэйскага насельніцтва, якое жыло ў міры з суседзямі-беларусамі з часоў Вялікага Княства Літоўскага. З 70 000 віленскіх габрэяў засталіся жывымі толькі блізу 7 тысяч.

Спасибо Великому Сталину за наше счастливое детство

Між тым, 13 ліпеня 1944 г. савецкія войскі пры падтрымцы польскіх аддзелаў выбілі немцаў з Вільні. Пра свае прэтэнзіі на горад заявілі палякі, чыя Армія Краёва змагалася не толькі за незалежнасць Польшчы, але і за вяртанне ёй Вільні. Летувісы, натуральна, лічылі, што горад мусіць належаць ім, але былі надзвычай устрымажлівыя. Іхны масавы калабарацыянізм і, наадварот, шырокі супраціў беларусаў нацысцкай акупацыі (разам з велізарнымі чалавечымі і эканамічнымі стратамі) у той час давалі падставы для перагляду лёсу Вільні і Віленшчыны і вяртання гістарычнай справядлівасці. Але Сталін палічыў, што больш выйграе, калі пакіне горад летувісам, і аднавіў Летувіскую ССР з сталіцай у Вільні.

Захаваліся прысвечаныя тым падзеям згадкі вядомага пісьменьніка Юстаса Палецкіса, які займаў пасаду старшыні Прэзідыюма Вярхоўнага Савета ЛССР і ў складзе ўрадавай дэлегацыі трапіў на прыём да Сталіна: «Мы меркавалі пра будучыню Вільні, баючыся, што яна нам не дастанецца. Ведалі, што Беларусь моцна пацярпела ў вайне і там актыўна змагаліся з немцамі, тым часам у нас усё было інакш. Сядзім, маўчым... Сталін кажа: «Ну што прыйшлі?» Мы не адважваемся сказаць, а ён гаворыць: «Я думаю, што мяжа павінна прайсці вось так», – і пазногцем правёў па карце. Тады мы, узрадаваныя (Вільня з нашага боку!), падаліся да карты, каб сёе-тое паправіць. Так мы здабылі Вільню».

Летувіскі савецкі ўрад не толькі не дазволіў адчыніць у Вільні ніводнай беларускай школы, але і ліквідаваў беларускую гімназію з настаўніцкай семінарыяй.

Знішчэнне беларускага асяроддзя пасля вайны

У пасляваеннай савецкай Летуве знішчэнне беларускага культурнага асяроддзя ў Вільні праходзіла з яшчэ большай, чым да вайны, паслядоўнасцю. Славуты гістарычна-этнаграфічны музей імя Івана Луцкевіча ў 1945 г. быў фактычна разрабаваны. Большая частка яго збораў трапіла ў летувіскія музейныя фонды і бібліятэку Акадэміі навук Летувы. Новыя гаспадары паклапаціліся пра тое, каб залічыць унікальныя беларускія калекцыі ў спадчыну летувісаў. Нават знакамітыя слуцкія паясы і ўрэцкае шкло былі абвешчаныя «вырабамі летувіскіх рамеснікаў». Тым часам гэбісты праводзілі новыя арышты віленскіх беларускіх дзеячаў і іхніх сем'яў, якіх у лепшым разе чакала дэпартацыя.

Узгадніўшы свае дзеянні з Масквой і камуністычнай Варшавай, летувіскія ўлады замест беларускіх школаў насаджалі польскія і расейскія. Калі ў міжваенны перыяд польскамоўны Віленскі ўніверсітэт быў навучальнай установай, дзе беларусаў імкнуліся асімiляваць, то пасля вайны гэтая вышэйшая школа стала ўстановай, куды беларусаў проста не прымалі. Вакол Вільні месціліся сотні беларускамоўных вёсак, да мяжы з Беларуссю было ўсяго трыццаць з нечым кіламетраў, але колькасць студэнтаў-беларусаў не перавышала 1%.

Дзе толькі магчыма, беларусаў запісвалі ў дакументах летувісамі, аллаведным чынам мяняючы імёны і прозвішчы. Тое самае адбывалася ў літаратуры, навуковых працах, на мемарыяльных дошках.

Міцкевіч рабіўся Міцкявічусам, Каліноўскі – Калінаўскасам, Васілеўскі – Васіляўскасам. Часам беларускія прозвішчы проста перакладаліся: да прыкладу, Жвірбліс замест Верабей. Нават Пётру Сергіевічу, славутаму віленскаму мастаку, даводзілася катэгарычна пратэставаць, каб яго не пісалі Пятрасам Сергіевічусам.

Адначасова ўлада ўсяляк спрыяла масаваму выезду нелетувіскага насельніцтва. У 1945–1948 гг. запісаліся палякамі і з'ехалі ў Польшчу каля 100 тысяч жыхароў Віленшчыны, сярод якіх большую частку складалі беларусы. На іх месца перасялялі сялянаў з этнічнай Летувы. Найперш дзякуючы гэтаму да пачатку 1950 г. у Вільні з'явіліся дзясяткі тысяч новых жыхароў. Такі працэс доўжыўся ў наступныя дзесяцігоддзі і даў свой плён.

У савецкай Вільні пазачыняліся ўсе беларускія выданні, затое пачала выходзіць польскамоўная газета «Чырвоны штандар». Ксяндзы-палякі ўбівалі ў галовы беларусам-каталікам Віленшчыны, што і яны – палякі. Уладам не перашкаджалі, бо былі зацікаўленыя ў змяншэнні колькасці беларускага насельніцтва, якое ўпарта не хацела ператварацца ў летувісаў. Адначасова праводзілася татальная летувізацыя тапанімікі Віленскага краю: Трокі ператвараліся ў Тракай, Меднікі – у Медзінінкай, Салечнікі – у Шальчынінкай, Свянцяны – у Швянчоніс.

«...». Вільня. Мастак ... 1965 г.

Беларусь ёсць адзінай краінай-пераможцай у Другой сусветнай вайне, якая панесла тэрытарыяльныя страты. Апрача перададзенай Летуве Віленшчыны, у жніўні 1945 г. Масква пры поўнай бяздзейнасці менскіх уладаў падаравала «польскім таварышам» амаль усю Беластоцкую вобласць БССР (у тым ліку населеныя пераважна беларусамі Аўгустоўскі, Беластоцкі, Бельскі, Браньскі, Дубровускі, Заблудаўскі, Сакольскі раёны), а таксама частку Берасцейскай вобласці (Клешчэлеўскі і Гайнаўскі раёны). У 1950 г. адбылося яшчэ адно «ўдакладненне мяжы», калі на карысць Польшчы перадалі шэраг беларускіх паселішчаў. Сярод іх была і родная вёска К. Каліноўскага Мастаўляны.

Паводле звестак усесаюзнага перапісу насельніцтва 1959 г., з 236 100 віленчукоў 79 400 (34%) назваліся летувісамі, 69 400 (29%) – расейцамі, 47 200 (20%) – палякамі, 14 700 (6%) – беларусамі. Такім чынам, доля летувісаў вырасла больш чым у 20 разоў (у 1939 г. яна не складала і 2%). Перапіс 1970 г. засведчыў, што летувісаў было ўжо 50,5%, а колькасць расейцаў, палякаў і беларусаў зменшылася адпаведна да 20, 19 і 5 адсоткаў.

У адказ на лаяльнасць летувіскіх камуністаў Масква фактычна дазволіла ў Летуве побач з камуністычнай і нацыяналістычную ідэалогію. Не было ніякіх перашкодаў таму, што спадчына Вялікага Княства Літоўскага абвяшчалася выключна летувіскай, а Вільня – насуперак гістарычным фактам – спрадвечна летувіскім горадам. За савецкім часам у Летуве выйшлі сотні навуковых і навукова-папулярных выданняў, дзе гэтыя падыходы ўсяляк прапагандаваліся і абгрунтоўваліся. Да прыкладу, у кнізе «Lietuvos pilys» («Летувіскія замкі») да такіх былі аднесеныя Навагрудскі, Лідскі, Мірскі, Полацкі ды іншыя беларускія замкі. Летувіскімі паэтамі абвяшчаліся Ян Вісліцкі і Мікола Гусоўскі. Рабіліся спробы залічыць у лік выдатных дзеячоў летувіскай культуры нават Францішка Скарыну.

Змены межаў Беларусі ў 1918–1945 гадах

Ад страты Вільні пацярпела найперш Беларусь, але не толькі яна. Палітыка тагачасных летувіскіх уладаў прывяла да разбурэння ўнікальнай культурнай прасторы, створанай некалькімі народамі.

Але найцяжэйшаю з усіх тэрытарыяльных стратаў была страта нашай гістарычнай сталіцы Вільні.

Як вядома, у Летувіскай ССР, як і ва ўсім паваенным Савецкім Саюзе, згадваць сакрэтныя пратаколы да пакта Молатава–Рыбентропа забаранялася. Напярэдадні распаду СССР на мітынгах і дэманстрацыях летувісы характарызавалі пакт як нацыянальную трагедыю. Пры гэтым замоўчвалася тое, што менавіта дзякуючы змове Сталіна і Гітлера Летува атрымала Вільню. Аднак пра сталінскі падарунак добра памятала кіраўніцтва савецкай імперыі.

Заява Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, прынятая ў сувязі з абвяшчэннем Летувой свайго суверэнітэту, была надрукавана 1 красавіка 1990 г. у газеце «Звязда». Гэты дакумент заканчваўся наступнымі словамі: «У сувязі з выкладзеным мы будзем вымушаныя настойваць на вяртанні Беларускай ССР беларускіх земляў».

11 сакавіка 1990 г. Летува першай з савецкіх рэспублік абвясціла пра свой дзяржаўны суверэнітэт. У той дзень летувіскі парламент на чале з Вітаўтасам Ландсбергісам прыняў Акт аб узнаўленні незалежнасці.

У адказ 28 сакавіка таго самага года Вярхоўны Савет Беларускай ССР, у якім рэй тады вяла кансерватыўная камуністычная большасць, накіраваў у Вільню рэзкую заяву. Яна нагадвала, што ў 1939–1940 гадах без згоды БССР Летуве «былі перададзеныя спрадвечныя беларускія тэрыторыі». Летувісаў папярэджвалі: «Пры выхадзе Літоўскай ССР з Савецкага Саюза Беларуская ССР не будзе лічыць сябе звязанай законамі, указамі і іншымі актамі адносна перадачы Літве часткі беларускіх земляў». Адначасова падкрэслівалася, што «Дагавор аб перадачы Літоўскай Рэспубліцы горада Вільні і Віленскай вобласці і аб узаемадапамозе паміж Савецкім Саюзам і Літвой» быў вынікам сакрэтнага дадатковага пратакола да савецка-нямецкай дамовы аб ненападзе ад 23 жніўня 1939 г., якую з'езд народных дэпутатаў СССР у 1989 г. прызнаў «юрыдычна беспадстаўнай і несапраўднай».

Такім чынам мясцовыя камуністы, якія шэсцьдзесят гадоў праводзілі саветызацыю і русіфікацыю Беларусі, ператварыліся на загад Крамля ў «абаронцаў нацыянальных інтарэсаў». Відавочна, што Масква ў сваіх геапалітычных мэтах прадугледжвала стварыць на нашых землях яшчэ адну «гарачую кропку» тыпу Карабаха або Прыднястроўя.

Беларускія нацыянальна-дэмакратычныя колы, у тым ліку кіраўніцтва БНФ «Адраджэньне» і франтаўская апазіцыйная фракцыя ў Вярхоўным Савеце не падтрымалі ўльтыматыўнай заявы на адрас незалежнай Летувы. Пазней тысячы грамадзян Беларусі выступілі з асуджэннем карнай акцыі савецкіх войскаў каля Віленскага тэлецэнтра. З візітам салідарнасці Вільню наведала дэлегацыя парламенцкай апазіцыі БНФ, а таксама – дзякуючы настойлівасці дэпутатаў-дэмакратаў – і афіцыйная дэлегацыя Вярхоўнага Савета.

Пасля канчатковага распаду Савецкага Саюза праблема Вільні пачала разглядацца на іншым роўні. На пачатку 1992 г. вялікая група грамадскіх і культурных дзеячоў Беларусі звярнулася ў гэтай справе да найвышэйшага заканадаўчага органа ўжо незалежнай Беларусі. Акадэмік Радзім Гарэцкі, заслужаны дзеяч мастацтваў Максім Лужанін, старшыня Рады Згуртавання беларусаў свету Яўген Лецка, вядомыя вучоныя і пісьменнікі Мікола Ермаловіч, Арсень Ліс, Барыс Сачанка ды іншыя прапанавалі Вярхоўнаму Савету цэлы комплекс захадаў. У звароце гаварылася пра неабходнасць абмеркаваць пытанне прызнання незаконнымі і антыдэмакратычнымі ўсіх актаў урадаў Савецкай Расіі і СССР, з аднаго боку, і Летувы – з другога, па дзяржаўным размежаванні паміж Летувой і Беларуссю, якія былі падпісаныя без удзелу прадстаўнікоў беларускага народа і без уліку народнага волевыяўлення.

Аўтары звароту, апублікаванага «Звяздой» 11 студзеня 1992 г., патрабавалі станоўча развязаць пытанне аб дэнансацыі дагавораў 1920–1940-х гадоў з Летувой, што «мелі захопніцкі характар і прывялі да падзелу беларускіх земляў». Вярхоўным уладам Беларусі і Летувы прапаноўвалася стварыць супольную камісію для распрацоўкі кампраміснага варыянта будучага ўладкавання Вільні і Віленскага краю (статус самакіравання, свабоднага горада, незалежнай ад Летувы і Беларусі зоны або аўтаноміі) «з запрашэннем экспертаў-назіральнікаў Савета Бяспекі ААН».

Зварот выклікаў у прэсе шырокую дыскусію, удзельнікі якой практычна аднадушна падтрымалі згаданыя прапановы. Аднак кіраўніцтва Вярхоўнага Савета не паставіла іх на разгляд. Тым самым была праігнараваная воля беларусаў як у Рэспубліцы Беларусь, так і ў Вільні і Віленскім краі.

Для вырашэння далейшага лёсу Вільні і Віленскага краю прапаноўвалася стварыць міждзяржаўную камісію з запрашэннем экспертаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый

Сілуэты старой Вільні. Фота Дзяніса Раманюка. 1999 г.

БЕЛАРУСЫ Ў СУЧАСНАЙ ЛЕТУВЕ

Некалькі дзесяцігоддзяў віленскія беларускія дзеячы, якія ацалелі пасля рэпрэсій і вярнуліся на радзіму з сталінскіх лагераў і высылкі, вымушаныя былі падтрымліваць паміж сабой выключна асабістыя кантакты. «Цэнтрамі прыцягнення» былі пісьменніца Зоська Верас (Людвіка Сівіцкая), мастак Пётра Сергіевіч, сыны Антона Луцкевіча Лявон і Юрка ды іншыя захавальнікі беларускіх культурных традыцый.

Паводле дадзеных перапісу 1989 г., у Летуве жыло 63 тысячы беларусаў (у Вільні – 30300). Пасля расейцаў і палякаў яны займалі трэцяе месца сярод нацыянальных меншасцяў, але доўгі час былі пазбаўленыя як права навучацца на роднай мове, так і астатніх правоў нацыянальнага жыцця.

ХРАНАЛОГІЯ

1989 г. – Стварэнне Таварыства беларускай культуры ў Летуве.
24–25 чэрвеня 1989 г. – У Вільні адбыўся Устаноўчы з'езд Беларускага Народнага Фронту «Адраджэнне».
1991 г. – У Вільні [illegible] газеты «Наша Ніва». [illegible]
1993 г. – [illegible] Францішка Скарыны.
1994 г. – У Вільні [illegible] Беларусаў Балтыі.
1997 г. – [illegible] паміж Беларуссю і Летувай [illegible]
1997 г. – Пачала выходзіць газета беларусаў Летувы «Руна». [illegible]
1 студзеня 2000 г. – У Вільні [illegible]
2001 г. – [illegible]

Толькі пры канцы 1980-х гадоў, калі ў СССР набраў сілу працэс палітычнай лібералізацыі, беларусы Віленшчыны і ўсёй Летувы атрымалі поўныя магчымасці для аб'яднання і грамадска-культурнай дзейнасці. Сярод першых утварыліся Таварыства беларускай культуры ў Летуве і Клуб аматараў беларускай народнай творчасці «Сябрына». З дапамогаю летувіскіх дэмакратаў і віленскіх беларускіх арганізацый у чэрвені 1989 г. у Вільні адбыўся Устаноўчы з'езд Беларускага Народнага Фронту «Адраджэнне».

Беларусы Віленшчыны бралі чынны ўдзел у змаганні за аднаўленне незалежнасці Летувы, у тым ліку ў вядомай абароне Віленскага тэлецэнтра ад савецкіх войскаў. Дзевяць нашых суайчыннікаў – Алег Аблажэй, Андрэй Балаховіч, Крысціна Балаховіч, Сяргей Дубавец, Ангеліна Якшэвіч (Русак), Уладзімір Кузьменка, Валянцін Стэх, Юрась Шаўцоў, Станіслаў Зялёнка – за праяўленыя тады адвагу і самаахвярнасць былі ўзнагароджаныя медалямі Летувіскай Рэспублікі.

Ад 1989 г. дзяржаўнае тэлебачанне і радыё Летувы транслюе беларускамоўныя перадачы. Шмат гадоў беларускія тэлевыпускі вяла паэтка і журналістка Таццяна Сапач. Яе калега Таццяна Поклад працуе віленскім карэспандэнтам беларускай службы Радыё «Свабода». Пэўны час у Вільні дзейнічала незалежная беларускамоўная радыёстанцыя «Балтыйскія хвалі», якая вяшчала на Беларусь.

На аснове беларускамоўных класаў, што ўтварыліся пры некалькіх віленскіх школах, у 1993 г. адчыненая беларуская сярэдняя школа імя Францішка Скарыны. Беларускія класы былі створаныя ў Вісагінасе ды іншых гарадах Віленшчыны.

У Літоўскім эдукацыйным універсітэце створаны цэнтр беларускай мовы, літаратуры і этнакультуры, які вядзе навучанне студэнтаў-беларусістаў.

Разам з адраджэннем беларускамоўнай адукацыі адрадзіўся беларускі друк. Менавіта ў Вільні ў 1991 г. было аднаўленае выданне газеты «Наша Ніва». У заснаванай ёю кніжнай серыі «Vostraja Brama» выйшлі творы Васіля Быкава, Адама Глобуса, Славаміра Адамовіча, Аляксандра Лукашука, Зьміцера Бартосіка, Сяргея Абламейкі ды іншых вядомых і маладых беларускіх пісьменнікаў.

Віленскія беларусы пэўны час выпускалі сваю газету «Рунь», а таксама стварылі адмысловае выдавецтва. Там, у прыватнасці, пабачылі свет кнігі Лявона Луцкевіча «Вандроўкі па Вільні», Міраславы Русак «Лявонава доля», Сымона Шаўцова «Мая адысея», Юр'я Весялкоўскага «Па сьлядох Другой сусьветнай вайны». У серыі «Партрэты віленчукоў» выйшлі кніжкі пра Зоську Верас, шматгадовага рэдактара легендарнай «Нашай Нівы» пачатку XX ст. Аляксандра Уласава, сусветна вядомага вучонага ў галіне астранаўтыкі Барыса Кіта, грамадскага і культурнага дзеяча Янку Шутовіча, кампазітара Канстанціна Галкоўскага...

У 1990-х гадах і на пачатку XXI ст. у Вільні надрукаваны шэраг кніг, прысвечаных нашаму гістарычнаму мінуламу, у тым ліку «Дзесяць вякоў беларускай гісторыі» Уладзіміра Арлова і Генадзя Сагановіча, «Беларусь незалежная» Ніны Стужынскай, «Адкуль наш род» Уладзіміра Арлова, «Дзесяць бітваў» Міхася Чарняўскага, «Асобы, якія тварылі гісторыю» Зьмітра Санько, «Культавае дойлідства Заходняй Беларусі» Сяргея Харэўскага, «Дзеля Рэчы Паспалітай Беларусі» Юрася Дубоўка, «150 пытанняў і адказаў з гісторыі Беларусі», укладзеная Зьмітром Санько і Іванам Саверчанкам, дзве кнігі першага тома «Архіваў Беларускае Народнае Рэспублікі», падрыхтаваных Сяргеем Шупам.

У сучасным жыцці Вільні прыкметную ролю адыгрывае Таварыства беларускай культуры, якое шмат гадоў узначальвае Хвядар Нюнька. Віленскія беларусы штогод адзначаюць Дзень абвяшчэння незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі і ўгодкі Слуцкага антыбальшавіцкага паўстання. Дзякуючы актыўнасці Таварыства наша старажытная сталіца з'яўляецца традыцыйным месцам правядзення з'ездаў беларусаў Балтыі. Тут адбываліся пасяджэнні цяперашняга складу Рады БНР.

З Вільняй звязаны лёс вядомых беларускіх літаратараў Алеся Мінкіна і Сяргея Дубаўца, які доўгі час быў рэдактарам адноўленай «Нашай Нівы». Тут жывуць і працуюць мастакі Алесь Аблажэй, Крысціна Бялявіч, Станіслаў Зялінка, Алесь і Сяргей Пахлабкі, што ўваходзяць у аб'яднанне беларускіх мастакоў Балтыі «Маю гонар». З поспехам адбываюцца выставы фотамастака Алеся Размовіча.

Таварыства беларускай культуры ў Летуве сталася ініцыятарам адкрыцця мемарыяльных дошак у гонар Францішка Скарыны, Янкі Купалы, Максіма Гарэцкага, Пятра Сергіевіча, Браніслава Тарашкевіча, Наталлі Арсенневай, Рыгора Шырмы, Адама Станкевіча ды іншых выдатных беларусаў, чый лёс непарыўна звязаны з Вільняй і Віленшчынай.

На могілках Росы сімвалічна перапахаваныя Іван Луцкевіч і Францішак Аляхновіч. Ім, а таксама Антону Луцкевічу пастаўленыя помнікі.

На гэтым старадаўнім некропалі знайшлі свой апошні прытулак шмат якія вядомыя дзеячы нашай гісторыі і культуры. Сярод іх пісьменнікі Уладзіслаў Сыракомля, Ядвігін Ш. (Антон Лявіцкі), паэт і святар Казімір Сваяк (Кастусь Стаповіч), гісторык і археолаг Яўстах Тышкевіч, архітэктар і грамадскі дзеяч Лявон Вітан-Дубейкаўскі. Віленскія беларусы клапоцяцца пра захаванне іхных магілаў і стварэнне надмагільных помнікаў.

Больш за 20 беларускіх культурніцка-асветных арганізацый, сярод якіх Таварыства беларускай мовы і беларускай школы Віленскага краю, аб'яднаныя ў Згуртаванне беларускіх грамадскіх арганізацый Летувы. Вільня стала гасцінным прытулкам для Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта.

У 1995 г. Беларусь і Летува падпісалі Дамову аб добрасуседстве і супрацоўніцтве. Сярод іншага гэты дакумент гарантуе правы нашых суайчыннікаў, якія жывуць у суседняй дзяржаве, на захаванне сваёй мовы, культуры і нацыянальных традыцыяў.

Такімі самымі правамі карыстаюцца ў нашай краіне летувісы, большасць якіх кампактна жыве ў памежных вёсках Астравецкага і Воранаўскага раёнаў Гарадзеншчыны. Там адчыненыя дзве сярэднія летувіскія школы, а ў вёсцы Рымдзюны дзейнічае Летувіскі грамадска-культурны цэнтр.

Эпоха Вялікага Княства Літоўскага –
найзначнейшы перыяд беларускай гісторыі.
Нашыя землі ў сярэдзіне XIII ст. сталіся стрыжнявым ядром гэтай моцнай сярэднявечнай дзяржавы. Сталіцамі Вялікага Княства Літоўскага былі спачатку старажытны беларускі Наваградак, а потым заснаваная крывічамі яшчэ ў XI ст. Вільня. Аб'ядноўшыся, беларускія княствы абаранілі ад расейскіх пагібелі і мангола-татарскага прыгнёту.
Найвышэйшай магутнасці Вялікае Княства дасягнула за князем Вітаўтам. Яно мела выйсце да Балтыйскага і Чорнага мораў і займала тэрыторыю больш як 900 тысяч квадратных кіламетраў, з'яўляючыся самай буйной краінай Еўропы. У Вялікім Княстве Літоўскім панавала беларуская культура, а беларуская мова была дзяржаўнай. На ёй гаварылі манархі ды іх двор, на ёй вялі справаводства ў вялікакняскай канцылярыі і ўсіх установах. Нашыя продкі займалі ў краіне большасць пасадаў.
Дзяржаўнае жыццё ў Вялікім Княстве Літоўскім, або, скарочана, у Літве, праходзіла пераважна ў беларускіх нацыянальных формах.
Менавіта там складваўся беларускі этнас. Па назве дзяржавы ж жыхары ў той час з гонарам называлі сябе ліцвінамі.
Цягам некалькіх стагоддзяў Княства паспяхова бараніла сваю незалежнасць ад захопнікаў з захаду і ўсходу. Ліцвінскія войскі здабылі бліскучыя перамогі пад Грунвальдам, Воршай, Кірхгольмам, Хацінам, Палонкай...
Літва-Беларусь была неад'емнаю часткаю Еўропы. Нашыя гарады, як у Нямеччыне, Францыі або Галандыі, жылі паводле права на самакіраванне, якога на ўсход ад Смаленска ніколі не было.
Вялікае Княства Літоўскае стала ўсходнім аванпостам Рэнесансу і Рэфармацыі, што засведчылі далейшы рух еўрапейскай цывілізацыі.
Створаныя ліцвінамі-беларусамі мастацкія і літаратурныя шэдэўры, навуковыя трактаты годна папоўнілі скарбніцу агульнаеўрапейскай культуры. Дзякуючы вядомаму гуманісту Францішку Скарыну мы атрымалі друкаваную Біблію на сваёй мове раней за расейцаў і ўкраінцаў, палякаў і летувісаў, французаў і англічанаў – наогул раней за большасць еўрапейскіх народаў.

Пасля Люблінскай уніі Вялікае Княства зрабілася часткаю канфедэратыўнай Рэчы Паспалітай, але захавала самастойнасць і праіснавала да канца XVIII ст.
Гарантыяй нашага дзяржаўнага суверэнітэту быў Статут 1588 г. – самы дасканалы збор законаў у тагачаснай Еўропе.
Палітычны заняпад Рэчы Паспалітай прывёў да захопу Літвы-Беларусі Расейскай імперыяй. Аднак ідэя адраджэння Вялікага Княства Літоўскага яшчэ доўга жыла ў розумах і сэрцах лепшых людзей краю, якія зноў і зноў паўставалі супраць чужаземскага панавання.
Жамойць ды іншыя землі, населеныя продкамі сучасных літоўцаў-летувісаў, займалі менш за 1/15 абшару нашай дзяржавы. Але міфалагізацыя гісторыі і спрыяльная палітычная кан'юнктура далі паўночна-заходнім суседзям магчымасць на пачатку XX ст. прысвоіць сваёй маладой дзяржаве гістарычную назву Літвы (Летува). Разам з гэтым яны насуперак фактам заявілі аб выключных правах на ўсю гістарычную і культурную спадчыну Вялікага Княства Літоўскага.
У 1939 г. у выніку змовы Сталіна і Гітлера Летува атрымала Вільню і Віленскі край. Гэта найбольш дапамагло летувісам замацаваць міф пра балцкі характар Вялікага Княства Літоўскага.
Як у савецкія часы, так і пасля распаду СССР летувіская гістарычная навука і адукацыя зыходзілі з таго, што спадкаемцай Вялікага Княства ёсць толькі іх краіна. [illegible] гэтага міфу [illegible] і ў міжнароднай гістарыяграфіі.
Ёсць рэальная небяспека сітуацыі, што цяпер, калі Летува ўступіла ў Еўропу, яе падыходы да гісторыі будуць мяркавацца адпаведнымі еўрапейскім стандартам. Але сцвердзіць свае правы на гістарычную спадчыну Вялікага Княства Літоўскага павінны мы самі, пачынаючы [illegible].
Гэтай справе і служыць кніга, якую вы трымаеце ў руках.

Аўтар тэксту і мастак выказваюць шчырую падзяку

Юрасю Бохану
Сяргею Вечару
Таццяне Дземідовіч
Сяргею Занкевічу
Міхалу Іванову
Пятру Казакевічу
Руслісу Камунтавічусу
Андрэю Катлярчуку
Вітаўту Кіпелю
Уладзіміру Кітурку
Сяргею Краўчуку
Уладзіміру Круцоўскаму
Генадзю Мацуру
Міхасю Міндзібекаву
Валеру Пазьнякову
Уладзіміру Піскуру
Валеру Ратнікаву
Зьмітру Сасноўскаму
Анджэю Струмілу
Вользе Стужынскай
Дарафею Фіёніку
Аляксею Хадыку
Міхасю Чарняўскаму
Яўгену Юрцэвічу

ІЛЮСТРАВАНАЯ ГІСТОРЫЯ

Краіна Беларусь.
ВЯЛІКАЕ КНЯСТВА ЛІТОЎСКАЕ

Аўтар тэксту Уладзімір Арлоў
Мастак Зьміцер Герасімовіч
Рэдактар Зьміцер Савко
Карэктары Яніна Марціновіч, Марыя Кавалечук
Апрацоўка ілюстрацый Юлія Арэч

ISBN 978-985-6919-82-7

KALLIGRAM, spol. s r.o.
Staromestská 6/d, P O Box 223, 811 05 Bratislava, Slovakia

Друкарня «NEOGRAFIA», Martin, Slovakia

Наклад 5000 асобнікаў